НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS KEEPING
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS
NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

*Series*
*«History, archeography, source studies»*

# Archivaryus

*Collection of scientific papers and articles*

*Founded in 2001*

## Volume 13

Minsk
NHAB
2015

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

*Серыя*
*«Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»*

# Архіварыус

*Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў*

*Выходзіць з 2001 года*

## Выпуск 13

Мінск
НГАБ
2015

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

*Серыя заснавана ў 1998 г.*

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Рэдакцыйная калегія:
*У. І. Адамушка, Ю. М. Бохан* (галоўны рэдактар), *Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў, У. М. Дзянісаў, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, А. Я. Рыбакоў, А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі* (адказны рэдактар), *М. Ф. Шумейка, Д. У. Яцэвіч*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук *А. І. Мальдзіс,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках.

**ISSN 2225-4412**

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2015

# Архівазнаўства, навукова-даведачны апарат, забеспячэнне захаванасці і ўліку архіўных дакументаў

*Ю. М. Лаўрык*

## Габрэйскія пергаментныя рукапісы ў зборах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

У зборах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца пяць габрэйскіх пергаментных рукапісаў (ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 1–5). Паколькі дагэтуль згаданыя дакументы не былі ўведзены ў навуковы зварот, то нам бачыцца слушным прапанаваць іх кнігазнаўчае апісанне.

Усе помнікі са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі выкананы каліграфічна — «квадратным» пісьмом на якасна выробленым пергаменце з ужываннем высокагатунковага чорнага атраманту і маюць форму сувояў; пералічаныя характарыстыкі ўказваюць на літургічны характар манускрыптаў.

Даволі сур'ёзную праблему ў справе вывучэння габрэйскіх літургічных сувояў як у цэлым, так і ў нашым канкрэтным выпадку — мае пытанне пра час стварэння рукапісу. З аднаго боку, гэта выклікана выкарыстаннем у якасці пісьмовага матэрыялу пергаменту, які ў адрозненне ад паперы не мае вадзяных знакаў. Другая прычына — у кансерватыўнасці «квадратнага» пісьма, якое не дае дастаткова матэрыялу для аналізу храналагічных змен: кожны вучань перапісчыка-софэра імкнуўся з максімальнай дакладнасцю ўнаследаваць почырк свайго настаўніка, што як вынік мела больш–менш стабільнае напісанне літар на працягу стагоддзяў. Што датычыць калафонаў з датай і імем перапісчыка, уладальніцкіх ці ўкладных запісаў або нейкіх іншых правененцый, якія ўвогуле

на літургічных сувоях сустракаюцца нячаста, то яны на манускрыптах НГАБ адсутнічаюць.

Ускосна пра ўзрост рукапісу могуць сведчыць колер і стан захаванасці атраманту, што, аднак, не з'яўляецца надзейнай датавальнай прыкметай. Так, з аднаго боку, для напісання літургічных тэкстаў заўсёды браўся атрамант высокай якасці, які мае тэндэнцыю захоўваць чорны колер на працягу доўгага часу. З другога боку пазнейшыя ўмовы захавання айчынных сувояў (пасля выдалення з сінагогі) былі найчасцей далёкія ад ідэальных і прыводзілі да страты колеру, нягледзячы на адносна малады ўзрост рукапісу. Тым не менш у сітуацыі поўнай адсутнасці пісьмовых сведчанняў пра час стварэння манускрыпта толькі колер і выгляд атраманту (а таксама помніка ўвогуле) можа даць хаця б нейкія падставы для датавання. Грунтуючыся на гэтай прыкмеце (на аснове аналізу аркушаў з сярэдзіны сувояў), мы ўмоўна датуем габрэйскія манускрыпты НГАБ XIX – першай паловай XX ст.; хоць разам з тым адзначым, што паасобныя рукапісы могуць паходзіць з больш ранняга часу.

*Структурны склад сувояў.* Літургічныя манускрыпты пісаліся на пергаментных аркушах. Паколькі ў працэсе падрыхтоўкі пергаменту аркушы атрымліваліся рознага памеру, іх абрэзвалі пад пэўную шырыню, каб атрымаць роўны сувой; на даўжыню звычайна не звярталі ніякай увагі, таму ў габрэйскіх сувоях айчыннага паходжання аркушы найчасцей маюць розную даўжыню. Пасля заканчэння працы над рукапісам аркушы сшываліся ў сувой адмысловым спосабам пры дапамозе ядвабнай ніткі або жылаў кашэрных жывёл (у айчынных рукапісах апошнія намі дагэтуль не былі заўважаны). Для ўмацавання шва на яго са знешняга боку сувоя часта наклейваліся простакутныя лапікі пергаменту найчасцей у колькасці 2–3 (у залежнасці ад фармату рукапісу).

Пасля сшывання аркушаў у сувой пачатковы і канцавы аркушы дзеля зручнасці разгортвання прымацоўвалі да драўляных стрыжняў, называных «эц-хаім» (עץ חיים — «дрэва жыцця»). На ніжні і верхні канцы стрыжняў насаджваліся асадкі з суцэльна вытачанымі ці накладнымі дыскамі-абмежавальнікамі, якія не дазвалялі пергаменту саслізгваць (часам такія асадкі выточваліся разам са стрыжнем з аднаго кавалка дрэва) (мал. 1, 2).

Каб не перагортваць сувой кожны раз нанова, пергаментныя рукапісы звычайна захоўваліся ў паўразгорнутым стане: канцы сувоя навіваліся кожны са свайго боку на адпаведны «эц-хаім» так, што патрэбны для чытання фрагмент трапляў пасярэдзіне, а сам рукапіс нагадваў нібыта два складзеныя разам скруткі. Такі спосаб захавання дапамагаў у кароткі час адшукаць месца чарговага чытання, але разам з тым шкодзіў манускрыпту: пасля доўгага ўжывання або падчас гвалтоўнага выдалення з сінагогі рукапіс нярэдка разрываўся па шве, які знаходзіўся каля адгорнутага фрагмента. Менавіта гэтай акалічнасцю тлумачыцца факт,



Мал. 1. Разгорнуты пергаментны сувой: выгляд з боку верхняй часткі. Фрагмент “эц-хаім” без наверша, на знешнім баку сувою шытво, што злучае аркушы (Сэфэр Тора — ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 2).
*Фотаздымкі Д. Лісейчыкава*

што ў значнай колькасці габрэйскіх сувояў з айчынных кнігасховішчаў адзін «эц-хаім» страчаны разам з прымацаваным да яго пачаткам ці канцом рукапісу.

Аналагічным чынам сітуацыя склалася і ў дачыненні да манускрыптаў НГАБ: у большасці з іх захаваўся толькі адзін «эц-хаім». Тым не менш, калекцыя архіва вылучаецца наступнымі асаблівасцямі: 1) адзін рукапіс (ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 4) захаваў абодва стрыжні (адпаведна — пачатак і канец тэксту); 2) на ўсіх манускрыптах уцалела хаця б па адной асадцы — а гэта дае нам магчымасць рэканструяваць іх знешні выгляд (на сувоях з іншых кнігасховішчаў такія асадкі найчасцей страчаны).

З пункту гледжання правілаў пісання літургічных тэкстаў, рукапісы НГАБ у цэлым адпавядаюць патрабаванням, што ставіліся перад перапісчыкамі габрэйскіх сувояў («нормы» афармлення літургічных тэкстаў агаворваюцца ў талмудычных трактатах «Сафрым», «Сэфэр Тора» і «Мэгілёт», а таксама ў творах пазнейшай, «галахічнай» літаратуры — у прыватнасці, у кнізе Майманіда «Мішнэ Тора» і ў «Шульхан Аруху» Язэпа Каро).



Мал. 2. Асадка на “эц-хаім” (Сэфэр Тора — ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 2).

Належыць адзначыць, што не ўсе з гэтых патрабаванняў заўсёды выконваліся — прыклады можна знайсці як сярод разгледжаных намі рукапісаў, так і ў габрэйскіх літургічных манускрыптах з іншых айчынных кнігасховішчаў. Напрыклад, шырыня прабелу паміж слупкамі тэксту часта раўняецца 2,5–3 см, што прыкладна адпавядае адной цалі (аднаму пальцу па традыцыйнай габрэйскай сістэме вымярэння) замест рэкамендаваных двух; прапорцыі вышыні і шырыні тэкставага слупка складаюць не суадносіны 2:1, а напрыклад 5:2 і г.д.

*Тэкставы склад і апісанне манускрыптаў.* Вывучэнне тэкставага складу помнікаў са збораў НГАБ паказала, што чатыры з пяці манускрыптаў змяшчаюць біблейскае Пяцікніжжа і з’яўляюцца рукапісамі Торы. Адзін манускрыпт — гэта зборнік тэкстаў, вядомых у габрэйскай традыцыі як «Хамеш мэгілёт».

Тора (תורה — даслоўна «Закон») ляжыць у аснове габрэйскага рэлігійнага і звычаёвага жыцця. Іудаізм адрознівае «Тору пісаную» і «Тору моўленую»: першая — гэта біблейскае Пяцікніжжа; другая з’яўляецца вусным каментарыем да апошняга ў кантэксце габрэйскіх звычаёвых практык (зрэшты, з часам і «Тора моўленая» набыла пісаную форму ў выглядзе Талмуда). У межах артыкула нас цікавіць толькі «Тора піса-



Мал. 3. Сэфэр Тора — ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 1.

ная» (Пяцікніжжа), а дакладней — «Сэфэр Тора» (ספר תורה — даслоўна «Кніга Закона»), г.зн. пергаментны сувой, напісаны квадратным пісьмом з захаваннем належных патрабаванняў і прыдатны для ўжывання ў сінагозе.

**1) Ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 1:**

*Сэфэр Тора (Кніга Закону). Умоўнае датаванне: XIX – першая палова XX ст.*

Колькасная характарыстыка рукапісу. Шырыня сувою — 51 см. Аб'ём — 26 арк.

Арганізацыя старонкі. Палі: верхняе — 6 см, ніжняе — 9 см. Колькасць слупкоў на старонцы — 4–5; адлегласць паміж слупкамі — каля 3 см.

Арганізацыя тэксту. Памеры тэкставага слупка: 36×13 см; колькасць радкоў у слупку — 42; адлегласць паміж радкамі — 5 мм.

Вышыня літар — 5 мм, з вынаснымі элементамі — да 8 мм; колькасць літар у радку — да 30.



Мал. 4. Сэфэр Тора — ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 4.

Тэкставы склад. Інцыпіт [1] (пачатак): שני השעירים גרלות
(Кніга Святарская 16, 8);
экспліцыт (канец): לעיני כל־ישראל
(Кніга Паўторанага Закона 34, 15).

Захаванасць. Страчаны пачатак разам з першым «эц-хаімам»; канцавы «эц-хаім» захаваўся разам з ніжняй асадкай, але наверша страчана. Знешні (першы з уцалелых) аркуш забруджаны, дэфармаваны і пашкоджаны. Прысутнічаюць нязначныя пашкоджанні і на іншых аркушах (мал. 3).

**2) Ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 2:**
*Сэфэр Тора (Кніга Закона). Умоўнае датаванне: XIX – першая палова XX ст.*

---

[1] Аўтарам выкарыстоўваецца лацінская тэрміналогія, традыцыйная для гебраістычнай літаратуры — *Рэд.*

Колькасная характарыстыка рукапісу. Шырыня сувою — 59 см. Аб'ём — 41 арк.

Арганізацыя старонкі. Палі: верхняе — 8 см, ніжняе — 10 см. Колькасць слупкоў на старонцы — 3–4. Адлегласць паміж слупкамі — каля 3 см.

Арганізацыя тэксту. Памеры тэкставага слупка — 40×14 см; колькасць радкоў у слупку — 42; адлегласць паміж радкамі — 5 мм.

Вышыня літар — 5–7 мм, з вынаснымі элементамі — да 10 мм; колькасць літар у радку — да 30.

Тэкставы склад. Інцыпіт: בראשית (Кніга Роду 1,1);
эксплiцыт: בראש ההר (Лічбаў 20, 28).

Захаванасць. Першы «эц-хаім» (драўляны стрыжань) захаваўся разам з ніжняй асадкай (але без дыска), наверша страчана; адсутнічае канцавы «эц-хаім» і частка тэксту. Знешні (апошні ўцалелы) аркуш пашкоджаны і дэфармаваны. Прысутнічаюць пашкоджанні і на іншых аркушах.

**3) Ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 4:**

*Сэфэр Тора (Кніга Закона). Умоўнае датаванне: XIX – першая палова XX ст.*

Колькасная характарыстыка рукапісу. Шырыня сувою — 37,5 см. Аб'ём — 60 арк.

Арганізацыя старонкі. Палі: верхняе — 6 см, ніжняе — 8,5 см. Колькасць слупкоў на старонцы — 3–4; адлегласць паміж слупкамі — каля 3 см.

Арганізацыя тэксту. Памеры тэкставага слупка — 23×10,5 см; колькасць радкоў у слупку — 42; адлегласць паміж радкамі — 5–6 мм.

Вышыня літар — 3 мм, з вынаснымі элементамі — да 5 мм; колькасць літар у радку — да 40.

Тэкставы склад. Інцыпіт: בראשית (Кніга Роду 1, 1);
эксплiцыт: לעיני כל־ישראל
(Кніга Паўторанага Закона 34, 15).

Захаванасць. Захаваны абодва «эц-хаіма»: 1) пачатковы з асадкай і насадным касцяным дыскам, але без наверша; 2) канцавы «эц-хаім» — без асадкі і наверша. Шэраг аркушаў забруджаны, пашкоджаны і дэфармаваны (мал. 4).

**4) Ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 5:**

*Сэфэр Тора (Кніга Закона). Умоўнае датаванне: XIX – першая палова XX ст.*



Мал. 5. Хамеш мэгілёт — ф. 1481, воп. 3, адз. зах. 3.

Колькасная характарыстыка рукапісу. Шырыня сувою — 56 см. Аб’ём — 50 арк.

Арганізацыя старонкі. Палі: верхняе — 7 см, ніжняе — 9 см. Колькасць слупкоў на старонцы — 5–6; адлегласць паміж слупкамі — каля 3 см.

Арганізацыя тэксту. Памеры тэкставага слупка — 40×14 см; колькасць радкоў у слупку — 42; адлегласць паміж радкамі — 5 мм.

Вышыня літар — 5-7 мм, з вынаснымі элементамі — да 10 мм; колькасць літар у радку — да 30.

Тэкставы склад. Інцыпіт: ברשית (Кніга Роду 1, 1);
эксплiцыт: עד האבידו אתך
(Кніга Паўторанага Закона 28, 51).

Захаванасць. Першы «эц-хаім» захаваўся разам з ніжняй асадкай, наверша страчана; адсутнічае канцавы «эц-хаім» і частка тэксту. Знешні (апошні ўцалелы) аркуш пашкоджаны і дэфармаваны. Прысутнічаюць нязначныя пашкоджанні і на іншых аркушах.

Назвай «Хамеш мэгілёт» (חמש מגלות — «Пяць сувояў») габрэйская традыцыя абагульняе тэксты, што чытаюцца на пэўныя святы і дні іудзейскага літургічнага года: менавіта біблейскія кнігі «Песня песняў», «Рут», «Плач Езэкіеля», «Эклезіяст» і «Эстэр». Наш манускрыпт змяшчае першыя чатыры з пералічаных тэкстаў.

**5) Ф. 1481, воп. 1, адз. зах. 3:**

*Хамеш мэгілёт (Пяць сувояў). Умоўнае датаванне: XIX – першая палова XX ст.*

Колькасная характарыстыка рукапісу. Шырыня сувою — 56,5 см. Аб'ём — 6 арк.

Арганізацыя старонкі. Палі: верхняе — 6 см, ніжняе — 9,5–10 см. Колькасць слупкоў на старонцы — 5–6; адлегласць паміж слупкамі — каля 3 см.

Арганізацыя тэксту. Памеры тэкставага слупка — 40,5×14,5 см; колькасць радкоў у слупку — 42; адлегласць паміж радкамі — 10 мм.

Вышыня літар — 5–6 мм, з вынаснымі элементамі — да 9 мм; колькасць літар у радку — да 32.

Тэкставы склад. 1) арк. 1: שיר השירים (Песня песняў);
2) арк. 2: רות (Рут);
3) арк. 3: איכה (Плач Ераміі);
4) арк. 4–6: קהלת (Эклезіяст).

Захаванасць. Адсутнічае пачатковы «эц-хаім»; другі захаваўся разам з ніжняй асадкай, але наверша страчана. Першы аркуш мае істотныя пашкоджанні ў розных месцах, у тым ліку ўздоўж краёў. Прысутнічаюць нязначныя пашкоджанні і на іншых аркушах (мал. 5).

Такім чынам, у дадзеным артыкуле мы разгледзелі і апісалі габрэйскія сувоі, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Падкрэслім, што гэтая невялікая калекцыя змяшчае ўсяго пяць манускрыптаў, але з'яўляецца цікавай і ў пэўнай ступені ўнікальнай. Па-першае, адзін з сувояў Сэфэр Торы захаваўся з мінімальнымі стратамі і мае, што для беларускіх збораў даволі рэдкая з'ява, як пачатковы, так і канцавы «эц-хаім» (праўда, толькі з адной уцалелай асадкай). Па-другое, у калекцыі прысутнічае «Хамеш мэгілёт» — рукапіс рэдкі для айчынных кнігасховішчаў.

Падагульняючы, адзначым, што матэрыялы са збораў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі і культуры габрэяў Беларусі.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.03.2015

*А. С. Тищенко*

# Создание и использование электронной базы данных «Именной указатель лиц, выезжающих за границу по данным паспортов» к фонду Национального исторического архива Беларуси «Канцелярия минского гражданского губернатора»

В Национальном историческом архиве Беларуси (далее — НИАБ) создаются и продолжают наполняться информацией различные тематические базы данных [1], которые представляют собой географические и именные указатели к документам архива.

На основании фонда 295 «Канцелярия минского гражданского губернатора» в результате кропотливой работы сотрудниками архива была создана база данных «Именной указатель лиц, выезжающих за границу по данным паспортов».

Указанный фонд охватывает период от учреждения в апреле 1793 г. до упразднения в марте 1917 г. канцелярии минского гражданского губернатора [7, с. 4]. Объем фонда составляет 10 116 ед. хр., его документы представлены в основном на русском языке [4].

В фонде содержатся указы Сената, генерал-губернатора, отчеты губернатора, сведения о фабриках, заводах, урожае зерновых, документы о революционном движении, Курловском расстреле, политической неблагонадежности граждан, установлении полицейского надзора, аресте участников восстаний, аграрных выступлениях крестьян [3]. Также имеются сведения о религиозных учреждениях (в т.ч. церквях), межконфессиональных переходах, об открытии школ, библиотек, устройстве выставок, спектаклей, о состоянии здравоохранения, распространении эпидемий, мерах борьбы с ними, выдаче паспортов и т.д. (ф. 295, оп. 1–2) [8].

В течение двух последних десятилетий в НИАБ наблюдается тенденция постоянного увеличения запросов генеалогического и биографического характера, поступающих от граждан и организаций. Они касаются, в том числе, сведений об уроженцах Беларуси, покинувших ее территорию в конце XIX – начале XX в. и переехавших на постоянное жительство в самые разные уголки мира. При выполнении этих запросов работники отдела научного использования документов и информации и других отделов столкнулись с необходимостью разработки архив-

---

[1] База данных — набор данных, организованных в строки и столбцы для облегчения их поиска, редактирования и систематизации [5].

ных указателей о выезде уроженцев Беларуси на жительство в другие регионы.

Уникальным источником, фиксирующим проявления взаимоотношений между государством и гражданином, является паспорт. Созданный для идентификации человека и контроля над его передвижениями, он постепенно вобрал в себя множество иных значений. В делах фонда 295 содержатся ценнейшие сведения о выдаче заграничных паспортов, особенно за период 1890–1917 гг. — период активной трудовой эмиграции населения Беларуси [3]. Но, к сожалению, материалы данного фонда сохранились фрагментарно. Также многие документы находятся в плохом физическом состоянии и постоянное обращение к ним только его усугубляет и может привести к утере важных сведений.

Для упрощения и удобства поиска необходимой информации И. Л. Вернер, ведущий научный сотрудник отдела научного использования документов и информации, начала создавать картотеку, а именно разрабатывать именные указатели к каждому делу. Затем совместно с сотрудниками отдела информационно-поисковых систем Г. Е. Акулович и А. Л. Гривеневым в 2000 г. началась работа по созданию электронной версии картотеки — базы данных. Для этого было выбрано программное средство MS Excel.

В созданной базе данных количество записей составило 27 860 строк, 10 столбцов, количество обработанных дел — 596.

В первых четырех столбцах помещены основные координаты документа: фонд, опись, номер дела и номера листов в нем. В пятом столбце указан год выдачи паспорта (например, самый ранний относится к 1843 г., самый поздний — к 1916 г.). В столбцах с шестого по десятый размещается основная информация о человеке, получающем паспорт: фамилия, имя, отчество, место приписки (жительства), возраст, родственники и примечание. В примечании указывается, к какому сословию принадлежит человек и каким родом деятельности он занимается. Так, большинство лиц, выезжающих за границу, составляли крестьяне, мещане и дворяне, другие же сословия (купцы, почетные граждане, духовенство) выезжали редко и в небольшой численности. Основными занятиями представленных лиц являлись сельскохозяйственная и торгово-промышленная деятельность.

Также по базе данных можно проследить, что с каждым годом количество выданных заграничных паспортов значительно увеличивалось. Связано это было с тем, что в основном целью поездок за границу являлись заработки, причем в это время на фабриках все более стал применяться женский труд. Земские статистики того времени писали: «Если прежде отцы, мужья, сыновья и братья считали зазорным посылать в дальние края своих жен, дочерей и сестер на заработки, то

теперь вынужденная необходимость посылать их на сторону для отыскания себе средств существования указывает на невозможность добыть себе дома хлеб насущный» [10, с. 87]. Конечно же, существовали и другие цели для поездок за границу: для лечения или по торговым делам.

С каждого паспорта взимался единообразный сбор за напечатание бланкета в размере 50 коп. и сбор по 10 руб. за каждое полугодие, из которых 9 руб. 50 коп. обращались в состав инвалидного капитала, а 50 коп. — в пользу казны. С одной только платой за напечатание бланкета заграничные паспорта выдавались лицам, выезжающим в Иерусалим на поклонение Святым местам, купцам, мещанам, раненым офицерам и т.п. Десятирублевый сбор возвращался, если лицо, не воспользовавшееся заграничным паспортом, представляло его обратно до истечения 2 месяцев со дня получения паспорта [12, с. 926].

Канцелярией губернатора выдавались паспорта по просьбе частных лиц (в основном дворян и представителей интеллигенции, желающих поехать за границу по сугубо личным делам — на лечение, учебу и т.п.). Объявление о каждом выезжающем трижды публиковалось в официальных газетах. Выдавались загранпаспорта только тем, к кому не было «претензий» у частных лиц и официальных органов [2, с. 342].

Интересен тот факт, что срок действия паспорта определялся сословным положением его получателя. Для дворян, чиновников, отставных офицеров, гильдейских купцов, потомственных и почетных граждан существовали бессрочные паспорта, выдаваемые хотя бы и по конкретному случаю (поездка за границу), но фактически сохраняемые на всю жизнь. Для мещан (купцов и ремесленников) устанавливались срочные паспорта, которые делились на паспортные книжки (сроком на 5 лет) и одногодичные паспорта. Книжки выдавались лицам, которых цех, артель или мещанское общество рекомендовали как крепкого хозяина и аккуратного налогоплательщика. Одногодичный паспорт предназначался лицам, неимеющим доверия у полиции [6]. Крестьянам и рабочим выдавались виды и на еще более малый срок — на 3 и 6 месяцев, что усиливало их зависимость, заставляло часто наведываться в полицию для продления [1, с. 146].

Разработанная нами база данных имеет ряд достоинств:

1. Несмотря на то что в пакете Office имеется отдельное приложение для работы с базами данных — Microsoft Acces, для создания именного указателя была выбрана программа Excel. Плюс данной программы заключается в том, что в ней легко доступны функции, позволяющие создавать, редактировать и генерировать отчеты базы данных.

2. Именной указатель поддерживает систему ограничения доступа для различных пользователей и групп пользователей. Используя эту

возможность, можно построить эффективную систему защиты конфиденциальности данных.

3. Таблица четко структурирована, а представленная в ней информация лаконична.

Количество обращений к именному указателю варьируется из года в год. Если в 2013 г. зарегистрировано лишь 31 обращение, то в 2014 г. этот показатель увеличился до 120. Такой «наплыв» вызван высоким интересом посетителей НИАБ к истории своей семьи, рода. Поиск сведений о родственниках, эмигрировавших за границу, осуществляют не только граждане Республики Беларусь, но и жители России, Украины, Казахстана, США, Польши, Израиля, Франции, Англии, Канады, Италии, Австралии, Германии, Швеции, Литвы и Латвии.

В связи с тем что количество посетителей и исследователей в читальном зале архива постоянно увеличивается, а вместе с ним растет и количество генеалогических запросов, в дальнейшем планируется создание аналогичной базы данных по Витебской и Могилевской губерниям. В фонде «Канцелярия витебского гражданского губернатора» хранятся дела о выдаче паспортов иностранным подданным за 1827–1916 гг. (ф. 1430, оп. 1), в фонде «Канцелярия могилевского гражданского губернатора» — за 1846–1883 гг. (ф. 2001, оп. 1) [11, с. 251, 262]. Информация о выдаче заграничных паспортов в делах указанных фондов расположена бессистемно, поэтому поиск необходимых документов значительно усложняется. Ввиду этого на создание именного указателя к перечисленным выше фондам потребуется больше времени и сил из-за значительного объема дел, которые требуется пересмотреть.

Таким образом, создание «Именного указателя лиц, выезжающих за границу по данным паспортов» к фонду 295 способствовует не только сохранности документов этого фонда, но и значительно упрощает поисковую работу сотрудников архива и исследователей читального зала.

На сегодняшний день работа по созданию электронной версии базы данных находится на заключительном этапе: проводится проверка, учитываются мнения специалистов по ее улучшению. В законченном варианте она позволит более быстро и качественно осуществлять поиск по необходимым критериям.

## Приложения

### 1. Пример заграничного паспорта мещанина Фридриха Георгиева Гинца, выданного 05.07.1903




*Источник:* НИАБ. Ф. 295. Оп. 2. Д. 23. Л. 26–27. Рукописный [9].

### 2. База данных «Именной указатель лиц, выезжающих за границу по данным паспортов» (фрагмент)



| 1 | Фо | | Дел | Лист | Год | Фамилия | Место приписки (жительства | возра | Примечание | С кем выезжает(или только | родстве |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 13695 | 295 | 2 | 119 | 2 | 1911 | Рудерман Хана Рубинова-Иоселева | Минск | 28 лет | жена аптекарского помощника | | |
| 13696 | 295 | 2 | 119 | 13 | 1911 | Кашкан Николай Киприянов | Гомолинщина, фольв. Бродецкая в | род. 9.05. | крестьянин | | |
| 13697 | 295 | 2 | 119 | 20 | 1911 | Френкель Мовша Мордуховна | Калинковичи, м. Речицкий у. | 40 лет | мещанка | | |
| 13698 | 295 | 2 | 119 | 58 | 1911 | Гираховский Берка Ицков | Вызна, м. Слуцкий у. | 52 года | мещанин | дети: Абрам - 12 лет, Кетля - 17 лет | |
| 13699 | 295 | 2 | 119 | 78 | 1911 | Голод Сроль Иоселевич | Озаричи, м. Бобруйский у. | 48 лет | мещанин | дети: Злата - 19 лет, Люба - 17 лет, Хаим-Лейзер - | |
| 13700 | 295 | 2 | 119 | 85 | 1911 | Броссель Вера Генриховна | Слуцк, г. | 28 лет | мещанка | | |
| 13701 | 295 | 2 | 119 | 104 | 1911 | Царивец Хаим Абрамович | Слуцк, г. | род. 24.1( | портной | | |
| 13702 | 295 | 2 | 119 | 105 | 1911 | Царивец Айсик Абрамов | Слуцк, г. | род. 10.1: | столяр | | |
| 13703 | 295 | 2 | 119 | 113 | 1911 | Соколовская Альбина Казимировна | Вызненская вол. Слуцкий у. | 20 лет | крестьянка | | |
| 13704 | 295 | 2 | 119 | 127 | 1911 | Штайд Порфирий Федорович | Слуцкий у. | 33 года | крестьянин | | |
| 13705 | 295 | 2 | 119 | 141 | 1911 | Косберг Меер Аронов | Слуцк, г. | 38 лет | мещанин | дети: Арон - род. 8.11.1898 г., Шлом - род. 28.02.1 | |
| 13706 | 295 | 2 | 119 | 147 | 1911 | Эпштейн Шимон Лейбов | Слуцк, г. | 30 лет | мещанин | | |
| 13707 | 295 | 2 | 119 | 150 | 1911 | Латушко Радион Семенов | Слуцкий у. | 40 лет | крестьянин | | |
| 13708 | 295 | 2 | 119 | 170 | 1911 | Лозинский Киви Мордухов | Слуцкий у. | 60 лет | мещанин | жена: Бейля-Эша - 51 год | |
| 13709 | 295 | 2 | 119 | 180 | 1911 | Рудерман Хаима-абы Янкелев | Бобруйск, г. | 24 года | аптекарская помощница | паспорта нет | |
| 13710 | 295 | 2 | 119 | 188 | 1911 | Барбаш Лейба Давидов | Бобруйск, г. | 24 года | купец 2-ой гильдии | | |
| 13711 | 295 | 2 | 119 | 201 | 1911 | Горелик Гилер Нотов | Паричи, м. Бобруйский у. | 25 лет | столяр | | |
| 13712 | 295 | 2 | 119 | 207 | 1911 | Дреер Бейля Янкелевна | Глуск, м. Бобруйский у. | 52 года | мещанка | | |
| 13713 | 295 | 2 | 119 | 225 | 1911 | Райхцаум Сора Гиршова | Глуск, м. Бобруйский у. | 24 года | мещанка | | |
| 13714 | 295 | 2 | 119 | 232 | 1911 | Ошеровский Меер Лейб-Ошеров | Любча, м. Новогрудский у. | 30 лет | мещанин | жена: Шейна-Ривка - 28 лет | |
| 13715 | 295 | 2 | 119 | 286 | 1911 | Шаиович-Вишкович Гита Лея | Любча, м. Новогрудский у. | 49 лет | мещанин | сыновья: Лейба - род. 11.11.1893 г., Исайя - род. | |
| 13716 | 295 | 2 | 119 | 241 | 1911 | Гирнзбург Мовшев | Пинск, г. | 33 года | мещанин | | |
| 13717 | 295 | 2 | 119 | 259 | 1911 | Айзинберг Сора Абрамова | Телеханы, м. Пинский у. | 21 год | мещанка | | |
| 13718 | 295 | 2 | 119 | 274 | 1911 | Миндель Сора Иоселева | Дужиловичи, м. Вилейский у. Виле | 31 год | мещанка | сыновья: Вульф - 9 лет, Израиль - 2 года, дочь: Х | |

### 3. Статистика обращений к базе данных «Именной указатель лиц, выезжающих за границу по данным паспортов»

| *Год* | *Количество обращений* |
|---|---|
| 2014 | 120 |
| 2013 | 31 |

| *Год* | *Количество обращений* |
|---|---|
| 2012 | 62 |
| 2011 | 43 |
| 2010 | 42 |
| 2009 | 52 |

## Источники и литература


1. Байбурин, А. К. К предыстории советского паспорта (1917–1932) // Неприкосновенный запас. — 2009. — № 2. — С. 140–154.
2. Бригадин, П. И. Минские губернаторы : история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. — Минск: Гос. ин-т управления и социальных технологий Бел. гос. ун-та, 2009. — 351 с.
3. Вернер, И. Л. Источники исследований по родословию и истории семьи (конец XVIII – начало XX ст) [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://knihi.com/storage/kastounasci/01/15.html. — Дата доступа: 10.07.2015.
4. Информация о фонде «Канцелярия минского гражданского губернатора» [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/fond/89206/. — Дата доступа: 10.07.2015.
5. Использование Excel как базы данных [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.williamspublishing.com/PDF/978-5-8459-1402-6/part.pdf. — Дата доступа: 09.07.2015.
6. Историческая справка: по страницам истории паспорта [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://ufms-khb.ru/node/555 — Дата доступа: 12.07.2015.
7. Минские губернаторы // Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / Сост. Т. Е. Леонтьева; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.) [и др.]. — Минск, 2006. — 392 с.
8. Национальный исторический архив Беларуси (далее — НИАБ). — Ф. 295. — Оп. 1–2.
9. НИАБ. — Ф. 295. — Оп. 2. — Д. 23. — Л. 26–27.
10. Федоров, В. А. История России 1861–1917 гг. / В. А. Федоров. — М.: ЮРАЙТ, 2011. — 400 с.
11. Фонды Национального исторического архива Беларуси: справочник / Сост. Г. Е. Акулович [и др.] — Минск: БелНИИДАД, 2006. — 304 с.
12. Энциклопедический словарь / Сост. Ф. А. Брокгауз, И. А. Ефрон. — Т. 22. — С-Петербург, 1897.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.07.2015

# Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў

*А. Б. Доўнар*

## Прывілеі Шклову на Магдэбургскае права

Шклоў упершыню адзначаны ў пісьмовых крыніцах пачатку XVI ст. Спачатку гэта быў гаспадарскі двор Гаштольдаў, дзе знаходзіўся цэнтр уладання і размяшчалася панская адміністрацыя.

У 1559 г. новы ўладальнік шклоўскага маёнтка пан Геранім Хадкевіч, карыстаючыся вялікай ласкай пры двары манарха з-за сваёй вернай і адданай службы, звярнуўся да караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста аб выдачы яму прывілея на заснаванне места Шклова з торгам і іншымі неабходнымі прэрагатывамі. У тым жа 1559 г. такі прывілей з дазволам «в тым имении его Шкловском на реце Бобр в селе Забобровье … место садити и в нем корчмы и торг мети» быў атрыманы [2, арк. 203]. З таго часу Шклоў хутка развіваўся, некалькі разоў пераносіўся на іншае месца, спачатку ў раён сучаснай в. Рыжкавічы, а затым на цяперашняе месца [1, с. 109–110; 7, с. 34].

У XVII–XVIII стст. Шклоў з'яўляўся адным з важнейшых гарадоў ВКЛ, які меў вялікае значэнне для эканамічнага развіцця не толькі рэгіёна, але і ўсёй краіны. З сярэдзіны XVII ст. да пачатку XVIII ст. ён належаў Сяняўскім, а з 30-х гг. XVIII ст. — князям Чартарыйскім.

Канец 50-х – пачатак 60-х гг. XVIII ст. — перыяд надання магдэбургскага права прыватным гарадам і мястэчкам Вялікага Княства Літоўскага. Гарадское самакіраванне атрымалі Ушачы (1758 г.), Шчучын (1761 г.), Бобр (1762 г.), Стары Мядзел (1762 г.). Акт надання гарадскога самакіравання Шклову аформлены спецыяльным прывілеем, які гаран-

таваў гораду захаванасць і недатыкальнасць новых правоў і вольнасцяў, і выдадзены ў Варшаве каралём польскім і вялікім князем літоўскім Аўгустам III 10 красавіка 1762 г. [4, арк. 646–648] (гл. Дадатак 2).

У прывілеі Шклову адзначана, што ім валодалі «вяльможны Аўгуст, князь Чартарыйскі» і яго жонка Марыя з роду Сяняўскіх. Без іх згоды горад не мог атрымаць ніякіх правоў і вольнасцяў. Звычайна ў Вялікім Княстве Літоўскім прыватныя гарады і мястэчкі атрымлівалі прывілеі на магдэбургскае права ад манархаў па просьбе іх уладальнікаў. Такія просьбы і былі праявамі згоды ўладальніка на самакіраванне гарадскому паселішчу. Хутчэй за ўсё мяшчане Шклова атрымалі яе ў вуснай форме і пасля распачалі працэс па атрыманні правоў гарадскога самакіравання. Надаючы магдэбургскае права, манарх улічыў, што Шклоў засяляюць «людзі слушныя, якія здольны да трымання добрага ўраду» [4, арк. 647], г.зн. цэнтральная ўлада прызнавала шклоўскіх мяшчан за дзейсных, ініцыятыўных жыхароў дзяржавы, якія прыносілі ёй шмат карысці.

Важна адзначыць, што просьба аб надзяленні Шклова магдэбургскім правам сыходзіла не ад уладальнікаў горада Чартарыйскіх, а менавіта ад саміх мяшчан. Матывам іх дзеянняў быў клопат пра дабрабыт і росквіт паселішча. Мяшчане лічылі, што магдэбургскае права будзе садзейнічаць развіццю горада, ці як гаворыць прывілей, дапаможа ім «да лепшай прыйсці формы пад абаронай праў і прэрагатыў, якія маюць гарады Вялікага Княства Літоўскага пад правам тэўтонскім або магдэбургскім». У сувязі з гэтым «усе жыхары таго горада» самі «горача» прасілі караля польскага і вялікага князя літоўскага аб надзяленні іх гарадскім самакіраваннем [4, арк. 647]. Ужо сам факт звароту да манарха мяшчан прыватнаўладальніцкага горада заслугоўвае ўвагі.

Аўгуст III пагадзіўся з просьбай мяшчан і, жадаючы, каб Шклоў «між іншымі прыстойнымі і гандлёвымі гарадамі (…) зацвісці і разрасціся» мог, надаў яму магдэбургскае права і іншыя вольнасці, якія спадарожнічалі праву па прыкладу іншых гарадоў дзяржавы.

Выдадзены прывілей, нягледзячы на тое што меў подпіс караля польскага і вялікага князя літоўскага і быў замацаваны дзяржаўнай пячаткай Вялікага Княства Літоўскага, сам па сабе не меў юрыдычнай сілы. Каб атрымаць статус заканадаўчага акта яму належала прайсці працэс абвяшчэння яго як дакумента. Для ўступлення ў сілу прывілей патрэбна было запісаць у кнігі «аўтэнтычныя» (г. зн. актавыя кнігі судоў, якія мелі права вечнасці: гродскія, земскія, магдэбургскія). Акрамя гэтага яго прачытвалі «ўголас» на людным месцы служачыя мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі — возныя. Копіі прывілея прымацоўвалі да дзвярэй парафіяльных касцёлаў і цэркваў.

З наданнем магдэбургскага права гарадское паселішча вылучалася з ранейшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэмы і ўтварала асоб-

ную самастойную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку са сваёй сістэмай улады. Сімвалам гэтай самастойнасці лічылася наяўнасць сваіх герба і пячаткі. Таму і Шклову прывілеем 1762 г. надаваўся для сцвярджэння актаў, распараджэнняў гарадскіх улад і ўсякіх гарадскіх спраў герб і пячатка *«Бязмен»*.

Адным з прывабных прынцыпаў магдэбургскага самакіравання ў ВКЛ было тое, што ўлада ў горадзе належала самім мяшчанам: яны на агульных сходах вырашалі найбольш важныя пытанні жыцця горада, выбіралі і кантралявалі органы гарадскога кіравання і суда (пры гэтым вярхоўная ўлада заставалася за ўладальнікам горада). З увядзеннем магдэбургскага права ўся ўлада ў горадзе пераходзіла да органаў гарадскога самакіравання. Горадам кіравалі войт, бурмістры, радцы, лаўнікі. Таму прывілей Шклову 1762 г. дазваляў і прадпісваў мяшчанам «магістрат бурмістраўскі і войтаўскі, таксама радцаў, лаўнікаў, мужоў і іншых гарадскіхураднікаў выбіраць, ставіць, адным словам стварыць юрысдыкцыю радзецкую і войтаўскую» [4, арк. 647]. Пры гэтым падкрэслівалася, што выбраных бурмістраў і войта патрэбна было прадстаўляць панскаму двару на зацвярджэнне. Абраныя асобы прыносілі прысягу на вернасць гораду і на належнае выкананне сваіх абавязкаў на агульным сходзе мяшчан у ратушы. Пасады ў гарадскім самакіраванні займаліся на працягу аднаго года, пасля чаго адбывалася справаздача гарадской улады аб сваёй дзейнасці за год перад мяшчанамі і новыя выбары. Гарадскія ўлады па магдэбургскаму праву ў ВКЛ выконвалі адначасова прадстаўнічую, распарадчую, судовую, адміністрацыйную, фіскальную, натарыяльную і іншыя функцыі. У кампетэнцыю гарадской адміністрацыі (магістрата) уваходзілі кіраванне і кантроль над усімі бакамі жыцця горада: добраўпарадкаваннем, зборам дзяржаўных падаткаў, спагнаннем гарадскіх павіннасцяў, выдаткаваннем сродкаў гарадскога бюджэту, сацыяльнай падтрымкай бедных і г.д. Адной з асноўных функцый гарадскіх улад было ажыццяўленне судовай дзейнасці для садзейнічання «святой справядлівасці». Абавязкам магістрата з'яўляўся разгляд усіх спрэчных спраў гараджан: судзіць мяшчан і іншых асоб, якія здзейснілі крымінальнае злачынства на гарадской тэрыторыі і былі затрыманы па гарачых слядах.

Асаблівасцю надання Шклову магдэбургскага права было тое, што ён атрымліваў яго не першы раз. Яшчэ з другой паловы XVI ст. у Шклове дзейнічала магдэбургскае права. Пра гэта сведчыць зацвярджэнне ўладальнікам Шклова Янам Хадкевічам 16 лютага 1574 г. на пасаду магдэбургскага войта горада Харытона Васілевіча, якога абралі самі шклоўскія мяшчане [6, s. 904]. Відаць, пазней па не вядомых пакуль прычынах, Шклоў перастаў карыстацца магдэбургскім правам і ідэя аб яго ўвядзенні зноў узнікла ў сярэдзіне XVIII ст. 7 кастрычніка 1750 г.

(гл. Дадатак 1) Шклоў атрымаў адпаведны прывілей ад караля польскага і вялікага князя літоўскага Аўгуста III [3, арк. 801–802].

Дадзены прывілей 1750 г. Шклову быў падобны на прывілей 1762 г. Фактычна тэкст абодвух ідэнтычны, але ў іх розныя даты, крыху розняцца загалоўкі, у прывілеі 1750 г. указваецца толькі адзін уладальнік Шклова — князь Аўгуст Чартарыйскі, а ў прывілеі 1762 г. згаданы імёны двух уладальнікаў: мужа і жонкі — князя Аўгуста і Марыі з роду Сяняўскіх Чартарыйскіх. У прывілеі 1750 г. проста гаворыцца пра права горада карыстацца сваім гербам, а ў прывілеі 1762 г. — герб названы «Бязмен».

Неабходна адзначыць, што прывілей на магдэбургскае права Шклову ад 1750 г. па нейкіх прычынах не быў рэалізаваны, у сувязі з чым і спатрэбілася выданне прывілея 1762 г. І ўжо ён быў уведзены ў дзеянне. Пра гэта сведчыць пячатка Шклова 1762–1767 гг., на якой напісана пра магдэбургію ў Шклове і пазначана дата «1762 г.» [5, с. 231; 6, s. 906]. Для ўвядзення ў горадзе норм магдэбургскага права яго ўладальнікамі ў тым жа 1762 г. была складзена спецыяльная інструкцыя [6, s. 905]. Для большай вагі наданне магдэбургскага права Шклову было зацверджана соймам Рэчы Паспалітай 1764 г. [8, s. 183].

Атрымаўшы магдэбургскае права шклоўскія мяшчане атрымалі магчымасць самім вырашаць большасць пытанняў свайго жыцця, што развівала грамадзянскую адказнасць і ініцыятыўнасць.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што прывілей 1762 г. Шклову надаваў яму паўнавартаснае магдэбургскае права. Гэта ў сваю чаргу спрыяла развіццю горада і паляпшэнню дабрабыту яго жыхароў.

## Дадатак 1

**07.10.1750 г. Варшава. — Прывілей Аўгуста III на наданне магдэбургскага права гораду Шклоў, уласнасці Аўгуста Чартарыйскага.**

[арк. 801] Jus Gladij miastu Szkłowu w(ielmożnieg)*o* | Augusta x(iąży)cia Czartoryskiego w(ojewod)y | ruskiego dziedzicznemu nadaie się. |

August Trzeci etc. |

Wszem wobec y kożdemu zosobna komu o tym wiedziec nale|ży do wiadomośći podaiemy.

Ponieważ miasto Szkłow w(ielmożnieg)*o* | Augusta x(iąży)cia Czartoryskiego woiewody dziedziczne w w(ojewo)dz(s)twie Witebskim p(owie)cie Orszanskim leżące będąc lu|dzmi słusznemi y do trzymania rządu dobrego sposobnemi | osa-

dzone do tych czas bez przyzwoitego sobie mieyskiego prawa | ustanowienia znayduie się, a z tąd | usiłuie przyiść do lepszey for|my pod zaszczytem praw y prerogatyw principalnieyszych | w W(ielkim) X(ięstwie) Litt(ewski)*m* miast prawem teutonskim albo magdebur|skim zaszczycaiących się, o co samo gorąco do Nas przez Panow | Rad przy boku Naszym będących | wszyscy obywatele tegoż | miasta do nas wniesli prozbę.

Tedy My chcąc, aby w pan|stwach naszych między inszemi porządnemi y handlowne|mi miastami toż miasto zakwitnąć y rozkrzewić się mogło, | za rzecz słuszną y z prawem pospolitym zgadzaiącą się [2], uznawszy, | oraz chcąc żeby dobry rząd sprawiedliwośćie swiętey pomno|żenie y podwyższenie tamże kwitnęło, umyslilismy temuz mia|stu prawo teutonskie, ktore się magdeburskim nażywa, także inne wolnośći, prerogatywy, ktorych tak w Koronie, iako y w W(ielki)*m* X(ięstwie) Litt(ewski)*m* miasta zażywaią, temuż miastu Szkłowu nadać y kon|ferować.

Jakoż ninieyszym listem Naszym wiecznemi cza|sy nadaiemy y konferuiemy, deklaruiąc y stanowiąc że na | wzor wszelkich innych miast, mianowicie iednak pruskich, | zwyż rzeczone miasto Szkłow rządzić się powinno y od tąd wol|ne y mocne będzie magistrat sobie burmistrzowski, woyto|wski; raycow, ławnikow, mężow y innych mieyskich [3] urzę||[арк. 802]dnikow obierac stanowic y iednym słowem juryzdykcyą ra|dziecką, woytowską ufundować; burmistrzow doczesnych, woy|ta dozywotniego obranych do opprobacyi [4] dworowi podawać, | tak zaś ustawionym sądom sprawy wszelkie: potoczne y uczyn|kowe między sobą rozeznawać, sądzić, dekretować, ludzi | występnych swywolnych y wszelką osobę [5] w miescie y na grun|tach onego w swieżo popełnionym uczynku łapać, władzą są|dowi swemu nadaną na kryminale poymanych według pra|wa karać. Appellacyi w sprawach znacznieyszych do sądu dwor|skiego dopuszczaiąc, a przeciw rycyrskiego stanu ludziom oby|czaiem innych miast na prawie magdeburskim ufundowa|nych zachowuiąc się y sprawuiąc.

Na gerb zaś mieyski | pieczęc do stwierdzienia aktow y spraw swoich zażywać będzię [6]. |

Nadane iednak prawa y wolnośći dawnym | zwyczaiom y powinnośćiom zdawna dwarowi należącym prze|szkadzać nie maią.

Na co dla lepszey wiary, ręką się Naszą | podpisawszy, pieczęc W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskiego) przycisnąć rozkazalismy.

Dan | w Warszawie dnia 7 mę(siac)a pazdziernika roku panskiego | 1750, panowania Naszego 17 roku.

---

[2] sie *упісана між слоў больш дробнымі літарамі, вышэй ніжняй лініі рдк.*

[3] ic *замазана.*

[4] ro *на сцёртым.*

[5] b *выпр. з* e.

[6] *далей прабел у17–19 літ., прабел падкрэслены.*

Augustus Rex [Sekretar pieczęci mieńszey W(ielkiego) X(ięstwa) Litt(ewskiego) p(an) Jozef Dulęba]

*Крыніца:* НГАБ. — КМФ-18. — Воп. 1. –Спр. 176. — Арк. 801-802.

## Дадатак 2

**10.04.1762. Варшава. — Прывілей Аўгуста III на наданне магдэбургскага права і герба гораду Шклоў, уласнасці Аўгуста і Марыі Чартарыйскіх.**

[арк. 646] Przywiley na ustanowienie | prawa magdeburskiego cum | jure gladij miastu Szkłowu | wielmożnych Agusta [7] y Maryi | Jozefy z Sieniawskich xiążąt | Czartoryskich wojewodow ru|skich małł(żą)kow dziedzicznemu nadaie się.

August III et. |

Wszem wobec y kazdemu zosobna komu o tym wiedziec na|leży do wiadomości podaiemy.

Ponieważ miasto Szkłow | wielmożnych Augusta [8] y Maryi z Sieniawskich xią|żat Czartoryskich wojewodow ruskich dziedziczne, | w w(oiewo)d(s)twie Witebskim powiecie Orszanskim leżące, | będąc ludzmi słusznemi y do trzymania rządu dobre|go sposobnemi osadzone do tych czas bez przyzwoitego so|bie mieyskiego prawa ustanowienia znayduie się, a z tąd | usiłuie do lepszey przyiść formy pod zaszczytem praw y | prerogatyw principalnieyszych w Wielkim Xięstwie | Litewskim miast prawem [9] teutonskim al|bo magdeburskim zaszczycaiących się o co samo gorącą | do Nas przez Panow Rad przy boku Naszym będących | wszyscy obywatele tegoż miasta [10] wniesli prożbę.

Tedy | My chcąc, aby w panstwach naszych między inne|mi porządnemi y handlownemi miastami tož mia||[арк. 647]sto zakwitnąc y rozkrzewić się mogło, za rzecz słuszną | y z prawem pospolitym zgadzaiącą się, uznawszy, oraz | chcąc zeby dobry rząd sprawiedliwoście swiętey pomno|żenie y podwyższenie tamze kwitneło, umyslilismy | temuż miastu prawo teutońskie, ktore się magdebur|skim nazywa, takze inne wolności, prerogatywy, kto|rych tak w Koronie, iako y w Wielkim Xięstwie Litewskim | [miasta] zażywaią, temuż miastu Szkłowu nadać y konferować.

Jakoż ninieyszym listem Naszym wiecznemi czasy | nadaemy y konferuiemy, deklaruiąc y stanowiąc że | na wzor wszelkich innych miast, mianowicie iednak

---

[7] *так у тэксце, трэба чытаць* Augusta.

[8] *першае* u *выпр. з* o *(як элемент* g*).*

[9] *у тэксце* prawem *нап. двойчы.*

[10] *на* s *пляма.*

pruskich, zwyż rzeczone miasto Szkłow rządzić się powinno | y od tąd wolne y mocne będzie, magistrat sobie burmi|strowski, woytowski; raycow, ławnikow, mężow y | innych mieyskich urzędnikow obierać stanowić y iednym | słowem juryzdykcyą radziecką, woytowską ufundować; | burmistrzow doczesnych, tudziez woyta doczesnego, obranych | do opprobacyi dworowi podawac, tak zaś ustanowionym | sądom sprawy wszelkie: potoczne y uczynkowe między | sobą rozeznawać, sądzić, dekretować, ludzi występnych | swawolnych y wszelką osobę w mieśćie y na gruntach | jego [11] w swieżo popełnionym uczynku łapac, władzą | sądowi swemu nadaną na kryminale poymanych we|dług prawa karac. Appellacyi w sprawach znacznieyszych | do sądu dworskiego dopuszczaiąc, a przeciw rycerskie|go [12] stanu ludziom obyczaiem innych miast na prawie | magdeburskim ufundowanych zachowuiąc się y sprawu|iąc.

Na herb zaś mieyski pieczęć do stwierdzienia aktow | y spraw swoich zażywać będzie za herb bezmian.

Na|dane iednak prawa y wolnośći dawnym zwyczaiom | y powinnośćiom zdawna dwarowi należącym przeszka|dzać nie maią.

Na co dla lepszey wiary, ręką sie Naszę | podpisawszy, pieczęć W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskiego) przycisnąć rozkazaliśmy. ||

[арк. 648] Działo sie w Warszawie dnia 10 mę(siac)a kwietnia roku | panskiego 1762, panowania Naszego 29 roku.

Augustus Rex [Jozef Dulęba sekretar pieczęci Wielkiey W(ielkiego) X(ięstwa) Litt(ewskiego)]

*Крыніца:* НГАБ. — КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 183. — Арк. 646–648.

## Крыніцы і літаратура


1. Левко, О. Н. Средневековые территориально-административные центры севера-восточной Беларуси: Формирование и развитие. — Минск: Бел. Навука, 2004. — 280 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ) — КМФ-18 (Метрыка ВКЛ). — Воп. 1. — Спр. 38. — Метрыка прывілееў, данін і пацвярджэнняў, складзеная пры каралі Жыгімонце II Аўгусце ў часы маршалкоўства і пісарства Яна Шымковіча. 1554–1568.
3. НГАБ — Ф. КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 176. — Кніга малой канцылярыі ВКЛ, складзеная пры віцэ-канцлеры Міхале Фрэдэрыку Чатрарыйскім. 1747–1752.


[11] *на j дзірка ад пераплёту.*

[12] *на* go *дзірка ад пераплёту.*

4. НГАБ — Ф. КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 183. — Кніга вялікай канцылярыі ВКЛ, складзеная пры канцлеры Міхале Фрэдэрыку Чартарыйскім. 1758–1763.
5. Цітоў, А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі. — Мінск: Полымя, 1993. — 239 с.
6. Rimša E. Pieczęcie miast Wielkiego Księstwa Litewskiego. — Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2007. — 1259 s.
7. Topolska, M.B. Dobra szłowskie na Białorusi wschodniej w XVII i XVIII wieku. — Warszawa: Panstw. Wyd-wo Nauk. PWN, 1969. — 157 s.
8. Volumina legum: Przedruk zbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wydanego. — T. 7. — Petersburg: nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. — 426 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.09.2015

*Ю. Н. Снапковский*

# «Великая европейская война» в жизни населения прифронтовых губерний в документах НИАБ. Часть II (1915 г.)

Данная публикация является тематико-хронологическим продолжением нашей публикации в предыдущем выпуске «Архіварыуса» [1]. Однако на этот раз отобранные документы отличаются большей степенью сюжетного разнообразия, повествуя не только о депортационной политике властей в отношении иностранных подданных (док. №№ 1, 6, 10, 12), но и проливая свет на такие явления жизни населения в условиях войны, как тяжелое материальное положение (док. №№ 2, 5, 9, 11, 15), настроения среди населения в связи с военным временем (док. №№ 7, 8, 17), конфликтные ситуации между военными властями и гражданским населением (док. №№ 4, 14, 16), между военнослужащими и частными лицами (док. № 13). Среди публикуемых документов выделяется по своим жанровым особенностям письмо несовершеннолетнего вольнонаемного погонщика военного транспорта своим родителям (док. № 3).

Принципы археографической обработки публикуемых документов сохранены те же, что и в предыдущей публикации.

Документ 1

**1915 г. января 9. — Прошение депортированного в г. Самару австрийского подданного К. И. Дымека минскому губернатору А. Ф. Гирсу о разрешении ему вернуться в м. Барановичи Новогрудского у. вместе с женой и детьми, высланными в г. Кострому.**

№ 45093

Его Превосходительству
Господину [a] Минскому Губернатору [2]

Австрийского подданного [b] Карла Ивановича Дымека [3] жит[ельствующего] в г. Самаре по Полевой ул. д[ом] № 22 [c]

Прошение.

По постановлению Вашего Превосходительства, я, как австрийский подданный, был выслан в г. Самару на жительство. Я возбудил ходатайство о принятии меня в русское подданство, каковое ходатайство по существу еще не разсмотрено.

В настоящее время имею честь просить разрешить мне вернуться в местечко Барановичи Минской губ., откуда я был выслан.

В Барановичах у меня имеется плац земли и дом. По профессии я машинист. В детстве отец мой вывез меня из Галиции [4], и до сих пор я проживаю в России.

Семья моя состоит из жены русской подданной Елены Францевны Дымек [5] и детей Болеслава [6], Елизаветы [7] и Марии [8] проживающих ныне по постановлению Вашего Превосходительства в г. Костроме.

Я ходатайствую перед Вашим Превосходительством о разрешении одновременно со мною и семье моей вернуться в местечко Барановичи.

При сем прилагаю доказательства моего р[имско-]католич[ческого] вероисповедания и польского происхождения.

Карл Дымек.

*Источник:* НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 8638. Л. 35–35 об. Рукописный.

---

[a] Ниже стоит резолюция синим карандашом: «9/I Отказ[ать]», под ней — отметки простым карандашом: «50513» и «Нов[огрудский] у.».

[b] Выше стоит прямоугольный штамп: «ПРАВИТЕЛЬ КАНЦЕЛЯРИИ ·9. ЯНВ. 1915· МИНСКОГО ГУБЕРНАТОРА».

[c] Ниже стоит отметка красным карандашом: «4».

Документ 2

**1915 г. февраля 5. — Прошение крестьянина д. Семеновка Руденецкой вол. Гомельского у. Могилевской губ. С. Т. Зайцева в волостное правление и волостному сходу попечителей о назначении ему пособия за его сыновей, находящихся в действующей армии.**

В Руденецкое волостное правление и волостному сходу попечителей оставивших семейства нижних чинов взятых на войну.

Крестьянина дер. Семеновки Руденецкой волости
Сидора Титовича Зайцева.

Прошение.

[36] *См. прим. 34 к док. № 6 в части I.*

[37] Имеется в виду *архив князей Радзивиллов в Несвиже* (архив Несвижского замка) — крупнейший родовой архив Беларуси. Его штат состоял из архивистов и помощников архивистов. М.И. Конопов-Конопко, вероятно, был одним из помощников Антония Ивановского, занимавшего должность архивиста в Несвиже с 1908 г. до сентября 1915 г. (до эвакуации архива).

[38] Резолюцией минского вице-губернатора от 14.07.1915 прусскому подданному М. И. Конопову-Конопко было отказано в разрешении вернуться в г. Несвиж *«ввиду нахождения Минской губернии на военном положении и на театре военных действий»* (НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 8627. Л. 453). Его дальнейшая судьба неизвестна.

[39] Имеется в виду М.В. Арцимович. *См. прим. 23 к док. № 4.*

[40] *Ансаберг Готфрид Ансович* (*23.03.1871, Арлавская вол. Тальсенского у. Курляндской губ. — после 1918 г., Латвия?) — из крестьян Арлавской вол., ев.-лют. вероисп., окончил Тальсенское городское училище, 24.11.1905 зачислен в штат Витебского губернского правления канцелярским служителем 3-го разряда с откомандированием в распоряжение витебского полицмейстера, с 10.03.1906 секретарь Режицкого уездного полицейского управления, коллежский регистратор (1909), губернский секретарь (1910/1911), с 1910/1911 г. младший помощник правителя Канцелярии витебского губернатора, коллежский секретарь (1914/1915), после 1917 г. проживал в Латвии.

[41] *Мальцев Гавриель Шаевич-Вульфович* (*~1876 г.) — еврей, витебский мещанин, трубочист, проживал в г. Витебске по ул. Луческой в доме № 53, с 05.11.1915 по 06.12.1915 отбывал заключение в Витебской губернской тюрьме за распространение слухов об офицерах российской армии и выражение германофильских чувств.

[42] В результате наступательной операции германо-австрийских войск в Галиции с 02.05.1915 по 15.05.1915 («Горлицкий прорыв») у русской армии были отвоеваны города *Перемышль* (21.05.1915) и *Львов* (09.06.1915), из-за чего возникла угроза захвата неприятелем Царства Польского.

[43] Вероятно, имеются в виду антиеврейские мероприятия верховного командования русской армии, в ходе которых евреи безосновательно обвинялись в измене и шпионаже, выселялись из прифронтовой зоны во внутренние губернии, подвергались казням по приговорам военно-полевых судов, а также издевательствам и избиениям, носившим характер еврейских погромов. Одной из самых масштабных антиеврейских акций в годы Первой мировой войны стала депортация весной 1915 г. из Ковенской и Курляндской губерний всех евреев общей численностью около 200 тыс. человек.

[44] *Говорович Андрей Иванович* (*30.11.1876) — выпускник Виленского пехотного юнкерского училища (1898), служил в 164-м пехотном Закатальском полку, ротмистр (06.12.1909), с 26.06.1912 по 14.03.1917 помощник начальника Витебского губернского жандармского управления в г. Витебске, Витебском, Велижском, Городокском, Невельском, Полоцком и Лепельском уездах, с 14.03.1917 по 29.03.1917 содержался на Витебской городской гауптвахте, на 08.05.1917 содержался под караулом на квартире (числился за военной комиссией исполнительного органа Витебского городского общественного комитета). Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (08.09.1905) и Св. Анны 3-й ст. (06.04.1914).

[45] Имеется в виду Н. А. Астафьев. *Астафьев Николай Анатольевич* (10.09.1880–08.12.1967, Ницца, Франция) — из потомственных дворян, прав. вероисп., окончил Императорский Александровский лицей с чином коллежского секретаря, 15.05.1901 определен на службу в Канцелярию Комитета Министров, с 09.09.1901 рядовой 8-й роты лейб-гвардии Преображенского полка, ефрейтор (19.12.1901), младший унтер-офицер (22.03.1902), с 25.07.1902 подпрапорщик 9-й роты, с 10.08.1902 подпоручик (26.09.1902), с 19.05.1903 помощник начальника полковой учебной команды, с 11.04.1905 делопроизводитель полкового суда, батальонный адъютант 3-го батальона и помощник полкового адъютанта по мобилизационной части, с 19.04.1906 по 05.08.1906 заведовал певческим хором и школой солдатских детей, с 10.08.1906 произведен в поручики с зачислением в запас гвардейской пехоты по Санкт-Петербургскому у. (22.09.1906), 17.07.1906 определен на службу в Министерство финансов, с 20.06.1907 кандидат на должность земского начальника при Валковском уездном съезде Харьковской губ., с 12.09.1907 земский начальник 2-го уч. Валковского у., с 22.12.1912 непременный член Уфимского губернского присутствия, с 26.03.1913 непременный член Рязанского губернского присутствия, с 10.08.1906 титулярный советник (01.10.1913), с 10.08.1909 коллежский асессор (31.03.1914), с 21.06.1914 по 09.03.1915 и.д.

радомского вице-губернатора, с 10.08.1913 надворный советник (29.11.1914), с 09.03.1915 по 23.12.1916 минский вице-губернатор, с 10.08.1914 коллежский советник (01.01.1916), с 23.12.1916 по март 1917 г. харьковский вице-губернатор. Эмигрировал во Францию, состоял членом Гвардейского объединения в Ницце, Союза преображенцев и правления Объединения бывших воспитанников Императорского Александровского лицея. Похоронен на кладбище Сент-Женевьев-де-Буа в г. Париже. Кавалер орденов Св. Анны 3-й ст. (06.12.1909) и Св. Станислава 2-й ст. (01.01.1912).

[46] *Левик Лейба Зайвелев* (*~1848 г.) — еврей, минский мещанин, вдовец. 04.09.1915 начальник Минского сыскного отделения доносил минскому полицмейстеру о том, что *«Лейба Зайвелев Левик страдает умопомешательством»* (НИАБ. Ф. 300. Оп. 1. Д. 92. Л. 137 об.).

[47] Имеется в виду С. А. Будагоский. *Будагоский Степан Алексеевич* (*08.12.1879) — сын чиновника, прав. вероисп., обучался в Минской гимназии (полного курса не окончил), участник русско-японской войны 1904–1905 г., с 16.01.1907 канцелярский служитель 2-го разряда Минского губернского правления, с 25.04.1908 по 1911 г. околоточный надзиратель Минского городского полицейского управления, с 16.01.1909 коллежский регистратор (01.02.1910), с 1911 по 1912 г. и.д. помощника пристава 1-й части г. Минска, губернский секретарь (1912), с 1912 по 1914 г. помощник пристава 1-й части г. Минска, с 1914 г. по 13.01.1916 пристав 5-й части г. Минска, с 13.01.1916 по 1917 г. пристав 1-й части г. Минска, коллежский секретарь (16.01.1916), на 06.09.1918 судебный пристав Минского окружного суда по г. Слониму и Слонимскому у. Гродненской губ. Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Владимира 4-й ст. (22.09.1912) и Св. Станислава 3-й ст. (1916). Награжден серебряной медалью «За усердие» на Станиславской ленте.

[48] *Рабинович Элиезер (Лейзер, Лазер)* (1859–1924, г. Минск, Белорусская ССР) — выпускник Воложинской иешивы, с 1896 по 1924 г. духовный раввин г. Минска.

[49] *Канторович (Конторович) Кива Меерович* (*~1862 г.) — купец 1-й гильдии г. Ярославля, проживал в г. Минске по ул. Ново-Московской, владел обойной фабрикой в г. Минске.

[50] Вероятно, имеется в виду жена ев.-лют. пастора Минской губ. *Ольга Николаевна Мачулан*, урожд. *баронесса Клодт-фон-Юргенсбург* (*21.05.1874, Тольсбург Лифляндской губ.).

[51] 16.09.1915 минский губернатор отклонил ходатайство Л.З. Левика о выдаче ему пособия, а с жалобой на побои предложил обратиться в суд (НИАБ. Ф. 300. Оп. 1. Д. 92. Л. 138).

[52] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1 в части I.*

[53] *Фекеч Станислав Иванович* (*1885 г.) — бывший австрийский подданный (17.06.1914 принял российское подданство), мещанин, рим.-кат. вероисп., 08.06.1913 получил степень лекаря в Императорском Московском университете, с 10.12.1913 запасной врач Новогрудского уездного земства, с 1914 по 1915 г. земский врач Ганцевичского уч. Слуцкого у. Минской губ., с 1915 г. врач организации «Северопомощь». Дальнейшая судьба неизвестна.

[54] *Фекеч (Фекич) Иван Иванович* (*~1850 г.) — словак, австрийский подданный, с 1862 г. проживал в Минской губ., занимался торговлей.

[55] Возможно, имеется в виду *Лужецкий № 157 винокуренный завод* графа Виктора Генриховича Плятер-Зиберга, расположенный в его им. Лужки Дисненского у. Виленской губ. и основанный в 1862 г.

[56] Имеется в виду П.В. Веревкин. *Веревкин Петр Владимирович* (05.01.1862–18.02.1946, курорт на озере Лаго-Маджоре, Италия) — выпускник Пажеского Е. И. В. корпуса, в службе с 06.08.1883, камер-юнкер двора Е. И. В. (1898), камергер двора Е. И. В. (1903), с 24.04.1904 по 07.05.1912 ковенский губернатор, действительный статский советник (13.04.1908), с 07.05.1912 по 1915 г. виленский губернатор, егермейстер двора Е. И. В. (1914), с 1915 г. по 08.06.1917 эстляндский губернатор, затем содержался под арестом в Петропавловской крепости, откуда освобожден по ходатайству правительства Литвы, в 1919 г. получил литовское гражданство, служил советником министра внутренних дел Литвы. Владел родовым имением в Ковенской губ. (на 01.03.1916 — 913 дес. земли). Кавалер орденов Св. Анны 3-й ст. (1897), Св. Владимира 3-й ст. (1911), Св. Станислава 1-й ст. (1913) и Большого креста французского Ордена Почетного легиона (1897).

[57] *«Северопомощь»* — организация по устройству беженцев Северного и Западного фронтов, основана летом 1915 г. по инициативе члена Госсовета С. И. Зубчанинова, когда в связи с активным наступлением немецкой армии на восток хлынул поток беженцев из западных губерний империи. Канцелярии главноуполномоченного по устройству беженцев Северного и Западного фронтов и особоуполномоченного по устройству беженцев Западного фронта по Виленской, Минской и Могилевской губерниям находились в г. Петрограде. К 1917 г. «Северопомощью» было устроено 295 питательных станов, 46 чайных, 60 лавок с продажей предметов первой необходимости, 72 больницы, 73 амбулатории, 47 школ, аптеки, бани, жилые бараки, детские приюты, около 2900 прифронтовых населенных пунктов обслуживалось сухими пайками. Организация прекратила свою деятельность в начале 1918 г.

[58] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1 в части I.*

[59] *Зубчанинов Сергей Иванович* (27.06.1864, Псковская губ. – 1935 г., СССР) — из потомственных дворян Псковской губ., прав. вероисп., выпускник Псковского кадетского корпуса и Николаевского инженерного училища, 31.08.1882 поступил на военную службу юнкером, 07.08.1885 произведен в офицеры, в 1886 г. переведен в лейб-гвардии Саперный батальон, в 1890 г. уволен в запас в чине гвардии поручика, с 1890 г. земский начальник 3-го уч. Псковского у., с 1893 г. почетный мировой судья Псковского у., с 1902 г. земский начальник 2-го уч. Псковского у., с 1905 по 1913 г. председатель Псковской губернской земской управы, с 1908 г. постоянный член Совета по делам местного хозяйства МВД, с 10.06.1911 депутат Государственной думы от съезда землевладельцев, с 04.09.1912 член Госсовета по выборам от Псковского губернского земского собрания, с 1913 по 1917 г. псковский губернский предводитель дворянства, действительный статский советник (08.01.1914), с 1915 г. главноуполномоченный по устройству беженцев

Северного и Западного фронтов, в 1917 г. член Поместного собора по избранию от Госсовета (на собор не прибыл), 13.02.1930 арестован по обвинению «в переписке с заграницей и активном выступлении против Советской власти», 26.05.1930 приговорен к трем годам исправительно-трудовых лагерей и отправлен этапом в Москву. Кавалер орденов Св. Станислава 2-й ст. (1904), Св. Анны 2-й ст. (1908), Св. Владимира 4-й ст. (1911), Св. Владимира 3-й ст. (1916).

[60] Имеется в виду *Всероссийский земский союз помощи больным и раненым воинам* — общеземская санитарная организация, созданная 30.07.1914 в г. Москве на съезде уполномоченных губернских земств.

[61] Имеется в виду *Комитет Е. И. В. великой княжны Татьяны Николаевны для оказания временной помощи лицам, пострадавшим от военных бедствий*, созданный 14.09.1914 в г. Санкт-Петербурге.

[62] *Ильяшенко Константин Яковлевич* (*09.12.1874) — дворянин, прав. вероисп., с 28.06.1894 по 17.08.1894 почтово-телеграфный чиновник 5-го разряда Могилевской почтово-телеграфной конторы, с 15.09.1901 по 15.09.1904 вольнонаемный служащий Риго-Орловской железной дороги, окончил Рижский политехнический институт со званием агронома 1-го разряда (13.12.1904), с 16.09.1904 и.д. младшего (с 20.03.1905 старшего) сверхштатного (с 10.06.1905 младшего штатного) чиновника особых поручений при лифляндском губернаторе, с 01.08.1906 и.д. старшего помощника (с 10.01.1908 старший помощник) правителя Канцелярии лифляндского губернатора, с 13.12.1904 коллежский секретарь (10.01.1908), с 24.03.1908 и.д. инспектора (с 17.05.1910 инспектор) типографий и книжной торговли в г. Риге, с 13.12.1909 коллежский асессор (10.04.1910), с 29.10.1910 младший сверхштатный чиновник особых поручений при генерал-губернаторе киевском, подольском и волынском, с 17.09.1911 уманский уездный предводитель дворянства, с 06.10.1911 по 25.01.1913 сквирский уездный предводитель дворянства, с 01.04.1911 почетный мировой судья Сквирского округа (16.05.1912), с 14.01.1912 по 19.05.1912 и с 17.11.1912 по 14.01.1913 и.д. киевского губернского предводителя дворянства, с 13.12.1910 надворный советник (16.09.1912), с 30.01.1913 и.о. председателя (с 12.02.1913 председатель) Бердичевской уездной земской управы, 19.03.1913 причислен к МВД, с 13.12.1912 коллежский советник (14.04.1913), с 30.12.1914 по 06.10.1915 речицкий уездный предводитель дворянства, 06.10.1915 причислен к МВД, затем председатель Бердичевской уездной земской управы. Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер Ордена Св. Станислава 3-й ст. (06.12.1906).

[63] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1 в части I.*

[64] *Финдейзен (Финдейзин, Финдензейн) Карл Карлович* (~1834–12.10.1918, г. Борисов) — саксонский подданный, арендовал хут. Мужанка Лошницкой вол. Борисовского у., похоронен 13.10.1918 на Борисовском городском кладбище.

[65] *Старо-Борисовское имение* принадлежало великим князьям Н. Н. и П. Н. Романовым (на 1914 г. — 62 025 десятин земли). Имение было расположено в Борисовском у. Минской губ. на территории восьми волостей (Зачистской, Бытчанской, Лошницкой, Гливинской, Велятичской, Дмитриевичской, Ухвальской, Эсьмонской) и состояло преимущественно из лесных массивов. Контора глав-

ноуправляющего имением находилась в 4-х километрах от г. Борисова на месте старого города (крепости Борисов).

[66] *Финдейзен (Финдейзин, Финдензейн) Отилия Готлибовна* (~1849–01.02.1919, г. Борисов) — саксонская подданная, жена *К.К. Финдейзена*, похоронена 03.02.1919 на Борисовском городском кладбище.

[67] Имеется в виду *Чельцов Павел Андреевич* — пристав 4-го стана Борисовского у. с 1910 по 1917 г.

[68] 05.11.1915 от командующего 2-й армией Северо-Западного фронта последовало уведомление минскому губернатору следующего содержания: *«Уведомляю Ваше Превосходительство, что препятствий к оставлению на жительстве в Борисовском уезде Карла ФИНДЕНЗЕЙНА, ввиду его преклонного возраста и болезненного состояния, с моей стороны не встречается»* (НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 8629. Л. 164).

[69] Имеется в виду С.Г. Калантаров. *Калантаров (Калантарян) Степан Герасимович* (16.08.1855–09.07.1926, г. Талллин, Эстония) — армяно-грегорианского вероисп., выпускник 2-й Санкт-Петербургской классической гимназии, 05.03.1873 вступил в службу, с окончанием Ставропольского казачьего юнкерского училища выпущен прапорщиком в 16-й драгунский Нижегородский полк (24.11.1875), участник русско-турецкой войны 1877–1878 г., поручик (15.07.1879), с 14.01.1885 адъютант командира 2-го Кавказского армейского корпуса, штабс-ротмистр (30.08.1886), с 18.02.1889 адъютант командира 16-го армейского корпуса, ротмистр (15.03.1895), с 28.09.1893 командир эскадрона, с 12.11.1895 ремонтер Управления инспектора ремонта и бригады кавалерийского запаса, с 06.04.1902 адъютант помощника командующего войсками Кавказского военного округа, подполковник (28.11.1902), с 23.11.1904 адъютант командующего войсками Виленского военного округа, полковник (06.12.1905), с 09.04.1911 виленский комендант, генерал-майор (06.12.1911), с 23.09.1914 витебский комендант и начальник гарнизона г. Витебска, с 11.01.1916 2-й комендант г. Петрограда, с 04.04.1918 председатель окружной ликвидационной комиссии 2-го Петроградского комендантского управления, с июля 1918 г. в отставке. Эмигрировал в Эстонию. Похоронен на Александро-Невском кладбище. Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. с мечами и бантом (1877), Св. Анны 4-й ст. с надписью «За храбрость» (1877), Св. Анны 3-й ст. (1889), Св. Владимира 4-й ст. с бантом, Св. Станислава 2-й ст. (1908), Св. Владимира 3-й ст. (18.01.1915), Св. Станислава 1-й ст. (22.02.1915), Св. Анны 1-й ст. (23.09.1915).

[70] 15.11.1915 начальник Витебской конвойной команды на запрос адъютанта витебского коменданта сообщил, что на службе в конвойной команде нижний чин Цейва не состоит (НИАБ. Ф. 2533. Оп. 1. Д. 132. Л. 427 об.).

[71] Имеется в виду А.Г. Чернявский. *Чернявский Андрей Гаврилович* (02.07.1867 – после 22.11.1937, г. Тбилиси?) — из потомственных дворян, окончил Новороссийский университет, с 1893 по 1900 г. чиновник особых поручений при Черниговском управлении государственных имуществ, с 1902 по 1905 г. правитель Канцелярии тифлисского губернатора, с 21.12.1905 по 10.05.1911 тифлисский вице-губернатор, с 10.05.1911 по 23.06.1914 тифлисский губернатор, с 23.06.1914

по 30.10.1915 и.д. вятского губернатора, с 30.10.1915 по 15.08.1916 минский губернатор, действительный статский советник (1915), с 15.08.1916 по 1917 г. екатеринославский губернатор, в 1919 г. киевский губернатор при Деникине. Проживал в г. Тифлисе со своей семьей, зарабатывал на жизнь написанием либретто к операм для оперного театра, в ноябре 1937 г. арестован и осужден Военной комиссией Верховного Суда СССР по Грузинской ССР, приговорен к расстрелу.

[72] *Петропавловская ул.* — сегодня ул. Энгельса.

[73] *Ванькович Витольд-Клеменс Павлович* (28.03.1888, г. Варшава – 31.08.1948, г. Вашингтон, США) — дворянин Минской губ., рим.-кат. вероисп. До 1920 г. его собственность в г. Минске в квартале № 39 составляли деревянный 1-этажный дом с мансардой и полуподвалом, два деревянных 1-этажных дома, каменный 1-этажный флигель с мансардой и полуподвалом, каменный сарай, два деревянных сарая, три деревянных ледника, деревянная беседка и 1150 квадратных саженей земли. Дом, о котором идет речь в документе, был расположен на углу Петропавловской и Магазинной улиц (сегодня — угол улиц Энгельса и Кирова) под № 41/36, до наших дней не сохранился.

[74] *Ставров Михаил Митрофанович* (29.10.1868 – после 1922 г.) — прав. вероисп., выпускник Оренбургского Неплюевского кадетского корпуса, с окончанием Казанского пехотного юнкерского училища выпущен в 79-й резервный пехотный батальон (1890), подпоручик (19.01.1890), поручик (01.09.1893), окончил Николаевскую академию Генерального штаба по 1-му разряду (1896), штабс-капитан (17.05.1896), с 20.12.1897 по 06.05.1898 старший адъютант штаба 1-й Донской казачьей дивизии, капитан (05.04.1898), с 06.05.1898 по 25.03.1903 служил в штабе 14-го армейского корпуса, подполковник (14.04.1902), с 25.03.1903 по 28.09.1904 старший адъютант войскового штаба Оренбургского казачьего войска, с 28.09.1904 по 14.11.1908 штаб-офицер при управлении 8-й Туркестанской стрелковой бригады, полковник (02.04.1906), с 14.11.1908 по 29.12.1910 начальник войскового штаба Забайкальского казачьего войска, с 29.12.1910 по 09.05.1911 начальник штаба 4-й Сибирской стрелковой дивизии, с 09.05.1911 по 29.12.1914 командир 4-го Сибирского стрелкового полка, с 29.12.1914 по 07.07.1915 начальник штаба 5-го Сибирского армейского корпуса, генерал-майор (06.01.1915), с 07.07.1915 генерал-квартирмейстер штаба 2-й армии Западного фронта, с 07.02.1917 по 12.05.1917 командующий 5-й гренадерской дивизией, с 12.05.1917 по 29.07.1917 начальник штаба 1-й армии, с 29.07.1917 командующий 35-м армейским корпусом, генерал-лейтенант (23.08.1917), с 15.10.1918 в Донской армии, на 20.11.1918 генерал для поручений при управлении военного и морского отдела, затем преподаватель повторительных офицерских курсов Кавказской Добровольческой армии, с 23.07.1919 преподаватель Ейского ускоренного курса для подготовки офицеров пехоты, с 1920 г. в эмиграции. Награжден Георгиевским оружием (11.03.1915). Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (1899), Св. Анны 3-й ст. (1904), Св. Станислава 2-й ст. (1908) с мечами (16.05.1915), Св. Анны 2-й ст. (22.02.1913), Св. Георгия 4-й ст. (25.10.1914), Св. Георгия 4-й ст. (26.11.1914), Св. Владимира 4-й ст. с мечами и бантом (07.05.1915), Св. Владимира 3-й ст. с мечами (09.1915), Св. Станислава 1-й ст. (18.03.1916).

[75] Имеется в виду А.Г. Чернявский. *См. прим. 68 к док. № 14.*

[76] *Кирилловская ул.* — сегодня ул. Могилевская.

[77] *См. прим. 60 к док. № 11.*

[78] *См. прим. 56 к док. № 10.*

[79] *Минская ев.-лют. церковь*, или *Минская кирха*, являлась центром духовной жизни лютеран Минской губ., преимущественно немцев по происхождению. Ев.-лют. община в г. Минске существовала с конца XVIII в. Первое (каменное с деревянной крышей) здание кирхи, размещавшееся по ул. Доминиканской (рядом с пересечением современных ул. Энгельса, бывшей Доминиканской, и просп. Независимости), было построено в 1811 г. и освящено как церковь Павла и Александра, однако сгорело 30.05.1835 во время пожара вместе с церковным архивом, пасторатом и школой. Новое (каменное) здание Минской кирхи было возведено в 1842 г. по ул. Захарьевской (рядом с современным рестораном «Иль Патио», просп. Независимости, 22) и освящено 13.05.1845 как церковь Св. Николая. Считалось одним красивейших строений города. Минская ев.-лют. община перестала существовать в 1930-е гг., а в здании кирхи разместили детский звуковой кинотеатр «Новости дня». Здание было разрушено в начале Великой Отечественной войны и после войны окончательно снесено.

[80] *См. прим. 17 к док. № 2 в части I.*

[81] Имеется в виду М.М. Ставров. *См. прим. 71 к док. № 14.*

[82] Имеется в виду А.Г. Чернявский. *См. прим. 68 к док. № 14.*

[83] *Привислинский край* (польск. Kraj Przywiślański) — общее название 10 губерний Царства Польского в 1867–1917 гг.

[84] Имеется в виду австро-германская оккупация Привислинского края с лета 1915 г.

[85] *Савич Александр Антонович* (*~1866 г.) — из податного сословия, прав. вероисп., с 04.03.1887 канцелярский служитель 3-го разряда Канцелярии прокурора Минского окружного суда, 07.03.1887 определен в штат Минского губернского правления, с 23.03.1888 и.д. помощника начальника Минской тюрьмы 1-го разряда, с 10.05.1889 и.д. начальника Новогрудской тюрьмы, в ноябре 1900 г. в Педагогическом совете Новогрудского городского 4-классного училища выдержал испытание на производство в первый классный чин, с 04.11.1900 коллежский регистратор (16.04.1901), с 13.12.1901 начальник Новогрудской тюрьмы, с 08.07.1904 пристав 1-го стана Бобруйского у., с 04.11.1903 губернский секретарь (30.07.1904), с 25.10.1906 помощник бобруйского уездного исправника, с 04.11.1906 коллежский секретарь (14.01.1908), титулярный советник (1910), коллежский асессор (1913), с 1913 по 1917 г. слуцкий уездный исправник. Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Анны 3-й ст. (03.02.1903), Св. Станислава 2-й ст. (06.12.1909), Св. Владимира 4-й ст. (08.11.1916).

Артыкул паступіў у рэдакцыю 17.07.2015

*В. В. Урублеўскі*

## Выпадак вызвалення селяніна ад прыгоннай залежнасці з наданнем новага прозвішча

Актавыя кнігі дзяржаўных установаў часу Рэчы Паспалітай змяшчаюць разнастайныя дакументы натарыяльнага (тастаменты, інтрамісіі, дарэнне, купля і г.д.), гаспадарча-фінансавага (інвентары, рэестры, рахункі, тарыфы), дзяржаўнага (прывілеі, універсалы, інструкцыі, пастановы) і судовага (дэкрэты, скаргі, позвы, сазнанні і г.д.) характару. Стварэнню згаданых відаў дакументацыі паспрыяла юрыдычная запатрабаванасць у акрэсленні публічна-прававых адносін паміж дзяржавай і асобай і прыватна-прававых адносін паміж канкрэтнымі людзьмі.

Дамінантнае становішча і інфармацыйны патэнцыял прывілеяў, інвентароў, тастаментаў, рэестраў, актаў куплі-продажу, інтрамісій і дэкрэтаў надаюць ім асаблівую значнасць для правядзення гістарычных даследаванняў. Аднак зрэдку ў актавых кнігах з’яўляюцца актыкацыі прававых актаў, якія не маюць шырокага ўжытку з-за фіксацыі непашыранай і рэдкай з’явы. Да ліку такіх дакументаў адносяцца акты аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці.

У канцы XVIII ст. Рэч Паспалітая ў культурных адносінах перажывала эпоху Асветніцтва, а значыць, большай чалавечнасці “прасветленай” шляхты ў дачыненні да падданых. Выпадкам праяўлення такіх адносін з’яўляецца акт вызвалення ў 1780 г. селяніна Антонія Станёнка з сям’ёй ад прыгоннай залежнасці Марціна Корсака, харужага і ротмістра навагрудскага. Асаблівую каштоўнасць дакументу надае факт перамены сялянскага прозвішча Станёнак на Васілеўскі, які стаў знешняй праявай змены сацыяльнага статусу (Дадатак).

Прычына атрымання прозвішча Васілеўскі згаданай сям’ёй не высветлена, аднак яго канчатак (-еўскі) пацвярджае замену статусу з прыгоннага на вольны. У дакуменце не пазначаным застаецца маёнтак, дзе пражывала сям’я Станёнкаў-Васілеўскіх. Аднак з ускосных крыніц можна даведацца, што Марцін Корсак са спадчыннікамі ў канцы XVIII ст. валодалі асобнымі маёнткамі ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства, у прыватнасці ў ваколіцах мястэчка Талачын [1–3].

У метрыках Талачынскага касцёла XVIII ст. адшукана інфармацыя пра сем’і Антонія Васілеўскага з вёскі Каменка і Антонія Васілеўскага з мястэчка Талачын [5, арк. 195, 197, 201 адв., 209, 247 адв., 252 адв., 258 адв., 266 адв.]. На ролю аб’екта пошуку найбольш падыходзіць другі выпадак: у гэтым шлюбе з Агатай N. дзеці хрышчаны незадоўга да актыкацыі дакумента ў Аршанскім гродскім судзе (29.05.1763 — Ста-

ніслаў, 13.03.1768 — Ян-Тамаш, 17.10.1773 — Уладзіслаў або Людвік, 27.10.1778 — Ангела-Барбара).

Прозвішча Васілеўскі сустракаецца сярод жыхароў ваколіцы Букарава і вёскі Кацэвічы Талачынскай рымска-каталіцкай парафіі ў 1853 г. [4, арк. 168, 170 адв.].

## Крыніцы і літаратура


1. Акт продажу вёскі Гута маёнтка Вечарынка межавым суддзёй Мікалаем Корсакам каморніку пінскаму Мельхіёру Мілашэўскаму і яго жонцы Багуміле з Вербаловічаў за 30.04.1792 // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 2117. — Воп. 1. — Спр. 13. — Арк. 195–196 адв.
2. Анищенко, Е. К. Шляхта Оршанского повета : Список XVIII ст. — Минск, 2015. — 324 с.
3. Дэкрэт падкаморскі аб размежаванні маёнткаў Марціна Корсака, харужага і ротмістра навагрудскага, і Габрыэля Скірыята, падстолія вількамірскага, у Аршанскім павеце за 10.07.1769 // НГАБ. — Ф. 2117. — Воп. 1. — Спр. 6. — Арк. 267–355.
4. Іспаведная ведамасць Талачынскай рымска-каталіцкай парафіі Магілёўска-Копыскага дэканата за 1853 г. // НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 959.
5. Копіі метрычных кніг Талачынскага касцёла аб хрышчаных за 1713–1720, 1722–1798 гг., аб венчаных 1713–1720, 1722–1797, аб памерлых 1765–1770, 1772–1798 // НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1231. — Арк. 177–371 адв.


## Дадатак

Палітарнае транскрыбіраванне дакументаў выканана з захаваннем тагачасных асаблівасцей польскамоўнага арыгінала. Пры публікацыі дакументаў выкарыстаны наступныя правілы: нумар аркуша актавай кнігі пазначаецца ў дакуменце ў квадратных дужках курсівам; літары ą, ć, ę, ł, ń, ś, ó, ż транскрыбіраваны, як у арыгінале, таксама як і вялікія літары ў пачатку слоў; знакі прыпынку (–) у канцы радкоў апушчаны, пасярэдзіне радка (?) пакінуты; падкрэсленыя літары ў тэксце захоўваюцца; памылкі ў словах, нерасчытаныя скарачэнні і забрудненыя часткі слоў адзначаны ў падрадковых заўвагах; скарачэнні раскрываюцца ў простых дужках; зроблены пераклад на сучасную літаратурную беларускую мову.

**14.12.1780. — Акт вызвалення з-пад прыгоннай залежнасці ад Марціна Корсака, харужага і ротмістра навагрудскага, сям'і Антонія Станёнка-Штанёнка з новым прозвішчам Васілеўскі.**

[1005] Aktykacya Prawa wolnoscią dar(o)wanego Antoniego Wasilewskiego od W(ielmożnego) Korsaka Chor(ążego) wydanego.

Roku Tysiąc Siedmset Ośmdziesiątego męca Decembra czternastego Dnia.

Na Urzędzie Jkmęci Grodz(kiego) Orszan(skiego) comparendo personaliter Antoni przczywaiący się Wasilewskim Prawo uwalniaiące Siebię z Sukcessorami Jegoż ad Acta podał w te Słowa pisane? Marcin Korsak Chor(ąży) y Rotm(istr) W(oiewodz)twa Nowogr(ódzkiego) jawno wyznawam teraz y na potomne Czasy Komu o tym potrzeba bylo tym moim dobrowolnym Zapisem na Wieczną wolność wydanym Prawem Antoniemu przeszle Stanionkowi a teraz Wasilewskiemu Żenie jego synom corkom y onych Potomkom na wieczne Czasy slużącym? iż Ja Marcin Korsak Chor(ąży) y Rotm(istr) W(oiewodz)twa Nowogr(ódzkiego) maiąc wzgłąd na Zasługi Antoniego przeszle Stanionka a teraz Wasilewskiego w wielu okazyach wiernie y zyczliwie od młodosci lat Jego doswiadczone, a uzywaiąc w tym wolnosci z Prawa narodowego dozwoloney pomienionego Antoniego Sztanionka a teraz Wasilewskiego zowiącego się Poddanego wieczystego moiego z Jego Żoną Synami y Corkami [1005 v.] spłodzonemi y spłodzic się maiącemi, z Jch Potomstwem wszełkim następcami y Szczątkami na wieczne anigdy nieodzowne czasy od poddanstwa y powinnosci wszelkiey Platy pieniężney daniny y poslugi na wiecznie anigdy nieodzowna Czasy Uwolniwszy moc daięcy pozwalam gdzie kolwiek chcąc na mieszkanie ze wszystkim onego dobytkiem wyiechać bez Żadney odemnie przeszkody y od Potomstwa mego w Kazdym nawet cudzoziemskim Kraiu szczycic się ex ony używać. Ja Marcin Korsak zaręczaiąc za moie Potomstwo od Daty niniejszego na wolno(ś)ć od Poddanstwa wieczystego Zapisu wydanego pod Żadnym Pretextem do osoby Antoniego przeszle Stanionka a teraz Wasilewskiego Żony Jego utriusq(ue) saexus Potomstwa Następcow y Szczątkow interessować [1] się do maiątku Jego teraz będącego y w pryszły Czas wszelakiego nabycia Żadnej należnosci usciełać [2] niemam y powinien nie będę, owszem za tą Jemu nadaną od wieczystego [3] Poddanstwa ze zwierzchnosciu Posługi moią wieczysta nigdy nieporuszoną wolnoscią w Kazdego Sądu, od kazdego turbuiącego bronić y zachować jako wolnego od Poddanstwa wieczystego na wieko pomne Czasy obowiazuię się. Wolen tedy y mocen będzie Antoni prszeszle Stanionka a teraz Wasilewski zawiący się z żoną Dziecmi z następcami y szczątkami jako wolnoscią od mojego wieczystego [1006] Poddanstwa na wiecznie a nieodzowne Czasy udarowany, gdzie chcąc z maiątkiem swojm na mieszkanie przewoziec[4] się handle rozpoczynać, y już od tąd bez żadney odemnie y moich następcow zwierchnosci interessowania się przeszkody wolnosci używac. Y na tom dał ten mój wieczysty uwalniaiący Zapis, waruiąc jednak to. Iż za przewodnictwem tego to uwolnienia od wieczystego Poddanstwa wciskać się Bracia onego Rodzone y wszyscy z tego Imienia Sztanionkow Wasilewscy idący bądz gdziekolwiek będące nie mogą pod Prawo uwolnienia się. Y na tom dał ten mój dobrowolny zapis

[1] На месцы літар «nte» пляма.

[2] Так у тэксце. Магчыма, маецца на ўвазе «ustalać».

[3] На месцы літар «cz» пляма.

[4] Канчатак слова напісаны з памылкай. Правільны варыянт «przewozić».

z Podpisem Ręki mej uproszonych I(ch miłosciwych) PP(anów) Pieczentarzew temi wyraza się Słowy? Marcin Korsak Chor(ąży) W(oiewodz)twa Nowogr(ódzkiego). Ustnie y oczewisto proszony Pieczentarz o [5] tego wolnosci od Poddanstwa wieczystego zapisu Antoniemu y Żenie jego prszeszle Stanionkom a teraz Wasilewskim zawiącym się Poddanym wieczystym y onych Dzieciom y Sukcessorem od W(ielmożnego) J(ego miłości) Pana Marcina Korsaka Chor(ążego) [1006 v.] y Rotm(istra) Nowogr(ódzkiego) danym na wieczną wolność w tym Liscie Zapisu wyrażonym wedle mysli Prawa podpisuię się Mikołay Korsak Rotm(istrz) P(owia)tu Orszańs(kiego). Ustnie proszony Pieczentarz od osoby wydaiącey ten Zapis wedle mysli. Prawa podpisuię się Ignacy Korsak Rotm(istrz) Nowogr(ódzki). Ustnie y oczewisto proszony Pieczentarz od osoby wydaiącey ten Zapis według Prawo podpisuię się Antoni Fiedorowicz m[iejsce] p[ieczęci]. Ktore to takowe Prawo Zapisu danej wolnosci Antoniemu Wasilewskiemu z Żoną y Potomstwem utriusq(ue) saexus będącym na wieczne Czasy za podaniem onego przez wyż wyrażoną osobę jest do xiąg grodz(kich) orszans(kich) przyięte y wpisane.

*Крыніца:* НГАБ. Ф. 1731. Воп. 1. Спр. 49. Арк. 1005–1006 адв.

## Пераклад

[1005] Актыкацыя права, дадзенага на вольнасць Антонію Васілеўскаму ад вяльможнага Корсака, харужага.

Года тысяча семсот васьмідзясятага месяца снежня чатырнаццатага дня.

Перад урадам Яго каралеўскай міласці Аршанскага гродскага суда асабіста стаў Антоні, які называецца Васілеўскім. Права на вольнасць, сваю і сваіх нашчадкаў, да актаў падаў, пісанае ў такіх словах: Марцін Корсак, харужы і ротмістр Навагрудскага ваяводства, для тых, каму ёсць патрэба, ясна сведчу цяпер і на наступныя часы свой дабравольны запіс на вечную вольнасць, выдадзены Антонію, у мінулым Станёнку, а цяпер Васілеўскаму, жонцы яго, сынам, дочкам і іх нашчадкам на вечныя часы служачы. Я, Марцін Корсак, харужы і ротмістр Навагрудскага ваяводства, маючы на ўвазе паслугі Антонія, у мінулым Станёнка, а цяпер Васілеўскага, які давёў мне ад часоў яго маладосці сваю вернасць ва ўсіх справах і добразычлівасць, надзяляю вольнасцю, дазволеную грамадскім правам. Антонія Штанёнка, цяпер названага Васілеўскім, вячыстага майго падданага, яго жонку, сыноў і дачок [1005 адв.], народжаных і тых, што нарадзіцца маюць, з іх патомствам усялякім, спадчыннікамі і нашчадкамі на вечныя і бясконцыя часы вызваляю ад падданства і ўсялякай павіннасці, грашовай платы, даніны і паслугі на вечныя і бясконцыя часы. Вызваліўшы, дазвол даю пражываць дзе-кольвек хоча, са сваім здабыткам выехаць без ніякай ад мяне і ад патомства майго перашко-

[5] Перад літарай «о» пляма.

ды. У кожным, нават у чужаземным краі, гонар гэты мець. Я, Марцін Корсак, заручыўшыся падтрымкай майго патомства, датай цяперашняй у запісе на вольнасць Антонію, у мінулым Станёнку, а цяпер Васілеўскаму, жонцы яго, дзецям абодвух полаў, спадчыннікам і нашчадкам, паведамляю, што цікавіцца цяпер існуючым маёнткам і ў будучым часе ўсялякім яго набыткам ні з якой прычыны не буду і вызначаць яго не маю і павінен не буду. Таксама абавязваюся яму за аказанне мне, свайму панству, верных паслуг вольнасць яго ў кожным судзе ад кожнага нападніка бараніць і захаваць як вольнага ад вечнага падданства на векапомныя часы. Вольны тады і правамоцны будзе Антоні, у мінулым Станёнка, а цяпер Васілеўскім названы, з жонкай, дзецьмі, спадчыннікамі і нашчадкамі, паколькі вольнасцю ад майго вячыстага [1006] падданства на вечныя часы надзелены, куды хоча з маёнткам сваім на жыхарства перапязджаць, гандаль распачынаць, і без аніякага майго і маіх спадчыннікаў гаспадарскага разліку перашкодзіць іх вольнасці. На гэтых умовах даў гэты свой вячысты вызваляючы запіс, агаворваючы, аднак, наступнае. З-за адметнасці аднаго толькі Антонія ўключыць родных братоў яго і ўсіх з таго роду Станёнкаў-Васілеўскіх, якія ёсць ці калі-небудзь будуць, у акт гэтага вызвалення ад вечнага падданства не магу. На гэтым даў свой дабравольны запіс за подпісам рукі маёй і запрошаных, іх міласцівых паноў пячатараў, тымі словамі. Марцін Корсак, харужы ваяводства Навагрудскага. Вусна і асабіста запрошаны пячатар. Запіс аб вольнасці ад вечнага падданства выдадзены Антонію і жонцы яго, у мінулым Станёнкам, а цяпер Васілеўскім названым, падданым вячыстым і іх дзецям і спадчыннікам ад вяльможнага Яго міласці пана Марціна Корсака, харужага [1006 адв.] і ротмістра навагрудскага. На тым лісце запіс згаданы паводле прававога парадку падпісвае Ігнацы Корсак, ротмістр навагрудскі. Вусна і асабіста запрошаны пячатар ад асобы, якая выдае гэты запіс, паводле права падпісваецца Антоні Федаровіч. Такое права запісу вольнасці, дадзенай Антонію Васілеўскаму з жонкай і патомствам абодвух полаў, будучае на вечныя часы, пасля перадачы праз вышэй згаданую асобу да кніг гродскіх аршанскіх прынята і ўпісана.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 04.09.2015

# Крыніцазнаўства

*М. А. Волкаў, М. А. Плавінскі*

## Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц

Вывучэнне гісторыі беларускіх гарадоў і замкаў познесярэднявечнага часу, відавочна, з'яўляецца міждысцыплінарнай працай, у якой павінны выкарыстоўвацца як пісьмовыя, так і археалагічныя крыніцы. Разам з тым, прыклады сапраўды міждысцыплінарных даследаванняў у айчыннай гістарыяграфіі пакуль нешматлікія. Археолагі найчасцей спрабуюць «механічна прывязаць» матэрыялы сваіх раскопак да пэўных вядомых гістарычных дат. У сваю чаргу гісторыкі звычайна выкарыстоўваюць даныя археалагічных раскопак у якасці ілюстрацый да вынікаў аналізу пісьмовых крыніц. Такая сітуацыя, да пэўнай ступені, прадвызначана складанасцю адначасовай апрацоўкі значнага аб'ёму атрыманых падчас раскопак археалагічных крыніц і не менш шматлікіх архіўных матэрыялаў. Зыходзячы з гэтага, можна сцвярджаць, што на сучасным этапе даследаванне познесярэднявечных замкаў і гарадоў патрабуе сумеснай працы гісторыкаў і археолагаў. Гэты артыкул з'яўляецца спробай менавіта такога даследавання.

Гісторыя будаўніцтва і функцыянавання Мядзельскага замка дасюль застаецца малавядомай, што вынікае найперш з недахопу інфармацыі ў пісьмовых крыніцах. Тым не менш праз вывучэнне гісторыі ўсяго рэгіёна, самога паселішча Мядзел і яго ўласнікаў мы маем магчымасць абысці «маўчанне» крыніц і высветліць некаторыя цікавыя факты з мінулага замка. Агульная карціна гісторыі рэгіёна таксама дапаможа нам зразумець значэнне гэтага помніка.

Гісторыя зямельных валоданняў у рэгіёне з'яўляецца даволі заблытанай. Адным з найбольш яскравых момантаў, які адлюстроўвае складанасць адносін паміж зямельнымі ўласнікамі, з'яўляецца адначасовае існаванне некалькіх Мядзелаў. У крыніцах згадваюцца Мядзел (каралеўскі, ці Новы Мядзел), які з XVI ст. быў цэнтрам дзяржаўнага ста-

роства, Стары Мядзел, што з XV ст. з'яўляўся прыватнай уласнасцю, і Малы Мядзел. Пра гэта шмат публікавалася ў навуковай літаратуры, тым не менш для таго, каб разабрацца з гісторыяй замка, ёсць патрэба зноў звярнуцца да гэтага пытання. Да таго ж, на нашу думку, некаторыя гіпотэзы, прынятыя навукоўцамі, патрабуюць карэкціроўкі.

***Праблема першапачатковага Мядзела***. Наколькі можна меркаваць, першапачаткова Мядзелам называлася паселішча на востраве Замак возера Мядзел, якое складалася з гарадзішча і селішча. Гарадзішча размяшчаецца на паўднёва-ўсходнім ускрайку вострава. Помнік быў абследаваны Л. В. Аляксеевым у 1956 г., які на падставе сабранага пад'ёмнага матэрыялу — фрагментаў кругавой керамікі датаваў узнікненне ўмацаванага паселішча XI ст. і лічыў яго памежнай крэпасцю Полацкага княства [1, с. 82, мал. 14:1]. У 1970 і 1981 гг. невялікія па аб'ёмах раскопкі гарадзішча ажыццявіў М. А. Ткачоў. У 1981 г. ён заклаў на гарадзішчы чатыры шурфы памерам 2×2 м. Шурфоўка выявіла, што магутнасць культурнага пласта дасягае 2,43 м. Знойдзеныя матэрыялы даследчык датаваў у межах IX/X–XV стст. Акрамя таго, М. А. Ткачоў выявіў селішча, размешчанае на поўнач і захад ад гарадзішча, плошча якога вызначана ў 2 га. На селішчы ў 1981 г. закладзены 2 шурфы памерам 2×2 м. Выяўленыя матэрыялы датаваны даследчыкам XI/XII–XIII стст. Аналізуючы матэрыялы раскопак 1981 г., М. А. Ткачоў прыйшоў да высновы, што гарадзішча спыніла сваё функцыянаванне ў XV ст., а селішча было закінута некалькі раней [20, с. 6–7; 21, с. 449].

Даследаванні на селішчы адноўлены ў 2014 г. экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. А. Плавінскага — у паўночна-ўсходняй частцы селішча быў закладзены Шурф I плошчай 3 кв.м. У культурным пласце, магутнасць якога дасягала 0,7–0,85 м, выяўлены бронзавая, верагодна, паясная накладка, шматлікія фрагменты кругавой керамікі, металургічны жужаль і косткі жывёл. На падставе знойдзеных матэрыялаў адкладанне культурнага пласта на даследаваным участку варта датаваць XI–XIII стст.

Аналіз матэрыялаў раскопак М. А. Ткачова 1981 г. дазваляе меркаваць, што гарадзішча ўзнікла ў канцы I тыс. н.э., пра што сведчыць ляпная кераміка «з плечуком», характэрная для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, якая практычна ўсімі сучаснымі даследчыкамі атаясамляецца з летапіснымі крывічамі [4; 11, с. 203]. Гарадзішча функцыянавала ў якасці памежнай полацкай крэпасці на працягу старажытнарускага часу — XI–XIII стст., а, верагодна, працягвала выкарыстоўвацца яшчэ і ў XIV ст. У сваю чаргу селішча на дадзеным этапе даследаванняў можа быць датавана XI–XIII стст. (хаця не выключана, што і яно працягвала функцыянаваць у XIV ст.).

Існаванне ўмацавання на востраве Замак возера Мядзел у эпоху ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ўскосна пацвярджаецца і звесткамі з пісьмовых крыніц. Па ўсёй верагоднасці, менавіта яно згадваецца ў 1325 г. [1] у лісце вялікага князя Гедыміна як «замак Мядзел» (лат. *castrum Medelo*) [29, p. 218–221].

Прычыны заняпаду паселішча на востраве Замак пакуль застаюцца незразумелымі. М. А. Ткачоў лічыў, што жыхары пакінулі яго ў канцы XIV–XV стст. з-за «моравай пошасці» [19, с. 95]. Аналагічнага погляду прытрымліваўся і Міх. М. Чарняўскі, які ў якасці яго абгрунтавання прыводзіў мясцовае паданне [26, с. 45]. Аднак ніякіх пацвярджэнняў гэтай досыць «рамантычнай» версіі няма.

Не выключана, што першапачатковы Мядзел мог быць закінуты пасля пералому ў войнах з крыжакамі напачатку XV ст. з прычыны страты свайго стратэгічнага значэння. Апрача знешнепалітычных абставін заняпаду старога ўмацавання і паселішча каля яго, магла паспрыяць і іншая акалічнасць. З пачатку XV ст. тэрытарыяльна-пасяленчая структура, што сфарміравалася вакол старога цэнтра, пачала надавацца прыватным уласнікам, г.зн. выйшла з-пад непасрэднага кіравання вялікага князя. У выніку гэтага маглі быць парушаны ранейшыя механізмы забеспячэння ўмацавання і падтрымання яго абарონаздольнасці.

Разам з тым варта яшчэ раз адзначыць, што наяўныя археалагічныя матэрыялы на сённяшнім этапе даследаванняў не дазваляюць упэўнена сцвярджаць, што гарадзішча на востраве Замак і размешчанае побач з ім паселішча, якое мы атаясамляем з першапачатковым Мядзелам, працягвалі функцыянаваць да пачатку XV ст.

***Зямельныя валоданні на Мядзельшчыне ў XV–XVI стст.*** Першым уласнікам Мядзела з воласцю стаў Жыгімонт Карыбутавіч з роду Гедымінавічаў [2]. Пасля яго смерці ў 1435 г. тут зацвердзіўся ўплывовы на той час род Саковічаў: па чарзе Мядзелам валодалі Андрэй Саковіч (пам. пасля 1465 г.), а затым яго сын Багдан (пам. 1490 г.). Першапачаткова іх права на валоданне гэтымі землямі не было аформлена пісьмова і падмацоўвалася тым, што абодва займалі пасады мядзельскіх старастаў [14, с. 163–164, 293]. Толькі ў 1484 г. вялікі князь Казімір Ягелончык сваім прывілеем пацвердзіў Багдану Саковічу права ўласнасці на

---

[1] У. Ц. Пашута памылкова датаваў згаданую грамату 1324 г. [10, с. 526]. У далейшым гэтая дата пашырылася ў літаратуры. Аўтары прыносяць шчырую падзяку С. У. Палехаву за кансультацыю ў дадзеным пытанні, а таксама за агульныя заўвагі і дапамогу пры падрыхтоўцы артыкула.

[2] Жыгімонт Карыбутавіч, ці Жыгімонт Карыбут (пам. 1435 г.), сын Карыбута Альгердавіча (пам. пасля 1404 г.). У крыніцах, што тычацца Мядзела, ён згадваецца пад імем Карыбут [34, p. 135–136].

Мядзел і землі, якія да таго трымаў яго бацька [35, p. 74–76]. У гэтым можна бачыць прыклад працэсу паступовай феадалізацыі грамадства ВКЛ і афармлення прыватнай уласнасці на зямлю.

Умацаванне Саковічаў на Мядзельшчыне не было выпадковым. Як адзначае літоўскі гісторык Р. Пятраўскас, у гэтым рэгіёне знаходзіліся іх вотчынныя валоданні Груздава і Вішнева. Урэшце, і сам Мядзел даследчык называе «старой вотчынай» Саковічаў [14, с. 293, 296]. Цалкам магчыма, што саковічаўскі Мядзел, вядомы з другой паловы XVI ст. як Стары Мядзел (паўночная частка сучаснага Мядзела), спачатку існаваў пад іншай назвай і насамрэч быў даўняй вотчынай гэтага роду, а ў сярэдзіне — другой палове XV ст. адбыўся перанос назвы «Мядзел» на паселішча. Гэта магло быць вынікам адмысловай стратэгіі Саковічаў, якія пачалі фарміраваць тут цэнтральную рэзідэнцыю сваёй мядзельскай зямельнай латыфундыі. Яскравай праявай гэтага стала, напрыклад, заснаванне ў Старым Мядзеле касцёла Св. Станіслава, якому ў 1457 г. Андрэем Саковічам быў нададзены значны фундуш [30, s. 252–253]. Сам жа храм мог паўстаць яшчэ пры яго бацьку Станіславу Саку (пам. пасля 1433 г.), які, магчыма, і прыняў рашэнне асвяціць касцёл у гонар свайго святога заступніка [3].

Другім паводле свайго ўплыву ў рэгіёне быў род князёў Свірскіх, галоўная сядзіба якіх Свір знаходзілася на беразе аднайменнага возера на захад ад Мядзела. Адным з найбольш цікавых комплексаў дакументаў, якія характарызуюць памеры зямельных уладанняў Свірскіх, з'яўляюцца чатыры фундушы 1434–1494 гг. на касцёл Св. Андрэя ў т.зв. Малым Мядзеле (лат. *Minor Medalo*). Як мяркуюць Я. Фіялэк і У. Сэмковіч, тры з іх былі падроблены, а чацвёрты выглядае падазрона [30, s. 147–149, 187–188, 276–279, 470–472] [4]. Таму цалкам магчыма, што гэтыя дакументы былі створаны ў пачатку XVI ст., калі шматлікія збяднелыя князі Свірскія пачалі распрадаваць свае землі, а каталіцкі касцёл з дапамогай такога кшталту фальсіфікатаў спадзяваўся пазмагацца за частку іх спадчыны. Тым не менш, нават калі згаданыя дакументы і з'яўляюцца падробкамі, яны даволі рэальна адлюстроўваюць сітуацыю з зямельнымі ўладаннямі Свірскіх на пачатак XVI ст. Такім чынам, аб зямельнай

---

[3] З канца XIX ст. датай заснавання касцёла Св. Станіслава многія даследчыкі лічылі 1454 г. [31, s. 283–284; 28, s. 199; 15, с. 238]. Аднак да сённяшняга часу не выяўлена крыніц, якія б пацвярджалі гэтую інфармацыю. Магчыма, тут мы маем справу з памылковай інтэрпрэтацыяй прывілея А. Саковіча ад 1457 г. на фундуш мядзельскаму храму.

[4] Аб познім паходжанні гэтых дакументаў сведчыць, напрыклад, ужыванне адносна Малога Мядзела-Кабыльніка азначэння «мястэчка» (лац. *oppidum*). Права на вядзенне гандлю паселішча атрымала, відавочна, не раней за першую палову XVI ст., як і суседнія Свір і Мядзел.

уласнасці Свірскіх, як, зрэшты, і Саковічаў, на Мядзельшчыне можна меркаваць пераважна на падставе дакументаў XVI ст., хаця самі гэтыя роды ў гэты час ужо заняпалі: Свірскія збяднелі і распрадалі значную частку сваіх зямель, а мядзельская лінія Саковічаў абарвалася.

Цэнтрам зямельнай латыфундыі Свірскіх у рэгіёне з'яўляўся Малы Мядзел, які ўжо з канца XIX ст. даследчыкі атаясамляюць з мястэчкам Кабыльнік (сучасны гарадскі пасёлак Нарач), размешчаным на паўночны захад ад возера Нарач [5]. Сумнявацца ў тым, што гаворка ідзе менавіта пра Кабыльнік, няма прычын, аднак ёсць падставы лічыць, што ўжыванне назвы «Малы Мядзел» не было шырока распаўсюджана. Напрыклад, у Метрыцы ВКЛ, дзе ёсць цэлы шэраг запісаў аб продажы Свірскімі сваіх зямель у гэтым рэгіёне, у тым ліку Кабыльніка, нам не ўдалося знайсці згадак аб тапоніме «Малы Мядзел». Цалкам магчыма, што гэтая назва актыўна ўжывалася найперш самімі Свірскімі, каб абазначыць свае прэтэнзіі на частку колішняй мядзельскай воласці, але так і засталася ў цені саковічаўскага Мядзела. Дарэчы, у фундушы касцёлу ў Кабыльніку ад 1494 г. згадваецца таксама тапонім «Вялікі Мядзел» (лат. *Maior Medalo*), які, відавочна, адносіўся да Мядзела Саковічаў. Гэта дазваляе параўнаць значэнне абодвух паселішчаў і іх гаспадароў у рэгіёне.

Як можна меркаваць па наданнях Свірскіх касцёлу Св. Андрэя ў Кабыльніку ў 1463 і 1494 гг., у яго акругу ўваходзілі значныя землі, расцягнутыя з паўночнага ўсходу ад азёраў Споры, Світа, Чэцьверць на паўднёвы захад да возера Свір з паселішчамі Споры, Чэцьверць, Зары, Калодна, Сырмеж і інш. На ўсход ад іх знаходзілася велізарная зямельная латыфундыя Саковічаў. Пра яе памеры можна меркаваць на падставе апісання зямель, якія падзялілі паміж сабой нашчадкі дачкі Багдана Саковіча Альжбеты (пам. пасля 1543 г.) і яе мужа Мікалая Радзівіла (1470–1521 гг.) у 1544 г. У ім згадваюцца шматлікія паселішчы, якія захаваліся да нашага часу: Кураполле, Груздава, Вохабня, Ваўкалата, Мядзел (Стары), Спягла, Узла і інш. Апрача таго, паводле прывілея 1484 г. Саковічам належала і права карыстання азёрамі Мядзел, Мястра і Нарач, а таксама Мядзельскай пушчай [37, l. 60–64]. Такім чынам, у XV ст. Свірскія і Саковічы былі самымі буйнымі землеўладальнікамі ў рэгіёне, а іх прэтэнзіі на дамінаванне адбіліся ў пераносе тапоніма «Мядзел» на свае паселішчы.

---

[5] Аб тым, што Кабыльнік называлі Мядзелам, аднымі з першых напісалі М. Балінські і Т. Ліпінські. Праўда, яны лічылі, што мястэчка называлася «Новы Мядзел» [28, s. 200]. А. Сапуноў і В. Друцкі-Любецкі паставілі пад сумненне гэтую гіпотэзу і выказалі меркаванне, што Новым Мядзелам называлі гандлёва-рамесную слабаду, заснаваную ў 1736 г. побач са Старым Мядзелам [15, с. 241]. У далейшым атаясамленне Малога Мядзела з Кабыльнікам стала агульнапрынятым [17, с. 69].

У 20-х гг. XVI ст. на Мядзельшчыне пачаў актыўна скупляць землі адзін з найбольш магутных магнатаў ВКЛ таго часу Альбрэхт Гаштольд (пам. 1539 г.). На яго дзейнасць варта звярнуць асаблівую ўвагу, бо многія даследчыкі лічаць, што пасля смерці яго сына Станіслава (каля 1507–1542 гг.) мядзельскія землі Гаштольдаў адышлі каралю, і на іх аснове было сфарміравана дзяржаўнае староства, якому ў далейшым і належаў Мядзельскі замак [6].

Перадумовай разгортвання дзейнасці Альбрэхта Гаштольда на Мядзельшчыне стала збядненне князёў Свірскіх, у якіх ён і пачаў набываць землі. Магчыма, гэтаму садзейнічала і смерць у 1521 г. Мікалая Радзівіла, які быў адным з галоўных супернікаў Гаштольда як на палітычнай арэне ВКЛ, так і ў гэтым рэгіёне, бо Мікалаю Радзівілу разам з рукой Альжбеты Саковіч адышла вялікая мядзельская латыфундыя гэтага роду. У 1527 г. у Аляксандра Міхнавіча Свірскага Альбрэхт Гаштольд набыў яго «ўладанні Мядзел і Кабыльнік» за 300 коп літоўскіх грошаў, у тым жа годзе ў Андрэя Юхнавіча Свірскага — «уладанне Мядзел каля Зары» за 300 коп, у 1533 г. у Войцеха і Андрэя Юхнавічаў Свірскіх — «уладанні Мядзел» за 400 коп, у 1535 г. у Аляксандра Марцінавіча Свірскага — аднаго падданага ў Зары за 15 коп. Апрача таго, у 1532 г. Альбрэхт Гаштольд купіў у Ядвігі Янавай некалькі падданых ля возера Нарач за 50 коп, а ў 1539 г. у Матыса Алехнавіча — двух падданых ці дзве службы ля возера Нарач «да ўладання свайго Кабыльнік» за 25 коп [33, p. 42, 45, 59, 61, 95]. На падставе гэтых фактаў можна зрабіць шэраг высноў. Па-першае, азначэнне «мядзельскія ўладанні» ўжывалася адносна ўсіх зямель Свірскіх у рэгіёне і не было прывязана да канкрэтнага паселішча. Па-другое, Альбрэхт Гаштольд скупляў землі Свірскіх на ўсход ад возера Нарач, да якога імкнуўся атрымаць доступ праз набыццё зямель паблізу ад яго.

***Каралеўскі Мядзел***. Цэнтрам мядзельскага каралеўскага староства, сфарміраванага ў сярэдзіне XVI ст., стаў Мядзел, званы таксама Новым ці каралеўскім (паўднёвая частка сучаснага Мядзела). Першае вядомае апісанне Мядзельскай воласці, якая стала асновай для ўтварэння староства, паходзіць з 1545 г. [3, с. 75–85], а адно з найбольш поўных — з 1668 г. [9]. Абапіраючыся на іх, можна дакладна акрэсліць тэрыторыю староства. Яго землі прасціраліся на ўсход ад Мядзела і ўключалі ў сябе

[6] Адным з першых гэтую гіпотэзу выказаў Ю. Кшывіцкі. Ён памылкова атаясамляў Мядзел Свірскіх не з Кабыльнікам, а з каралеўскім Новым Мядзелам. Паводле гэтага даследчыка, А. Гаштольд выкупіў гэтае паселішча ў Свірскіх, а пасля яно як вымарачнае ўладанне перайшло каралеўскаму скарбу [31, s. 283–284]. У далейшым гэтая гіпотэза пашырылася ў навуковай літаратуры [17, с. 71; 7, с. 48].

вёскі Студзяніца, Канчаны, Лук'янавічы, Шкленікава і інш. Такім чынам, гэты зямельны комплекс быў размешчаны на ўсход ад азёраў Нарач, Мядзел і Мястра. Пры гэтым мы не маем ніякіх згадак аб тым, ці мелі тут землі Свірскія або набываў іх Альбрэхт Гаштольд.

Недахоп інфармацыі ў крыніцах XV–XVI стст. не дазваляе вызначыць дакладна, каму належалі землі, на аснове якіх было ўтворана дзяржаўнае староства. Дапамагаюць звесткі з дакументаў пазнейшага часу. Адной з найбольш каштоўных крыніц па гісторыі Мядзела з'яўляецца камісарскі дэкрэт 1744 г. па судовай справе паміж мядзельскім старастам Юзафам Брастоўскім і ўладальнікам Старога Мядзела Антоніем Кошчыцам. У прыватнасці, у ім згадваецца, што ў свой час Саковічам былі нададзены «ўладанні Мядзел <…> разам са Старым і Новым Мядзелам» [40, l. 38] [7]. Такім чынам, абодва паселішчы з прылеглымі тэрыторыямі першапачаткова належалі гэтаму роду. Аднак яшчэ да смерці апошняй прадстаўніцы роду Альжбеты Радзівіл Мядзел разам з землямі на ўсход ад яго пры нявысветленых абставінах трапіў у распараджэнне каралеўскага скарбу. Па ўсёй верагоднасці, пэўную ролю ў гэтым адыграла каралева Бона Сфорца (1494–1557 гг.), вядомая сваімі рашучымі крокамі па ўмацаванні матэрыяльнага становішча каралеўскай сям'і шляхам павелічэння і ўпарадкавання яе зямельных уладанняў. У прыватнасці вядома, што ў 1543 г. каралева асабіста высылала сваіх камісараў для разгляду зямельных спрэчак з Альжбетай Радзівіл [40, l. 43v].

Вывучэнне нешматлікіх звестак з пісьмовых крыніц, а таксама аналіз планаў Мядзела XIX – пачатку XX ст. [41–44] даюць магчымасць разабрацца ў ранняй гісторыі гэтага паселішча. Вядома, што ў першай чвэрці XVI ст. Стары Мядзел знішчылі маскоўскія войскі. Паводле А. Сапунова і В. Друцкага-Любецкага, паселішча было спалена ў 1519 г., г.зн. у час вайны 1512–1522 гг. [15, с. 233]. Пасля, як паведамляецца ў дэкрэце 1744 г., Альжбета Радзівіл не пажадала аднаўляць разбураны касцёл Св. Станіслава на старым месцы, і ён быў перанесены на «каралеўскія грунты», г.зн. у Мядзел. Замест касцёла ў Старым Мядзеле ў 1549 г. была пабудавана капліца Св. Яна Хрысціцеля [32, s. 219].

Як бачна па планах XIX – пачатку XX ст., касцёл Св. Станіслава быў узведзены на скрыжаванні вуліцы «над возерам Мястра», як яна названа ў інвентары 1668 г. (пазней — вул. Віленская, цяпер — вул. Ленінская, Набярэжная і завул. Набярэжны), і безыменнай (цяпер — вул. 1 Мая), што ішла ад моста праз рэчку Дробня да возера Мястра (мал. 1) [8].

---

[7] Аўтары выказваюць шчырую падзяку В. Ф. Голубеву за дапамогу ў пошуку і атрыманні копіі дакумента.

[8] Вывучэнне планіровачнай структуры Мядзела на падставе інвентара 1778 г. правёў Я. Г. Звяруга [6, с. 45–60].




Мал. 1. План мястэчка Мядзел другой паловы XIX ст.

На скрыжаванні перад касцёлам была ўтворана невялікая трохвугольная гандлёвая плошча. Гэта значыць, што перанос касцёла ў 1520–1530-я гг. супаў з наданнем паселішчу права на гандаль, ці ўтварэннем на яго аснове гандлёва-рамеснага мястэчка. Таму ў першым вядомым апісанні мядзельскай воласці 1545 г. сярод падаткаплацельшчыкаў згадваюцца мяшчане. Такім чынам, у першай палове XVI ст. Стары Мядзел у выніку разбурэння заняпаў, а побач з ім пачало хутка развівацца новае мястэчка, якое стала называцца Новым Мядзелам. Праўда, застаецца незразумелым, хто стаў ініцыятарам заснавання новага паселішча: каралева Бона ці Альжбета Радзівіл.

У 1550 г. у Новым Мядзеле каралеўскія камісары правялі т.зв. «лакацыю»: на поўдзень ад старога рынку быў закладзены вялікі прамавугольны ў плане рынак, да якога праклалі новыя вуліцы, а ўздоўж нарэзалі пляцы для мяшчан [15, дадатак, с. 21–22]. Фарміраванне новага планіровачнага каркаса было ў асноўным скончана да канца наступнага дзесяцігоддзя. У прыватнасці вядома, што ў 1559 г. царква Св. Троіцы атрымала дзве валокі зямлі ўжо ў канцы Даўгінаўскай вуліцы (цяпер вул. 17 верасня) [15, дадатак, с. 27–28]. У 1562 г. Мядзел атрымаў уставу, якая забяспечвала эканамічныя правы мясцовых мяшчан праз забарону засноўваць шынкі і корчмы, а таксама весці гандаль у адлегласці трох міль ад мястэчка [40, l. 32v.]. Прынятыя меры прывялі да таго, што



Мал. 2. Паўвостраў, на якім размяшчаўся Мядзельскі замак, на плане мястэчка Мядзел другой паловы XIX ст.

каралеўскі Мядзел стаў адным з найбольш развітых эканамічных цэнтраў у рэгіёне. Аб росквіце мястэчка і росце заможнасці яго жыхароў найлепш сведчыць той факт, што мяшчане ўзяліся за ўзвядзенне абарончых умацаванняў вакол паселішча. Вядома, напрыклад, што з усходняга боку быў насыпаны земляны вал [9].

***Гісторыя археалагічнага вывучэння Мядзельскага замка***. Прадстаўленне агульнай карціны гісторыі Мядзельшчыны ў XV – першай

---

[9] Пра вал згадваецца ў інвентары 1668 г. [9, арк. 166]. Яго рэшткі былі бачны яшчэ ў канцы XIX ст. [15, с. 235]. Паводле Міх. М. Чарняўскага, які ў 1982 г. праводзіў вывучэнне рэшткаў вала, яго вышыня складала 2 м, шырыня — 10 м [26, с. 46].

палове XVI ст. дае магчымасць, нарэшце, перайсці да разгляду гісторыі Мядзельскага замка. Мэтазгодна паасобку разгледзець матэрыялы археалагічных раскопак і даныя пісьмовых крыніц з мэтай іх далейшага супастаўлення і верыфікацыі. Варта пачаць з аналізу матэрыялаў археалагічных раскопак.

Мядзельскі замак размяшчаецца на паўвостраве возера Мястра ў паўднёвай частцы сучаснага Мядзела (мал. 1–2). Пляцоўка, якую займала ўмацаванне, нагадвае пагорак марэннага паходжання памерам 135–140 м па лініі паўднёвы захад — паўночны ўсход на 100 м па лініі паўночны захад — паўднёвы ўсход (мал. 3) [10]. Схілы пагорка былі, відавочна, штучна падрэзаны падчас будаўніцтва замка. У паўночна-ўсходняй частцы пагорка размяшчалася мураваная вежа. Як сведчаць апісанні Мядзельскага замка, зробленыя М. А. Ткачовым і Міх. М. Чарняўскім, ён быў дадаткова ўмацаваны па перыметры паўкруглымі бастэямі. На сённяшні час яны захаваліся толькі часткова — прасочваюцца толькі тры бастэі. Дзве з іх размяшчаюцца з паўднёвага і паўднёва-ўсходняга бакоў замкавага пагорка, а трэцяя фіксуецца на паўночным баку.

Варта адзначыць, што за апошняе паўстагоддзе пагорак, на якім размяшчаўся Мядзельскі замак, і навакольная тэрыторыя паўвострава былі значна разбураны. Найбольш моцна пацярпела паўночна-заходняя частка паўвострава, дзе падчас стварэння парку імя Трыццацігоддзя перамогі ў 1974 г. быў закладзены футбольны стадыён. У выніку гэтых прац падрэзаны паўночна-заходні схіл замкавага пагорка, што прывяло да знішчэння размешчаных тут бастэі ці бастэяў. Таксама падчас закладкі парку ўздоўж паўднёва-ўсходняга схілу замкавага пагорка пракладзена таполевая алея, якая часткова закранула адну з бастэй, размешчаных з гэтага боку.

З мэтай узмацнення фартыфікацыйных якасцей пагорак, на якім размяшчаўся Мядзельскі замак, быў у далейшым дадаткова ўмацаваны валам з бастыёнамі. На жаль, гэты вал зазнаў найбольшыя разбурэнні. Яго паўночна-заходні і паўночны ўчасткі цалкам знішчаны падчас закладкі згаданага парку. З усходняга боку знешні вал часткова знішчаны сцежкай, якая вядзе на вяршыню замкавага пагорка. З паўднёва-ўсходняга боку ад замкавага пагорка знешняя лінія ўмацаванняў размытая возерам Мястра. Фактычна на сённяшні дзень знешні вал захаваўся толькі з паўднёва-ўсходняга (на даўжыню 150 м) і часткова з усходняга (на даўжыню 120 м) бакоў замкавага пагорка. На гэтай адлегласці фіксуюцца чатыры бастыёны.

---

[10] Інструментальны план замка быў зняты ў 2013 г. Э. А. Астаповічам, удзельнікам археалагічнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам М. А. Плавінскага.




Мал. 3. Інструментальны план Мядзельскага замка (здымка Э. А. Астаповіча, 2013 г.) з пазначэннем месцазнаходжання падмурка мураванай вежы, шурфаў і раскопаў, закладзеных у 2013–2014 гг.

Мядзельскі замак вядомы ў археалагічнай літаратуры з канца XIX ст. [13, с. 33–34], але яго вывучэнне распачалося толькі ў 1970 г., калі М. А. Ткачоў ажыццявіў абследаванне замка і заклаў на яго тэрыторыі шурф памерам 2×2 м [18, с. 20, 25]. Зробленае ў 1970 г. апісанне помніка было пакладзена ў аснову тэксту, прысвечанага Мядзельскаму замку ў манаграфіі М. А. Ткачова «Абарончыя збудаванні заходніх зя-

мель Беларусі XIII–XVIII стст.» [19, с. 95–97]. У гэтай працы даследчык аднёс пабудову замка да другой паловы XVI – пачатку XVII ст. Ён лічыў, што замкавы пагорак па перыметры быў абнесены мурам шырынёй ад 1,5–1,7 да 2 м з камянёў, пакладзеных на гліну. Апрача таго, даследчык адзначыў наяўнасць па перыметры замкавага пагорка паўкруглых бастэй, якія, на яго думку, таксама былі муравынымі, прычым шырыня іх муроў дасягала 2,5 м. Паводле меркавання М. А. Ткачова, у 1970 г. у паўднёва-ўсходняй частцы замка заўважаны падмурак муравынай круглай вежы дыяметрам 10 м, сцены якой мелі таўшчыню 2 м. А ў яго паўночна-ўсходняй частцы зафіксаваны падмурак муравынага з цэглы і каменю будынка памерам 10×20 м. Ніжні пояс замкавых умацаванняў складаўся з землянога вала з бастыёнамі і размешчаным перад ім ровам [19, с. 95–97]. У манаграфіі 1978 г. прыводзіцца і схематычны план замка з пазначэннем месцаў размяшчэння бастэй (мал. 4: 1), муравыных веж і меркаванага палаца [19, рыс. 57]. Адзначым, што апрача іншых недакладнасцей дадзены план памылкова арыентаваны па баках свету [12, с. 331].

У 1981 г. экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. А. Ткачова на тэрыторыі помніка былі праведзены дастаткова значныя па маштабах раскопкі (мал. 4: 2). Даследаваная плошча склала 116 кв.м. [20, с. 2–4]. Як вынікае са справаздачы аб раскопках, у выніку даследаванняў выяўлена муравыная вежа дыяметрам 17,5 м, сцены якой дасягалі таўшчыні 3,75 м. Вежа збудавана ў тэхніцы паласатай мmuроўкі з валуноў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне з дамешкам добра прасеянага пяску. Яе падмуркі ўпушчаны ў мацярык на 4 м. М. А. Ткачоў датаваў вежу XV ст. З паўночнага боку ад вежы раскрыты ўчастак сцен муравынага будынка шырынёй 10 м і таўшчынёй 2 м, які аўтар лічыў палацам. Паўднёвая сцяна будынка ўшчыльную прыкладзена да вежы. На думку аўтара раскопак, палац Мядзельскага замка збудаваны ў пачатку XVI ст. Варта таксама адзначыць, што падчас раскопак 1981 г. у культурным пласце замка выяўлены два пласта спалення, якія М. А. Ткачоў датаваў пачаткам XVI і XVII стст. адпаведна [20, с. 2–4].

Вынікі даследаванняў 1970 і 1981 гг. пакладзены ў аснову артыкула М. А. Ткачова, прысвечанага Мядзельскаму замку ў энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі» [22, с. 450]. У ім у тым ліку паведамляецца, што замак *«Складаўся з муравыных вежы і палаца, а таксама знешняга абарончага комплексу (захаваліся руіны). Круглая ў плане вежа-данжон адкрыта ў 1981 археал. экспедыцыяй Гродзенскага ун-та. Яе знешні дыям. 17,5 м, унутраны — 10 м, таўшч. сцен каля 3,5 м <…> У 1-й палове 16 ст. да вежы з зах. прыбудаваны прамавугольны ў плане палац, руіны якога ўскрыты часткова. Ён <…> меў сцены таўшч. каля 2 м і шыр. 10 м, падвалы глыб. 3 м, перакрытыя скляпеннем. Даў-*




Мал. 4. Схематычны план Мядзельскага замка з манаграфіі М. А. Ткачова «Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст.», 1978 г. (1); схематычны план Мядзельскага замка са справаздачы аб раскопках М. А. Ткачова ў 1981 г. (2): А — месца раскопак на замкавай пляцоўцы.

*жыня палаца канчаткова не вызначана <...> Пляцоўка М.з. абведзена традыцыйным для сярэдневяковай Беларусі мурам з валуноў на вапне. Ніжняя зона падмурка складзена на гліне, самы ніжні рад камянёў — на дубовых плахах. З усіх бакоў поля таўшч. замкавых муроў 2 м, з інш. бакоў прыкрытых возерам — 1,5–1,7 м. Асноўны ўпор у абароне замка*




Мал. 5. План-схема Мядзельскага замка Міх. М. Чарняўскага з артыкула М. А. Ткачова ў кнізе «Памяць. Мядзельскі раён», 1998.

*рабіўся на 5 мураваных паўкруглых бастэй, разлічаных, відаць, на размяшчэнне тут гармат для стральбы ўздоўж сцен. У паўд.-ўсх. куце замка выяўлены падмурак цыліндрычнай вежы дыям. 10 м і сцены двухметровай таўшчыні <...>»*. Гэты артыкул, таксама як і іншыя тэксты М. А. Ткачова, прысвечаныя Мядзельскаму замку, адрозніваецца блытанінай і ўтрымлівае пэўныя недакладнасці, якія ў далейшым неаднаразова паўтараліся ў працах іншых даследчыкаў.

Вялікую ўвагу вывучэнню Мядзельскага замка надаваў таксама Міх. М. Чарняўскі. У яго асабістым архіве захаваўся схематычны вокамерны план замка, год стварэння якога, на жаль, невядомы (не выключана, што ён быў зняты падчас раскопак М. А. Ткачова ў 1981 г. [12, с. 331, мал. 3а]). Верагодна, менавіта гэты план стаў падставай для плана-схемы Мядзельскага замка Міх. М. Чарняўскага, апублікаванага ў кнізе «Памяць. Мядзельскі раён» (мал. 5) [24, с. 74].

Нарэшце, найбольш дакладны з планаў, што існавалі да 2013 г., таксама зняты Міх. М. Чарняўскім і прыведзены ў справаздачы за 1997 г. (мал. 6), калі ім былі зроблены абследаванні і шурфоўка на розных




Мал. 6. План размяшчэння археалагічных помнікаў на паўвостраве возера Мястра Міх. М. Чарняўскага са справаздачы аб раскопках у 1997 г.

участках паўвострава, на якім размешчаны замак (акрамя самога замка [26, мал. 6]).

Апрача замка, культурны пласт эпохі Сярэднявечча і Ранняга Новага часу выяўлены на так званым «перадзамчы», размешчаным на паўночна-ўсходняй частцы паўвыспы. Помнік выяўлены Міх. М. Чарняўскім у 1979 г. Раскопкі на «перадзамчы» праводзіліся ў 1981 г. М. А. Ткачовым і ў 1985 г. Я. Г. Звяругам. Культурны пласт тут дасягае таўшчыні 0,4–0,6 м. На тэрыторыі помніка таксама выяўлены сляды неалітычнага паселішча [20, с. 5; 23, с. 450].

Акрамя М. А. Ткачова, да разгляду матэрыялаў раскопак Мядзельскага замка звярталіся І. М. Чарняўскі, Ю. А. Заяц, Ю. М. Бохан, А. М. Кушнярэвіч. І. М. Чарняўскі, разглядаючы развіццё палацава-паркавых комплексаў XV–XVII стст. на тэрыторыі Беларусі, выклаў сваё бачанне гісторыі пабудовы Мядзельскага замка. У апісанні замкавых умацаванняў І. М. Чарняўскі арыентуецца на выніку даследаванняў М. А. Ткачова. Ён таксама датуе пабудову замка XV ст. На думку даследчыка, замкавы пагорак быў абнесены мураванай сцяной з вежамі. У XVI ст. у яго

ўсходняй частцы пабудаваны мураваны палац. Пры гэтым І. М. Чарняўскі лічыць, што Мядзельскі замак вызначаўся развітай сістэмай абарончых збудаванняў і адначасова падвышэннем ролі будынкаў грамадзянскага характару. Гэта дазволіла даследчыку аднесці Мядзельскі замак разам са Старым замкам у Гродна да тыпу «канвентхаўзаў» («канвенцкіх дамоў») [25, с. 66–67].

Ю. А. Заяц у сваім нарысе, прысвечаным познесярэднявечным беларускім замкам, арыентаваўся, у першую чаргу, на тэкст манаграфіі М. А. Ткачова 1978 г. (напісаны да пачатку раскопак помніка) [19, с. 95–97] і артыкул з энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі» 1993 г. [22], а таксама, у меншай ступені, на тэкст справаздачы М. А. Ткачова аб раскопках 1981 г. [20, с. 2–4]. Ён лічыў, што Мядзельскі замак меў складаную будаўнічую гісторыю. Паводле меркавання даследчыка, у XV ст. у ім спалучаліся драўляныя і мураваныя (магутная вежа) умацаванні, а ў XVI ст. замак стаў цалкам мураваным, прычым прыбудаваны да галоўнай вежы палац уключаны ў лінію абарончых сцен. Грунтуючыся на выяве замка на мапе Томаша Макоўскага 1613 г. (мал. 7), ён меркаваў, што ў замку налічвалася тры мураваныя вежы, галоўная з якіх мела дыяметр 17,5 м, другая размешчана на паўднёва-ўсходнім схіле дыяметрам 10 м. Аб месцазнаходжанні трэцяй вежы аўтар не піша. У XVI ст. замак быў дадаткова ўзмоцнены бастэямі. Разбурэнне замка Ю. А. Заяц услед за М. А. Ткачовым адносіў да часоў Паўночнай вайны [5, с. 70, 81].

Апісанне Мядзельскага замка, зробленае Ю. М. Боханам, фактычна паўтарае тэкст Ю. А. Заяца. Ю. М. Бохан лічыць, што мураваныя ўмацаванні замка былі ўзведзены ў XV ст. Таксама, як і Ю. А. Заяц, ён мяркуе, што ў замку было тры вежы, самая магутная з якіх магла мець пяць ярусаў і вышыню да 30 м і дамінавала ў структуры замкавых умацаванняў. У пачатку XVI ст. з захаду да яе прыбудаваны мураваны палац. Акрамя таго, замак умацаваны чатырма бастэямі, якія, на яго думку, мелі выгляд прысадзістых баштаў і прызначаліся для канцэнтрацыі агняпальнай зброі. На думку Ю. М. Бохана, менавіта гэтыя башты, ці бастэі з’яўляліся асновай замкавай абароны ў XVI–XVII стст. [2, с. 425].

А. М. Кушнярэвіч у сваім апісанні ўмацаванняў Мядзельскага замка спасылаецца на манаграфію М. А. Ткачова 1978 г. і працы Ю. А. Зайца і Ю. М. Бохана. На думку даследчыка, замак узнік у першай палове XV ст. [8, с. 222]. У XV ст. замак меў драўляныя і мураваныя ўмацаванні, а ў XVI ст. ён стаў цалкам мураваным. У пачатку XVI ст. з заходняга боку да вежы дыяметрам 17,5 м, якую А. М. Кушнярэвіч услед за М. А. Ткачовым [22] лічыць данжонам, прыбудаваны палац. Апрача таго, таксама як і Ю. А. Заяц, А. М. Кушнярэвіч мяркуе, што ў Мядзельскім замку існавала яшчэ дзве вежы — адна дыяметрам 10 м




Мал. 7. Мядзельскі замак на мапе Томаша Макоўскага 1613 г.

у паўднёва-ўсходнім куце, а другая, на яго думку, заставалася пакуль нелакалізаванай. Апрача гэтых вежаў, у XVI–XVII стст. замак быў узмоцнены чатырма баштамі, ці бастэямі [8, с. 122]. Найбольш істотным у апісанні Мядзельскага замка А. М. Кушнярэвіча з'яўляецца тое, што ён адносіць гэты помнік да ліку вышгарадаў — асобнага, вылучанага ім тыпу абарончых дынастычных і сеньярыяльных фартэцый, якія звычайна размяшчаліся на высокіх цяжкадаступных пагорках і займалі тэрыторыю былых дзядзінцаў гарадоў старажытнарускага часу. У якасці асноўнай прыкметы ўмацаванняў дадзенага тыпу даследчык вылучае тое, што яны мелі ў плане няправільную канфігурацыю, якая складалася пад уплывам рэльефу мясцовасці [8, с. 106].

Усе пералічаныя працы дэманструюць некрытычнае стаўленне даследчыкаў да матэрыялаў раскопак М. А. Ткачова і «сляпое» перайманне яго высноў, прычым пераважна першапачатковых, якія былі зроблены да пачатку раскопак замка і якіх сам М. А. Ткачоў у далейшым, мяркуючы па тэксце справаздачы аб раскопках 1981 г., ужо не прытрымліваў-

ся [20, с. 2–4]. Варта заўважыць, што ўсе аўтары, акрамя І. М. Чарняўскага, не праводзілі ўласнага натурнага абследавання помніка і цалкам абапіраліся на даныя М. А. Ткачова.

Падсумоўваючы гісторыю археалагічнага вывучэння Мядзельскага замка, можам адзначыць, што ў выніку дастаткова значных па аб'ёмах раскопак М. А. Ткачова 1981 г. было вызначана, што Мядзельскі замак з'яўляецца помнікам археалогіі эпохі позняга Сярэднявечча — Новага часу (XV–XVII (пачатку XVIII (?)) ст.). Разам з тым стан справаздачнай дакументацыі і наяўных калекцый [11] да нядаўняга часу не дазваляў сказаць аб Мядзельскім замку штосьці больш пэўнае, апрача таго, што найбольш старажытным яго збудаваннем з'яўлялася магутная круглая вежа, размешчаная на паўночна-ўсходнім ускрайку замкавага пагорка. Праз пэўны час з паўночна-заходняга боку ўшчыльную да вежы было прыбудавана яшчэ адно мураванае збудаванне.

У той жа час недакладнасці, якія ўтрымліваюцца ў сціслых тэкстах М. А. Ткачова, прысвечаных Мядзельскаму замку, неаднаразова паўтараліся наступнымі даследчыкамі абарончай фартыфікацыі і такім шляхам атрымалі шырокае распаўсюджанне ў літаратуры і фактычна сталі агульнапрынятымі, стварыўшы трывалы вобраз Мядзельскага замка як магутнай мураванай фартэцыі.

***Археалагічныя даследаванні Мядзельскага замка ў 2013–2014 гг.*** Новы этап археалагічнага вывучэння Мядзельскага замка распачаты ў 2013–2014 гг. экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. А. Плавінскага [12]. У выніку быў зняты інструментальны план замка і ўскрыта агульная плошча памерам 92 кв.м (працы праводзіліся пераважна ў паўночна-ўсходняй і ўсходняй частках замкавага пагорка (мал. 3)). Асноўныя высновы даследаванняў 2013–2014 гг. зводзяцца да наступнага [12].

Раскопкі 2013–2014 гг. пацвердзілі інфармацыю М. А. Ткачова аб тым, што культурны пласт на пляцоўцы замкавага пагорка мае адносна невялікую магутнасць — 0,25–0,3 м на вяршыні і паступова павялічваецца да яго краёў. Культурны пласт на пляцоўцы цалкам перамяшаны шматразовым разворваннем.

У 2014 г. ва ўсходняй частцы Раскопа II быў паўторна раскрыты ўчастак муру замкавай вежы, складзены з валуноў і цэглы-пальчаткі на вапнавай рошчыне, што дазволіла звязаць гэты аб'ект з інструментальным планам замка (мал. 3).

---

[11] Захоўваюцца ў Мядзельскім музеі народнай славы.

[12] Улічваючы той факт, што раскопкі Мядзельскага замка працягваюцца ў 2015 г., выкладзеныя тут меркаванні аб храналогіі і стратыграфіі помніка пакуль носяць папярэдні характар.

Росквіт Мядзельскі замак перажыў у першай палове XVI ст., найбольш верагодна ў першых яго дзесяцігоддзях. Гэтым часам датуецца заглыбленая ў зямлю жылая пабудова, якая выяўлена і часткова даследавана ў Раскопе I (на вяршыні замкавага пагорка). Да гэтага ж часу належаць і шматлікія фрагменты кафлі, выяўленыя ў Шурфе II, закладзеным у паўночна-ўсходняй частцы замкавага пагорка. Кафля з Шурфа II знаходзіць сабе самыя блізкія аналогіі сярод знаходак у пласце першай паловы XVI ст. на вуліцы Santakos 14 у Коўне [48, 6:1 pav.], у слаях сярэдзіны — трэцяй чвэрці XVI ст. на вуліцы Stiklių 16 у старым горадзе Вільні [47, p. 392, 21 pav.], а таксама ў матэрыялах другой чвэрці XVI ст. з раскопак Віленскіх замкаў [46, p. 207]. Паводле меркавання І. У. Ганецкай, знаходкі кафлі з Шурфа II могуць быць супольна датаваныя 20–30-мі гг. XVI ст. [13]. Адпаведна можна меркаваць, што актыўная будаўнічая дзейнасць на пляцоўцы Мядзельскага замка адбывалася ад пачатку да 20–30-х гг. XVI ст. Верагодна, менавіта ў гэты час пабудаваны мураваны «палац», абсталяваны печамі, кафля з якіх мела найбліжэйшыя аналогіі ў матэрыялах раскопак Вільні.

У Шурфе II выяўлены дзве праслойкі будаўнічага смецця (бітай цэглы, вапнавай рошчыны і фрагментаў кафлі), якія ўтварыліся ў выніку выраўноўвання пляцоўкі замкавага пагорка пасля нейкіх катастрафічных падзей, якія адбыліся ў XVI ст. У абедзвюх праслойках будаўнічага смецця знойдзены фрагменты кафлі адных і тых жа тыпаў першай паловы XVI ст. (найбольш верагодна 20–30-х гг. гэтага стагоддзя). Праслойкі будаўнічага смецця ў Шурфе II, напэўна, адпавядаюць дзвюм попельна-вугальным праслойкам, выяўленым М. А. Ткачовым у прылеглым да вежы профілі раскопу 1981 г. Варта адзначыць, што М. А. Ткачоў датаваў ніжнюю праслойку часам да 1535 г., бо менавіта ў гэтым годзе была адчаканена манета, знойдзеная ў пласце, які яе перакрываў [20, с. 2, мал. 5а–5б].

Адным з галоўных вынікаў раскопак 2013–2014 гг. стала ўдакладненне нашых уяўленняў аб характары ўмацаванняў замкавага пагорка. Разведачныя даследаванні на яго паўднёва-ўсходнім (Шурф I) і паўночна-ўсходнім (Шурф II) схілах выявілі адсутнасць тут мураваных умацаванняў (мал. 3). Аналіз стратыграфіі Шурфа II дазваляе наступным чынам рэканструяваць будаўнічую актыўнасць у паўночна-ўсходняй частцы замкавага пагорка: першапачаткова ён быў падрэзаны. У XVI ст., верагодна, у яго сярэдзіне, у замку адбываліся нейкія катастрафічныя падзеі, якія прывялі да разбурэння мураванага будынка ці будынкаў з кафлянымі печамі 20–30-х гг. XVI ст. Пасля гэтага на пля-

---

[13] Аўтары выказваюць шчырую падзяку І. У. Ганецкай за ласкавую дапамогу ў атрыбуцыі і датаванні знаходак кафлі з раскопак Мядзельскага замка.

цоўцы замка, верагодна, адбываліся працы па перапланіроўцы, у выніку чаго будаўнічае смецце скідалася на ўскраек пагорка. Такім чынам, павялічвалася плошча замкавай пляцоўкі. Пасля гэтага схіл абмазваўся глінай, якая з мэтай павышэння трываласці абпальвалася, а па краі замкавай пляцоўкі ўсталёўваўся драўляны тын ці вастракол з укапанага вертыкальна бярвення. Унізе ён быў умацаваны камянямі [14]. Праз нейкі час, верагодна, адбываецца яшчэ адна катастрофа (яшчэ адно разбурэнне замка?), пасля чаго ўтвараецца верхняя праслойка будаўнічага смецця, якая перакрывае і каменную кладку ў падмурку тыну і гліняную абмазку схілу пагорка. Зыходзячы з таго, што ў абедзвюх праслойках будаўнічага смецця выяўлены фрагменты кафлі адных і тых жа тыпаў, можна выказаць дзве аднолькава магчымыя версіі рэканструкцыі фарміравання культурных адкладаў у паўночнай частцы Шурфа II: 1) абедзве катастрофы на замкавым пагорку (пасля першай з якіх адбылася перапланіроўка і ўсталяванне па яго краі тыну, умацаванага камянямі) здарыліся за адносна кароткі перыяд часу — у межах некалькіх дзесяцігоддзяў — паўстагоддзя, адпаведна — недзе ў сярэдзіне — другой палове XVI ст.; 2) верхняя праслойка будаўнічага смецця ўтварылася ў выніку заняпаду замка, разбурэння нейкіх збудаванняў і магчымых прац па разраўнаванні тэрыторыі замкавага пагорка (у прыватнасці, у яго паўночна-ўсходняй частцы).

Такім чынам, матэрыялы археалагічных раскопак на сённяшнім этапе даследаванняў дазваляюць меркаваць, што на першым этапе замкавы пагорак быў эскарпаваны, а ў яго ўсходняй частцы пабудавана магутная мураваная вежа. У першых дзесяцігоддзях XVI ст. з паўночна-заходняга боку да вежы прыбудаваны мураваны «палац». Дакладных звестак аб тым, як выглядалі ў гэты час умацаванні Мядзельскага замка, пакуль няма, аднак відавочна, што суцэльнага пасу мураваных умацаванняў па перыметры замкавага пагорка не існавала. Прыкладна ў сярэдзіне XVI ст. на замкавай пляцоўцы адбываліся пэўныя драматычныя падзеі, якія прывялі да разбурэння мураванага будынка ці будынкаў з кафлянымі печамі 20–30-х гг. XVI ст. Пасля гэтага праводзяцца працы па перапланіроўцы замкавага пагорка, яго схіл абмазваецца абпаленай глінай, на якой усталёўваецца драўляны тын, умацаваны ўнізе камянямі. Праз некаторы час пасля гэтага замак зазнаў яшчэ адно разбурэнне ці прыйшоў у заняпад, пасля чаго яго ўмацаванні ўжо не аднаўляліся. Актыўная будаўнічая дзейнасць на тэрыторыі замкавага пагорка (у прыватнасці, ў яго паўночна-ўсходняй частцы) у XVII–XVIII стст. на дадзеным этапе археалагічных даследаванняў пакуль не прасочваецца, хаця, мяркуючы

---

[14] Мяркуючы па фотаздымку са справаздачы, аналагічная каменная кладка на краі замкавай пляцоўкі была выяўлена М. А. Ткачовым і ў раскопках 1981 г. [20, мал. 3].

па наяўных матэрыялах, гаспадарчая дзейнасць на пляцоўцы замка працягвалася і ў XVII ст.

Варта таксама асобна спыніцца на пытанні аб існаванні на пляцоўцы Мядзельскага замка другой мураванай вежы дыяметрам 10 м. Інфармацыю пра яе ўпершыню прыводзіць М. А. Ткачоў у сваёй манаграфіі 1978 г. [19, с. 96] і паўтарае ў энцыклапедычным артыкуле 1993 г. [22, с. 450]. Паводле яго, вежа размяшчалася ў паўднёва-ўсходнім куце замка. Яна пазначана таксама на схематычным плане замка, апублікаваным у 1978 г. (мал. 4: 1) [19, мал. 57]. Улічваючы, што план памылкова арыентаваны па баках свету, на самой справе гэтая вежа размешчана на паўднёва-заходнім схіле замкавага пагорка. У справаздачы аб раскопках 1981 г. яна не згадваецца [20, с. 2–4]. На жаль, застаецца толькі меркаваць, ці М. А. Ткачоў змяніў сваё меркаванне наконт існавання ў Мядзельскім замку другой мураванай вежы, ці проста не палічыў вартым апісаць яе ў тэксце справаздачы, бо раскопкі ў гэтым месцы не праводзіліся. У той жа час усе паслядоўнікі М. А. Ткачова механічна паўтарылі ў сваіх працах звесткі пра другую замкавую вежу, размешчаную на паўднёва-ўсходнім схіле замкавага пагорка, што, відавочна, стала вынікам іх некрытычнага стаўлення да апісання Мядзельскага замка, зробленага М. А. Ткачовым [5, с. 81; 8, с. 122; 25, с. 66–67]. Разам з тым нельга выключаць, што другая мураваная вежа ў Мядзельскім замку ўсё ж сапраўды існавала і размяшчалася менавіта на паўднёва-заходнім схіле замкавага пагорка, дзе яе першапачаткова і размясціў М. А. Ткачоў, хаця і памыліўся з вызначэннем бакоў свету, у выніку чаго ў яго апісанні яна апынулася на паўднёва-ўсходнім схіле. Аб магчымасці яе існавання сведчыць аналіз плана, знятага ў 2013 г. (мал. 3): на паўднёва-ўсходнім схіле замкавага пагорка вылучаецца пляцоўка акруглай формы дыяметрам каля 13 м, якая можа адпавядаць падмурку круглай у плане вежы. Аднак пацвердзіць ці адхіліць яе існаванне магчыма толькі шляхам новых археалагічных даследаванняў.

***Мядзельскі замак у святле пісьмовых крыніц***. У выніку апрацоўкі значнай колькасці пісьмовых крыніц, якія ўтрымлівалі звесткі пра Мядзел, М. Ф. Спірыдонаў прыйшоў да высновы, што замак быў узведзены пры Саковічах ці Радзівілах. У прыватнасці, ён лічыў, што Мікалай Радзівіл мог атрымаць тытул князя на Мядзеле з рук імператара Святой Рымскай імперыі толькі пры ўмове наяўнасці ў паселішчы замка [17, с. 69, 72]. На нашу думку, дадзенае сцвярджэнне з’яўляецца неабгрунтаваным. Цяжка сказаць нешта пэўнае аб узаемасувязі паміж наяўнасцю рэпрэзентатыўнай рэзідэнцыі ў магната і магчымасцю атрымання тытула з рук імператара. Іншая справа, што само атрыманне тытула на пэўным маёнтку сведчыла пра яго значэнне для гаспадара ў

доўгатэрміновай перспектыве. Менавіта гэта вымушала ўласніка клапаціцца пра перабудову мясцовай рэзідэнцыі. Да таго ж імкненне Мікалая Радзівіла атрымаць тытул з рук імператара сведчыць аб яго арыентаванасці на імперыю, культурны і палітычны ўплыў якой стаў адной з найважнейшых перадумоў росквіту будаўніцтва прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый у ВКЛ [16, с. 63].

Адзіным вядомым на сёння дакументам, у якім маюцца звесткі аб будаўніцтве замка ў Мядзеле, з'яўляецца прыведзены вышэй дэкрэт 1744 г. У ім пішацца, што «наступнікі Саковічаў (*Sukcessores Sakowiczowscy*) <…> замак узвялі і касцёл па спаленні на іншае месца перанеслі» [40, l. 38]. Арыентуючыся на інфармацыю пра перанос касцёла, можна меркаваць, што ў сярэдзіне XVIII ст. будаўніцтва замка адносілі да першай паловы XVI ст. і звязвалі са спадчыннікамі Багдана Саковіча. Іншыя крыніцы пацвярджаюць слушнасць гэтага меркавання. У прывілеі 1484 г. упамінаецца «двор Мядзел» (*curia alias dworzysko Miadelo*), г.зн. у гэты час замка яшчэ не існавала. Упершыню пра Мядзельскі замак паведамляецца ў 1544 г., калі пасля смерці Альжбеты Радзівіл яе спадчыннікі дамовіліся замак «супольна трымаць» [37, l. 60–64].

Хаця ў пісьмовых крыніцах адсутнічае інфармацыя аб тым, хто дакладна распачаў узвядзенне мураванага замка, пэўныя высновы можна зрабіць на падставе аналізу яго архітэктуры. Галоўным архітэктанічным элементам умацаванай рэзідэнцыі з'яўлялася вялікая вежа, знешні дыяметр якой дасягае 17,5 м. Такога кшталту збудаванне для першай чвэрці XVI ст. ужо было надзвычай архаічным. У гэты час магнаты будавалі рэзідэнцыі іншага кшталту. Напрыклад, у Геранёнах, Іказні і Міры ў першай чвэрці XVI ст. узводзяцца мураваныя замкі з унутраным дзядзінцам правільнай канфігурацыі, абкружаным мураванымі сценамі з палацам і нарожнымі вежамі. Таму, на нашу думку, узвядзенне замка на паўвостраве возера Мястра распачаў яшчэ Багдан Саковіч, а яго вежа стала адным з найбольш ранніх элементаў рэзідэнцыі. Разам з тым закончыць будаўніцтва вежы, а таксама працягнуць перабудову замка мог Мікалай Радзівіл, для якога мядзельская латыфундыя, як пісалася вышэй, мела вялікае значэнне. Галоўнай мядзельская рэзідэнцыя заставалася і для Альжбеты Радзівіл, якая валодала гэтымі землямі больш за два дзесяцігоддзі пасля смерці мужа ў 1521 г. У прыватнасці вядома, што ў 1542 г. у яе ў Мядзеле гасцяваў яе сын Ян Мікалаевіч Радзівіл [36, p. 273]. Такім чынам, на нашу думку, Багдан Саковіч, яго дачка Альжбета і зяць Мікалай Радзівіл былі ў найбольшай ступені зацікаўлены ў перабудове Мядзельскага замка і мелі для гэтага магчымасці.

Сітуацыя змянілася пасля смерці Альжбеты Радзівіл. Паколькі ўсе яе сыны заўчасна памерлі, мядзельская латыфундыя была падзелена на

чатыры часткі паміж нашчадкамі жаночага полу. Замак паводле ўмоў падзелу павінен быў знаходзіцца ў сумесным валоданні. Гэта фактычна значыла, што ніводзін са спадчыннікаў не мог выкарыстоўваць яго ў якасці рэзідэнцыі. Таму новыя ўласнікі, верагодна, не мелі вялікага інтарэсу да гэтай часткі спадчыны Саковічаў-Радзівілаў, і ў хуткім часе пасля згаданага падзелу замак ці праз выкуп, ці праз падараванне трапіў у распараджэнне караля. Адмова ад валодання замкам з боку яго спадчыннікаў магла таксама вынікаць з таго факта, што доступ да яго фактычна быў закрыты пасля пераходу Новага Мядзела ў валоданне караля ў другой чвэрці – сярэдзіне XVI ст. Па ўсёй верагоднасці, гэта парушыла сувязь рэзідэнцыі з навакольнымі землямі і стварыла пэўныя складанасці з яе выкарыстаннем і забеспячэннем. З іншага боку, наяўнасць моцнага замка стала добрым стымулам для далейшага развіцця каралеўскага Мядзела. Таму кароль як уласнік мястэчка праявіў зацікаўленасць у набыцці замка. Магчыма, галоўным натхняльнікам актыўнай зямельнай палітыкі дзяржавы на Мядзельшчыне з'яўлялася каралева Бона, якая і зрабіла неабходныя захады, каб здабыць замак. Аб значнай ролі каралевы ў развіцці Мядзела можа сведчыць і паданне аб тым, што менавіта Бона пабудавала замак [15, с. 236]. Аднак ці будавала тут нешта каралева застаецца невядомым.

Адной з галоўных функцый Мядзельскага замка з пераходам яго ва ўласнасць караля стала абарона мяшчан каралеўскага мястэчка ў выпадку ваеннай небяспекі. Гэта мусіла стымуляваць дэмаграфічны рост паселішча і адпаведна яго эканамічны росквіт. Гарадскія ўмацаванні, якія меліся ў Мядзеле, былі разлічаны на супрацьстаянне адносна слабаму непрыяцелю, а ў выпадку нападу моцнага ворага адзінай надзеяй мяшчан станавіўся замак. Аб ролі замкаў для абароны жыхароў прылеглых паселішчаў сведчаць прыклады Іказні і Друі. У 1628 г. іказенскі ўраднік пісаў, што «ў час небяспекі іншы не шукаў чоўна, а ўплаў уцякаў у тыл мураванага замка», які знаходзіўся на востраве пасярод аднайменнага возера [38, l. 9]. У тым жа годзе мяшчане Друі звярталіся да ўласніка з просьбай забяспечыць Друйскі замак, дзе яны б маглі схавацца ў выпадку небяспекі [39, l. 29].

У распараджэнне караля Мядзельскі замак перайшоў прыблізна ў другой палове 1540-х гг. У прыватнасці, у апісанні мядзельскай каралеўскай воласці 1545 г. аб ім яшчэ не вялася гаворка, а ў 1550 г. гаспадар вызваліў мяшчан ад неабходнасці даглядаць мост, што ішоў да замка, які на той час мусіў ужо яму належаць [3, с. 75–85; 15, с. 21–22]. Магчыма, неўзабаве пасля гэтага пад кіраўніцтвам каралеўскіх намеснікаў пачаліся нейкія працы, скіраваныя на павелічэнне яго абарончага патэнцыялу. Вядома, што ў 1562 г. у Мядзельскі замак з галоўнага арсенала ВКЛ у Вільні выслалі 4 гарматы, што сведчыць аб імкненні гаспадара ўмаца-

ваць замак [45, s. 113]. Працы па мадэрнізацыі фартыфікацый, напэўна, працягваліся і ў другой палове XVI – першай палове XVII ст., калі замак захоўваў свой абарончы патэнцыял. Верагодна, менавіта ў гэты час перад замкам быў насыпаны дадатковы земляны вал, які ўзмацніў яго абарону.

Вайна Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 гг. паказала, што такія невялікія ўмацаванні, як Мядзельскі замак, ужо не здольны выконваць ускладзеныя на іх функцыі. У час вайны ён, верагодна, быў спалены і больш як абарончае ўмацаванне не аднаўляўся. На нашу думку, меркаванне М. А. Ткачова аб тым, што замак быў разбураны ў час Паўночнай вайны 1700–1721 гг. не абгрунтавана [19, с. 97]. Па ўсёй верагоднасці, у гэты час замак у якасці абарончага ўмацавання ўжо не выкарыстоўваўся.

Аб лёсе Мядзельскага замка ў першай палове XVIII ст. цікавыя звесткі змяшчаюцца ў дэкрэце 1744 г. Само стварэнне дакумента звязана з вострым канфліктам паміж уласнікам Старога Мядзела А. Кошчыцам і мядзельскім старастам Ю. Брастоўскім. Імкнучыся павялічыць прыбытковасць сваіх маёнткаў, А. Кошчыц у 1736 г. дамогся ў караля прывілея на заснаванне ў Старым Мядзеле мястэчка, што прама супярэчыла ўставе, дадзенай Мядзелу ў 1562 г., і пагражала эканамічным інтарэсам каралеўскага мястэчка [15]. Апрача таго, уласнік Старога Мядзела распачаў адкрытую рэвізію старых межаў яго маёнтка з землямі староства. Разам з тым ён звярнуў увагу на замак, які кантраляваў доступ да возера Мястра з усходу і пяць тоняў на ім. 31 сакавіка 1735 г. замак быў спалены па загаду цівуна Старога Мядзела. Што канкрэтна было знішчана невядома. Аднак згадка ў тым жа дэкрэце 1744 г. аб арандаванні замкавай зямлі падданымі Старога Мядзела сведчыць аб знаходжанні там нейкіх малазначных гаспадарчых пабудоў [40, l. 34, 45]. Пасля гэтага тэрыторыя замка, верагодна, была закінута цалкам. У прыватнасці ў дакуменце 1744 г. напісана: «востраў пусты, на якім перад тым быў замак» [37, l. 104].

Такім чынам, Мядзельскі замак з’яўляецца цікавым прыкладам прыватнаўласніцкай рэзідэнцыі, якая, нягледзячы на высілкі некалькіх пакаленняў уладальнікаў, так і не ператварылася ў паўнавартасны цэнтр магнацкай латыфундыі. Галоўнай прычынай гэтага стала выміранне найперш роду Саковічаў, а затым галіны роду Радзівілаў, што валодала Мядзелам. Узвядзенне Мядзельскага замка, па ўсёй верагоднасці, пачалося яшчэ ў канцы XV ст., а перыяд яго непрацяглага росквіту прыпаў

---

[15] У сувязі з заснаваннем слабады ў Старым Мядзеле ўзнікла пэўная блытаніна ў гістарычных працах і геаграфічных картах, якое з іх называць Старым, а якое Новым [15, с. 233].

на першую палову XVI ст. Ён выявіўся ў актыўнай будаўнічай дзейнасці: пабудове мураванага «палаца», абсталяванні жылых будынкаў печамі, складзенымі з кафлі, якая знаходзіць самыя блізкія аналогіі ў матэрыялах раскопак Вільні. У далейшым з пераходам ва ўласнасць каралеўскага скарбу замак як жыллёвы і рэпрэзентатыўны комплекс паступова прыйшоў у заняпад. Яго асноўнай функцыяй у другой палове XVI – першай палове XVII ст. стала забеспячэнне абароны для жыхароў мястэчка Мядзела, якое развівалася побач з замкам. Як умацаванне Мядзельскі замак спыніў сваё існаванне, найбольш верагодна, у час вайны 1654–1667 гг., а яго тэрыторыя ў далейшым стала выкарыстоўвацца для гаспадарчых патрэб.

Напрыканцы варта адзначыць, што праведзены паралельны аналіз пісьмовых і археалагічных крыніц выяўляе ўсю складанасць працэсу вывучэння познесярэднявечных фартыфікацыйных помнікаў. Калі падыходзіць да аналізу наяўных даных са строгіх крыніцазнаўчых пазіцый, становіцца відавочным, што яны далёка не заўжды могуць быць карэктна суаднесены паміж сабой. Да пэўнай ступені гэта тлумачыцца з аднаго боку фрагментарнасцю і складанасцю інтэрпрэтацыі наяўных пісьмовых звестак па гісторыі Мядзельскага замка, а з другога дастаткова абмежаваным аб'ёмам археалагічных раскопак, праведзеных на яго тэрыторыі. Разам з тым адзначаныя абмежаванні ў суаднясенні гэтых двух падыходаў, відавочна, маюць і аб'ектыўны характар і заўжды павінны ўлічвацца даследчыкамі помнікаў познесярэднявечнага абарончага дойлідства.

## Крыніцы і літаратура

1. Алексеев, Л. В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. / Л. В. Алексеев. — М. : Наука, 1966. — 296 с. : ил.
2. Бохан, Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. / Ю. М. Бохан. — Мінск : Беларуская навука, 2008. — 449 с.: іл.
3. Документы московского архива Министерства юстиции. — Т. 1. — М. : Товарищество типографии А. И. Мамонтова, 1897. — 570 с.
4. Енуков, В. В. Ранние этапы формирования смоленско-полоцких кривичей (по археологическим материалам) / В. В. Енуков. — М., 1990. — 262 с. : ил.
5. Заяц, Ю. А. Замкі / Ю. А. Заяц // Археалогія Беларусі. — Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. — Мінск : Беларуская навука, 2001. — С. 66–84.
6. Звяруга, Я. Г. Мядзел «каронны» (пазней — Новы) паводле «Апісання 1778 года» / Я. Г. Звяруга // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Вып. 23. — 2007. — С. 45–59.

7. Звяруга, Я. Г. З гісторыі Старога і Новага Мядзелаў — мястэчак Ашмянскага павета Віленскага ваяводства / Я. Г. Звяруга // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Вып. 24. — 2008. — С. 47–51.
8. Кушнярэвіч, А. М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч. — Мінск : Беларуская навука, 2011. — 234 с. : іл.
9. Інвентар Мядзельскага староства 13 верасня 1668 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 1928. — Воп. 1.— Спр. 1. — Арк. 163–170 адв.
10. Пашуто, В. Т. Образование литовского государства / В. Т. Пашуто. — М. : АН СССР, 1959. — 531 с.
11. Плавінскі, М. А. Полацка-смаленскіх доўгіх курганоў культура / М. А. Плавінскі // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. — Т. 2. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2011. — С. 202–203.
12. Плавінскі, М. А. Раскопкі Мядзельскага замка ў 2013 годзе / М. А. Плавінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — Вып. 26. — Мінск, 2015. — С. 331–340.
13. Покровский, Ф. В. Археологическая карта Виленской губернии / Ф. В. Покровский. — Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1893. — 164 с.
14. Пятраўскас, Р. Літоўская знаць у канцы XIV–XV ст. : Склад — структура — улада / Р. Пятраўскас. — Смаленск: Інбелкульт, 2014. — 386 с.
15. Сапунов, А. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / А. Сапунов, В. Друцкий-Любецкий. — Витебск: Губернская типолитография, 1896. — 486 с.
16. Скеп'ян, Н. Пачаткі будаўніцтва прыватнаўласніцкіх мураваных замкаў у Вялікім Княстве Літоўскім / Н. Скеп'ян // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) : зборнік навуковых прац / Пад рэд. А. М. Янушкевіча. — Мінск : «Медысонт», 2014. — С. 54–63.
17. Спірыдонаў, М. Ф. Тры Мядзелы / М. Ф. Спірыдонаў // Памяць. Мядзельскі раён. — Мінск : Беларуска энцыклапедыя, 1998. — С. 68–73.
18. Ткачоў, М. А. Справаздача аб палявых даследаваннях 1970 г. / М. А. Ткачоў. — Гродна, 1970. — Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. — Спр. № 377.
19. Ткачоў, М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. / М. А. Ткачоў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1978. — 144 с. : іл.
20. Ткачоў, М. А. Справаздача аб палявых даследаваннях за 1981 г. / М. А. Ткачоў. — Гродна, 1981. — Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. — Спр. № 778.
21. Ткачоў, М. А. Мядзел / М. А. Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мінск : БелЭн, 1993. — С. 449–450.
22. Ткачоў, М. А. Мядзельскі замак / М. А. Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мінск : БелЭн, 1993. — С. 450.
23. Ткачоў, М. А. Мядзельскае селішча / М. А. Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1993. — С. 450.

24. Ткачоў, М. А. Мядзельскі замак / М. А. Ткачоў // Памяць. Мядзельскі раён. — Мінск : Беларуска энцыклапедыя, 1998. — С. 73–75.
25. Чарняўскі, І. М. Развіццё палацава-замкавых комплексаў Беларусі ў канцы XV–XVII стст. / І. М. Чарняўскі // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі. Новыя матэрыялы і даследаванні. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — С. 66–73.
26. Чарняўскі, М. М. Археалагічныя вандроўкі па старадаўнім Мядзеле / М. М. Чарняўскі // Памяць. Мядзельскі раён. — Мінск : Беларуска энцыклапедыя, 1998. — С. 45–47.
27. Baliński, M., Lipiński, T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana. T. 4. Wielkie Księztwo Litewskie / M. Baliński, T. Lipiński. — Warszawa, 1886. — 876 s.
28. Chartularium Lithuaniae res gestas magni ducis Gedeminne illustrans. Gedimino laiškai / Par. S. C. Rowell. — Vilnius : Vaga, 2003. — 460 p.
29. Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej = Codex diplomaticus ecclesiae cathedralis necnon Dioeceseos Vilnensis. T. 1. (1387–1507). — Kraków, 1948. — 771 s.
30. Krzywicki, J. Miadzioł / J. Krzywicki // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 6 [Malczyce — Netreba]. — Warszawa, 1885. — S. 283–284.
31. Kurczewski, J. Biskupstwo wileńskie od jego założenia aż do dni obecnych, zawierające dzieje i prace biskupów i duchowieństwa djecezji wileńskiej, oraz wykaz kościołów, klasztorów, szkół i zakładów dobroczynnych i społecznych. / J. Kurczewski. — Wilno, 1912. — 614 s.
32. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 1 (1380–1584) : Užrašymų knyga1. — Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1998. — 207 p.
33. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 11 (1518–1523): Užrašymų knyga 11. — Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1997. — 227 p.
34. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 25 (1387–1546) : Užrašymų knyga 25. — Vilnius : Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1998. — 460 p.
35. Lietuvos Metrika.Knyga Nr. 225 (1528–1547) : 6-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabaigos kopija) — Vilnius : Vilniaus Universiteto leidykla, 1995. — 338 p.
36. LMAB (Lietuvos mokslų akademijos biblioteka). — F. 9. B. 3130.
37. LMAB. — F. 139. — B. 2148. — L. 9.
38. LMAB. — F. 139. — B. 4060. — L. 29.
39. Камісарскі дэкрэт у справе пісара ВКЛ мядзельскага старосты Юзафа Брастоўскага з ўладальнікам Старога Мядзела Антоніем Кошчыцам 20 чэрвеня 1744 г. // Lietuvos valstybės istorijos archyvas (далей — LVIA). — SA. — B. 15474. — L. 32–57v.
40. LVIA. — F. 525. — A. 2. — B. 676. — План мястэчка Мядзел. 1868. — L. 1.

41. LVIA. — F. 525. — A. 2. — B. 679. — План мястэчка Мядзел. б/д. (др. пал. XIX – пач. XX ст.) — L. 1.
42. LVIA. — F. 525. — A. 2. — B. 680. — План мястэчка Мядзел. б/д. (др. пал. XIX – пач. XX ст.) — L. 1.
43. LVIA. — F. 526. — A. 3. — B. 581. — План мястэчка Мядзел. б/д. (др. пал. XIX – пач. XX ст.) — L. 1.
44. Nowak, T. Z dziejów techniki wojennej w dawnej Polsce / T. Nowak. — Warszawa : Wydawn. Ministerstwa Obrony Narodowej, 1965. — 335 s.
45. Rackevičius, G. The 1990–2010 Excavations on the Grounds of the Castles in Vilnius / G. Rackevičius // Archaeological Investigations in Independent Lithuania 1990–2010. — Vilnius : BALTO, 2012. — P. 200–207.
46. Veževičienė, V. Bernardinų gatvė 6B / V. Veževičienė // Archeologiniai tyrinėjimai Lietuvoje 2013 metas. — Vilnius : BALTOprint, 2014. — P. 385–392.
47. Žalnieris, A. 2007. Tyrinėjimai Santakos g. 14 / A. Žalnieris, D. Balčiūnas // Archeologiniai tyrinėjimai Lietuvoje 2006 metas. — Vilnius : Akritas, 2007. — P. 296–317.

*Я. С. Глінскі*

## Родавая памяць ці звычайны падман? Венская бітва 1683 г. у справах аб доказе дваранства ў Мінскай губерні

У XIX ст. зварот да гісторыі, перш за ўсё найбольш яскравых і вызначальных падзей у ёй, стаў адным з істотных аспектаў фарміравання нацыянальнай ідэалогіі. Асабліва гэта тычылася гісторыі народаў, якія знаходзіліся пад іншаземнай уладай — для іх слаўнае мінулае было «ідэальным светам», процілегласцю ганебнага стану падпарадкавання ў сучаснасці. Нярэдка падзеі гісторыі, уплеценыя ў нацыянальны наратыў, былі тэндэнцыйна інтэрпрэтаваны ці свядома фальсіфікаваны [1].

Адной з найбольш значных падзей у гісторыі Рэчы Паспалітай абодвух народаў была перамога войска на чале з каралём польскім і вялікім князем літоўскім Янам III Сабескім над арміяй Асманскай імперыі ў бітве пад Венай у 1683 г., якая выратавала адзін з галоўных цэнтраў хрысціянскага Захаду ад мусульман. Гэтая перамога адлюстравалася як у асноўных гістарычных тэкстах, так і ў родавай памяці асобных шля-

[1] Разнастайныя аспекты сумнеўных інтэрпрэтацый мінуўшчыны ў гісторыяпісанні XIX ст. аналізуюцца ў найноўшай калектыўнай працы пра гістарычныя фальсіфікацыі ў Еўропе [23].

хецкіх родаў. Пры гэтым у апошняй яе акалічнасці амаль адразу маглі зазнаць своеасаблівую інтэрпрэтацыю. Так, у гербоўніку «Карона Польская» Каспера Нясецкага згадваўся Самуэль (Ян-Самуэль) Глагоўскі, «палкоўнік каралеўскі, удзельнік бітвы пад Венай у часы Яна III» [25, s. 147]. Аднак, як паказана ў сучаснай гістарыяграфіі, ён хоць і ўдзельнічаў у кампаніі 1683 г., але чыну палкоўніка не меў [28, s. 101].

У гэтым рэчышчы выклікаюць цікавасць шматлікія згадкі Венскай бітвы 1683 г. у вывадовых пратаколах Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу, якімі ў XIX ст., падчас «разбору шляхты», пацвярджалася дваранства прадстаўнікам вышэйшага стану Мінскай губерні [2]. Варта паставіць пытанне, ці апеляцыя да перамогі пад Венай выяўляла актуальную прысутнасць гэтай падзеі ў родавай памяці, яе вялікае значэнне для свядомасці як эліты, так і звычайнай шляхты Мінскай губерні ў першай палове XIX ст.

Пры адказе на гэтае пытанне неабходна вызначыць час і акалічнасці падання звестак пра ўдзел прадстаўнікоў родаў у Венскай бітве, а таксама наяўны сацыяльны статус тых, хто сцвярджаў, што іх продкі адзначыліся ў ёй. Гэта абумоўлена тым, што ў працэсе доказу дваранства часта падаваліся сфальсіфікаваныя звесткі (гэтая тэндэнцыя стала больш яскравай пасля паўстання 1830–1831 гг., калі ўзмацнілася расійская палітыка «разбору шляхты» [20, с. 10–12; 21, с. 145–150]). У сваю чаргу больш спрыяльныя ўмовы для «паляпшэння» ўласнага радаводу мелі прадстаўнікі заможнай шляхты, а таксама чыноўнікі і наогул людзі, звязаныя з бюракратычным апаратам.

Так, прадстаўнікі роду Багушэўскіх двойчы падавалі комплекс дакументаў для доказу дваранства (інакш кажучы, рабілі «вывад шляхецтва») — у 1808 і 1834 гг. [18, с. 84–85]. У першым з іх звестак пра ўдзел іх продкаў у Венскай бітве не маецца [9, арк. 14 адв.–15]. У 1834 г. дваранскі дэпутат ад Ігуменскага павета Антоні Багушэўскі, «улічваючы недастатковасць дакументаў на аддаленых продкаў», дапасаваў да схемы роду два пачатковыя калены, а першапродка Антонія назваў «маёрам у гвардыі каралеўскай, што пацвярджае сапраўдны прывілей Яна III за геройскія подзвігі 1683 года верасня 22 дня ў лагерах пад Стрыгоняй дадзены, а 1715 года сакавіка 20 дня ў Ашмянскім земскім судзе сынам яго шляхетным Тэадорам Багушэўскім, скарбнікам слонімскім, актыкава-

---

[2] Артыкул грунтуецца на матэрыялах Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу (НГАБ, ф. 319). Пры гэтым прааналізаваны толькі справы аб дваранстве, апрацаваныя падчас падрыхтоўкі першых чатырох тамоў «Гербоўніка беларускай шляхты». Адпаведна ўлічаны звесткі пра справы родаў на літары А–Г (лацінскія — A, B, G, H, большасць на O і W). Іх налічваецца каля 1000, што складае прыкладна чвэрць ад агульнай колькасці спраў аб дваранстве, што, на нашу думку, з'яўляецца рэпрэзентатыўнай выбаркай.

ны» [9, арк. 19–19 адв.]. Антоні Багушэўскі не фіксуецца з чынам маёра каралеўскай гвардыі [28, s. 9–46; 29, s. 12–43], што поруч са «з'яўленнем» яго ў якасці пачынальніка роду толькі ў 1834 г. дазваляе меркаваць, што, найбольш верагодна, гэтыя звесткі былі сфальсіфікаваны.

Падобны сюжэт назіраецца і ў выпадку роду Вайніловічаў з Мінскага павета [19, с. 33–34] (іх сувязь з уплывовым аднайменным родам, з якога паходзіў знакаміты фундатар касцёла Св. Сымона і Алены ў Мінску Эдвард Вайніловіч, не прасочваецца). Яны ў вывадзе ад 1832 г. спасылаліся на «рэскрыпт караля Яна III ад 13 кастрычніка 1683 года, які безумоўна пацвярджае, што Самуэль сын Яраша Вайніловіч быў спачатку маёрам, а пазней прызначаны каралём палкоўнікам войскаў польскіх» [11, арк. 7–7 адв.]. У першым вывадзе ад 1815 г. такой інфармацыі не было. Паказальна, што «дапаўненне» звестак у 1832 г. рабіў Міхал Янавіч Вайніловіч, які на той час быў чыноўнікам канцылярыі мінскага павятовага маршалка.

Часам спасылкі на ўдзел у Венскай бітве ўключаліся ў шырокі комплекс легендарных і сфальсіфікаваных звестак. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца справа шэрагу родаў Грабоўскіх. Адны з уладальнікаў прозвішча ў XVIII ст. атрымалі графскі тытул. Непасрэдна графы Грабоўскія падавалі даволі сціплую родавую легенду — у сваіх вывадах (ад 1798 і 1814 гг.) яны адно толькі аднеслі ўшанаванне тытулам у XV ст., калі графам нібыта стаў іх продак Гедэон Тапорчык [16, арк. 26]. Аднак у наступным да графскай лініі захацелі далучыцца іншыя Грабоўскія з Мазырскага і Барысаўскага паветаў. У сваім вывадзе ад 1832 г. яны сфальсіфікавалі гісторыю роду, дапоўніўшы яе ўяўнымі прадстаўнікамі да і пасля Гедэона. Напрыклад, у якасці бацькі пачынальніка роду (паводле ранніх вывадаў) Ежы-Яна названы са спасылкай на гербоўнік Шымана Акольскага Крыштаф-Рыгор, які загінуў на вайне з Маскоўскай дзяржавай у 1609 г. разам з братам Станіславам. Яны сапраўды згадваюцца ў Акольскага, але маюць прозвішча не Грабоўскія, а Ксенскія герба «Тапор» [27, p. 64]. Апрача таго, у вывадзе ад 1832 г. былі пададзены фальшывыя прывілеі на графскі тытул ад 5 жніўня 1572 г. Жыгімонта II Аўгуста і ад 4 жніўня 1653 г. Яна II Казіміра [16, арк. 48–50]. Прадстаўнікі наступных пакаленняў ушанаваны высокімі ўрадамі і чынамі, атрыманымі ў тым ліку за ўдзел у бітве пад Венай 1683 г. (а таксама ў бітве пад Алькенікамі ў 1700 г.). У гэтым выпадку можна нават гіпатэтычна вызначыць стваральніка родавай легенды барысаўскіх і мазырскіх Грабоўскіх у XIX ст. Так, адным з падпісантаў вывада ад 1832 г. быў Пётр Сымонавіч Грабоўскі. Ён спачатку з'яўляўся рэгентам Мазырскага межавага суда (1821–1827 гг.), затым прыняў сан, стаў генеральным пракуратарам і сакратаром Мінскай дыяцэзіі (1827 г.), быў вікарыем Мінскага кафедральнага касцёла (1829 г.), пробашчам ка-

сцёла ў мястэчку Петрыкаў Мазырскага павета (1832–1835 гг.). Пра яго актыўную ролю ў стварэнні радаводу сведчыць і той факт [16, арк. 36], што ён рабіў запыт у Віленскі дваранскі сход наконт прызнання ў дваранстве іншага роду Грабоўскіх — герба «Побаг». Цікава, што крыху раней (1827 г.) яшчэ адзін род з Мазырскага павета — Гняўчынскія — таксама падаваў маляўнічы і не надта верагодны радавод, у якім сустракаюцца матывы, падобныя да легенды Грабоўскіх [15, арк. 24–26]. Нібыта продак Гняўчынскіх Стэфан за ўдзел у бітве пад Венай атрымаў чын ротмістра гусарскай харугвы, а пасля смерці бацькі заняў яго ўрад стражніка перамышльскага. З 8 сыноў Стэфана тры (Ян, Канстанцін, Тамаш) загінулі ў бітве пад Венай, а іншыя тры (Якуб, Рыгор, Мікалай) — у бітве пад Алькенікамі. Бацьку перажылі два сыны — Юзаф і Адам, ад апошняга з якіх пайшлі наступныя пакаленні роду.

Гэтыя выпадкі паказваюць, што спасылкі на ўдзел продкаў у Венскай бітве неслі цалкам прагматычны характар і вынікалі з неабходнасці падмацаваць шляхецкае паходжанне. Яшчэ больш яскрава гэта праяўляецца ў справе дробнамаёмаснага роду Бакеяў з Бабруйскага павета. У 1838 г. яны не былі зацверджаны ў дваранстве Дэпартаментам Герольдыі Сената і з 1844 г. знаходзіліся ў складзе саслоўя аднадворцаў. Гэта прымусіла іх у прашэнні ад 1847 г. дадаць у радавод тры першыя пакаленні (інфармацыя некрытычна ўспрынята ў [18, с. 91–93]), прадстаўнік якіх Філіп Іванавіч атрымаў прывілей Яна III ад 10 лістапада 1683 г., якім нібыта ўзнагароджваўся чынам «маёра драгуніі войскаў ВКЛ» [8, арк. 16 адв., 81–81 адв.]. Такая, не самая трапная фальсіфікацыя дазваляе прасачыць яе крыніцы. Так, Філіп і яго бацька Ян (Іван) Бокіі (не Бакеі) жылі ў першай палове XVII ст. і згадваюцца ў гербоўніках Каспера Нясецкага [24, s. 217] і Войцеха-Вінцэнта Вялёндкі [31, s. 587]. Верагодна, на падставе звестак гербоўнікаў яны і былі ўпісаны ў радавод у 1847 г. Аднак паказальна, што яны перанесены ў іншы часавы перыяд і звязаны з падзеямі 1683 г., што, на нашу думку, было абумоўлена зручнасцю звароту да Венскай бітвы ў справе доказу дваранства.

Удзел продкаў у гэтай бітве як адзін з доказаў асабліва характэрны для спраў родаў, якія рабілі першы вывад у канцы 1820-х – 1830-я гг. У іх апеляцыя да Венскай бітвы часта ўводзілася ў генеалагічныя схемы, пазычаныя з гербоўнікаў часоў Рэчы Паспалітай. У 1830 г. магістр тэалогіі Цырылі Бабравіцкі спасылаўся на гербоўнік К. Нясецкага [6, арк. 2 адв.], адкуль узяў звесткі пра першапродка Стэфана, старасту прадборскага [24, s. 180], якія дапоўніў інфармацыяй пра сына апошняга — таксама Стэфана, які «1683 дня 18 верасня рэскрыптам Яна III, дадзеным у лагеры супраць туркаў, атрымаў званне ротмістра» (з такім чынам невядомы, у 1646–1649 гг. ротмістрам называецца Самуэль Бабраўніцкі [28, s. 24]).

Да інфармацыі гербоўнікаў звярнуліся і Чаховічы-Андраноўскія. З гербоўніка В.-В. Вялёндкі яны ўзялі інфармацыю пра паходжанне продкаў з Чэхіі (адсюль частка прозвішча) і атрыманне зямлі пад Кобрынам ад князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага [30, s. 291] (у сапраўднасці гэтыя звесткі меліся ўжо ў працах геральдыка сярэдзіны XVII ст. Альберта Віюка-Каяловіча [32, s. 279], а В.-В. Вялёндка запазычыў іх з «Кароны Польскай» К. Нясецкага [24, s. 30–31]). Аднак для зацвярджэння гэтага было недастаткова, таму ў 1833 г. імі быў пададзены «патэнт караля Яна III года 1683 кастрычніка 13 пад замкам Стрыгоняй над Дунаем дадзены, а 1689 лютага 9 у гродзе Ашмянскім актыкаваны, з якога даведваемся, што ў вайне з туркамі за адбіццё іх ад моста, з асаблівай ад караля пахвалой стаў Ян Казімір Андраноўскі з ротмістра маёрам, з забеспячэннем пасля вяртання на Радзіму адпаведнай узнагароды» [3, арк. 2 адв.].

Калі ў выпадку Чаховічаў-Андраноўскіх і ў меншай ступені Бабравіцкіх запазычанні з гербоўнікаў сапраўды датычыліся іх продкаў, то род Арцішэўскіх (у 1818 г. арандатары на землях Нясвіжскай ардынацыі [5, арк. 13]) сфарміраваў свой вывад значна больш складаным шляхам. У 1825 г. падчас першага падання дакументаў у Мінскі ДДС канцылярыст Мінскага земскага суда Якуб Сымонавіч Арцішэўскі ў якасці доказу выстаўляў копію прывілея Яна III ад 6 чэрвеня 1695 г., дадзенага ў Варшаве і актыкаванага ў Драгічынскім замку, на ўрад падчашага закрачымскага ротмістру гусарскай харугвы Антонію Арцішэўскаму, які вызначыўся падчас Венскай бітвы [5, арк. 106–106 адв.]. Вельмі сумнеўна, каб незаможны род з Міншчыны з'яўляўся сваяцкім прадстаўнікам лакальнай эліты Мазавецкага ваяводства. Больш за тое, фактычна 3–4-я пакаленні роду ў вывадзе ад 1825 г. сканструяваны на падставе звестак В.-В. Вялёндкі (некрытычна ўспрыняты ў [17, с. 292–293]). Так, Антоні, які нібыта ўдзельнічаў у Венскай бітве, і яго сыны з тымі ж пасадамі, якія пазначаны ў вывадзе, у В.-В. Вялёндкі запісаны ў мазавецкай галіне Арцішэўскіх [30, s. 303]. Можна меркаваць, што, як і ў двух папярэдніх выпадках, інфармацыя пра ўдзел у Венскай бітве была сфальсіфікавана з мэтай падмацавання доказаў дваранства.

Своеасаблівы прыклад выкарыстання дадзеных гербоўнікаў перыяду Рэчы Паспалітай даюць вывады Галіцкіх-Рожыцаў. Ужо ў першым з іх — ад 1801 г. — яны спасылаліся на радавод, наяўны ў працы Станіслава Дунчэўскага (1753 г.) [22, s. 189–196], і першыя пакаленні роду пададзены паводле яго, што ў гэтым выпадку выклікае пэўны давер. Аднак ужо ў прашэнні ад 1841 г. яны падалі звесткі пра новыя акалічнасці, якія таксама часткова абапіраліся на гербоўнік С. Дунчэўскага, але пераважна ўяўлялі сабой акты на займанне ўрадаў і атрыманне маёнткаў за ўдзел у вайсковых кампаніях [14, арк. 198–200]. Гэта было патрэбна, таму што, паводле ўказа Сената ад 1839 г., яны не былі зацверджаны

з прычыны адсутнасці доказаў валодання маёнткамі з сялянамі і перадачы іх у спадчыну [14, арк. 187]. Непасрэдна на Венскую бітву Галіцкія-Рожыцы не спасылаліся, але апелявалі да больш ранніх вайсковых дзеянняў — бітваў пад Смаленскам (1633 г.) і Ачакавам (1646 г.).

Іншыя вывады канца 1820–1830-х гг., у якіх фігуруюць патэнты і прывілеі, атрыманыя продкамі шляхты Мінскай губерні нібыта за ўдзел у бітве з туркамі ў 1683 г., таксама не выклікаюць даверу і не знаходзяць пацвярджэння ў крыніцах [28; 29]. У 1829 г. Дварэцкія-Багдановічы выстаўлялі прывілей Яна III ротмістру харугвы польнай стражы літоўскіх войскаў Гальяшу на ўрад крайчага аршанскага (нібыта актыкаваны 6 кастрычніка 1689 г. у ГТ ВКЛ) [7, арк. 14–15 адв.], у якім сцвярджалася, што ён «у годзе тысяча шэсцьсот восемдзесят трэцім у Венскай выправе праявіў перад нашымі вачыма разам са сваёй харугвай уласцівую рыцарству ваяўнічасць і адвагу». Яшчэ адзін род Вайніловічаў у 1833 г. падаваў дакументы пра тое, што іх продак Крыштаф «служыў у войску польскім і меў званне спачатку ротмістра, а за праяўленую смеласць падчас вайны з туркамі атрымаў званне маёра» [12, арк. 66].

Асобную групу родаў, якія апелявалі да перамогі пад Венай, складаюць фаміліі нямецкага паходжання. Зразумела, што часцей за ўсё яны не былі аселымі жыхарамі Міншчыны і не мелі дакументальных доказаў шляхецтва. Таму зварот да Венскай бітвы, сярод удзельнікаў якой афіцэры нямецкага паходжання складалі істотную частку, быў ім вельмі прыдатным. У 1833 г. жыхар Слуцкага павета Юзаф Антоніевіч Бэсэр сцвярджаў, што яго продак Пётр «быў узнагароджаны званнем маёра палка лёгкай кавалерыі, вызначыўся мужнасцю і ваяўнічасцю ў вайне супраць туркаў падчас аблогі Вены, а менавіта на Стрыгонскім мосце, дзе, не звяртаючы ўвагі на ўсякую небяспеку, абараняў перад туркамі пераход праз мост, тым самым паказваючы прыклад для іншых, гэта пацвярджаецца кансэнсам найяснейшага караля польскага Яна III 1683 года 22 кастрычніка ў лагеры пад Стрыгоняй дадзены» [10, арк. 17 адв].

Некалькі складаней выглядае схема выкарыстання звестак пра Венскую бітву ў вывадзе Вінабэраў ад 1829 г. (адзін з падпісантаў вываду — Вінцэнт Бярнардавіч — служыў канцылярыстам Беластоцкага абласнога праўлення). Сярод дакументаў роду меўся вельмі сумнеўны патэнт вялікага гетмана ВКЛ Казіміра-Яна Сапегі ад 18 сакавіка 1694 г. першапродку Фердынанду Ліхтфусу Вінабэру, паручніку рэгімента драгунскага, на званне капітана Пружанскага лейб-рэгімента харугвы вялікай булавы ВКЛ [13, арк. 2] (некрытычна ўспрыняты ў [19, с. 317]), але ў ім ніякіх адсылак да Венскай кампаніі не было. Затое ў іншым дакуменце — тастаменце яго ўнука і цёзкі Фердынанда Янавіча ад 1 верасня 1748 г. (нібыта актыкаваны 10 верасня 1748 г. у Паморскім гродскім судзе) гаворыцца наступнае: «пасля продажу бацькам маім [Янам] дзяр-

жавы Пукаберга Малога, некалі дадзенай як узнагарода за вайсковыя заслугі нашаму дзеду Фердынаду Ліхтфусу Вінабэру, паручніку рэгімента драгунскага, за Венскую экспедыцыю» [13, арк. 5]. Такім чынам, спасылка на Венскую бітву была даволі частай з'явай падчас доказаў дваранства, фактычна стала «агульным месцам», на яе спасылаліся нават пры адсутнасці непасрэдных прывілеяў, атрыманых за ўдзел у вайне супраць туркаў.

Гэта ж назіраецца і ў выпадку Вэнжыкаў-Амбражэвічаў са Слуцкага павета. Яны яшчэ ў першым вывадзе ад 1804 г. называлі сваім першапродкам Станіслава, які сапраўды быў мечнікам ашмянскім у канцы XVII ст. Наколькі такое паходжанне праўдзіва, вызначыць цяжка, але ўпэўнена можна сцвярджаць, што звесткі, пададзеныя ў 1837 г. пра ўдзел Станіслава з сынамі Станіславам і Стэфанам «у некалькіх кампаніях» у часы Яна III [2, арк. 22–22 адв.], сфальсіфікаваны дзеля таго, каб звязаць мечніка Станіслава з яго нашчадкамі, а таксама паказаць іх шляхецкую службу ў войску.

Большасць вывадаў дваранства, якія разглядаліся Мінскім ДДС і ў якіх згадвалася Венская бітва 1683 г., была пададзена ў канцы 1820-х і пачатку 1830-х гг., калі ў шляхты ў сувязі з узмацненнем працэсу «разбору шляхты» ўзнікла пільная патрэба ў «адшуканні» пераканаўчых доказаў сваёй высакароднасці. Зварот да кампаніі 1683 г. прыдаваўся да гэта як мага лепш — за подзвігі падчас бітвы сапраўды маглі быць нададзены чыны і ўрады, а таксама маёнткі. Ды і сам факт удзелу ў вайне пацвярджаў шляхецкую службу прадстаўнікоў роду. Такім чынам, удзел у Венскай бітве стаў дастаткова распаўсюджаным матывам у справах аб дваранстве. Аднак няма падстаў лічыць гэта праявай асаблівага значэння гэтай падзеі для свядомасці шляхты беларускіх зямель у першай палове XIX ст. Добра прасочваецца часавая лакалізацыя «прыгадвання» Венскай бітвы выключна ў прамежку ад канца 1820-х гг. Дагэтуль да дастаткова аддаленых падзей, звязаных з панаваннем Яна III Сабескага ў цэлым і яго ваенных кампаній у прыватнасці, звярталіся вельмі рэдка. З такога кшталту спасылак можна згадаць вывад ад 1804 г., які рабіўся дробнамаёмасным шляхецкім родам Бадзюкоўскіх, што паходзілі з былога Слуцкага княства. Яны сцвярджалі, што іх продак у 1675 г. у складзе паспалітага рушэння знаходзіўся ў лагеры пад Казінцамі [1, спр. 37, арк. 651–651 адв.], што, дарэчы, выглядае даволі праўдападобна.

Наогул, што датычыцца найбольш ранніх вывадаў, то нават калі там і падаваліся легендарныя і сфальсіфікаваныя звесткі пра вайсковыя чыны пачынальнікаў фамілій, то яны звязваліся не з Венскай бітвай. Напрыклад, у моцна сфальсіфікаваным вывадзе Арахоўскіх (Аржахоўскіх) ад 1804 г. [17, с. 264] іх першапродак Аляксандр называецца «палкоўнікам гусарскім» і героем бітвы пад Варнай (з памылковай датай — замест

1444 г. стаіць 1443 г.) [4, арк. 210–210 адв.]. Крыніцай гэтай фальсіфікацыі, што ў вывадзе і не ўтойваецца, стала «Карона Польская» К. Нясецкага [26, s. 133].

Шырокае з'яўленне прывілеяў, выдадзеных нібыта па выніках Венскай бітвы 1683 г., тлумачылася не раптоўна ўзніклай родавай памяццю шляхты Міншчыны, а, верагодна, наяўнасцю ў мінскіх фальсіфікатараў узору гэтых прывілеяў, які дазволіў фабрыкаваць усе новыя і новыя дакументы для доказаў дваранства.

Такім чынам, масавасць згадак пра Венскую бітву 1683 г. у вывадах Мінскага ДДС памылковая. Яна ніякім чынам не адлюстроўвае цікавасць мясцовай шляхты да гэтай падзеі. Зрэшты, паказальна, што такое ганаровае дасягненне як удзел іх продкаў у бітве пад Венай маглі сабе дазволіць пераважна прадстаўнікі лакальнай эліты або чыноўнікі адміністрацыі Мінскай губерні.

## Крыніцы і літаратура

1. Пастановы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні розных асобаў // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 37.
2. Справа аб дваранскім паходжанні роду Амбражэвічаў-Вэнжыкаў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 35.
3. Справа аб дваранскім паходжанні роду Андраноўскіх-Чаховічаў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 49.
4. Справа аб дваранскім паходжанні роду Арахоўскіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2347.
5. Справа аб дваранскім паходжанні роду Арцішэўскіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 59.
6. Справа аб дваранскім паходжанні роду Бабравіцкіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 189.
7. Справа аб дваранскім паходжанні роду Багдановічаў-Дварэцкіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 160.
8. Справа аб дваранскім паходжанні роду Бакеяў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 211.
9. Справа аб дваранскім паходжанні роду Багушэўскіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 191.
10. Справа аб дваранскім паходжанні роду Бэсэраў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 122.
11. Справа аб дваранскім паходжанні роду Вайніловічаў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 561.
12. Справа аб дваранскім паходжанні роду Вайніловічаў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 568.
13. Справа аб дваранскім паходжанні роду Вінабэраў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 505.

14. Справа аб дваранскім паходжанні роду Галіцкіх-Рожыцаў // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 644.
15. Справа аб дваранскім паходжанні роду Гняўчынскіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 724.
16. Справа аб дваранскім паходжанні роду Грабоўскіх // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 811.
17. Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 1 / Т. Капіца, А. Леўчык, С. Рыбчонак і інш. — Мінск: БелНДІДАС, 2002. — 493 с.
18. Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 2: Б / С. Рыбчонак і інш. — Мінск: НАРБ, 2007. — 672 с.
19. Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 3: В / Д. Ч. Матвейчык [і інш.]; навук. рэд. А. Рахуба. — Мінск: Беларусь, 2014. — 647 с.
20. Лісейчыкаў, Д. Прадмова / Д. Лісейчыкаў, Д. Матвейчык // Гербоўнік беларускай шляхты. — Т. 3: В. — Мінск, 2014. — С. 3–17.
21. Туміловіч, Г. Расійскі царызм і шляхта Беларусі (1775–1863) / Г. Туміловіч // Беларускі гістарычны агляд. — 2010. — Т. 17. — Сш. 1–2. — С. 125–154.
22. Dunczewski, S. Herbarz wielu domów Korony Polskiej i W. X. Litewskiego / S. Dunczewski. — T. 2. — Kraków: Drukarnia B. Jana Kantego, 1753. — 483 s.
23. Manufacturing a Past for the Present. Forgery and Authenticity in Medievalist Texts and Objects in Nineteenth-Century Europe / Ed. by J. M. Bak, P. J. Geary, G. Klaniczay. — Leiden; Boston: Brill, 2014. — 325 p.
24. Niesiecki, K. Herbarz polski / K. Niesiecki, wyd. J. N. Bobrowicz. — T. 2. — Lipsk: Breitkopf i Haertel, 1839. — 390 s.
25. Niesiecki, K. Herbarz polski / K. Niesiecki, wyd. J. N. Bobrowicz. — T. 4. — Lipsk: Breitkopf i Haertel, 1839. — 518 s.
26. Niesiecki, K. Herbarz polski / K. Niesiecki, wyd. J. N. Bobrowicz. — T. 7. — Lipsk: Breitkopf i Haertel, 1842. — 582 s.
27. Okolski, S. Orbis Polonis. — T. 3 / S. Okolski– Cracovia: Officina Typographica Francisci Caesarii, 1643. — 371 p.
28. Wagner, M. Słownik biograficzny oficerów polskich drugiej połowy XVII wieku. — T. 1. — Oświęcim: Napoleon V, 2013. — 348 s.
29. Wagner, M. Słownik biograficzny oficerów polskich drugiej połowy XVII wieku. — T. 2. — Oświęcim: Napoleon V, 2014. — 359 s.
30. Wielądko, W. W. Heraldyka czyli Opisnaie herbów. — T. 1. — Warszawa: Drukarnia Piotra Zawadzkiego, 1792. — 344 s.
31. Wielądko, W. W. Heraldyka czyli Opisnaie familii. — T. 2. — Warszawa, 1794. — 819 s.
32. Wijuk Kojałowicz, W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego / W. Wijuk Kojałowicz; wyd. F. Piekosińskiego. — Kraków: «Czas» Fr. Kluczyckiego i Spółki, 1897. — IV, 527 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 24.08.2015

*Д. В. Лісейчыкаў*

# Надмагільныя камяні з «рускімі» надпісамі XVI–XVII стст. каля в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна [1]

Старыя могілкі каля в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці мала вядомыя шырокаму колу навуковай грамадскасці. Звесткі аб іх адсутнічаюць у энцыклапедычных выданнях савецкага часу, прысвечаных помнікам гісторыі і культуры Брэсцкай вобласці [11; 29]. Не ўнесены яны і ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [10]. Нашу ўвагу на гэты помнік звярнуў галоўны захавальнік фондаў Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея і адміністратар інтэрнэт-рэсурса «Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал» Віталь Герасіменя, які абследаваў могілкі і зрабіў іх падрабязную фотафіксацыю [6].

Могілкі знаходзяцца на адлегласці 1 км на ўсход ад вёскі ва ўрочышчы «На агародах». Яны размешчаны на невысокай градзе ў пойме р. Цна. Вышыня ўзвышша каля 3 м, дыяметр каля 20–30 м [7]. На паверхні могілак захавалася каля сотні камянёў і надмагільных помнікаў. У чэрвені 2015 г. аўтар разам з В. Герасіменем правёў абследаванне названага помніка, у выніку якога на некаторых камянях былі знойдзены інскрыпцыі і малюнкі, якія дазваляюць зрабіць высновы аб часе вырабу асобных надмагілляў і аб часе функцыянавання саміх могілак.

На трох камянях маюцца выявы розных варыянтаў крыжоў і фрагменты надпісаў (гл. малюнкі 1–3). Два надмагіллі ўтрымліваюць надпісы па-старабеларуску: «[Клейнавы знак] | Лѣ*т*(а) Бо(жого) на*р*(оженя) | ҂афпе (1585) ро(кꙋ) | Наста|сьѧ» (далей будзем зваць гэты камень «Настассяй», гл. малюнак 4) і «І(су)с [Выява крыжа] Х(ристо)с. | Рокꙋ | Бо*ж*(ого) наро*ж*(еня) | а(…) [2] (1…) рокꙋ | тутъ положо|(н)и методъ (К)о|марови|чъ» (далей будзем зваць гэты камень «Камаровіч», гл. малюнак 5). Верагодна, надпісы і выявы маюць і некаторыя іншыя надмагіллі. Паколькі за сотні гадоў многія з іх былі перакуленыя, разбітыя, закапаныя альбо папросту «ўраслі» ў зямлю, то без правядзення раскопак адшукаць іншыя помнікі эпіграфікі на малькавіцкіх могілках немагчыма.

---

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку **Герману Брэгеру**, **Віталю Герасіменю**, **Сяргею Грунтову**, **Айвасу Рагаўскасу**, **Галіне Флікоп**, **Юрыю Хадыку** і **Робертасу Юргайцісу** за дапамогу ў зборы матэрыялаў для падрыхтоўкі гэтага артыкула. Прамалёўкі інскрыпцый на камянях паводле фотаматэрыялаў аўтара зроблены мастаком **Вольгай Кісялёвай**.

[2] Тры літары, якія павінны азначаць стагоддзе, дзесяцігоддзе і год, не выбітыя.

**Агляд найбольш вядомых надмагілляў XVI–XVII стст. з «рускімі» надпісамі**. На жаль, да нашага часу захавалася зусім мала надмагілляў канца XVI – пачатку XVII ст., якія ўтрымліваюць надпісы на старабеларускай («рускай») мове, каб прааналізаваць іх змест, вылучыць шаблоны напісання. Таму для далейшага аналізу малькавіцкіх камянёў мы паспрабавалі сабраць звесткі пра найбольш вядомыя знаходкі «рускіх» надмагілляў з тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага канца XVI – пачатку XVII ст.

Разам з апісанымі ў краязнаўчай літаратуры XIX – пачатку XX ст. прыкладамі нам удалося налічыць не больш за паўтара дзясяткі «рускіх» надмагілляў азначанага перыяду.

Найбольш вядомыя з іх знаходзіліся над пахаваннямі прадстаўнікоў вышэйшых пластоў грамадства Вялікага Княства Літоўскага. Далёка не ўсе яны захаваліся да нашага часу, і аб большасці мы можам меркаваць толькі па публікацыях XIX – пачатку XX ст. У кнізе Яўстаха Тышкевіча «Надмагіллі сям'і Тышкевічаў» [1] ёсць звесткі аб трох «рускіх» надмагіллях прадстаўнікоў роду: Васіля († 1571) у крыпце царквы Супрасльскага манастыра, Астафея Васільевіча († 1558) у «Замкавай» царкве ў м. Лагойск Мінскага (пасля Барысаўскага) пав. і Марыны Марцінаўны († 1598) у царкве ў в. Дзікушкі Лідскага пав. Змест іх наступны. На надмагіллі Васіля, якое было зроблена са звычайнага каменю, мелася выява родавага герба і надпіс «Въ лето от нароженія Господа Бога и Спаса нашего Іисуса Христа 1571 мѣсеца августа 13 дня въ неделю, преставися рабъ Божій панъ Василі Тышковичъ воевода смоленскій, староста менскій и пинскій, положенъ въ храмѣ Благовѣщенія Богородицы въ монастыру Супраськомъ» [1, s. 2]. Паводле стану на 1871 г. надмагілля ў царкве ўжо не было. Надмагільны камень Астафея Васільевіча знаходзіўся ў будынку Лагойскай царквы перад дзвярамі, адкуль у 1858 г. быў вывезены Яўстахам Тышкевічам у Віленскі музей старажытнасцей пры бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта. Ён утрымліваў кароткі надпіс «В лѣто Бож•(аго) нꙗр.(оженя) | •а•ф•ни• (1558) м(еся)ца• а|вгүста ѕ҃. (6) днꙗ | в пѧтницу/• пре|ставшꙗ Ѡст|афеи Васи*л*евич | Тишкович.» [3] [1, s. 8 a]. Найбольш цікавым з'яўляецца надмагілле Марыны Марцінаўны. Яно, па сутнасці, прадстаўляе разгорнутую біяграфію нябожчыцы з апісаннем рыс яе характару: «Тꙋ*т* лежи*т* в том гробѣ положона Мари|на Мартиновна Ме(леш)кови*ча* Скꙋміноваѧ Тишкеви(чо)ваѧ. | Н*е*вѣста побо*ж*нос*т*ю і ꙋчтивос*т*ю вшелѧко*ю* часꙋ жи*т*ѧ сво|его навѣтъ всѣ*м* людем в том па*н*ствѣ В(еликом) К(нястве) Лѣт(овском) знаемаѧ, цнот вшелꙗ|ки*х*

[3] Тэкст расчытаны аўтарам з літаграфіі, паколькі ў варыянце тэксту, расчытаным Яўстахам Тышкевічам, зроблены шэраг памылак.

Мал. 1



Прамалёўкі камянёў з малюнкамі і інскрыпцыямі *(мастак Вольга Кісялёва)*

хрестиѩнских взо*р* ї wбра*з* ви*до*мы*и* днеи до*б*ры*х* бл*а*гословенства Божѣго | полна. Поше*д*ш*и* зам*ѹ*ж з до*мѹ* родичо*в* свои*х* *ѹ* го*ду* дї (14) wт нарож*е*нѧ своего, жи|ла *ѹ* малж*е*н*ск*ом ст(ане …) мв (42) го*ды*, по сме*ръ*-ти м*ѹжа* свое*го* *ѹ*довою | годов лв (32) *ѹ*чтіво (…) с(в)оего провадӗнѧ до сконанѧ *сво*его w др*ѹ*|гом ма*л*же*н*ствѣ не мы(с)леч*и*, wставивш*и* п(о соб)ѣ всег*о* потомства своег*о* д*ѹ*ш | болшѣ wсмі деті, в старости (…) не толко ма*тка* ма*тком*, але | ба*бкам* ї праба*бкам* маткою б*ѹ*(ла, до)ждав-шu праща*ѹ*рат, то е*ст* чет|ве*р*того по*колен*ѧ своего wгледавъши, в рок*ѹ* пи (88) w*т* нароженѧ своего | д*ѹшѹ* свою в р*ѹ*кі Тво*р*цы своем*ѹ* w*т*дала ї до ѳалы[4] его светое з сего св|ѣта преставіласѧ *ѹ* вымению w*т*чином ма*л*жонка (своего?), на кото|ром wт него w*с*тавлена была, в Дик*ѹ*шкахъ ро(к*ѹ* …) | Бо*ж*(ого) наро*ж*(енѧ) ҂афчи (1598) м(еся)ца їюлѧ ки (28) днѧ *ѹ* воторок го*ди*ны д (4) і в том | же рок*ѹ* чи (98) м(еся)ца се*н*тѧбрѧ г (3) днѧ похов*ана* прі ц(е)р(к)вѣ Преwбраже*н*ѧ | Х(ристо)ва w*т* с(ы) нов свои*х*, ста*р*шого Дмитра Ск*ѹмі*на, старосты Мѣ(н)ско*го*, ма*р*|шалка Его К(оролевскои) М(и)л(ос)ти, *ѹ* Вел*и*(ким) К(ня)*ст*(ве) Лѣ(товском) пїсара за*м*ко*в* влос*теи* *Ѹ*краіны, | а молод*шого* Теwдора Ск*ѹ*міна, воево-

[4] У тэксце памылкова *ѳады*.

ды Новгородского, старо|сты Городенского, Ѡлитского, Юрборского ї Н|ововолского»[5] [1, s. 14 a]. Уверсе ў цэнтры пліты, выраблена́й з чорнага мармуру, мелася выява чэрапа і перакрыжаваных касцей, па рагах пліты выявы гербаў «Корчак» і «Корсак». Надмагілле багата аздобленае раслінным арнаментам і ў цэлым выканана на вельмі высокім мастацкім узроўні. На сённяшні дзень фрагмент названага надмагілля захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры.

У будынку царквы Св. Пятра і Паўла[6] ў г. Мінску ў XIX ст. доўгі час захоўвалася надмагілле жонкі мінскага бурмістра Марыі Маслянкі. Да нашага часу помнік не захаваўся, маецца толькі даволі прыблізная перадача тэксту надпісу, складзеная ў 1878 г. сябрам Маскоўскага археалагічнага таварыства Руфам Ігнацьевым: «+Паметь+ | Понеже. Гласить. Труба. Духовная. Покайся. | Днесь. Мнѣ. Утро. Тобѣ | Неомыляйся. | Размышля(й). Собѣ. Описм(енахъ) | Законнь(і)хъ. Главизны. | Достоитъ. Бо искать оное. | Небесное. Очизъны. | Для которое. Представіся | Раба Божія учьстивая | Марья. Филиповъна | Пані Андрѣевая Масленъ|чіная. Бурмистровая. | Мѣнская. Лѣта. Бож. Нарож. а… (1…) | Зекгаръ. Мнѣ. Годины. Выбілъ. | Пейчокъ[7]. Глас(ъ). Сво(й). Вывылъ | Смерть приму (…)» [12, с. 84–85]. Настаяцель кафедральнай саборнай царквы Павел Афонскі ў 1887 г. даў больш падрабязнае апісанне помніка, падаў свой варыянт расчытання некаторых слоў, а таксама прачытаў некаторыя неразабраныя Ігнацьевым кавалкі тэксту. Вось найбольш цікавыя характарыстыкі надпісу: *«Увесь надпіс складаецца з 19 радкоў, пры гэтым увесь ён зроблены стараславянскімі літарамі, абрыс якіх дастаткова правільны, літары, што змяшчаюцца ў 15 радках, крыху буйнейшыя, чым у апошніх чатырох радках. (…) Кожнае асобнае слова ў надпісу аддзяляецца ад іншага кропкай (у выглядзе невялікага ромбу), якая ставіцца, зрэшты, не ў ніжняй частцы радка, а ў сярэдзіне радка, каля апошняй літары кожнага асобнага слова. Кожны асобны верш, апрача гэтага, аддзяляецца ад іншага яшчэ дзвюма невялікімі рыскамі, пастаўленымі над кропкай, што аддзяляе кожнае слова»* [5, с. 208–209]. У варыянце Афонскага змест надпісу гучыць так: «+Паметь+ | Понеже. гласить. труба. ду|ховная. покаися. // | Днесь. мнѣ. утро. тебѣ. | Не омыляися. // | Размышляи. себѣ. о ним’. | Законныхъ. главизны. // | Достоитъ. бо. искать. оное. | Небесное. очыизъны. // | Да яко. того е. преставися. | Раба. Божія. Учьстивая. | Марья. Филиповъна. | Пани Андрѣевая. Масленъ|чи-

---

[5] Тэкст расчытаны аўтарам з літаграфіі, паколькі ў варыянце тэксту, расчытаным Яўстахам Тышкевічам, зроблены шэраг памылак.

[6] У XIX ст. тытул Св. Пятра і Паўла насіла былая базыльянская царква Св. Духа (у адноўленым будынку яе сёння размяшчаецца Канцэртная зала Дзіцячай філармоніі «Верхні горад»).

[7] Так у тэксце.

Мал. 2



ная. Бурмистровая. | Мѣнская. лѣта. ьож. нарож. а. (1…) | Зекгар. мнѣ. годныи. выбилъ(?)…….. | Псичокъ (sic!) гласъ. сбои. выбилъ(?)…… | Смерть. приму я. отъ т………… | Обратилося. тѣло…………»[8] [5, с. 208–209]. Афонскі таксама вызначыў, якім чынам надмагілле трапіла ў царкву Св. Пятра і Паўла. Першапачаткова пліта была ўмуравана ў сцяну манастырскай царквы Узнясення Божага. Пасля заняпаду царквы пліта была перанесена ў манастырскую базыльянскую царкву Св. Духа, якая ў 1799 г. пераўтворана ў праваслаўную кафедральную са-

[8] У цытаце захаваны асаблівасці перадачы тэксту, зробленыя П. Афонскім, — кропкі ў тэксце, дзве нахіленыя рыскі ў канцы некаторых радкоў. Для аддзялення аднаго радка ад іншага ў тэксце пастаўлена адна вертыкальная рыска.

борную царкву Св. Пятра і Паўла. Афонскі піша, што другая пліта ўласна з магілы самога бурмістра Андрэя Маслянкі найверагодней загінула ў час зруйнавання Увазнясенскага манастыра [5, с. 212–213].

Абодва даследчыкі, і Ігнацьеў, і Афонскі, звярнулі ўвагу на тое, што на надмагіллі ў пазначэнні года смерці фігуруе толькі кірылічная літара *а*, што азначае 1000. Абодва не наважыліся абвергнуць ранейшае фантастычнае сцвярджэнне архімандрыта Мікалая (Трускоўскага), што надмагілле датуецца 1000 г. і з’яўляецца помнікам хрысціянства часоў кіеўскага князя Уладзіміра [13, с. 79]. Больш верагодным часам стварэння помніка зыходзячы з выкарыстанай лексікі яны лічылі XV альбо XVI ст., але версія аб старажытным паходжанні пліты імі таксама дапускалася. Між тым муж Марыі Маслянкі Андрэй Маслянка займаў пасаду мінскага бурмістра ў 1590-х гг. Дакумент 1590 г. згадвае яго ў якасці бурмістра і адзначае, што Андрэй Маслянка прызначаны гадавым бурмістрам на 1592 г. [30, с. 40–41]. Пад 1612 г. у дакументах Мінскага магістрата ў якасці бурмістра фігуруе ўжо Васіль Маслянка, відавочна, сын пана Андрэя, які да гэтага часу напэўна памёр [30, с. 80]. Далей мы вернемся да «недапісаных» дат на надмагіллях. Яны, як паказала наша даследаванне, прысутнічаюць на многіх падобных помніках.

У музеі старажытнабеларускай культуры захоўваецца надмагілле луцкага і астрожскага ўніяцкага епіскапа Кірыла Цярлецкага, якое перавезена сюды з будынка царквы ў в. Пярковічы Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У канцы XIX ст. ужо рабілася падрабязнае апісанне надмагілля: *«Магіла епіскапа Цярлецкага — з левага боку ад святога алтара, пад рызніцай, у склепе, наглуха закладзеным. Над ёю, у рызніцы змяшчаецца гарызантальна каменная пліта з зубчатай аздобай і з выразанымі на ёй словамі»* [9, с. 181]. Тэкст надпісу ў кнізе прыводзіцца са спрашчэннямі і апіскамі, таму падаём яго тут паводле расчыткі з арыгіналу, які захоўваецца ў музеі: «Тȣ*т* лежи*т* тѣло ве|лебного еп(и)*с*к(о)па | Лȣ*ц*кого и Ѡстроз|ского Кирила Терле*ц*|кого. А положено | рокȣ ҂а҃х҃(…) (16…) м(е)с(я)ца (…). | Которы*и* бы*л* пре*ж*де | еп(и)*с*к(о)по*м* Пі*н*ски*м* лѣт і҃ (10), | (…) еп(и)*с*к(о)п(о)м | лѣтъ дваде*с*ѧ*т*. | К(ирилъ) Т(ерлецкии), | е(пископъ) Л(уцкии) і Ѡ(строзскии)». Кірыла Цярлецкі памёр у 1607 г. і быў пахаваны ў в. Пярковічы Пінскага пав. [9] Падрабяз-

---

[9] Пра акалічнасці знаходкі надмагілля ў прыватным лісце распавёў мастацтвазнаўца **Юры Хадыка**: *«Калі мы прыбылі ў Пярковічы, першае што кінулася ў вочы, вялікія памеры і аскетычна стрыманыя формы царквы. Яна была адкрытая і разрабаваная ўнутры. Толькі праз праломы падлогі ў раёне алтара мы пабачылі надмагілле, а прачытаўшы тэкст, зразумелі, якую каштоўнасць знайшлі. Забраць пліту тады мы не маглі з-за адсутнасці свайго транспарту. Толькі ў 1978 г. Вольга Васільеўна [Церашчатава] арганізавала спецыяльную паездку і прывезла надмагілле ад няўдзячных нашчадкаў аднаго з галоўных бацькоў вялікай спробы*

Мал. 3



ней аб усіх перыпетыях, звязаных з гісторыяй гэтага надмагілля, напісана ў працы ўкраінскага гісторыка Леаніда Цімашэнкі [32].

Яшчэ адно надмагілле прыблізна таго ж перыяду, пастаўленае па віленскім бурмістры Апанасе Брагу і яго сыне Антоне, знаходзіцца ў будынку царквы Св. Тройцы манастыра базыльянаў у г. Вільні: «Тꙋ*т* лежи*т* раб Божи*и* Ѡѳана*а*|сеі Ѳедорович Брага, бꙋрм*и*|стр места Ви-

---

*адрадзіць хрысціянскае адзінства»* (з ліста Ю. Хадыкі да Д. Лісейчыкава ад 05.07.2015).

ле*н*ского. А *п*ре|стависѩ в лето ѡ*т* вопло|щеніѩ Сп(а)са нашего ҂афоѕ (1576) | мѣсеца ѡктебра кѕ (26) днѩ. | А жи*л* на свете лѣ*т* нз (57). Т*ꙋт* | же лежи*т* і сы*н* его А*н*то|ніи. Ѡ*н* же престависѧ | в лето ҂афп (1580), м(еся)ца ѡк|тебра г (3) днѧ». Мастацкім асаблівасцям гэтага надмагілля прысвяціла свае працы літоўская даследчыца Марыя Матушакайтэ [3, p. 84–88; 4, p. 66–67].

У будынку царквы Св. Пятра і Паўла ў г. Мінску яшчэ ў канцы 1940-х гг. знаходзілася надмагілле першай паловы XVII ст. (царква тады насіла назву кафедральнай Кацярынінскай). Тэкст расчытаны намі паводле фотаздымка ад 14 студзеня 1948 г., які захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь: «Рокꙋ ѡт нароженіѧ С(ы)на Б(о)ж(о)го ахле (1635) м(еся)ца марца | ін (18) днѧ преставісѧ раба Б(о)жіѧ Маріѧ Ивановна | Ѩроцко(…) [10] Миколаеваѧ Геленачевичоваѧ, | мещанъка мѣнскаѧ послꙋшеньства | всходнего, (веры пр)авославное греческое | в дꙋхꙋ дщерь. Ѡ*т* нароженіѧ своего мѣ|ла лѣтъ трыдцать дѣ(вя)ть. Котораѩ | на семъ мѣсци естъ погребена при ц(е)ркви | С(вя)тыхъ Ап(осто)лъ Петра и Павла» [16].

Звернем увагу, што вышэй гаворка ішла аб надмагіллях, якія знаходзіліся ў будынках храмаў. Гэта азначае, што асобы, пахаваныя пад імі, займалі высокае становішча ў сацыяльнай структуры грамадства. Значна менш захавалася звестак аб надмагільных помніках, якія знаходзіліся на царкоўных цвінтарах і належалі прадстаўнікам менш прывілеяваных пластоў грамадства. Малькавіцкія камяні адносяцца менавіта да такога тыпу надмагілляў.

Вельмі нагадвае сваёй лаканічнасцю малькавіцкую «Настассю» апісаны Еўдакімам Раманавым каменны крыж каля в. Вендараж Магілёўскага пав. з надпісамі «҂афчи (1598) | Иванъ» [14, без пагінацыі]. Даследчык дапускае версію, што гэты крыж мог з’яўляцца надмагіллем, аднак згодна з духам часу больш схіляецца да версіі аб тым, што яго паставілі руплівцы хрысціянства на месцы былога язычніцкага капішча. Тут Раманаў, як падаецца, трапляе ў палон сваіх гіпотэз аб паходжанні т. зв. «Барысавых камянёў», вывучэнню і апісанню якіх ён прысвяціў не адзін год. У «Археалагічнай карце Гродзенскай губерні» Фёдара Пакроўскага, дзе маецца шмат узгадак пра старыя могілкі і камяні з малачытабельнымі надпісамі, апісаны два падобныя помнікі: каля в. Хвіневічы Слонімскага пав. з надпісам «Ѧцько Илиничъ» [27, с. 17] і каля в. Паўлава Кобрынскага пав. з надпісам «Ничипоръ» [27, с. 84]. Яшчэ на двух, каля в. Гавенавічы (сёння в. Падгорная) Слонімскага пав. і м. Мо-

[10] Фрагмент пашкоджаны. Магчыма, маецца на ўвазе прозвішча Яроцкая-Сенніцкая. Мяшчане з такім прозвішчам адзначаны ў г. Мінску ў другой палове XVI ст. [30, с. 32–34] (1579 год).

Мал. 4



таль Кобрынскага пав., Пакроўскі расчытаў верагодныя даты «1611» і «1651» адпаведна [27, с. 20, 139]. Паводле нашых звестак на сённяшні дзень у м. Моталь знаходзіцца камень з надпісам «рокꙋ | ҂ахмз (1647)». Цяжка сказаць, ці гэта той камень, які апісваў Пакроўскі (з памылковай расчыткай даты), ці ўсё ж нейкі іншы.

Такім чынам, у фармуляры складання надпісаў на «рускіх» надмагіллях другой паловы XVI – пачатку XVII ст. можна вылучыць некалькі элементаў, наяўнасць якіх залежала ад фінансавых магчымасцей заказчыка і ад яго месца ў сацыяльнай структуры грамадства. Большая колькасць прысутных на надмагіллі элементаў сведчыць пра большую значнасць (заможнасць) асобы (гл. прыведзены пералік):

1. Дата (год) пахавання.
2. Імя.
3. Прозвішча.
4. Пасада.
5. Выява крыжа.
6. Выява родавага герба.
7. Мастацкае аздабленне.
8. Біяграфічныя звесткі.
9. Літаратурныя прыёмы складання тэксту.

Асобна трэба ўлічваць, да якога тыпу надмагілля адносіцца камень паводле месца захавання — унутрыхрамавага альбо прыхрамавага.

Надмагілле «Настасся» мае тры з пералічаных элементаў (год, імя, выяву клейнавага герба), надмагілле «Камаровіч» — чатыры (год, імя, прозвішча, выяву крыжа). Абодва адносяцца да прыхрамавага тыпу надмагілляў.

**Гісторыя малькавіцкіх могілак**. Адна з першых узгадак вёскі і маёнтка Малькавічы (Малкавічы) датуецца 1526 г. У той час разглядалася спрэчка паміж уладальнікам Малькавічаў Юрыем Іллінічам і ўладальнікам суседняга маёнтка Лунін (Лулін) Янам Пенькам за права валодання паляўнічымі ўгоддзямі на сумежных землях [2, р. 192–194]. На жаль, ніякіх дакладных звестак аб самім маёнтку і яго жыхарах у тэксце дакумента не ўтрымліваецца.

Існаванне ж могілак цесна звязана з дзейнасцю царквы, якая існавала ў Малькавічах як мінімум з першай паловы XVI ст. Дакладных звестак аб гэтым мы не маем. Аднак, аналізуючы этапы фарміравання парафіяльнай сеткі цэркваў на беларускіх землях у гэты перыяд, можна сцвярджаць, што разглядаемыя намі могілкі ўяўляюць сабой тое, што ў крыніцах называецца *пагостам* — месцам, на якім размяшчаліся найбольш старажытныя храмы. Працэс пераносу будынкаў цэркваў з *пагоста* непасрэдна ў вёскі ў цэлым завяршыўся да канца XVI ст., аднак месцамі, асабліва па ўсходзе беларускіх зямель — Полацкай епархіі — храмы *на пагостах* фіксуюцца яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. [15, с. 65].

Найбольш ранняя дакладная звестка аб гэтай мясцовасці датуецца 28 лютага 1612 г. У гэты час адбылося размежаванне зямель Станіслава Кішкі і Яна Крачатоўскага ў раёне вёсак Малькавічы і Вялута Навагрудскага пав. Пры падрабязным апісанні межаў прыгадваюцца некалькі «астравоў» сярод балот на правым беразе р. Цна ў накірунку ад Малькавічаў да Вялуты: *«Востраў Лаза, востраў Ютычаў, востраў Казляноўскі, востраў Пагосцкі, востраў Салом'я, востраў Дубаў да вострава Селішча»* [25, арк. 769] (паколькі дакумент быў актыкаваны ў кнігах Пінскага земскага павятовага суда 23.09.1798, то пісар запісаў стара-

Мал. 5



беларускі тэкст польскім «транслітам». У актавых кнігах ён запісаны ў такім выглядзе: «*Ostrow Łoza, Ostrow Jutyczow, Ostrow Kozlanowski, Ostrow Pohoski, Ostrow Solomja, Ostrow Dubow do Ostrowa Seliszcza*»). Пад назвай «*востраў Пагосцкі*» якраз і фігуруюць старыя малькавіцкія могілкі. Гэта гаворыць аб тым, што ў пачатку XVII ст. будынак царквы хутчэй за ўсё ўжо знаходзіўся ў вёсцы.

Малькавіцкая царква належала да юрысдыкцыі Кіеўска-Віленскай мітрапаліцкай епархіі і знаходзілася на паўднёвым яе ўскрайку. Суседнія з Малькавічамі парафіі ў Хатынічах, Луніне і Малой Плотніцы належалі ўжо да юрысдыкцыі пінска-тураўскіх епіскапаў. Пратакол генеральнай візітацыі Малькавіцкай царквы 1696 г. нічога не гаворыць аб дакладнай лакалізацыі храма і могілак. Стан парафіі на той час быў нездавальняючы. Не з лепшага боку характарызавалася візітатарам асоба тагачаснага святара Яна Навіцкага: «*Сам святар нічога не ўмее. На саборах ніколі не быў, наконт чаго атрымліваў позвы* (у кансісторскі суд. — *Д. Л.*), *паводле якіх не з'яўляўся*» [28, арк. 16 адв.]. Верагодна, малькавіцкая парафія і царква не лічыліся надта прэстыжнымі ўжо ў той час.

На плане 1855 г. будынак царквы адзначаны на новым месцы [22, арк. 1–3], непасрэдна ў вёсцы. Зусім лаканічна гаворыць аб будынку і месцазнаходжанні храма візіта Малькавіцкай царквы за 1820 г.: *«Месца знаходжання гэтай царквы ў лясах і балотах, дзе матэрыялаў каменных не маецца»* [20, арк. 181]. Пры гэтым не ўдакладняецца канкрэтнае месца. Не фіксуе візіта і наяўнасць асобнай капліцы на старым царковішчы, адзначаецца толькі наяўнасць капліцы ў суседняй в. Люсіна [20, арк. 181]. Тытул малькавіцкай царквы паводле візіты 1820 г. — Св. Юрыя (Георгія), калятарам царквы запісаны Рудольф Тызенгаўз, апісанне разлегласці прыхода — у даўжыню 17 вёрст, ад бліжэйшай царквы ў в. Бостынь знаходзіцца за 7 вёрст, усяго ў прыходзе 160 дамоў, 837 душ (408 мужчын, 429 жанчын) [20, арк. 181]. Кліравыя ведамасці царквы за 40-я гг. XIX ст. і больш позні перыяд фіксуюць наяўнасць на тэрыторыі парафіі яшчэ адной капліцы — у в. Макава [17, арк. 155, 157].

Дынаміку змен колькасці парафіян можна праілюстраваць наступнымі лічбамі: 1844 г. — 129 дамоў, 1128 душ (518 мужчын, 610 жанчын) [17, арк. 158 адв.], 1851 г. — 134 дамы, 1149 душ (536 мужчын, 613 жанчын) [18, арк. 159 адв.], 1864 г. — 112 дамоў, 995 душ (446 мужчын, 549 жанчын) [19, арк. 173 адв.], (усе яны ў той час з'яўляліся ўжо паддан ымі памешчыкаў Патоцкіх).

Самыя раннія з захаваных метрычных кніг аб памерлых Малькавіцкай царквы за 1791–1813 гг. фіксуюць тры месцы пахавання: *«на Малкавіцкіх могілках»*, *«пры Люсінскай капліцы»* і *«пры Макаўскай капліцы»* [23, арк. 205–210, 213, 225, 233, 237, 246–249 адв., 254, 258–258 адв., 262–262 адв., 267–267 адв., 273–273 адв., 281–281 адв., 287–

287 адв., 293–294, 299–300, 304–305 адв., 310–311, 316–317, 322–323]. Дзе канкрэтна размяшчаліся «Малкавіцкія могілкі», дакументы не паведамляюць.

Пахаванні на старых малькавіцкіх могілках працягваліся і ў больш позні час. Самае позняе з захаваных на сённяшні дзень надмагілляў датавана 1907 г. Увогуле, тры самыя познія надмагіллі сведчаць, што на могілках у той час хавалі немаўлят (19 снежня 1905 г. — Віталь Багно, 1 снежня 1905 г. — Галіна Цвяткова, 13 лютага 1907 г. — Мікалай Цвяткоў). Магчыма, на той час існавала нейкая мясцовая традыцыя памерлых дзяцей хаваць менавіта на гэтых старых могілках. Позніх надмагілляў усяго некалькі, і яны рэзка адрозніваюцца ад астатніх паводле знешняга выгляду і часу вырабу. Ставіліся яны, відавочна, прадстаўнікамі мясцовых «вышэйшых колаў». 9-месячны Віталь Багно (Багон), які памёр ад запалення лёгкіх 19 снежня 1905 г., быў сынам памочніка начальніка раз’езда Люсіна Вільня-Ровенскай чыгункі Івана Сільевіча Багона [21, арк. 211 адв.–212].

Святар адмыслова не пазначаў у метрычных кнігах дакладнае месца пахавання. Насупраць запісаў аб месцы пахаванняў адпетых у Малькавіцкай царкве ў пачатку ХХ ст. паўсюль маецца стандартны запіс: *«На мясцовых могілках»* (рус. — *«На местных кладбищах»*). Такая ж нататка пастаўлена і насупраць запісу аб смерці вышэйзгаданага Віталя Багно.

Адзначаныя ў самым пачатку артыкула дзве асобы, надмагіллі якіх захаваліся найлепш — Настасся (без прозвішча) і Мяфодзі Камаровіч — верагодна, належалі да прывілеяваных саслоўяў навакольных зямель. Па-першае, знайсці дастаткова вялікі камень для вырабу надмагілля ў гэтым рэгіёне практычна немагчыма. Найбліжэйшая мясцовасць, дзе фіксуецца наяўнасць т.зв. *эрратычных валуноў* [11], гэта ваколіцы вёсак Дзяніскавічы, Шашкі, Малыя і Вялікія Круговічы — прыблізна 20 км ад месцазнаходжання малькавіцкіх могілак. Па-другое, неабходна было заплаціць за працу майстру, каб той адшліфаваў паверхню каменю і выбіў патрэбны тэкст. Усё гэта маглі сабе дазволіць найперш самыя знатныя ў парафіі асобы — калятары, шляхта і ўласна прадстаўнікі духавенства. Астатнія парафіяне малькавіцкай царквы ў лепшым выпадку ставілі па сваіх памерлых сваяках звычайны валун без надпісу альбо толькі з выявай крыжа. Менавіта такія помнікі складаюць абсалютную большасць на могілках.

Як бачна, у выпадку з Настассяй майстар не зафіксаваў на камяні яе прозвішча. Між тым гэтая жанчына з’ўлялася важнай асобай на тэрыторыі парафіі малькавіцкай царквы. На нашу думку, надмагілле

---

[11] Эрратычныя валуны альбо ледавіковая эрратыка — фрагменты горнай пароды, прынесенай ледавіком.

належыць жонцы альбо дачцэ малькавіцкага святара другой паловы XVI ст. У святарства *ritus graeci* беларуска-літоўскіх зямель у гэты перыяд у цэлым яшчэ не склалася традыцыя пазначаць устойлівыя прозвішчы на пісьме [12].

На камяні Мяфодзія Камаровіча, як можна бачыць, страчаны некаторыя фрагменты тэксту, у тым ліку першая літара прозвішча. Можна дапусціць, што першай літарай тут можа з'яўляцца не *К*, а *Т* альбо *С*. Аднак для *Т*, якую рэзчык піша ў варыянце перагорнутай *Ш* (*Ꙛ*), пры такой шчыльнасці літар на камяні проста не было месца. Прозвішча ж *Самаровіч* у гэтай мясцовасці альбо прылеглых тэрыторыях дакументы XVI – пачатку XVII ст. не фіксуюць. Камаровічы ж, наадварот, зафіксаваны ў дакументах Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. У перапісе войска ВКЛ 1528 г. адзначаны два носьбіты прозвішча Камаровіч: Мітка (Міцька) Камаровіч [26, с. 66], баярын Навагрудскага павета, і Ігнат Камаровіч [26, с. 151], баярын Пінскага павета, якія не маюць сваіх людзей і мусяць ехаць на вайсковую службу самі. На жаль, дакладнае месца пражывання гэтых асоб не адзначана. Мяфодзі Камаровіч з аднолькавай доляй верагоднасці мог з'яўляцца нашчадкам аднаго з іх. Аднак у дакументах аб дваранскім паходжанні роду Камароў-Стахоўскіх з фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу [24, арк. 613–614 адв.] падрабязна распісаны ўсе нашчадкі таго самага пінскага баярына Ігната Камаровіча (Камара). Асобы з іменем Мяфодзі ў іх не зафіксавана. Найбольш верагодна, што Мяфодзі Камаровіч з'ўляецца нашчадкам баярына Навагрудскага павета Міткі (Міцькі) Камаровіча.

Аналіз надпісу на помніку Мяфодзія наводзіць нас на цікавую гіпотэзу аб часе вырабу надмагілля. Як бачым, у тэксце адсутнічае дакладны год пахавання, літарай «а» (1) адзначаны толькі нумар тысячагоддзя. Далей да слова *рокꙋ* адсутнічаюць тры літары, якія б мусілі азначаць нумар стагоддзя, дзесяцігоддзя і года. Скрупулёзны агляд структуры каменя дазваляе сцвярджаць, што мы маем справу не са знішчэннем фрагмента надпісу — рэзчык спецыяльна пакінуў лакуну ў гэтым месцы. Так было зроблена, магчыма, паводле жадання заказчыка. На выказаную думку наштурхоўвае прыклад іншых помнікаў таго ж перыяду — надмагілля луцкага і астрожскага ўніяцкага епіскапа Кірылы Цярлецкага, а таксама надмагілля жонкі мінскага бурмістра Марыі Маслянкі, аб якіх ішла гаворка вышэй. Кірыла Цярлецкі, як вядома, памёр у 1607 г. Між тым на надмагільным помніку выбітыя толькі дзве кірылічныя літары *а* і *х* (1 і 6), якія азначаюць нумар тысячагоддзя і стагоддзя. Помнік багата і

[12] Фарміраванню ўстойлівых святарскіх прозвішчаў у канцы XVI – сярэдзіне XVII ст. прысвечаны падраздзел адной з нашых прац [15, с. 20–28 («Фарміраванне святарскіх дынастый»)].

па-майстэрску аздоблены. Відавочна, уладыка Кірыл замовіў яго незадоўга да смерці — у самым пачатку XVII ст. Пасля ж яго смерці паводле нейкай прычыны душапрыказчыкі ўладыкі не парупіліся, каб майстар выбіў на надмагіллі дакладны год трагічнай падзеі. У выпадку з каменем Мяфодзія Камаровіча, на нашу думку, адбылася такая ж гісторыя. Час замовы помніка самім Мяфодзіем прыпадае, напэўна, на 1590-я гады — менавіта таму майстар не пазначыў на камяні нават нумара стагоддзя. Смерць жа адбылася верагодней за ўсё ў тыя ж 1590-я гады — калі б Камаровіч пераі жыў 1599 год, ён, мабыць, папрасіў бы майстра дадаць на помнік нумар стагоддзя — літару *х* (6). Такім жа чынам тлумачыцца і наяўнасць адной толькі літары *а* (1000) у даце смерці Марыі Маслянкі, надмагілле па якой замаўлялася ў майстра ў самым канцы XVI ст.

У ходзе абследавання намі старых малькавіцкіх могілак высветлілася яшчэ адна праблема. Паводле сведчанняў галоўнага захавальніка фондаў Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея Віталя Герасімені, фотаздымкі гэтых надмагілляў ужо высылаліся на экспертызу ў Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, адкуль быў дадзены адказ, што прачытаць змест надпісаў немагчыма. Магчыма, падобныя звароты трапляюць на разгляд у «профільныя» аддзелы археалогіі. Між тым для прачытання зместу надпісаў неабходна валодаць навыкамі ў палеаграфіі XVI–XVII стст. і вопытам архіўнай, а не палявой археалагічнай работы.

Сюжэты аб наяўнасці камянёў з надпісамі даволі часта з'яўляюцца на форумах розных краязнаўчых сайтаў і з-за адсутнасці палеаграфічных навыкаў у іх апісальнікаў ствараюцца легенды, якія пасля тыражуюць сродкі масавай інфармацыі. Так, нядаўна на канале «Сталічнае тэлебачанне» прайшоў сюжэт аб наяўнасці ў парку в. Манькавічы Столінскага раёна камянёў, якія былі перавезены са Столінскага касцёла і якія ўтрымліваюць надпісы на грэцкай мове [31]. Журналісты разам з мясцовымі краязнаўцамі агучылі стандартную ў такіх выпадках легенду: гэта камяні-абярэгі, якія лічацца «бліжэйшымі сваякамі падобных камянёў у Барысаве (відаць, маюцца на ўвазе «Барысавы камяні». — *Д. Л.*)» На самай справе гэта надмагільныя камяні другой паловы XVIII ст.: «NИ [Выява крыжа] КА | ҂аѱп|е (1785) | Гри|гори» [8]. Большасць камянёў з «незразумелымі» надпісамі якраз і з'яўляюцца надмагіллямі XVI–XVIII стст., а, магчыма, і больш ранняга перыяду.

Зварот па экспертызу ў кампетэнтныя ўстановы дазволіць у будучым пазбягаць падобнай міфатворчасці.

**Высновы**. Такім чынам, старыя могілкі каля в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна ўяўляюць сабой *пагост* — месца знаходжання найбольш старажытнай малькавіцкай царквы, якая была перанесена непасрэдна

ў вёску ў канцы XVI ст. Як вынікае з аналізу тэкстаў надмагілляў, пахаванні тут адбываліся як мінімум з 1585 г. і да самага пачатку XX ст. Надмагіллі пачатку XX ст. сведчаць, што на той час паводле мясцовай традыцыі тут хавалі немаўлят.

Два надмагіллі ўтрымліваюць добра чытабельныя тэксты надпісаў на старабеларускай («рускай») мове канца XVI – пачатку XVII ст., якія былі пастаўлены па асобах, што належалі да прывілеяваных пластоў грамадства. Аналіз зместу надпісаў і параўнанне малькавіцкіх камянёў з іншымі прыкладамі вядомых «рускіх» надмагілляў канца XVI – пачатку XVII ст. зямель былога Вялікага Княства Літоўскага дазваляе сцвярджаць наступнае. Фармуляр складання надпісаў (наяўнасць 3–4 элементаў з 9 магчымых) сведчыць аб тым, што заказчыкі помнікаў належалі да катэгорыі асоб з даволі вялікімі фінансавымі магчымасцямі. Практыка замаўлення надмагілляў у майстра пры жыцці заказчыка, уласцівая беларуска-літоўскім землям разглядаемага перыяду, была характэрнай і для ваколіц Малькавічаў. Камяні дастаўляліся ў Малькавічы з адносна вялікай адлегласці — каля 20 км.

На падставе ўсяго пералічанага вышэй мясцовым уладам Ганцавіцкага раёна мэтазгодна ініцыяваць працэс уключэння старых могілак каля в. Малькавічы ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Два найбольш каштоўныя надмагіллі 1585 і 1590-х гг. заслугоўваюць таго, каб папоўніць фонды Ганцавіцкага раённага краязнаўчага музея і несумненна будуць з'яўляцца аднымі з найбольш каштоўных прадметаў у экспазіцыі па гісторыі хрысціянства на тэрыторыі Ганцавіцкага раёна.

## Крыніцы і літаратура

1. Groby rodziny Tyszkiewiczów. Opisał Eustachy Tyszkiewicz, b. prezes Komissyi Archeologicznej i kurator Muzeum starożytności w Wilnie, członek honorowy cesarskiej Akademii Nauk w Petersburgu, Królewskiej Akademii Historyi i Starożytności w Sztokholmie, Instytutu Archeologicznego w Londynie, Cesarskiej Publicznej biblioteki w Petersburgu, Serbskiej Maticy w Budystynie, towarzystw naukowych: w Moskwie, Kopenhadze, Odessie, Rydze, Moguncyi, Krakowie, Poznaniu, Mitawie, etc. — Warszawa, 1873.
2. Lietuvos Metrika Nr. 224 (1522–1530): 4-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabaigos kopija) / Spaudai parengė S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt. — Vilnius: Vilniaus Universiteto leidykla, 1997.
3. Matušakaite, M. Brahų antkapinė reljefinė plokštė Vilniaus bazilijonų bažnyčioje // Muziejai ir paminklai. — Vilnius, 1970. — P. 84–88, 137, 139.
4. Matušakaite, M. Išėjusiems atminti: laidosena ir kapų ženklinimas LDK. — Vilnius: Vilniaus Dailes akademijos Leidykla, 2009. — 351 p.
5. Афонский, П. Об одном малоизвестном памятнике древности в Минском Кафедральном Петропавловском соборе (Археологическая

заметка) // Минские епархиальные ведомости. 1887 г. — № 9. — Часть неофициальная.
6. Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал. — Вёска Малькавічы. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.gants-region.info/photo/vjoska_malkavichy/24; Дата доступу 29.07.2015.
7. Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал. — Старыя закрытыя могілкі. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.gants-region.info/index/staroe_zakrytoe_kladbishhe/0-2607; Дата доступу 29.07.2015.
8. Глобус Беларуси. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://forum.globus.tut.by/vewtopic.php?t=780&postdays=0&postorder=asc&start=30. Дата доступа: 28.06.2015.
9. Гродненский православно-церковный календарь или Православие в Брестско-Гродненской земле в конце XIX века. Изд. 2-е. Т. I. — Воронеж : Типография В. И. Исаева, 1899. — 456 с.
10. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. — Мінск : БЕЛТА, 2009. — 680 [3] с.
11. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. — Мн. : БелСЭ, 1984. — 367, [1] с.
12. Игнатьев, Р. Плита с древнею надписью в Минском Петропавловском кафедральном соборе // Минские епархиальные ведомости. 1878 г. — № 4. — Часть неофициальная.
13. Историко-статистическое описание Минской епархии, составленное ректором Минской духовной семинарии архимандритом Николаем. — Санкт-Петербург : в Типографии духовного журнала “Странник”, 1864. — [4], 315 с.
14. Каменный крест 1598 года // Могилевская старина. Сборник статей «Могилевских губернских ведомостей» под ред. Е. Р. Романова. — Вып. 1. — 1898 и 1899 гг. — Могилев, 1900. — [Без пагінацыі].
15. Лісейчыкаў, Д. В. Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. / Дзяніс Лісейчыкаў. — Мінск: Беларусь, 2015. — 717, [2] с., [16] л. іл.
16. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. — НД 864.
17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 136 (Мінская духоўная праваслаўная кансісторыя). — Воп. 1. — Спр. 40701. — Кліравыя ведамасці цэркваў Пінскага пав. 1843–1844 гг.
18. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40747. — Кліравыя ведамасці цэркваў Пінскага пав. 1851 г.
19. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 40856. — Кліравыя ведамасці цэркваў Пінскага пав. 1864 г.
20. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41258. — Генеральныя візіты цэркваў Любяшоўскага, Мазырскага, Пінскага і Слуцкага дэканатаў. 1819–1820 гг.

21. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 25. — Спр. 195. — Метрычныя кнігі Малькавіцкай царквы Пінскага пав. аб народжаных, шлюбаваных і памерлых за 1902–1906 гг.
22. НГАБ. — Ф. 1477 (Калекцыя тапаграфічных карт і планаў вёсак, сёл, маёнткаў Мінскай губерні). — Воп. 1. — Спр. 1813. — План зямлі праваслаўнай царквы ў в. Малькавічы Пінскага пав. 1855 г.
23. НГАБ. — Ф. 1633 (Брэсцкая ўніяцкая духоўная кансісторыя). — Воп. 1. — Спр. 5. — Метрычныя кнігі Малькавіцкай царквы Пінскага пав. аб народжаных, шлюбаваных і памерлых за 1791–1813 гг.
24. НГАБ. — Ф. 319 (Мінскі дваранскі дэпутацкі сход). — Воп. 1. — Спр. 32а. — Пастановы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні родаў. 1802 г.
25. НГАБ. — Ф. 936 (Пінскі земскі павятовы суд). — Воп. 1. — Спр. 4. — Актавая кніга. 1797–1799 гг.
26. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 523. Кн. Публічных спраў 1 / Падрыхт. А. І. Груша, М. Ф. Спірыдонаў, М. А. Вайтовіч; Рэдкал.: Г. Я. Галенчанка (адк. рэд.) і інш.; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : Бел. навука, 2003. — 442, [3] с.
27. Покровский, Ф. В. Археологическая карта Гродненской губернии. — Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1895. — 165 с.
28. Российский государственный исторический архив. — Ф. 823 (Канцелярия митрополитов греко-униатских церквей). — Оп. 3. — Д. 420. — Генеральные визиты церквей Гродненской, Волковысской, Клецкой, Несвижской, Слонимской и Циринской протопопий. 1696–1697 гг.
29. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора, Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол.: С. В. Марцелев (гл. ред.) и др. — Мінск : БелСЭ, 1990. — 417, [4] с.
30. Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. — Минск, 1848. — Минск : в Губернской типографии, 1848. — [2], XLVIII, 402 с.
31. Столичное телевидение. [Электронный ресурс]. Режим доступа: www.ctv.by/новости/деревня-маньковичи-брестская-область-последний-владелец-кароль-радзивилл-после-освобождения. Дата доступа: 28.06.2015.
32. Тимошенко, Л. Заповіти, смерть і поховання єпископа Кирила Терлецького // Дрогобицький краєзнавчий збірник. — Вип. XI–XII. — Дрогобич : Коло, 2008. — С. 467–483.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 24.08.2015

# Гісторыя

*З. В. Антановіч*

## Лёсы канцылярыстаў Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі ў канцы XIX ст.

Эфектыўнасць дзейнасці ўстановы, нягледзячы на яе памеры, арганізацыйна-прававую форму і час існавання, залежыць ад арганізацыі справаводства, якое ў сваю чаргу непасрэдна звязана з асабістымі і прафесійнымі якасцямі персанальнага складу служачых. У Расійскай імперыі рымска-каталіцкія кансісторыі, найбольш значнай з якіх як па памеры, так і па статусе была Магілёўская, з'яўляліся органамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіраўніцтва канфесіяй і духоўнага суда. Яны камплектавалі свае штаты з ліку духавенства, якое ўваходзіла ў склад прысутнасці, і свецкіх асоб, працаваўшых у канцылярыі. Да іх ліку адносіліся сакратары, загадчыкі сталоў, прыходарасходчык, рэгістратар, архіварыус, а ніжэйшую ступень іерархіі складалі канцылярысты, сярод якіх у канцы XIX ст. былі Антон Іванавіч Манкевіч і Аляксандр-Уладзіслаў Антонавіч Стэфановіч. На кожнага са служачых абавязкова заводзілася асабовая справа, дзе адлюстроўвалася выкананне ім службовых абавязкаў і асаблівасці асабістага жыцця.

Служачы Магілёўскай кансісторыі А. І. Манкевіч нарадзіўся 4 снежня 1854 г. у шляхецкай сям'і Яна і Карнеліі (народжаная Некраш) Манкевічаў, што жылі ў в. Кайманы Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні [4, арк. 42 адв.]. Ён атрымаў хатнюю адукацыю і быў 1 студзеня 1876 г. прыняты на ваенную службу з залічэннем у другую артылерыйскую брыгаду лейб-гвардыі. На працягу службы быў узнагароджаны бронзавым медалём і румынскім жалезным крыжам з нагоды руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг., падчас якой удзельнічаў у шэрагу баявых аперацый: пры Горным Дубняку; у паланенні варожага атрада 12 кастрычніка 1877 г.; ва ўзяцці Цялішскіх умацаванняў 16 кастрычніка 1877 г.; пры в. Шандорнікі 21, 22, 23 і 29 лістапада 1877 г. Пры Плеўненскай аблозе быў перамешчаны падчас вывядзення войск

на Балканы. 19 лістапада – 20 снежня 1877 г. удзельнічаў у трохдзённым баі пад г. Філіпаполем і яго ўзяцці. Звольнены са службы 8 верасня 1880 г., пасля чаго атрымаў перспектыву далейшага самавызначэння [4, арк. 44–47].

У канцы XIX ст. у канцылярыі Магілёўскай кансісторыі працаваў Аляксандр-Уладзіслаў Антонавіч Стэфановіч. Ён нарадзіўся 26 мая 1875 г. у сям'і Антона і Алены (народжаная Жылевіч) Стэфановічаў, шляхціцаў Расіенскага павета Ковенскай губерні. Аднак яго далучэнне да роду зацягвалася да 11 жніўня 1892 г. [5, арк. 6]. А.-У. А. Стэфановіч скончыў у 1892 г. 4-класныя курсы вучылішча пры Санкт-Пецярбургскім касцёле Св. Кацярыны і, пражываючы на пр. Ліцейным, д. 64, пак. 42, пачаў шукаць уладкавання на працу [5, арк. 1, 8–9 адв.].

Прыём на працу ў кансісторыю, зыходзячы з яе падначаленага цывільным органам улады стану, рэгламентаваўся нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай імперыі і падрабязна дакументаваўся [6]. Замяшчэнне пасад чацвёртага і ніжэйшых класаў адбывалася па ўзгадненні з вышэйшымі органамі дзяржаўнага кіраўніцтва [6, арт. 169]. Для займання пасады пятага і шостага класаў патрабаваўся папярэдні вопыт працы ў ведамствах: у першым выпадку на працягу 5 гадоў, у другім — трох [6, арт. 138]. Прашэнне аб прыняцці на пасаду афармлялася на імя імператара з дадаткам выпісаў з метрычнай кнігі аб нараджэнні, пасведчанняў аб паходжанні і воінскай службе або прыпісцы да ўчастка [6, арт. 177, 178, 180]. Паводле заканадаўства кандыдаты на ніжнія службовыя пасады давалі падпіску аб вернасці службе і тым, што не належаць і не будуць належаць да «масонскіх лож і іншых тайных таварыстваў, пад якой бы назвай яны не існавалі» [4, арк. 7; 6, арт. 183]. Акрамя таго, для паступлення на службу ў канцылярыю кансісторыі прадстаўляўся атэстат аб адукацыі, як гэта зрабіў А.-У. А. Стэфановіч.

Нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай імперыі да служачых дзяржаўных устаноў, у лік якіх уваходзіла Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя, быў выпрацаваны шэраг кампетэнцый: здаровы розум, добравольнасць і сумленнасць у выкананні абавязкаў, чалавекалюбства, вернасць да службы, добразычлівасць, праўдзівасць, бескарыснасць і ўтрыманне ад хабару, прававы і роўны суд да кожнага стану, заступніцтва за нявінных і тых, што бядуюць [6, арт. 705]. Пасля першаснай праверкі на адпаведнасць ім сакратар даваў характарыстыку ў выглядзе рапарта, на падставе якога па выніках пасяджэння кансісторыі ў Рымска-каталіцкую калегію складалася хадайніцтва аб прызначэнні на пасаду (таксама ў выглядзе рапарта). Да дакументаў, якія накіроўваліся ў вышэйстаячую ўстанову, дадавалася пасведчанне з губернскага праўлення аб адсутнасці перашкод да прыёму на працу. Усе дакументы па прызначэнні фарміраваліся ў асабістыя справы і афармляліся адпаведна.

Прашэнне 26-гадовага Антона Іванавіча Манкевіча аб прыёме на пасаду пісара (канцылярыста) Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі ад 4 лістапада 1880 г. было афармлена на імя імператара Аляксандра II на паперы з гербавай маркай коштам 60 кап. Да яго дадаваліся пасведчанні Ковенскага дваранскага дэпутацкага сходу аб шляхецкім паходжанні [4, арк. 42–42 адв.], залічэнні на адбыццё воінскай павіннасці і бестэрміновы білет аб звальненні з 2-й артылерыйскай брыгады 5-й батарэі лейб-гвардыі ад 4 верасня 1880 г. Апошні дакумент па прыналежнасці быў перададзены санкт-пецярбургскаму граданачальніку [4, арк. 1–1 адв.]. А.-У. А. Стэфановіч, які меў 17 гадоў, склаў прашэнне аб прыёме на працу 23 чэрвеня 1892 г. з дадаткам уласных адпаведных дакументаў [5, арк. 12–12 адв.].

Кансісторыя мела права звяртацца ў іншыя ўстановы для ўдакладнення звестак аб асобах, якія прэтэндавалі на пасады ў яе складзе. Напрыклад, выпіс з метрычнай кнігі аб нараджэнні А. І. Манкевіча быў запатрабаваны 26 кастрычніка 1882 г. з Ковенскага дваранскага дэпутацкага сходу для пацвярджэння дваранскага паходжання [4, арк. 2–2 адв.]. Магілёўская кансісторыя атрымала яго 12 студзеня 1883 г. пасля непрацяглых удакладненняў [4, арк. 15, 16, 29–30].

У мэтах пацвярджэння кваліфікацыі кансісторыя ў ліку іншых дзяржаўных устаноў мела права праводзіць іспыты. Як адзначалася, А. І. Манкевіч у адрозненне ад А.-У. А. Стэфановіча атрымаў хатнюю адукацыю, таму ён павінен быў паказаць ўменне не толькі «правільна чытаць і пісаць», але і наяўнасць пачатковых ведаў у галіне граматыкі і арыфметыкі [6, арт. 17, 18, 19]. Іспыты прымалі члены прысутнасці кансісторыі ў складзе віцэ-афіцыяла А. Даўгялы, засядацеляў К. Сарачынскага, А. Грынявіцкага і П. Кялкевіча, а таксама выконваючага абавязкі сакратара [4, арк. 6; 7, s. 7]. Вынікі іспыта афармляліся актам усталяванай формы [4, арк. 6].

У агульныя абавязкі служачых (канцылярыстаў) усіх чатырох сталоў кансісторыі, у тым ліку А. І. Манкевіча і А.-У. А. Стэфановіча, уваходзілі апрацоўка дакументацыі, падрыхтоўка і падача дакументаў на пасяджэнні кансісторыі ў выглядзе дакладаў. Пасля заканчэння справаводнага года ў абавязкі канцылярыстаў уваходзіла падрыхтоўка дакументаў для перадачы ў архіў: фарміраванне спраў, нумарацыя аркушаў і складанне вопісаў [1; 8].

Зносіны служачых канцылярыі з прысутнасцю Магілёўскай кансісторыі і кіраўніцтвам архідыяцэзіі ажыццяўляліся шляхам рапартаў, у якіх адлюстроўваліся іх штодзённыя патрэбы. Першае прашэнне А. І. Манкевіча, афармленае 26 жніўнем 1881 г. аб дазволе узяць шлюб з дваранкай рымска-каталіцкага веравызнання Палінай Мікалаеўнай Бароўскай і свабодна пражываць у г. Санкт-Пецярбургу на прыватнай

кватэры, было задаволена [4, арк. 12–12 адв.]. Але свабоднае пражыванне ўсё ж запатрабавала паўторнага звароту 9 верасня 1881 г. за выдачай пасведчання [4, арк. 13–13 адв.]. Аналагічным чынам паведамлялася аб яго хваробе 11 снежня 1881 г., у выніку чаго канцылярыст не мог з'явіцца на працу. У гэты перыяд ён пражываў на вул. Вярэйскай, д. 36, пам. 8 [4, арк. 14]. Паўторна ён захварэў 24 студзеня 1883 г. [4, арк. 17].

Паляпшэнне ўмоў пражывання служачых таксама знаходзілася ў веданні кансісторыі і арцыбіскупа як яе кіраўніка. 16 ліпеня 1886 г. у кансісторыю паведамляў наглядчык пабудоў калегіі і архідыяцэзіяльнага ўпраўлення надворны радца Я. Ляскевіч. Ён паводле заявы А. І. Манкевіча аб антысанітарных умовах у памяшканнях па вул. 1-й роты Ізмайлаўскага палка, д. 9, пак. 40 запрасіў для агляду мясцовага ўрача сапраўднага стацкага радцу Даўконта і інжынера-архітэктара стацкага радцу А. Д. Фіялкоўскага. Сябры камісіі пацвердзілі наяўнасць падстаў для скаргі, таму наглядчык прапанаваў выдаць сродкі А. І. Манкевічу на тэрмін арэнды жылля да правядзення капітальнага рамонту яго пакояў, што было зроблена з дапаможных капіталаў рымска-каталіцкай царквы [4, арк. 25–26]. Складанасці з месцам жыхарства меліся і ў А.-У. А. Стэфановіча. Ён 13 верасня 1893 г. звярнуўся з рапартам аб пашырэнні памяшкання, бо пражываў у адным пакоі разам з сястрой, братам і канцылярыстам Мікалаем Бяйнацкім. Адным з аргументаў было таксама тое, што сястра навучаецца ў жаночым вучылішчы пры касцёле Св. Кацярыны, а бацькоў няма. Прасіў выдаткаваць два пакоі з кухняй [5, арк. 13–13 адв.].

Утрыманне канцылярыста кансісторыі складала 270 руб. штогод (каля 22 руб. у месяц), што дазваляла купіць каля 20 кг. хлеба нават ва ўмовах аграрнага крызісу [2, с. 165]. Аднак пры адсутнасці іншых шляхоў атрымання даходу і наяўнасці сям'і, як у А. І. Манкевіча і А.-У. А. Стэфановіча, жыццё ўскладнялася. Таму канцылярскім служачым давалася магчымасць прасіць аб выдачы ім датэрмінова трэцяй часткі ўтрымання з адлічэннем 1/3 штомесячна, чым яны актыўна карысталіся, афармляючы адпаведныя прашэнні ў выглядзе рапартаў [6, арт. 216, 217]. 5 лістапада 1884 г. А. І. Манкевіч у рапарце адзначаў, што «трэці дзень нічога не еў, акрамя піцця, наяўнай у яго кватэры чыстай неўскай вады, але гэтым харчавацца далей не можа і быць прычынай смерці жонкі сваёй ад голаду». Нягледзячы на гэта, кансісторыяй было вырашана адмовіць яму, улічваючы, што яе супрацоўнікам была выдзелена прэмія з нагоды свят Божага нараджэння [4, арк. 18–18 адв.]. Іншым разам, 12 лістапада 1884 г. А. І. Манкевіч прасіў аб выдачы пазыкі ў 40 ці 30 руб. з адлічэннем па 1/3 заробку, пачынаючы з 20 снежня. Грошы былі выдаткаваны з канцылярскай сумы пад гарантыю выплаты па 5 руб. штомесяц [4, арк. 19–19 адв.]. З сумнай нагоды смерці сына і

працяглай хваробы жонкі 5 студзеня 1885 г. А. І. Манкевіч звярнуўся ў кансісторыю па фінансавую дапамогу. Гэты рапарт быў пададзены на разгляд арцыбіскупа А. К. Гінтаўта, які выдаткаваў 100 руб. [4, арк. 20–22]. Праз чатыры месяцы — 23 мая 1885 г. — А. І. Манкевіч прасіў выдаткаваць 40 руб. на лячэнне жонкі, якая «ўжо другі месяц як не падымаецца з ложка». Яму было выдадзена 30 руб. з адлічэннем па 6 руб. штомесяц [4, арк. 23–23 адв.]. У наступным годзе, 17 чэрвеня 1886 г., канцылярыст зноў прасіў выдаць грошы. Улічваючы, што А. І. Манкевіч выконваў абавязкі загадчыка першага стала, а таксама меў поспехі ў справаводстве, кансісторыя падала гэты рапарт біскупу [4, арк. 24–24 адв.]. Праз год, 1 ліпеня 1887 г., А. І. Манкевіч паведамляў у кансісторыю, што з прычыны стану здароўя жонкі ён вымушаны, паводле парадаў дактароў, адправіць яе на лета ў правінцыю, і гэта пацягнула выдаткі [4, арк. 31–31 адв.]. У наступным годзе загадчык стала А. І. Манкевіч накіраваў жонку на «марскія купанні», таму таксама прасіў выдаткаваць сродкі з дапаможных капіталаў, аб чым паведамлялася арцыбіскупу з Магілёўскай кансісторыі [4, арк. 32–32 адв.]. 20 верасня 1888 г. А. І. Манкевіч прасіў выдаць яму білет на свабодны праезд і пражыванне ў Смаленску, а таксама прадаставіць адпачынак працягам у 25 дзён. Яму быў дадзены 21 дзень, аднак ён вярнуўся на тры дні раней [4, арк. 33–34]. 20 мая 1889 г., спасылаючыся на працяглую хваробу жонкі, А. І. Манкевіч зноў прасіў аб выдачы сродкаў, акцэнтуючы ўвагу, што ім бралася пазыка, аднак працэнты ён не ў стане выплачваць [4, арк. 36–36 адв.]. У апошнім рапарце ад 20 мая 1892 г. А. І. Манкевіч прасіў аб выдаткаванні сродкаў у сувязі з высокім коштам на ўсе «жыццёвыя першай неабходнасці прадукты пры сямейным стане», што не давала магчымасці набыць вопратку. Акрамя таго, здароўе канцылярыста пагоршылася.

Аналагічныя праблемы меліся ў А.-У. А. Стэфановіча, які 28 чэрвеня 1893 г. звярнуўся з рапартам аб выдаткаванні сродкаў, зыходзячы з невялікага ўтрымання і знаходжання пад яго апекай непаўналетніх сястры і брата [5, арк. 12–12 адв.]. Праз год, 27 мая 1894 г., яго сітуацыя ўскладнілася ўласнай хваробай, зыходзячы з чаго канцылярысту паводле рашэння арцыбіскупа было выдаткавана 75 руб. [5, арк. 14]. Захворванне 18 мая 1895 г. зноў запатрабавала звярнуцца аб выдаткаванні сродкаў на лячэнне ўлетку. У атрыманым ад арцыбіскупа адказе прапаноўвалася выдаць А.-У. А. Стэфановічу 100 руб. [5, арк. 20–21]. Адпаведна праз месяц, 10 чэрвеня 1895 г., ён прасіў 28-дзённы адпачынак на лячэнне ў Санкт-Пецярбургскай губерні [5, арк. 22]. Аналагічная сітуацыя паўтарылася ў наступным годзе [5, арк. 23]. Нягледзячы на тое што паводле расійскіх нарматыўных прававых актаў падчас дачы адпачынку павінна ўлічвацца, каб адна асоба не карысталася ім празмерна часта і заста-

валася дастатковая колькасць служачых для арганізацыі працы ўстановы, а першымі атрымлівалі адпачынак старшыя па пасадах, да якіх А.-У. А. Стэфановіч не адносіўся, кіраўніцтва Магілёўскай кансісторыі задавальняла яго звароты [6, арт. 762].

Нягледзячы на фінансавыя складанасці, праца ў кансісторыі дазваляла ў межах агульнарасійскай нарматыўнай прававой базы атрымаць павышэнне па службе. Грамадзянскія чыны падзяляліся на 14 класаў. Канцылярскія служачыя для атрымання 14-га класа (першы чын) падзяляліся на два разрады. Да першага належалі асобы, якія атрымалі адукацыю ў гімназіях і іншых навучальных установах і маглі прэтэндаваць на чын калежскага рэгістратара праз год працы. У іншым выпадку тэрмін працы падаўжаўся на два гады. Далейшае павышэнне залежала ад добрасумленнасці службы і адзнак, пад чым разумеліся асаблівыя паслугі звыш службовых абавязкаў [6, арт. 244–248]. Іспыты для павышэння чыну праводзіліся па месцы працы [6, арт. 298]. Нягледзячы на зацверджаны тэрмін, А. І. Манкевіч быў узнагароджаны чынам калежскага рэгістратара амаль праз 11 гадоў — у 1891 г. «за выслугу звыш 10 гадоў у кансісторыі». У адрозненне ад іншай дакументацыі гэты рапарт аформлены на паперы з гербавымі маркамі коштам 80 кап. Паводле расійскага заканадаўства прэлат А. Даўгяла звяртаўся ў Магілёўскую кансісторыю аб прадстаўленні чыну без іспыта [4, арк. 37–38 адв.]. Рашэнне, якое ў дадзеным выпадку было пазітыўным, афармлялася загадам Міністэрства ўнутраных спраў, адкуль паведамлялася ў 1892 г. у падначалены яму Дэпартамент духоўных спраў іншаземных веравызнанняў, а затым — у кансісторыю [3, арк. 39–39 адв., 61]. У прадстаўленні да чыну адзначалася, што паводле рашэння кансісторыі ў перыяды 12 верасня – 18 кастрычніка 1885 г., 10 ліпеня – 1 верасня 1887 г. і 23 мая – 25 ліпеня 1888 г. А. І. Манкевіч выконваў абавязкі загадчыка першага стала, што значна перавышала яго службовыя абавязкі [4, арк. 44–47]. У структурным падраздзяленні кансісторыі разглядаліся пытанні адміністрацыйнага кіраўніцтва духавенствам дыяцэзіі. Да кампетэнцыі яго служачых пад кіраўніцтвам загадчыка адносілася ажыццяўленне кантролю за выкананнем указаў імператара і распараджэнняў вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, а таксама біскупа і кансісторыі па рэгламентацыі дзейнасці святароў. У стале не рыхтаваліся рашэнні па асобных справах, а толькі распаўсюджваліся агульныя звесткі для ведама духавенства ўсёй дыяцэзіі ў выглядзе, напрыклад, цыркуляраў. Надзвычайныя здарэнні, справы аб прызначэнні на пасады, заключэнні на выпраўленне і звальненні святарства і служачых кансісторыі, хрышчэнні яўрэяў, маёмасных спрэчках з прыватнымі асобамі і замацаванні складу сіндзікаў у парафіяльных касцёлах фіксаваліся асобна. Служачыя першага стала таксама выконвалі абавязкі па арганізацыі агульнага справаводства кансісторыі.

Яны разам з сакратаром складалі ўнутраны распарадак працы канцылярыі, графік дзяжурстваў, вядзенне рэгістратарам агульных рэестраў і журналаў. У першым стале таксама абагульняліся справаздачы ўсёй канцылярыі [3, арк. 5–5 адв.; 8, арк. 14–15]. У стале канцэнтравалася каля 10 % агульнага справаводства кансісторыі, пераважную частку якога складалі справы аб службе святарства, міжканфесійных пераходах. У абавязкі загадчыка стала, якія выконваў А. І. Манкевіч, уваходзіў кантроль справаводства і дакладанне сакратару аб прычынах яго замаруджанасці. Кожны месяц рыхтаваліся справаздачы ў выглядзе пералікаў колькасці разгледжаных спраў з пазначэннем нявыкананай або нявырашанай дакументацыі. Апрача таго, загадчыкі стала маглі падаваць свае даклады падчас пасяджэнняў кансісторыі, а таксама ўдзельнічалі ў дзяжурствах па канцылярыі. Пры падрыхтоўцы перадачы матэрыялаў справаводства ў архіў іх абавязкам таксама з'яўлялася складанне завяральнага запісу да дакументаў [8, арк. 2 адв.–4].

Далейшы лёс А. І. Манкевіча не быў звязаны з Магілёўскай кансісторыяй, аднак адлюстраваўся ў матэрыялах яе архіва. 23 чэрвеня 1893 г. канцылярыст прасіў аб звальненні па стане здароўя і сямейных абставінах, а таксама аб вяртанні яго дакументаў [6, арт. 776]. Яму былі выдаткаваны сродкі ў памеры 100 руб., але без пенсіённага забеспячэння з-за недахопу тэрміну абавязковай працы ва ўстанове. Зыходзячы з пазначанага, А. І. Манкевіч быў вымушаны шукаць новае месца працы [4, арк. 40–41, 43–43 адв., 49]. На новым месцы ад кіраўніцтва ўстановы патрабавалася высветліць паводзіны і ступень адказнасці асобы, жадаючай працаўладкавацца [6, арт. 189]. Да прашэнняў чыноўнікаў дадаваліся атэстаты аб папярэдняй службе і чыне, у якім яны звальняліся [6, арт. 192, 194]. Таму 29 лютага 1896 г. А. І. Манкевіч для паступлення на дзяржаўную службу прасіў Магілёўскую кансісторыю выдаць пасведчанні аб прычынах звальнення і абавязках, якія выконваліся ім падчас працы [4, арк. 50]. Аднак працаўладкаванне было складаным, аб чым сведчыць яго зварот у 1898 г. аб атрыманні сродкаў [4, арк. 52–52 адв.]. У 1902 г. А. І. Манкевіч прасіў кансісторыю выдаць паўторна атэстат аб службе з-за яго пашкоджанасці і бестэрміновую пашпартную кніжку. Стары атэстат быў пададзены ў кансісторыю і далучаны да яго асабістай справы [4, арк. 56–58 адв.]. Пошук новай працы завяршыўся поспехам толькі ў кастрычніку гэтага года, калі Галоўнае турэмнае ўпраўленне Міністэрства юстыцыі сакрэтна звярнулася ў Магілёўскую кансісторыю па звесткі службовага і маральнага характару аб А. І. Манкевічы ў сувязі з яго жаданнем паступіць на службу. У характарыстыцы адзначалася акуратнае выкананне службовых абавязкаў і добранадзейнасць [4, арк. 62–62 адв.]. Але да 1905 г. ён працягваў звяртацца ў кансісторыю па сродкі для лячэння хворай жонкі [4, арк. 63–63 адв.]. 20 кастрычні-

ка 1905 г. кансісторыяй была атрымана адносіна з Галоўнага турэмнага ўпраўлення Міністэрства юстыцыі аб адсутных звестках, неабходных для прадстаўлення А. І. Манкевіча да чыну губернскага сакратара (12-га па табелі аб рангах) [4, арк. 64–64 адв.]. Пытанне аб прызначэнні пенсіі было ўзнята кансісторыяй толькі ў 1905 г. [4, арк. 63–63 адв.].

Жонкі чыноўнікаў карысталіся асабістымі правамі мужоў, таму ім дазвалялася, як і ўдовам, атрымліваць перавагі адпаведнага чыну [6, арт. 535, 538]. У сувязі з гэтым, улічваючы адсутнасць А. І. Манкевіча, які ў красавіку 1901 г. выехаў у расійскія губерні для лячэння і працаўладкавання, у лістападзе П. М. Манкевіч звярнулася ў кансісторыю. Аргументуючы тым, што яна засталася без сродкаў для існавання, страціла зрок і не магла працягваць працаваць, прасіла кансісторыю аб фінансаванні яе аперацыі на вочы, і ёй было выдадзена 50 руб. [4, арк. 53–55].

А.-У. А. Стэфановіч таксама не жадаў працягваць службу ў Магілёўскай кансісторыі, як і А. І. Манкевіч, відавочна, паводле фінансавых прычын. 20 студзеня 1897 г. ён прасіў звольніць яго па стане здароўя. Яму было выдадзена 100 руб., хаця арцыбіскуп прапаноўваў 150 [5, арк. 26–29 адв., 33]. 20 жніўня 1897 г. ён зноў звярнуўся ў кансісторыю аб унясенні ўдакладненняў у пасведчанне аб сваёй службе. У прыватнасці, А.-У. А. Стэфановіч прасіў адзначыць, што атрымаў чын калежскага рэгістратара і медаль у гонар гадавіны знаходжання на прастоле імператара Аляксандра III, а таксама, што апрача ўтрымання, пражываў на кватэры, дадзенай працадаўцам. На яго думку, гэта дакладна адлюстроўвала яго ўзнагароджанне за працу [5, арк. 31–32].

Такім чынам, у канцы XIX – пачатку XX ст. канцылярыя Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі, як і іншыя дзяржаўныя ўстановы, мела праблемы з камплектаваннем штату. Агульныя патрабаванні засяроджваліся на пачатковай граматнасці, што дазвалялася высвятляць падчас унутраных іспытаў, праведзеных для А. І. Манкевіча, а таксама прымаць маладых служачых, як 17-гадовага А.-У. А. Стэфановіча, без вопыту працы. Нягледзячы на адсутнасць патрабавання аб канфесійнай прыналежнасці, на працу прымаліся пераважна каталікі рымскага абраду шляхецкага паходжання з небагатых сямей, як А. І. Манкевіч і А.-У. А. Стэфановіч. Кансісторыя мела права выдаткоўваць пры неабходнасці сродкі з працэнтных капіталаў і даваць служачым месца для пражывання. Падобныя ўмовы не кампенсавалі невялікага памеру ўтрымання, а пры наяўнасці сям’і і праблем са здароўем вымагалі частых зваротаў, аформленых у выглядзе рапартаў аб выдачы сродкаў. Прысваенне чыну паводле табеля аб рангах патрабавала правядзення яго праз загад Міністэрства ўнутраных спраў, што ўскладняла павышэнне па іерархіі. Штодзённасць звольненых канцылярыстаў прасочваецца ў асабістых справах тых з іх ліку, хто, як А. І. Манкевіч, працягваў звяр-

таццa па фінансавую дапамогу і выдачу неабходных для працаўладкавання дакументаў ужо пасля свайго адбыцця на пошукі іншай працы.

Падсумоўваючы факты, можна сцвярджаць, што канцылярыя Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі не з’яўлялася прывабным працаўладкаваннем, аднак служба дазваляла атрымаць неабходны вопыт і некалькі прасунуцца па кар’ернай лесвіцы, што прыцягвала небагатую шляхту.

### Крыніцы і літаратура

1. Антановіч, З. В. Арганізацыя справаводства рыма-каталіцкіх кансісторый на Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. // Беларускі археаграфічны штогоднік / Гал. рэд. Э. М. Савіцкі. — Мінск, 2008. — Вып. 9. — С. 155–166.
2. Мендельсон, Л. А. Теория и история экономических кризисов и циклов / Л. А. Мендельсон. — Т. 2. — М.: Мысль, 1964. — 692 с.
3. Справа аб размеркаванні справаводства Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі па сталах, 1873 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 6172.
4. Справа аб прызначэнні ў штат Магілёўскай кансісторыі А. Манкевіча, 1880–1892 гг. // НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 4. — Спр. 56.
5. Справа аб прызначэнні ў штат Магілёўскай кансісторыі А.-У. Стэфановіча, 1892–1896 гг. // НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 4. — Спр. 300.
6. Устав о службе по определению от правительства // Свод законов Российской империи / Сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг / Под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. — Санкт-Петербург: Русское книжное товарищество «Деятель», 1896. — Т. III. — С. 3–145.
7. Ordo divini officii et missarum pro Archidioecesi Mohileviensi in annum Domini 1880. — Petropolis: Consistorii romano-cath., 1881. — 136 s.
8. Інструкцыя дзейнасці рымска-каталіцкіх кансісторый, 1842 г. // Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). — F. 694. — Ap. 1. — B. 1687.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 15.06.2015

*В. У. Герасімчык*

## Удзел праваслаўнага насельніцтва Беларусі ў паўстанні 1863–1864 гг.

У апошнія гады істотна ўзрасла цікавасць да айчыннай гісторыі. Гэта ў першую чаргу звязана з ростам самасвядомасці грамадзян Рэспублікі Беларусь. Аднак многія падзеі беларускай гісторыі

празмерна ідэалагізуюцца і выкарыстоўваюцца як сродкі для падаграванне напружанасці ў міжэтнічных і міжканфесійных узаемаадносінах. Адзін з такіх прыкладаў — паўстанне 1863–1864 гг.

Ідэалагізацыя самога паўстання закладалася яшчэ паўстанцамі з ліку заможнай шляхты (Якуб Гейштар) [1] і расійскімі ўладамі (перш за ўсё Міхаілам Мураўёвым) [2]. У выніку акцэнт рабіўся не столькі на сацыяльных канфліктах, незадаволенасці шырокіх колаў насельніцтва сваім становішчам і іх імкненні да сацыяльнай справядлівасці, колькі на ідэях аднаўлення былой Рэчы Паспалітай і міжканфесійных канфліктах. Пры гэтым апошнія моцна абсалютызаваліся і перараслі ў стэрэатып не проста памылковы, але і шкодны для айчыннай гістарыяграфіі: сцвярджалася, што ў гэтай барацьбе паўстанцы былі каталікамі, а праваслаўныя выступалі на баку расійскіх улад.

Насамрэч, як сярод тых, хто падтрымліваў расійскія ўлады, выдаваў паўстанцаў, пісаў даносы, былі каталікі [3, с. 12], так і сярод паўстанцаў былі праваслаўныя, якія ўдзельнічалі ў бітвах, паказвалі тым дарогу і перадавалі інфармацыю пра перамяшчэнне войскаў, хавалі ў сваіх хатах параненых, дапамагалі ежай і г.д. Сярод іх былі нават праваслаўныя святары, на што першым у 1930-я гады звярнуў увагу адзін з лідараў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Янка Пазняк [4].

Аднак ужо расійскі палкоўнік Аляксандр Гейнс, які змагаўся супраць паўстанцаў у баях пад Коцкам, пры Калішы і Сямяцічах, у асабістым лісце да свайго сябра Канстанціна фон Каўфмана, аднаго з паслядоўнікаў М. Мураўёва на пасадзе генерал-губернатара «Паўночна-Заходняга краю» Расійскай імперыі, пісаў, што афіцыйныя данясенні замоўчваюць факты «ўпартай абыякавасці да нас сялян ва ўвесь час барацьбы» і што «гэты недавер ішоў так далёка, што, не ў дакор афіцыйным данясенням, многія рускія [праваслаўныя. — *В. Г.*] сяляне бралі ўдзел у паўстанні», а ў маі 1863 г., напярэдадні Мілавідскай бітвы ў Слонімскім павеце, «сяляне цэлымі станамі прымалі праваслаўную прысягу на вернасць мяцяжу» [5, с. 244].

Зразумела, такія выказванні, што змяшчаліся ў перапісцы вышэйшых асоб Расійскай імперыі, заставаліся ў межах кабінетаў. Гэта было звязана з выбранай лініяй на прадстаўленне паўстання міжканфесійным канфліктам і «польскай справай», пад якой разумелі «прэтэнзіі [палякаў. — *В. Г.*] на першынство ў славянскім свеце і ўжываныя імі сродкі дасягнення сваіх намаганняў» [6, с. 2]. І ўсё ж нават у Расійскай імперыі час ад часу з’яўляліся думкі, якія выпадалі з прынятай ідэалагічнай схемы. Даследчык жыцця М. Мураўёва А. І. Мілавідаў адзначаў: «Наконт мяцяжу 1863 года існуе перакананне, што сельскае насельніцтва Паўночна-Заходняга краю з самага пачатку руху было цалкам на баку рускага законнага ўрада. Гэта магчыма казаць толькі пра беларускія гу-

берні, з пераважным рускім, праваслаўным насельніцтвам, і тое, якое не цалкам праяўляла сваю адданасць [7, с. 343].

У перыяд існавання СССР ва ўмовах негатыўнага стаўлення афіцыйных улад да царквы і існавання класавай дзяржаўнай ідэалогіі рэлігійны аспект рэдка станавіўся аб’ектам увагі з боку навукоўцаў. Гэта адбівалася і на працы з архіўнымі дакументамі. У паказаннях арыштаваныя паўстанцы амаль заўсёды называлі сваё веравызнанне, але гісторыкі засяроджвалі ўвагу перш за ўсё на сацыяльным стане асоб, іх непасрэдным удзеле ў паўстанні і атрыманых за гэта пакараннях. Выключэннем тут з’яўляецца даследаванне В. М. Зайцава, дзе адзначаецца, што сярод рэпрэсіраваных паўстанцаў у Літве і Беларусі пераважную большасць складалі каталікі — 95,11 %, 1,21% былі іудзеі, 0,53 % іншыя веравызнанні, а праваслаўныя толькі 3,15 % [8, с. 114]. Дадзеныя лічбы адносяцца толькі да рэпрэсіраваных паўстанцаў, прычым з тэрыторыі Беларусі і Літвы разам узятых. Таму іх нельга пераносіць на канфесійную структуру паўстанцаў, паколькі справы далёка не ўсіх з іх дайшлі да суда. Змякчаючымі абставінамі былі раскаянне, добраахвотная здача, сацыяльнае паходжанне (селянін або мешчанін) і веравызнанне (праваслаўе). Тым больш лічбы В. М. Зайцава зроблены з улікам рэпрэсіраваных не толькі з Беларусі, але і з тэрыторыі Літвы, дзе амаль усё насельніцтва было каталіцкім.

Згодна з архіўным матэрыялам, праваслаўныя Беларусі ўдзельнічалі ўжо ў маніфестацыйным руху ў 1861 г. Жандарамі ў Гродна пры спяванні патрыятычных гімнаў у Бернардынскім касцёле 12 чэрвеня 1861 г. былі заўважаны праваслаўныя чыноўнікі Кулакоў з Гродзенскай казённай палаты і Вышчэловіч з Гродзенскай грамадзянскай палаты [9, арк. 38], а 31 ліпеня ў Фарным касцёле — Палькоўскі з канцылярыі Гродзенскага губернскага праўлення і Фядзюшка [9, арк. 39 адв.].

Праваслаўныя сяляне з самага пачатку паўстання ў студзені 1863 г. былі шырока прадстаўлены ў атрадах Беластоцкага, Бельскага і Сакольскага паветаў, удзельнічалі ў захопе горада Сураж (23 студзеня) і бітве пад Сямяцічамі (6–7 лютага). У атрадзе ваеннага начальніка Мазавецкага ваяводства Каятана-Віктара Старжынскага ваяваў 18-гадовы Сымон Якубавіч Казлоўскі з вёскі Жаўткі Беластоцкага павета [10, с. 135]. Касінерам у атрадзе Святлінскага (Пяруна) быў 25-гадовы Севярын Аўгусцінавіч Талочка з вёскі Чэхі [10, с. 211], у атрадзе Дзікоўскага два месяцы правёў 17-гадовы Маркел Ільіч Дзямянчык з вёскі Лысы [10, с. 287] (абодва — Бельскага павета). З вёскі Студнякі Сакольскага павета адразу некалькі праваслаўных сялян уступілі ў атрад ваеннага начальніка Гродзенскага ваяводства Ануфрыя Духінскага, у тым ліку 18-гадовы Васіль Мацвеевіч Сінкевіч [10, с. 137], які таксама змагаўся пад кіраўніцтвам Фелікса Улодака і Валерыя Урублеўскага.

Некалькі дзясяткаў праваслаўных змагаліся ў атрадзе падпалкоўніка Аляксандра Лянкевіча (Ляндэра), які здзейсніў паспяховы напад на кватэру лясніцтва ў мястэчку Азёры Гродзенскага павета. Сярод іх 17-гадовы панскі батрак Міхаіл Аляксеевіч Кучынскі з вёскі Талочкі, які ў сваіх паказаннях пасля амаль пяці месяцаў змагання адзначыў: «Мэтаю майго паступлення ў атрад было толькі тое, што абяцалі даваць грошы і вольнасць» [11, арк. 125]. Аснову атрада Лянкевіча складалі ў большасці сваёй маладыя людзі 16–30 гадоў, незадаволеныя сваім сацыяльным становішчам, як, напрыклад, праваслаўныя 16-гадовы Адам Восіпавіч Кашатук з вёскі Гліняны [11, арк. 43] і 17-гадовы Міхаіл Аўгусцінавіч Аўсейнікаў з вёскі Галавачы [11, арк. 403].

Аднак вайсковыя здольнасці паўстанцаў заставаліся на нізкім узроўні, пра што сведчыў праваслаўны Антон Андрэевіч Бартанчук, 30-гадовы селянін з вёскі Гуціца: «Лянкевіч <…> даў мне старую стрэльбу, і, прабыўшы некалькі дзён, я быў пастаўлены на пікет. І калі я стаў баявой стрэльбай песціцца, але, не ведаючы як са стрэльбай абыходзіцца, неспадзявана выстраліў, і стрэльба разарвалася. З ёй вярнуўся ў атрад, і ўжо стрэльба была ў мяне забрана, а прыстаўлены да абозу, для пераношвання цяжару і ўвесь час насіў на сабе валізку з аптэчкамі, медыкаментамі. А так пры атрадзе знаходзячыся брадзяжыў па розных невядомых мне лясах. І аднойчы, калі атрад быў нагнаны расійскімі войскамі, і ўцёк, быў нагнаны расійскімі двума жаўнерамі, з якіх адзін мяне параніў штыком у правае плячо, то я, адчуўшы боль, валізку, якую нёс, кінуў і сам ратаваўся ўцёкамі і, праходзячы па лесе, сустрэўся з атрадамі Гідва [магчыма, Антонія Гедройця. — *В. Г.*] і Астрогі [Аляксандра Парадоўскага. — *В. Г.*], якія мяне ў сувязі з атрыманай ранай у атрад не прынялі» [11, арк. 291 адв.].

Расійскія ўлады для прадухілення пашырэння паўстання ў Гродзенскім павеце тэрмінова перакінулі вайсковае падмацаванне. Ужо 4 мая паўстанцы былі разбіты ў баі ва ўрочышчы Святыя Балоты Гродзенскага павета супраць расійскага атрада на чале з падпалкоўнікам Мікалаем Мантэйфелем у складзе дзвюх рот Калужскага пяхотнага палка і 30 казакоў. Пасля паражэння ў атрадзе Лянкевіча засталося ўсяго 25 чалавек, да якіх 5(17) мая далучыліся добраахвотнікі з Ваўкавыска. Яны рухаліся ў лагер каля вёскі Мілавіды Слонімскага павета, дзе 22 мая (3 чэрвеня) адбылася самая буйная на тэрыторыі Беларусі бітва паўстання 1863–1864 гг. У ёй праваслаўныя з'яўляліся значнай часткай паўстанцкага войска. Так, у слонімскім атрадзе пад камандаваннем Францішка Юндзіла іх было як мінімум трэць. Значная частка дарослага мужчынскага насельніцтва сучаснага цэнтра праваслаўя ў Беларусі — мястэчка Жыровічы — далучылася да паўстанцаў разам з чатырма прадстаўнікамі духавенства Жыровіцкага манастыра, якія сталі касінерамі і пазней да-

лучыліся да атрада ваеннага начальніка Гродзенскага ваяводства Валерыя Урублеўскага. Сярод іх быў 19-гадовы Іван Шышко з вёскі Добрая Воля Ваўкавыскага павета, што служыў пры жыровіцкім архімандрыце [10, с. 255].

У паўстанцкі лагер на мяжы Гродзенскай і Мінскай губерняў сышліся некалькі атрадаў, у тым ліку ваўкавыскі пад кіраўніцтвам Густава Стравінскага (паўстанцкая мянушка Млотак), у складзе якога ў чатырох сутычках удзельнічаў праваслаўны 23-гадовы Восіп Восіпавіч Кірэйда з вёскі Горны Ваўкавыскага павета [11, арк. 575]. Уваходзілі праваслаўныя сяляне і ў іншыя атрады, сабраныя ў паўстанцкім лагеры на мяжы Гродзенскай і Мінскай губерняў. Адным з іх быў 27-гадовы Міхаіл Сямянчук з вёскі Шчэчыцы (у цяперашні час — Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл.). У сваіх паказаннях, як і большасць паўстанцаў, для захавання ўласнага жыцця ён сцвярджаў пра прымусовае далучэнне да атрада, у той жа час пазначыўшы, што «ў шайку вярбоўшчыкі людзей не даставілі, але некаторыя з'яўляліся добраахвотна» [10, с. 40]. М. Сямянчук быў узброены аднаствольнай стрэльбай і пісталетам. Пераважная ж большасць сялян былі касінерамі і мелі двувострыя косы з круком унізе ляза, насаджаныя на дрэўка і абматаныя вакол яго дротам, знятым з тэлеграфнай лініі.

Кіраўніком адной з частак касінераў у Мілавідскай бітве быў 20-гадовы праваслаўны мешчанін Аляксандр Унгэбаўэр [12, с. 97а], які да паўстання працаваў сталярам у родным Навагрудку. Даведаўшыся пра адыход жыхароў горада ў Налібоцкія лясы, добраахвотна падаўся туды разам з братам, каб далучыцца да атрада Вітальда Міладоўскага і ксяндза Феліцыяна Лукашэвіча, затым удзельнічаў у сутычках пад Сяльцом, Крывошынам, Ігнатавам і Львоўшчынай. Паводле загаду В. Міладоўскага, ён кіраваў павешаннем селяніна, западозранага ў шпіёнстве на карысць царскіх улад. Сам Міладоўскі, які выдаў імёны ўдзельнікаў той акцыі і шмат іншых паўстанцаў, застаўся жывы. У адрозненне ад схопленага Унгэбаўэра, які быў расстраляны ў Навагрудку 20 студзеня 1864 г.

Тады ж на пляцы за горадам расійскімі ўладамі быў расстраляны і 22-гадовы праваслаўны мешчанін Уладзіслаў Смыслоў з Навагрудка [12, с. 94b], які да ўступлення ў атрад працаваў фельчарам у мястэчку Крошын Навагрудскага павета, на радзіме паэта Паўлюка Багрыма. У атрадзе Міладоўскага Смыслоў даглядаў параненых, але запляміў сябе ўдзелам у павешанні селяніна, здзейсненага групай на чале з Унгэбаўэрам. Генерал-губернатар М. Мураўёў адхіліў рэкамендацыю суда аб замене смяротнага пакарання ссылкай на катаргу.

Ні праваслаўнае веравызнанне, ні юнацкі ўзрост не перашкаджалі ў вынясенні жорсткіх пакаранняў за ўдзел у Мілавідскай бітве, у якой

царскія войскі вымушаныя былі адступіць. У Сібір адправілі нават 16-гадовага Лявона Рыгоравіча Дудзіноўскага з вёскі Гавінавічы Навагрудскага павета [11, арк. 922] і 18-гадовага Лявона Пракопавіча Рачко з маёнтка Альбярцін Слонімскага павета, як і дзясяткі іншых праваслаўных паўстанцаў.

Да паўстання заклікаў 43-гадовы праваслаўны святар Мікалай Мароз [13, s. 2], настаяцель Параскеўскай царквы ў сяле Лапацін Пінскага павета. Пасля набажэнства ён збіраў на сваёй кватэры праваслаўную шляхту з ваколіц вёскі Колбы Пінскага павета, чытаў маніфест паўстанцкага ўрада і ўгаворваў далучацца да атрадаў. Калі ж шляхта не згадзілася, сказаў: «За гэта можна атрымаць і кулю ў лоб». Спрабаваў айцец Мікалай пераканаць і свайго дыякана Пракаповіча: «Няма чаго баяцца паўстанцаў, я і сябе, і вас змагу абараніць». На Мароза ў паліцыю данёс святар Страховіч з суседняга сяла Мясяцічы таго ж павета, з якім у айца Мікалая былі напружаныя асабістыя адносіны. У выніку па патрабаванні М. Мураўёва Сінод пазбавіў Мароза духоўнага звання, пасля чаго той быў адпраўлены ў ссылку на 10 гадоў катаржных прац у крэпасцях [13, s. 2]. У адрозненне ад пінскай праваслаўнай шляхты, якую айцу Мікалаю Марозу не атрымалася прыцягнуць да ўдзелу ў паўстанні, на суседняй Слонімшчыне такія выпадкі сустракаліся. 21-гадовы праваслаўны дваранін Іпаліт Восіпавіч Карацінскі [11, арк. 967], які вучыў сялянскіх дзяцей у ваколіцах мястэчка Быцень, у маі 1863 г. далучыўся да атрада Ф. Юндзіла, у складзе якога прыняў удзел у бітве пад Мілавідамі. Аднак найбольш шырокую падтрымку з боку праваслаўнай шляхты паўстанцы мелі на Беласточчыне, дзе ім дапамагалі нават матэрыяльна, як у выпадку ўладальніка вёскі Янава Сакольскага павета надворнага радцы Шчэрбы [14, арк. 22].

Некалькі праваслаўных святароў за сваю падтрымку паўстання былі пакараны накіраваннем у манастыр, як у выпадку былога ўніяцкага святара Мікалая Лойкі [13, s. 2], якога адправілі ў Калугу. Ён быў настаяцелем царквы ў вёсцы Грабёнка Ігуменскага павета Мінскай губерні. 22 красавіка 1863 г. айцец Мікалай паводле рашэння паўстанцкага атрада прачытаў сялянам у царкве маніфест пра паўстанне і добраахвотна перадаў паўстанцам прадукты. У адказ на абвінавачванні на следстве і судзе М. Лойка адзначыў: «Калі б на маім месцы быў толькі адзін афіцэр або генерал, то таксама са страху перад паўстанцамі загад выканаў» [13, s. 2]. У той жа час улады даведаліся, што святар прапаноўваў сялянам узяць на парукі верагоднага ўдзельніка паўстання селяніна Весіка, размаўляў у хаце і са шляхтай па-польску, а з сялянамі «па-сялянску» (па-беларуску), насіў пад рызай сутану каталіцкага ксяндза, забараняў называць сябе «бацюшка» або «свяшчэннік», толькі ксяндзом і панам, а таксама затрымаў у сябе замест таго, каб адаслаць да кансістора для зні-

шчэння 46 пячатак былых уніяцкіх цэркваў дадзенага дэканата. Акрамя гэтага, М. Лойка забараняў сялянам браць удзел у паланенні паўстанцаў, гаворачы: «Для гэтага ўрад мае даволі ўзброеных жаўнераў, а селянін — безабаронны, і паўстанец можа яго забіць або пакалечыць» [13, s. 2]. На бацьку таксама данёс і сын Міканор, якога Мікалай Лойка ўгаворваў уступіць у паўстанцкі атрад.

Сёння вядомы прозвішчы 14 праваслаўных святароў, якія былі рэпрэсіраваны за падтрымку або ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. Сярод іх 42-гадовы манах Супрасльскага манастыра Феадосій Дымінскі [10, с. 146], які дзейнічаў у атрадзе Каржанеўскага. Ён паходзіў з сям'і спадчынных святароў, у 1847 г. паступіў у Віленскі Свята-Духаў манастыр пад імем Іосіфа, дзе быў паслушнікам. Праз пяць гадоў пастрыжаны ў манахі праасвяшчэнным вікарным Філарэтам з імем Феадосія. Жыў у некалькіх манастырах Літвы, пакуль у лютым 1859 г. не быў пераведзены ў Супрасльскі манастыр, адкуль 26 жніўня 1863 г. атрымаў перавод у Жыровіцкі манастыр, па дарозе ў яго і трапіў у паўстанцкі атрад.

У той жа час неабходна падкрэсліць, што ў выпадку праваслаўных святароў, якія ўдзельнічалі ў паўстанні, важным з'яўлялася іх былая прыналежнасць да скасаванага ў 1839 г. уніяцтва, да аднаўлення якога прызывала «Мужыцкая праўда» (№ 6). Аднак у паказаннях іншых паўстанцаў, якія пазначаны як «праваслаўныя», асноўнай падставай для выступлення супраць улад Расійскай імперыі пазначаецца сацыяльная несправядлівасць і незадаволенасць умовамі аграрнай рэформы 1861 г.

Немагчыма абысці ўвагай і тое, што да паўстанцаў далучаліся таксама праваслаўныя рускія, як у выпадку прапаршчыкаў Новаінгерманландскага палка Люцыяна Рэмішэўскага і Фёдара Ельчанінава, якія далучыліся да паўстанцаў у Мінскай губерні. Пасля паражэння яны здолелі эмігрыраваць у Парыж і сталі вучнямі майстра гадзіннікавых спраў [15, с. 290].

Увогуле ў Польшчы планавалася фарміраванне расійскага легіёна («дружыны»), ідэю якога выношваў Міхаіл Бакунін [16, s. 404]. З іншага боку ў колах радыкальных «чырвоных» сярод паўстанцаў фарміравалася ідэя пра тое, што паўстанне пры дапамозе расійскай рэвалюцыйнай арганізацыі «Зямля і воля» і атрадаў з беларускіх зямель на чале з Людвікам Звяждоўскім (мянушка Тапор) павінна будзе ахапіць тэрыторыю Расійскай імперыі аж да Волгі і прынесці вызваленне ад сацыяльнага прыгнёту расійскім сялянам [10, с. 184].

Нават гэтыя прыклады паказваюць, што думка, быццам у паўстанні 1863–1864 гг. паўстанцы былі выключна каталікамі, а праваслаўныя выступалі толькі на баку расійскіх улад, не адпавядае рэчаіснасці. Таксама архіўныя дакументы даводзяць, што рэлігійны фактар не з'яўляўся вызначальным у паўстанні. У выпадку звычайных удзельнікаў тых

падзей з ліку сялянства (як праваслаўных, так і каталікоў) асноўнай прычынай далучэння іх да барацьбы была незадаволенасць існуючым сацыяльным становішчам і жаданне палепшыць свой матэрыяльны дабрабыт. Выключэннем з'яўляліся свядомыя прадстаўнікі рэпрэсіраванага за ўдзел і падтрымку паўстання праваслаўнага духавенства, якія захоўвалі памяць аб уніяцтве, ліквідаваным на беларускіх землях у 1839 г., і спадзяваліся на яго аднаўленне.

## Крыніцы і літаратура


1. Gieysztor, J. Pamiętniki z lat 1857–1865. — T. 1–2. — Wilno, 1913.
2. Граф Михаил Николаевич Муравьев. Записки его об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа, 1863–1866 гг. // Русская старина. — 1882. — № 11–12; 1883. — № 1–5; 1884 — № 6.
В БВО механизированными полками кавалерийских дивизий командовали: 4-м (с 13 февраля 1937 г. — 4-й Донской казачий механизированный полк) — В. В. Новиков (1932–1935), майор С. И. Капустин (1935–1936), майор М. И Потапов (1937–1939); 6-м (с 13 февраля 1937 г. — 6-й Кубанский казачий механизированный полк) — Д. Г. Пав-

лов (1931–1934), полковник С. М. Кривошеин (1934–1937); 7-м — полковник М. М. Богомолов (1935–1937), капитан И. О. Яркин (временно исправляющий должность, 1937–1938); 24-м — майор С. Я. Огурцов (1935–1939); 27-м — полковник С. З. Мирошников (1935–1936) [3; 17; 18].

**Реорганизация танковых частей**. К началу 1936 г. в БВО насчитывалось 496 танков БТ, 913 — Т-26, 469 — Т-37, Т-38, 536 — Т-27, 161 — БА, всего 2575 машин [14, с. 377].

Установившаяся в середине 1930-х гг. оргструктура АБТВ просуществовала до 1938 г., когда была произведена реорганизация механизированных частей и соединений в танковые. 22 мая 1938 г. приказом НКО СССР началась перегруппировка в месячный срок танков в войсках Белорусского, Киевского и Ленинградского военных округов. В целях ликвидации разнотипности танков в БВО приказывалось укомплектовать танками БТ-7 10-ю и 21-ю танковые бригады, танковые полки 7-й, 24-й и 27-й кавалерийских дивизий. Танками БТ-2 и БТ-5 укомплектовывались 5-я танковая бригада, танковые полки 4-й, 6-й и 11-й кавалерийских дивизий. Однобашенными танками Т-26 вооружались все танковые бригады с Т-26 и все радио-танки танковых рот стрелковых дивизий. Все танковые роты в стрелковых дивизиях вооружались двухбашенными танками Т-26.

В августе 1938 г. все механизированные полки, бригады и корпуса окончательно были переименованы в танковые. При этом внутренняя структура частей и соединений претерпела очень незначительные изменения. Бригады с танками БТ и Т-26 стали именоваться легкотанковыми, с танками Т-28 и Т-35 — тяжелыми танковыми. Легкотанковые бригады по штату состояли из четырех танковых батальонов по 54 линейных и 6 артиллерийских танков в каждом, разведывательного, мотострелкового батальонов и подразделений обеспечения. В бригадах тяжелых танков взводы включали по три танка. В состав корпусов входили легкотанковые бригады [16, с. 275].

К концу 1938 г. в составе АБТВ РККА имелось 4 танковых корпуса (10-й, 15-й, 20-й, 25-й), 24 отдельные легкотанковые бригады, 4 тяжелые танковые бригады и 3 химические (огнеметные) бригады [5, с. 201], а также значительное количество танковых батальонов и полков, входивших в состав стрелковых и кавалерийских дивизий.

Массовые репрессии 1937–1938 гг. нанесли серьезный удар по кадровому составу АБТВ. В этот период были расстреляны руководители АБТУ РККА (И. А. Халепский, Г. Г. Бокис), АБТВ БВО (П. П. Рулев), командиры механизированных бригад (Н. Н. Андрушкевич-Шепель, С. Д. Бобков, Я.-А. М. Тылтынь, В. В. Фавицкий, М. С. Факторович) и

др. [12; 14; 17] Все это сказалось на общей подготовке танкистов и эволюции структуры танковых соединений.

Таким образом, в 1930-е гг. в СССР была разработана организационная система автобронетанковых войск и осуществлено их развертывание. К концу 1937 г. автобронетанковые войска Красной Армии имели в своем составе войсковые танки (танковые батальоны и механизированные полки стрелковых и кавалерийских дивизий), танки РГК (тяжелые танковые бригады) и отдельные крупные механизированные соединения (бригады и корпуса). При этом большинство из них дислоцировались в западных военных округах, что отвечало общим военно-стратегическим замыслам советского руководства этого периода, когда главная угроза виделась в Польше и Германии.

### Источники и литература


1. Герои Советского Союза: Краткий биографический словарь: в 2 т. / пред. ред. коллегии И. Н. Шкадов. — М.: Воениздат, 1987–1988. — Т. 1 (Абаев — Любичев). — 1987. — 911 с.
2. Дубинский, И. В. Особый счет / И. В. Дубинский. — М.: Воениздат, 1989. — 256 с.; 6 л. ил. — (Военные мемуары).
3. Жуков, Г. К. Воспоминания и размышления: в 2 т. / Г. К. Жуков. — М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2002. — Т. 1. — 415 с., ил.
4. Захаров, М. В. Генеральный штаб в предвоенные годы / М. В. Захаров. — М.: Воениздат, 1989. — 318 с. ; 10 л. ил. — (Военные мемуары).
5. История Второй мировой войны 1939–1945 гг.: в 12 т. / гл. ред. комиссия А. А. Гречко [и др.]. — М.: Воениздат, 1973–1982. — Т. 2. Накануне войны. — 1974. — 474 с.
6. История танковых войск Советской Армии / под общ. ред. О. А. Лосика: в 3 т. — М.: Изд. Академии бронетанковых войск, 1975. — Т. 1. Зарождение и развитие танковых войск Советской Армии до Великой Отечественной войны (1917–1941 гг.). — 273 с.
7. Катукова, Е. С. Памятное / Е. С. Катукова; лит. ред.: Р. Поликашина, И. Веснина. — М.: Изд.-во Благотворит. фонда памяти писателя Владимира Чивилихина, 2002. — 438 с. : портр., ил.
8. Качелин, М. М. Дальний костер : воспоминания / М. М. Качелин; [лит. запись Г. И. Каца]. — М. : Воениздат, 1968. — 240 с. : 1 л. портр.
9. Краснознаменный Белорусский военный округ. — Минск: Беларусь, 1973. — 674 с. ; ил.; 12 карт.
10. Краснознаменный Киевский. Очерки истории Краснознаменного Киевского военного округа (1919–1979) / сост. Г. И. Серебряков, Б. Н. Буйский, А. А. Вовк и др. — Изд. 2-е, испр. и доп. — Киев: Изд-во полит. литературы Украины, 1979. — 418 с., ил., цв. карт.
11. Кубышкин, А. В память о герое / А. Кубышкин // Орловская правда. — 1982. — 29 января.

12. Национальный архив Республики Беларусь. — Ф. 4п. — Оп. 1. — Д. 11993. — Замечания Военного совета БВО на проект [директивных] указаний по мобилизационно-оборонной работе партийных органов и др. — 13 февраля — 10 ноября 1937 г. — 92 л.
13. Свирин, М. Н. Броня крепка. История советского танка. 1919–1937 / М. Н. Свирин. — М.: Яуза, Эксмо, 2005. — 384 с., ил.
14. Сувениров, О. Ф. Трагедия РККА 1937–1938 / О. Ф. Сувениров. — М.: ТЕРРА, 1998. — 528 с.
15. «…Уничтожить Россию весной 1941 г.» (А. Гитлер, 31 июля 1940 года): Документы спецслужб СССР и Германии. 1937–1945 гг. / сост. В. П. Ямпольский. — М.: Кучково поле, 2008. — 656 с.
16. Центральный государственный архив Советской Армии: Путеводитель: в 2 т. / сост. Н. Д. Егоров, О. В. Бризицкая, Т. Ф. Каряева и др.; ред. Т. Ф. Каряева, М. В. Стеганцев, Л. В. Двойных. — Миннеаполис, США: East View Publications, 1991–1993. — Т. 2. — 1993 — VI, 531 с.
17. Черушев, Н. С. Расстрелянная элита РККА (командармы 1-го и 2-го рангов, комкоры, комдивы и им равные): 1937–1941. Биографический словарь / Н. С. Черушев, Ю. Н. Черушев. — М.: Кучково поле; Мегаполис, 2012. — 496 с., ил.
18. Черушев, Н. С. Расстрелянная элита РККА. 1937–1941: Комбриги и им равные / Н. С. Черушев, Ю. Н. Черушев. — М.: Кучково поле; Икс-Хистори, 2014. — 528 с., ил.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.05.2015

*С. П. Марозаў*

## Ідэя рэстытуцыі Вялікага Княства Літоўскага ў ідэалогіі партыі «белых» у Беларусі (1861 – вясна 1863 г.)

Моцная настальгія па Вялікім Княстве Літоўскім, якую з канца XVIII ст. зведвала інтэлектуальная і палітычная эліта Беларусі, з новай сілай ажыла напярэдадні паўстання 1863 г. — апошняй спробы ліцвінскай (беларускай і літоўскай) шляхты ўзброеным шляхам адрадзіць інстытуты і традыцыі страчанай дзяржавы. Аднак пачаткова яна спрабавала дамагчыся сваіх дзяржаўна-палітычных ідэалаў з дапамогай рэформ.

Рух за працяг дзяржаўна-палітычнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага, які знаходзіўся «ў цяні» змагання за адбудову Польшчы (Рэчы Паспалітай), да гэтага часу не стаў прадметам спецыяльнага даследавання. Папярэдняя гістарыяграфія, расійская і польская, як правіла,

ставіла знак роўнасці на дзяржаўна-палітычных ідэалах нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы і ў Беларусі-Літве. Гэта ж у значнай меры ўласціва айчыннай гістарычнай навуцы, у якой раней не было прынята даследаваць ідэалогію партыі «белых» у Беларусі. Традыцыйна лічыцца, што яны хацелі адраджэння Рэчы Паспалітай [1, с. 69, 120; 2, с. 166–167].

Першымі звярнулі ўвагу на адметнасць поглядаў ліберальна-дваранскай апазіцыі ў Беларусі і Літве Аляксандр Ляскоўскі ў Берліне [3, с. 6–7, 24–25], Анатоль Смірноў у Маскве [4, с. 76, 79, 83–85], Давід Файнгаўз у Варшаве [5]. У апошні час айчынныя даследчыкі бачаць у лідарах і ідэолагах партыі «белых” у Беларусі прадстаўнікоў палітычнай думкі [6, с. 170–172], носьбітаў дзяржавастваральных ідэй [7, с. 221].

Выяўленыя аўтарам новыя крыніцы ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (Масква), Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы (Вільнюс) і Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (Санкт-Пецярбург) падрываюць складзены гістарыяграфічны стэрэатып адносна таго, што ўся шляхта Беларусі жадала далучэння яе тэрыторыі да Польшчы, і сведчаць пра адметнасць яе дзяржаўна-палітычных інтарэсаў. Гэта відавочна, хоць мы і маем справу з крыніцамі расійскага паходжання, у якіх беларусы і Беларусь схаваны нібы за двайной завесай: адпаведна за найменнем «палякі» і назвай «Літва».

Каштоўная інфармацыя аб працы інтэлектуалаў і грамадскіх настроях у Беларусі ў пачатку 1860-х гг., а таксама аб урадавых контрмерах адносна любых праяў сепаратызму выяўлена ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі, у фондзе Трэцяга аддзялення Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі (ф. 109) — палітычнай паліцыі, якая вяла барацьбу з рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым рухамі. Грамадска-палітычны рух у Беларусі адлюстроўваюць данясенні агентаў, агентурныя зводкі, выпіскі з перлюстраваных лістоў, запіскі дзяржаўных дзеячаў і прыватных асоб, судова-следчыя матэрыялы [8–12]. Дакументы Трэцяга аддзялення адлюстроўваюць тую небяспеку, якую бачыў афіцыйны Пецярбург у праектах расчлянення і аслаблення імперыі праз рэстаўрацыю Вялікага Княства Літоўскага, яго далучэнне да Каралеўства Польскага і наданне беларуска-літоўскім землям аўтаноміі.

У Аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, у фондзе 629 «Ратч В. Ф.» выяўлена інфармацыя, што датычыць створанага Аляксандрам Аскеркам Літоўскага крэдытнага таварыства [13], якое рыхтавала палітычную і фінансавую базу пад адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага.

У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы ідэалогію «белых» у Беларусі магчыма вывучаць на падставе своеасаблівых крыніц з фонду Часовага палявога аўдытарыята Віленскай ваеннай акругі (ф. 1248) —

судова-следчых спраў аўтараў праектаў аўтаноміі Вялікага Княства Літоўскага пачатку 1860-х гг. Віктара Старжынскага [14] і Аляксандра Ас-керкі [15–16]. У гэтых справах адклаліся рэчавыя доказы, заключэнні аб знойдзеных у іх паперах і перапісцы (часам з дадаткам копій найбольш яскравых дакументаў) — самая каштоўная і аб’ектыўна дакладная крыніца з усёй следчай справы; пратаколы допытаў з тэрміналогіяй, якая належыць прадстаўніку карных органаў, што вёў пратакол; пісьмовыя паказанні, для якіх характэрна імкненне абвінавачаных адмаўляць, прыменшваць сваю віну; заключэнні следства, дзе давалася ацэнка ступені іх «злачыннасці», і прысуды.

Дзейнасць «мяцежнага маршалка» Старжынскага, які азадачваў урадавы Пецярбург сваімі праектамі «ўваскрашэння Літвы», знайшла таксама адлюстраванне на старонках мемуараў віленскага генерал-губернатара Міхаіла Мураўёва [17].

***Узмацненне ў 1861–1862 гг. незалежніцкіх настрояў у асяроддзі шляхты Беларусі і мар аб юрыдычнай адасобленасці свайго краю***. У 1861 г. на беларускіх землях пачала нарастаць новая хваля вызваленчага руху, звязаная з агульным грамадска-палітычным уздымам народаў былой Рэчы Паспалітай. З новай сілай загучалі тут адозвы ўзняцца са зброяй у руках на барацьбу за незалежнасць Айчыны — «Літвы і Русі». На змаганні менавіта за гэту айчыну — Вялікае Княства Літоўскае, або гістарычную Літву, — акцэнтавана ўвага ў дадзеным артыкуле.

Увесну 1861 г. некаторыя губернскія і павятовыя маршалкі атрымалі праз пошту вершаваную «Адозву сына Айчыны да братоў ліцвінаў». У ёй гаварылася, што час уваскрашэння Айчыны прабіў; ліцвінам трэба абудзіцца ад летаргіі, разам узняцца на барацьбу, і тады «наш край паўстане з мёртвых». Тайная паліцыя высветліла, што адозву склаў памешчык Мінскай губерні Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Ён, паводле слоў данясення ў Трэцяе аддзяленне, «адрозніваючыся духам польскага патрыятызму, імкнецца ўсімі мерамі ўзбуджаць сялян супраць урада, <…> распаўсюджвае паміж імі напісаны ім на народнай мове верш «Гутарка старога дзеда», дзе ў самым нявыгадным для Расіі святле распавядаецца гісторыя Літвы з 1792 г. да цяперашняга часу, а таксама перавёў на народную мову вядомы польскі патрыятычны гімн» [8, арк. 5–6].

Назапашаная дзесяцігоддзямі крыўда знішчэннем іх дзяржавы і адабраннем яе апошніх атрыбутаў — Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г., Віленскага ўніверсітэта, царкоўнай уніі, а таксама незадавальненне злоўжываннямі мясцовых улад выйшлі наверх. «Жанчыны, просты народ і юнацтва не могуць прымірыцца з цяперашнім, шкадуюць мінулага і спадзяюцца на будучыню», — канфідэнцыяльны ліст з такім

зместам атрымаў 7 верасня 1861 г. міністр унутраных спраў Расійскай імперыі ад прадвадзіцеля дваранства Мінскай губерні [9, арк. 23].

У вучня Віцебскай гімназіі Рышарда Зялёнкі ў лістападзе паліцыя знайшла «паперы падбухторваючага зместу»: адозву да «землеўладальнікаў Літвы і Русі», зварот да «ліцвінак і русінак», а таксама заклік да духавенства Літвы, Жмудзі і Русі падрыхтаваць народ да барацьбы за аднаўленне Айчыны [11]. Можна дапусціць, што гімназіст меў дачыненне да распаўсюджвання гэтых рэвалюцыйных матэрыялаў.

У адозве да «землеўладальнікаў Літвы і Русі» гаварылася, што «падача братняй рукі народу» — надзяленне імі сялян зямлёй — стане «краевугольным каменем, аб які разаб'ецца веліч царызму» [11]. Адозва невыпадкова адрасавалася землеўладальнікам. Разуменне грамадствам усёй глыбіні крызісных з'яў, выкліканых паражэннем Расіі ў Крымскай вайне 1853–1856 гг., распачатыя Аляксандрам II сацыяльныя рэформы стварылі новую гістарычную сітуацыю. З канца 50-х гг. ва ўсёй імперыі разам з абмеркаваннем будучай зямельнай рэформы пачалося адраджэнне легальных форм грамадскага жыцця, фарміраванне лібералізму ў Расіі, арыентаванага на заходнееўрапейскія ідэі канстытуцыяналізму і парламентарызму. На беларускіх землях адраджалася ліберальная думка [6, с. 170].

Абмяркоўваючы сялянскае пытанне, лібералы Беларусі і Літвы паспрабавалі прыцягнуць увагу новага імператара да асаблівасцей і патрэб свайго краю. Паступова яны прыйшлі да ідэі яго нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў складзе Расійскай імперыі і дамагчыся сваіх ідэалаў спадзяваліся з дапамогай рэформ. Лібералы склалі «белае» крыло апазіцыйнага царскаму ўраду руху [6, с. 171–172]. «Розумы нашых палякаў усхваляваныя <…>, — паведамлялася пра настроі ў Заходнім краі ў данясенні ў Трэцяе аддзяленне. — Непрыхільнасць іх да ўрада ўзрастае, у коле сваіх, не саромеючыся, выказваюць свае ідэі, іншыя хочуць нейкія правы, іншыя трызняць аднаўленнем старой Польшчы <…>» [12, арк. 2–2 адв.]. Міністр Д. А. Мілюцін слушна заўважыў сувязь паміж рознагалоссямі вакол рэформы лібералаў і прыгоннікаў з патрабаваннем аўтаноміі Літвы — мясцовыя памешчыкі лічылі, што калі б адбылося яе жаданае ўз'яднанне з Польшчай, то сялянскае пытанне набыло б зусім іншы абарот [4, с. 76].

Спадзяванні шляхты і інтэлігенцыі атрымаць самакіраванне з рук Аляксандра II знайшлі адлюстраванне ў пададзеным на яго імя адрасе ад 50 памешчыкаў Магілёўскай губерні на чале з рагачоўскім маршалкам падпалкоўнікам Янам Богушам. 10 кастрычніка 1861 г. на сваім сходзе ў Рагачове яны выпрацавалі зварот да імператара з просьбай далучыць Магілёўскую губерню ў адміністрацыйных адносінах да Літвы, з якой яна «была спакон вякоў злучана»; вярнуць старажытныя правы,

замацаваныя ў Статуце ВКЛ, публічны галосны суд, Віленскі ўніверсітэт; дазволіць сялянам вярнуцца ва ўніяцкую веру. Складальнікі адраса апелявалі да замацаваных у трактаце 1773 г. абяцанняў Кацярыны II «не мяняць правоў і пастаноў народных для грамадскага дабра Беларусі», спасылаліся на заяву Аляксандра I на Венскім кангрэсе злучыць усе вобласці, далучаныя ад Польшчы, у адзінае цэлае і ўвесці ў іх народнае прадстаўнічае праўленне.

22 кастрычніка 1861 г. у Пецярбургу атрымана тэлеграма, што Я. Богуш вязе ў Магілёў «дзёрзкі палітычны адрас аб далучэнні да Польшчы», каб потым перадаць яго імператару [10]. Са сталіцы загадалі Богуша па дарозе перахапіць, «палітычны адрас злачыннага зместу» ў яго адабраць.

Маршалка аддалі пад суд Сената. Богуша абвінавацілі ў тым, што сход пад яго кіраўніцтвам асмеліўся прыняць «супрацьзаконную пастанову». Магілёўскія дваране «дазволілі сабе ўвайсці ў абмеркаванне прадметаў, якія адносяцца да карэнных дзяржаўных пастаноў і ўстаноў, і нават дазволілі сабе тлумачэнне трактатаў і дзеянняў вышэйшага ўрада». Падпісанты адраса, на думку афіцыйнага Пецярбурга, зрабілі «ў вышэйшай ступені супрацьзаконнае» — «далёка пераўзышлі межы дадзеных ім правоў і парушылі вернападданніцкія абавязкі». А маршалак не толькі «не ўнушыў ім усю злачыннасць іх дзеянняў», але яшчэ і сам падпісаў адрас на імператарскае імя. Да таго ж у здзейсненым ён не раскаяўся, а за гэта — яшчэ адзін артыкул «Зводу законаў» імперыі. З ведама Аляксандра II кіраўніка і ідэйнага лідара магілёўскай шляхты асудзілі на паўтара года зняволення ў Петрапаўлаўскай крэпасці.

З 21 жніўня 1862 г. пачаўся адлік турэмнага тэрміну Богуша. Выпускнік кадэцкага корпуса, паважаны ў Магілёўскай губерні 49-гадовы вайсковец, 18 з якіх ён аддаў службе ў артылерыі, гэты чалавек узяў на сябе смеласць данесці да ведама імператара ўсеагульную мару магілёўскай шляхты аб аўтаноміі злучаных у адзіны дзяржаўны арганізм беларуска-літоўскіх зямель з народна-прадстаўнічым праўленнем і да таго ж «не падзяляў <…> памкненняў палякаў» [10]. Праўда, праз 10 дзён Богуш быў адпушчаны на волю з нагоды дня каранацыі імператара [4, с. 78].

Расправа з маршалкам з Беларусі не спыніла шляхту. У 1862 г. падача адрасоў пачасцілася. Быў распрацаваны план іх прадстаўлення ад усіх губерняў. У верасні да імператара звярнулася ўкраінская шляхта з хадайніцтвам аб далучэнні Падольскай губерні да Каралеўства Польскага. Урадавым адказам ёй быў арышт губернскага і павятовых маршалкаў.

Наступнай была мінская шляхта. 29 лістапада на дваранскіх выбарах яна адзінадушна вырашыла хадайнічаць перад імператарам аб далучэнні да Каралеўства Польскага Мінскай губерні. Як пісаў Канстанцін

Каліноўскі ў сваёй «Тлумачальнай запісцы» следству 28 лютага 1864 г., гэтыя «нявінныя заявы» выклікалі пярэпалах у Пецярбургу, які прызнаў іх «бунтоўнымі», а рашэнне шляхты — дзёрзкім і незаконным. Пракурор паклаў тады на стол мінскаму маршалку два лісты: адзін — міністра ўнутраных спраў губернатару, другі — мінскага губернатара; падачу адраса цару абодва, міністр і губернатар, забаранялі [18, с. 51, 141, 308]. План падачы адрасоў не ўдаўся: урад, будучы апавешчаны, прыняў меры — забараніў іх [4, с. 78–79].

Адзін з агентаў Трэцяга аддзялення ўжо пасля 1863 г. адзначаў, што «палякі <…> у Заходнім нашым краі захоўвалі пастаянна надзею на адлучэнне гэтага краю ад Расіі», якую «пры ўсякім хваляванні ў Царстве Польскім спрабавалі ажыццявіць», і прапаноўваў меры папярэджання новага паўстання ў заходніх губернях: «Усякая думка аб якім бы там ні было раз'яднанні <…> павінна лічыцца дзяржаўнай здрадай і ўсякае выяўленне гэтай думкі павінна быць праследавана як дзяржаўнае злачынства» [12, арк. 1–2].

Урад імкнуўся абмежаваць уплыў беларуска-літоўскага дваранства, якое стала ў фронду. У той жа час царскія саноўнікі, каб прыцягнуць на свой бок мясцовую шляхту, давалі ўхілістыя адказы на яе хадайніцтвы аб прадстаўленні краю нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Таму лідары дваранскай апазіцыі губернскія маршалкі гродзенскі Віктар Старжынскі (Стажэнскі), мінскі Аляксандр Лапа і віленскі Аляксандр Дамейка, а таксама епіскап Адам Красінскі не гублялі надзеі дамовіцца з урадам і працягвалі пошукі пагаднення з царызмам аж да паўстання [4, с. 83].

Начальнік IV корпуса акругі жандараў Аляксандр Гільдэбрант у запісцы з Вільні ад 24 снежня 1862 г. паведамляў шэфу жандараў і начальніку Трэцяга аддзялення Васілю Далгарукаву пра плыні ў вызваленчым руху ў Літве і Беларусі. Ён пісаў пра «так званую ўмераную партыю, да якой належыць амаль усё адукаванае, заможнае дваранства Заходняга краю і лепшая частка каталіцкага духавенства»: «Перад урадам яна называе сябе кансерватыўнай і прыкідваецца, быццам не мае ніякай надзеі на злучэнне Заходняга краю з Польшчай, <…> а хадайнічае пакорліва аб польскай мове ў школах і судах, аб універсітэце ў Вільні і аб Літоўскім статуце, як аб неабходных патрэбах для дабра ўсяго краю.

Але гэтыя з выгляду ўмераныя жаданні хаваюць спела абдуманы вераломны намер. <…>

У апошні час у асаблівасці партыя ўмераных <…> выяўляе ўзмоцненую дзейнасць частымі з'ездамі ў розных месцах Літвы для нарад і для збору на патрыятычныя патрэбы грошай» [19, с. 148].

Да ліку «самых руплівых членаў гэтай партыі» А. Гільдэбрант аднёс В. Старжынскага, які спалучае «з нястомнай дзейнасцю хітры розум і гарачы патрыятызм» [19, с. 148].

***Гродзенскі маршалак Віктар Старжынскі — аўтар праекта «ўваскрашэння Літвы»***. Выразнікам інтарэсаў беларуска-літоўскай шляхты, прыхільнай да ідэі аўтаноміі Літвы, у пачатку 1860-х гг. выступіў ураджэнец Гродзенскай губерні, адукаваны, аўтарытэтны і ўплывовы граф Віктар Старжынскі (Стажэнскі) (1826–1882). Выпускнік Мюнхенскага ўніверсітэта, ён, згодна з мемуарамі М. Мураўёва, з'яўляўся ўдзельнікам «палітычных спіскаў» (тайнай арганізацыі), за што быў высланы на Каўказ і служыў там у 1847–1850 гг. у расійскай арміі. У 1856 г. памілаваны вярнуўся на радзіму і быў абраны шляхтай Гродзенскага павета маршалкам [17, с. 29–30]. У 1861 г. В. Старжынскі стаў маршалкам Гродзенскай губерні. На гэтых пасадах ён знайшоў разуменне і сімпатыі вышэйшых урадавых сфер у Пецярбургу, карыстаўся іх увагай і даверам [14, арк. 166]. Імператарскі намеснік у Царстве Польскім вялікі князь Канстанцін 26 снежня 1862 г. характарызаваў яго як «чалавека вельмі разумнага, дзелавога і добранамеранага» [19, с. 484]. Аднак, як пазней высветлілася, ён адначасова падтрымліваў тайныя зносіны з замежнымі «рэвалюцыйнымі агентамі» і стаў адным з кіраўнікоў партыі «белых» у Беларусі і Літве.

На працягу 1861–1862 гг. гродзенскі маршалак вёў перамовы з царскімі ўладамі наконт аўтаноміі беларуска-літоўскага краю і аднаўлення Віленскага ўніверсітэта: некалькі разоў размаўляў з міністрам унутраных спраў Пятром Валуевым, атрымліваў аўдыенцыі ў цара, накіроўваў ва ўрад свае праекты і запіскі. У сакавіку 1861 г. ён перадаў П. Валуеву і ваеннаму міністру Д. Мілюціну запіску, а ў жніўні накіраваў П. Валуеву ліст, у якім пазначыў памылкі ўлад у краі і выказаў пажаданні мясцовага дваранства, у тым ліку аб наданні аўтаноміі Літве [7, с. 221].

Паводле слоў М. Мураўёва, карыстаючыся даверам міністра замежных спраў Аляксандра Гарчакова, В. Старжынскі «падаваў яму праекты ўваскрашэння Літвы, аддзеленай ад Расіі, а злучанай з Польшчай; пераконваў, што толькі такім чынам можна супакоіць хваляванні ў краі, што мелі месца ўжо тры гады». Апекаваны П. Валуевым, шэфам жандараў Далгарукавым і шэрагам іншых асоб з бліжэйшага атачэння Аляксандра II, В. Старжынскі быў прадстаўлены самому імператару, меў нават вызначанае яму памяшканне ў палацы ў Царскім Сяле, неаднаразова быў прыняты манархам «і чытаў яму свае праекты». Узімку 1862 г. кіраўніка гродзенскай шляхты запрасілі суправаджаць Аляксандра II у яго паездцы ў Маскву. Граф быў пры імператары ўвесь час яго знаходжання ў другой расійскай сталіцы і намагаўся яго «ўсялякімі спосабамі пераканаць, што хваляванні ў Заходнім краі можна супакоіць толькі мяккасцю, ласкавасцю і вяртаннем межаў 1772 г.» [17, с. 30].

З Аляксандрам II ён веў размовы аб «жаданнях краю»: стварэнне мясцовай адміністрацыі, аднаўленне дзеяння Статута ВКЛ, адкрыццё Віленскага ўніверсітэта з трыма факультэтамі (юрыдычным, эканамічным і медыцынскім), навучанне на роднай мове карэнных нацыянальнасцей краю (польскай, беларускай, літоўскай), стварэнне Крэдытнага і Земляробчага таварыстваў і да т.п. На думку ліберала, толькі ажыццяўленне гэтага праекта царом магло папярэдзіць рэвалюцыю і стварыць умовы для эканамічнага і культурнага развіцця краю. Вячаслаў Шалькевіч называе яго праектам нацыянальна-культурнай аўтаноміі [6, с. 171–172]. Праект гэты выпрацоўваўся на з’ездах прадстаўнікоў беларуска-літоўскага дваранства, якія ў 1862 г. адбываліся ва ўсіх губернях і паветах краю. У маі, верасні і лістападзе ў Вільні адбыліся іх агульныя з’езды. У верасні яны абралі камітэт белых, у які ўвайшлі патрыёты Вялікага Княства Літоўскага, якія не змірыліся са стратай сваёй дзяржавы, — лідары грамадскай думкі В. Старжынскі, А. Аскерка, а таксама Антоні Яленскі, Станіслаў Зіберг-Плятэр, Францішак Далеўскі і Якуб Гейштар [6, с. 171; 19, с. 164].

Аднак давер і сімпатыі да гродзенскага маршалка ў блізкім атачэнні імператара, як пісаў у сваіх успамінах М. Мураўёў, а яшчэ і «засляпленне <…> было такім вялікім, што верылі Старжынскаму як аракулу» [17, с. 30]. Зразумелыя нараканні віленскага генерал-губернатара на тое, што ідэя надання Заходняму краю поўнай аўтаноміі, вяртання яму ўсіх ранейшых ільгот сустракала яўную сімпатыю нават пры двары, а некаторыя высокія чыноўнікі (міністры ўнутраных і замежных спраў, шэф жандараў, міністр пошты) яшчэ і аказвалі пратэкцыю «ўваскрашальнікам польскай айчыны». З трох ворагаў — бунту, пецярбургскага і варшаўскага урадаў — змаганне з двума апошнімі было для М. Мураўёва найбольш цяжкім [17, с. 32, 73–75, 77–78]. «Польскай справе» спрыялі таксама расійскія дэмакраты. Галоўнымі праціўнікамі аўтаноміі Літвы з’яўляліся ва ўрадзе міністр дзяржаўных маёмасцей Аляксандр Зеляной і ваенны міністр генерал Дзмітрый Мілюцін [17, с. 76].

Згодна з успамінамі М. Мураўёва, В. Старжынскі, калі вярнуўся ў 1862 г. з Масквы ў Гродна, перастаў лічыцца з мясцовым губернатарам (Уладзімірам Назімавым), выказваў яму яўную непавагу. Акрыяла духам і гродзенская шляхта, слухаючы аповеды свайго маршалка пра добры прыём у імператара, пратэкцыю пецярбургскіх улад. «Сваім зачараваннем, — пісаў пра яго М. Мураўёў, — авалодаў усімі розумамі вар’яцкай польскай інтэлігенцыі ў краі; усе палякі бачылі ў ім будучага збавіцеля, цяпер адважна грэбуючы мясцовымі ўладамі» [17, с. 30].

Хадайніцтвы В. Старжынскага за свой край у Пецярбургу і Маскве (якія чаргаваліся з паездкамі ў Варшаву і Парыж) вынікаў не далі. З вуснаў П. Валуева ён атрымаў адказ, што ні пра якія саступкі не можа быць

і размовы, пакуль дваранства Літвы не дакажа ўраду сваю вернасць [4, с. 84]. Пераканаўшыся, што ўрад не дасць яму свабоды дзеянняў, мясцовае дваранства перайшло ад супрацоўніцтва з царызмам да адкрытай апазіцыі яму.

З пачаткам паўстання В. Старжынскі разам з маршалкамі Мінскай губерні Аляксандрам Лапам і Магілёўскай губерні князем Стэфанам Любамірскім арганізавалі дэмарш маршалкаў. У лютым 1863 г. ён напісаў дзёрзкія лісты да імператара і міністра ўнутраных спраў, у якіх абвінавачваў урад у падбухторванні сялян супраць памешчыкаў, а таксама ў выкарыстанні жорсткіх сродкаў пераследу і ўзброенай сілы супраць тых, хто з такой палітыкай нязгодны. В. Старжынскі заявіў, што ў гэтай сітуацыі не лічыць сябе абавязаным служыць ураду як маршалак шляхты і падаў у адстаўку [17, с. 30–31]. 16 сакавіка ён звярнуўся з цыркулярным лістом да павятовых маршалкаў Гродзенскай губерні, у якім тлумачыў прычыну, што прымусіла яго падацца ў адстаўку.

У сваім лісце, напісаным у Гродна, В. Старжынскі сцвярджаў, што ад гаспадарання новых улад і праведзеных імі пераўтварэнняў «уся Літва сістэматычна ў развіцці свайго жыцця звернутая назад і затрыманая» [14, арк. 12]. Ён, як «грамадзянін, які любіць сваю Бацькаўшчыну і верны яе гістарычным паданням», «на працягу двух мінулых гадоў стараўся прымірыць народ з урадам, у надзеі <…> выклапатаць такія ўстановы і пераўтварэнні, якія кожны, нават самых умераных жаданняў грамадзянін, лічыць істотным і неабходным» [14, арк. 9, 18 адв.]. Але яго «вельмі ўмераную праграму не ацанілі належным чынам»: напісаныя ім праекты рэформ — запіска, пададзеная ў лютым, і прашэнне («мемарыял») у снежні 1862 г., «а таксама пры кожным зручным выпадку вуснае тлумачэнне засталіся дагэтуль без усялякага выніку для Літвы» [14, арк. 19 адв.–20]. Пераканаўшыся, што яго двухгадовыя намаганні былі дарэмныя, В. Старжынскі падаў прашэнне аб адстаўцы.

Гэтыя нараканні на ўрад прагучалі «ў такі смутны час, калі ўжо і без таго [былі — *С. М.*] усхваляваныя розумы тутэйшага краю ілжывымі ідэямі і заклікамі рэвалюцыянераў» [14, арк. 20 адв.]. Прыклад свайго лідара падтрымалі павятовыя маршалкі. Дэмарш гродзенскага маршалка атрымаў міжнародны рэзананс, яго ліст аб нежаданні служыць рускаму ўраду трапіў у замежную прэсу [14, арк. 78 адв.].

Гэтак жа паводле загаду Нацыянальнага ўрада ў пачатку мая 1863 г. у адстаўку пайшлі мінскі губернскі маршалак А. Лапа і магілёўскі С. Любамірскі, а ўслед за імі пасаду таксама пакінула шмат павятовых маршалкаў [18, с. 311]. Калектыўная адстаўка маршалкаў вясной 1863 г. была дэманстрацыйным асуджэннем палітыкі царскага ўрада з боку ліберальнага дваранства Беларусі [4, с. 85]. Сваім учынкам яны паставілі ўрад, хоць на кароткі час, у складанае становішча [14, арк. 12].

Да такой масавай адмовы маршалкаў ад службы віленскі генерал-губернатар У. Назімаў не быў падрыхтаваны: адных ён угаворваў застацца на пасадзе, прашэнні іншых чакалі рашэння. В. Старжынскі праз прыязнага яму міністра ўнутраных спраў атрымаў згоду імператара на звальненне са службы па ўласным жаданні пры ўмове, аднак, не пакідаць Гродна.

Іншы ход гэтай «абуральнай маніфестацыі» ўраднікаў даў новы генерал-губернатар. М. Мураўёў звольніў з пасады ўсіх маршалкаў, якія сваёй падачай у адстаўку «ўсчалі бунт». Адных ён выслаў на пасяленне ў глыб Расіі, а іх маёнткі секвестраваў. Тых, хто ў сваіх паданнях аб адстаўцы ўжыў «абразлівыя выразы» ў адрас урада або ўдзельнічаў у тайных антыўрадавых арганізацыях і сходах, загадаў арыштаваць і аддаць ваеннаму суду.

За заявамі мінскага і гродзенскага маршалкаў — «арганізатараў і галоўных дзеячаў бунту ўраднікаў краю» — аб нежаданні служыць такому ўраду, які нібыта падбухторвае сялян супраць памешчыкаў, Мураўёў убачыў намер выклікаць агульнае незадавальненне беларускага дваранства і схіліць яго да больш руплівага ўдзелу ў бунце, на чале якога самі і сталі [17, с. 29].

А. Лапу ў Мінску арыштавалі, прывезлі ў Вільню, дзе асудзілі на высылку ў Пермскую губерню. Графа Старжынскага «па падазрэнні ва ўплыве на сучасны ў краі непакой» [14, арк. 6] пад канвоем таксама даставілі ў Вільню і, трымаючы пад арыштам, аддалі пад ваенны суд.

28 і 30 мая, 4 і 18 чэрвеня адбыліся допыты. Сярод пытанняў, якія высвятляла следства, было наступнае: «Да чаго ў лістах вашых да павятовых правадыроў змешчаны намёк аб гістарычных паданнях краіны ў такі час, калі гэтая ідэя ўваходзіць у планы падбухторшчыкаў супраць Расіі?». Графу прыйшлося апраўдвацца, што, расстроены няўдачай сваіх хадайніцтваў у Пецярбургу і Маскве, ён пісаў, не ўзважваючы выразаў, «але аб палітычным сэнсе адрыньвання Літвы ад Імперыі і не думаў і не мог думаць» [14, арк. 13 адв.].

На следстве В. Старжынскі сцвярджаў, што не падзяляе ўсеагульнага «жадання адміністрацыйнага далучэння Літвы да Царства Польскага»; падкрэсліваў, што пастаянна дзейнічаў «по правінцыйнаму кірунку», — гэта адлюстроўваюць яго запіскі ўраду [14, арк. 9 адв.], і «словамі пра любоў да Айчыны і вернасці гістарычным паданням ён не надаваў палітычнага сэнсу і не падтрымліваў гэтай ідэі» [14, арк. 161].

Наконт выразу ў яго лісце аб «затрыманні ўнутранага развіцця Літвы» граф настойваў на сваім: «Краіна, якая мела свае ўстановы мясцовыя, навучальныя і судовыя, адны — якія даюць бліскучы плён, <…> іншыя, якія ўвайшлі ў норавы, такая краіна, калі ёй гэтыя ўстановы адабраныя, <…> не можа не глядзець на сябе як стрыманую на шляху

развіцця». Так, адабраўшы ўніверсітэт, затрымалі яе «на шляху развіцця разумовага» [14, арк. 16 адв.]. Старжынскі вымушаны быў прызнаць, што «ў сваёй самаўпэўненасці <…> памыляўся», калі спадзяваўся «выклапатаць ва ўрада інстытуцыі і рэформы для краіны», у надзеі, што яго «руплівая для выгоды Літвы служба прынясе ёй карысць» [14, арк. 38–38 адв.].

Следчых цікавіла, чаму ён «прыняў на сябе пратэктарства ўсёй Літвы, тады як ён быў правадыром толькі Гродзенскай губерні» і «не абавязаны быў па службе клапаціцца пра цэлую Літву» [14, арк. 10, 12 адв.].

Ваенны суд прызнаў яго вінаватым у напісанні «ў духу абуральным» і распаўюджванні «злачыннага цыркуляра», у якім «дазволіў сабе ганіць усталяваны ў Заходніх губернях вобраз праўлення і абражаць урад, асуджаючы дзеянні яго па кіраванні гэтымі губернямі» [14, л. 155]. Мяцежнага маршалка аднеслі да другой катэгорыі палітычных злачынцаў [14, арк. 195]. Прысуд — шасцігадовая сібірская катарга — у Пецярбургу змякчылі і абмежавалі годам зняволення ў Бабруйскай крэпасці з наступнай высылкай у Варонежскую губерню [17, с. 31].

У верасні 1865 г. В. Старжынскі пачаў хадайніцтвы аб дазволе вярнуцца на радзіму. Пераемнікі М. Мураўёва — генерал-губернатары Канстанцін фон Каўфман і Эдуард Баранаў катэгарычна запярэчылі супраць. Ведалі, што ён «адзіна сваім асабістым прыкладам паклаў пачатак тым усім шматлікім унутраным беспарадкам, ліквідацыя якіх склала галоўную задачу ўціхамірвання мінулага бунту і сляды якіх засталіся да цяперашняга часу» [14, арк. 182–182 адв.].

Трэцяе аддзяленне мела цяпер новую інфармацыю наконт мяцежнага графа: ён прапаноўваў варшаўскаму Цэнтральнаму нацыянальнаму камітэту «мець для Літвы энергічнага камісара, амаль з дыктатарскай уладай», а напярэдадні свайго арышту раіў стварыць у Аўгустоўскай губерні новы моцны атрад «для другаснага, рашучага ўзняцця Літвы» на паўстанне, абяцаў пакрыць частку расходаў і прапаноўваў даверыць яму кіраўніцтва праектуемай экспедыцыяй.

Цяпер, праз гады, імперскім уладам было відавочна, што Старжынскі з’яўляўся «адным з найважнейшых дзеячаў мінулага паўстання», «найвышэйшым кіраўніком адной з мяцежных партый у Літве» [14, арк. 205 адв., 224 адв.–225], а яго цыркулярны ліст адыграў ролю сігнала для разрастання паўстання па ўсім краі і ўказання мясцоваму дваранству наконт ладу дзеянняў [14, арк. 200 адв.–201]. І праз гады В. Старжынскі, «як кіраўнік мяцежных задум», успрымаўся мясцовымі ўладамі нават больш небяспечным за тых, хто адкрыта са зброяй у руках паўстаў супраць урада [14, арк. 201–201 адв.]. Баяліся яго вялізнага аўтарытэту і ўплыву на мясцовае дваранства.

***Літоўскае земскае крэдытнае таварыства як праект адраджэння Вялікага Княства Літоўскага***. Гістарыяграфічная традыцыя лічыць, што асноўную падрыхтоўчую работу да паўстання правёў створаны летам 1862 г. у Варшаве Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК), а ў Беларусі і Літве, якія аказаліся недастаткова падрыхтаванымі да заклі-ку ЦНК 22 студзеня 1863 г. да выступлення, самую значную ролю ў паўстанцкім руху адыграў Канстанцін Каліноўскі. Аднак справа 348 фонду 629 «Ратч В. Ф.», якая захоўваецца ў Аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу [13], дазваляе адкрыць завесу над таямніцай сур'ёзнай і прадуманай падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве аж да распрацоўкі праекта ўладкавання Вялікага Княства Літоўскага пасля перамогі.

Гэта архіўная справа ўтрымлівае падрыхтоўчыя матэрыялы, сабраныя нейкім С. Крэйцам — хутчэй за ўсё прадстаўніком царскай адміністрацыі ў Беларусі, — для напісання нарыса пра Аляксандра Аскерку. Сярод гэтых матэрыялаў — копіі дакументаў са следчай справы Аскеркі, аповеды відавочцаў і інш. Відаць, С. Крэйц працаваў паводле задання Васіля Фёдаравіча Ратча, у фондзе якога зберагаецца згаданая адзінка захоўвання.

На першы план у падрыхтоўцы паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы, паводле гэтай архіўнай справы, выходзіць Літоўскае земскае крэдытнае таварыства і яго старшыня Аляксандр Уладзіслававіч Аскерка (1830–1911) — грамадскі дзеяч ліберальнага накірунку, адзін са знакамітых прадстаўнікоў старажытнага шляхецкага роду Аскеркаў. Ураджэнец Рэчыцкага павета Мінскай губерні, выпускнік Пецярбургскага ўніверсітэта, ён як сябра Мінскага губернскага камітэта па ўладкаванні побыту сялян удзельнічаў у распрацоўцы ўмоў сялянскай рэформы 1861 г. Быў праціўнікам надзялення сялян зямлёй. З лютага 1861 г. ён жыў у Вільні і ў вольны час займаўся вывучэннем гісторыі і палітычнай эканоміі.

Паводле палітычных поглядаў А. У. Аскерка з'яўляўся «белым», быў адным з кіраўнікоў партыі «белых» у Беларусі і Літве, прыхільнікам адраджэння Вялікага Княства Літоўскага мірным шляхам і карыстаўся вялікай папулярнасцю і павагай мясцовага панства.

Роля А. У. Аскеркі як ідэолага і кіраўніка паўстання на землях былога Вялікага Княства Літоўскага ацэньваецца па-рознаму Адны ўказваюць на яго поўную самастойнасць і незалежнасць у сваёй дзейнасці. Іншыя, як С. Крэйц, які ў другой палове 1860-х гг. рыхтаваў да выдання «выкрывальную» працу аб дзейнасці Аскеркі, праводзілі такія паралелі з Тадэвушам Касцюшкам: «Касцюшка быў толькі выканаўчым афіцэрам у гульні магнатаў, якія ўсё заказвалі і за ўсё плацілі. Гэтак жа і Ас-

керка — толькі выканаўца жаданняў графа Старжынскага, Тышкевіча, Чапскага, Андрэя Замойскага і г.д.» [13, арк. 9].

Аскерка прадстаўляў інтарэсы заможнай беларуска-літоўскай шляхты, якую жадаў аб'яднаць для абароны сваіх інтарэсаў, выступлення супраць адмены прыгоннага права. З гэтай мэтай у пачатку 1860-х гг. ён стварыў Літоўскае земскае крэдытнае таварыства.

Можна назваць тры прычыны ўтварэння гэтага таварыства:

1. Сацыяльная. Таварыства стваралася для абароны эканамічных інтарэсаў шляхты і памешчыкаў, па якіх адмена прыгоннага права нанесла ўдар. У радыкальным варыянце меркавалася зусім нівеліраваць адмену прыгону.

2. Эканамічная. Сутнасць яе можна выказаць прымаўкай тагачасных адміністратараў: «канфіскацыя — адзіны дзейсны сродак ад патрыятычнай гарачкі» [13, арк. 12 адв.]. Таму важна было эканамічна завязаць усю зямлю «Заходняй Расіі» і Літвы на таварыстве, не залежным ад дзяржавы.

3. Палітычная. Існуюць некаторыя разначытанні аб часе з'яўлення ў таварыства палітычных мэт. Паводле адных звестак, палітычныя мэты былі закладзены яшчэ на этапе яго ўтварэння. «Ніякія выгады і льготы не маглі прывязаць магнатаў да Расіі, — пісаў С. Крэйц, — у ёй яны маглі быць толькі багачамі землеўладальнікамі, а адноўленая Рэч Паспалітая абяцала ім зноў алігархію па правах нараджэння» [13, арк. 12]. «<…> Ён (Аскерка. — *С. М.*) задумваў аднаўленне Польшчы мірнымі шляхамі, па меншай меры, у пачатку, рэстаўрырванне ранейшага бязмежнага значэння і багацця дваранства было найважнейшай часткай у гэтым праекце. <…> З дапамогай таварыства ж (Літоўскага земскага крэдытнага — *С. М.*) ён хацеў з'яднаць дваранства ў адзінае згоднае палітычнае цела, — разнагалоснае і свавольнае, — падпарадкаваць строгай дысцыпліне, якая была тым больш трывалай, што трымала ў руках землі і маёнткі <…>» [13, арк. 33–33 адв.].

З другога боку, паказанні некаторых сведкаў на следстве па справе А. Аскеркі, якая вялася падчас і пасля паўстання 1863 г., сведчаць аб наступным: «19 лютага — фатальны пералом, з якога літоўская партыя белых, ад баляў і захапленняў да гасудара, пераходзіць спачатку да нараканняў, потым — канчаткова на бок замежных сваіх сабратоў <…> Усё гэта памаленьку захапіла паноў да адкрытага паўстання. У выглядзе такога павароту Аскерка змяніў свой план і прама ператварыў мірную арганізацыю Літоўскага крэдытнага таварыства ў арганізацыю рэвалюцыйнага жонду, а сам стаў на чале яго ў Літве. Уласна галавой «de jure» быў камісар Варшавы Дзюлерын, але маральная ініцыятыва і перавага ўплыву заўсёды былі на баку Аскеркі» [13, арк. 33 адв.–34].

Згаданая архіўная справа пераносіць акцэнт у падрыхтоўцы паўстання ў Беларусі і Літве з віленскага Камітэта Руху, які пазней быў падпарадкаваны ЦНК і пераўтвораны ў Літоўскі правінцыйны камітэт (ЛПК), грандыёзную эканамічна-палітычную арганізацыю, фактычна дзяржаву ў дзяржаве, сябрамі якой, па ідэі, была амаль уся шляхта Беларусі і Літвы — уласніца ўсёй памешчыцкай зямлі.

У 1861 г. у Вільні ў выдавецтве А. Кіркора быў надрукаваны Статут Літоўскага земскага крэдытнага таварыства. Паводле яго, са слоў С. Крэйца, «дваране і памешчыкі Літвы злучаюцца ў асацыяцыю, стройна і са строгімі пастановамі арганізоўваюць сваю адміністрацыю, амаль бескантрольную з боку дзяржавы» [13, арк. 10]. У арганізацыю планавалася ўцягнуць практычна ўсё дваранства заходніх губерняў, паколькі яно ўсё было эканамічна зацікаўлена ў гэтым таварыстве (сюды ж увайшлі б і прадстаўнікі буйнейшых магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага — Тышкевічы, Тызенгаўзы, Радзівілы, Патоцкія, Любамірскія і г.д. [13, арк. 10]).

Арганізацыйна ўтваралася цэлая вертыкаль: дырэктар Літоўскага крэдытнага таварыства — главы Дырэкцый — кіраўнікі акруг — мясцовыя выканаўцы. Усе кадры — са шляхты. С. Крэйц звярнуў увагу, што «галоўны дырэктар таварыства, даючы клятву выконваць распараджэнні кіраўнікоў Дырэкцыі, дзе ён сам — улада амаль бескантрольная, вельмі падобны на дыктатара Літвы, на ўрадавага кіраўніка, які клянецца выконваць інтарэсы саслоўяў, якія ўручылі яму ўладу». Пры гэтым «кантролю і назірання за справамі грамадства паводле статуту ўлады не маюць, а прызываюцца толькі так, дзеля павелічэння эфекту <…>» [13, арк. 15].

Таварыства невыпадкова названа эканамічным. Планавалася, што яно возьме пад свой кантроль усю зямлю ў заходніх губернях (яго ж члены — уласнікі гэтай зямлі), будзе ўстанаўліваць і рэгуляваць цэны на зямлю, выдаваць крэдыты, выконваць судовыя функцыі ў пытанні землеўладання.

Такім чынам, таварыства вырашала б дзве задачы. Па-першае, трымала на праве ўласнасці большую частку зямлі заходніх губерняў і кантралявала значную частку фінансаў краю. Па-другое, стваралася цэнтралізаваная бюракратычная сістэма кіравання. Знешне гэта выглядала як філіялы арганізацыі на месцах, але паколькі шляхціцы, якія кіравалі філіяламі, адначасова валодалі гэтымі ж землямі і сялянамі, то кантроль атрымліваўся не толькі эканамічны, але і судовы, адміністрацыйны, рэлігійны, палітычны.

Як пісаў С. Крэйц, «<…> адміністрацыя Літоўскага земскага крэдытнага таварыстваператварылася з часам у нарадовы жонд у сілу таго, што большасць яго ўдзельнікаў не толькі кампраметаваныя па мяцяжу,

але і стаяць на чале сваіх мясцовасцяў. Сам Аляксандр Аскерка аказаўся чымсьці накшталт Літоўскага міністра унутраных спраў і дзеяцельнейшым членам у Віленскім аддзяленні нарадовага жонда» [13, арк. 22].

Значыць, пакуль «рэвалюцыя» не пачалася, таварыства збірала людзей, землі, грошы. З пачаткам «рэвалюцыі» яно гатова было ўзяць на сябе кіруючую ролю. Планавалася, што пасля перамогі паўстання і выгнання расійскай адміністрацыі бездзяржаўя і анархіі не будзе — таварыства адразу стала б вярхоўнай уладай з ужо арганізаванай вертыкаллю і фінансавай структурай.

А. Аскерка быў арыштаваны ў канцы мая 1863 г. амаль адначасова з В. Старжынскім, з якім яны разам рыхтавалі стварэнне Літоўскага земскага крэдытнага таварыства. В. Старжынскі часта ездзіў у Пецярбург, хадайнічаў там аб зацвярджэнні праекта крэдытнага таварыства, а таксама аб дазволе стварыць Земляробчае таварыства і выдаваць земляробчыя перыядычныя выданні. А. Аскерка ж займаўся гэтымі двума праектамі на месцы, збіраў для іх матэрыялы, удасканальваў. Яны часта абмяркоўвалі іх разам [15, арк. 40]

Пры вобыску ў А. Аскеркі знайшлі запанкі з надпісам «Божа, што Польшчу…», статут Земскага крэдытнага таварыства, перапіску. У лісце з Рэчыцы ад 17 лютага 1862 г. утрымлівалася пытанне: «Што ж там у Вас адбываецца, мой Аляксандр, нейкія партыі ўтварыліся, якія хочуць мець асобную Літву, што такая думка з’явілася ў галовах вядомых па свайму розуму, якія заслугоўваюць добрую рэпутацыю сваім розумам (людзей. — *С. М.*) <…>» [15, арк. 62].

Палявы аўдытарыят прызнаў, што А. Аскерка належаў «да ліку галоўных асоб рэвалюцыйнай арганізацыі на Літве» і сваімі «злачыннымі дзеяннямі» распальваў паўстанне ў краі [15, арк. 342 адв., 347]. Яго пазбавілі чыноў, дваранскага звання і прыгаварылі да высылкі ў Сібір на катаржную работу ў рудніках на 15 гадоў.

Пасля арышту А. Аскеркі яго месца заняў лідар «чырвоных» К. Каліноўскі, які ў жніўні стаў старшынёй Выканаўчага аддзела Літвы. У дакументах дазнанняў даволі часта можна сустрэць шкадаванні з нагоды арышту Аскеркі. Дваранін Заборскі «ў развагах пра ход рэвалюцыі» казаў: «Адны варшаўскія не баязліўцы, а ў літоўцаў не хапае духу!» Ён «хваліў дзеянні варшаўскага камітэта, а віленскі лаяў і шкадаваў аб арыштаванні былога яго прэзідэнта: Аляксандра Аскеркі» [13, арк. 31 адв.].

Паводле С. Крэйца, нехта Рагалінскі, даведаўшыся пра арышт Аскеркі, шкадаваў, што арганізацыя згубіла такога дзейнага чалавека, і ў той жа час заўважыў, што месца яго зойме не менш здольны: «Гэта быў апошні кіраўнік жонду ў Літве — К. Каліноўскі, са смерцю (якога. — *С. М.*) арганізацыя мяцяжу, так спрытна складзеная Аскеркам пад вы-

глядам Літоўскага земскага крэдытнага таварыства, канчаткова разбурылася» [13, арк. 32–32 адв.].

Былы ковенскі ваявода доктар Людвік Дзічкоўскі паказаў на следстве: «Прыняўшы тытул кіраўніка аддзялення Унутраных спраў у жондзе, Аскерка аказаў мяцяжу велізарныя паслугі: амаль усе шкадавалі, калі ён выбыў з арганізацыі, а аб арышце яго спачуваюць роўна чырвоныя і белыя, прызнаючыся, што з ім рэвалюцыя панесла велізарную страту» [13, арк. 34].

С. Крэйц указваў, што «калі разабраць дзейнасць гэтага мірнага рэвалюцыянера і яго намеры, яны здадуцца непараўнальна вышэй за ўсіх подзвігаў Серакоўскіх, Звіждоўскіх і Каліноўскіх. Праславуты ваявода Серакоўскі проста прыехаў на гатовае ўжо паўстанне, якога ні павесці, ні падтрымаць не здолеў.

Каліноўскі <…> гэта быў паўвар'яцкі чалавек, адораны моцнаю воляю, вядомай дозай розуму і так званай мужыцкай хітрасцю <…> Ён імкнуўся да ажыццяўлення нейкай ідэальнай Літвы з простага народа <…> У следчай камісіі аднаму з членаў ён казаў за некалькі дзён да шыбеніцы: «я, хоць якое б там ні было, а ўсё ж — урад!». Нарэшце, ідучы на смерць, Каліноўскі выказвае: «адно мяне суцяшае: Палякі ў Літве пасля гэтага ніколі не ўмацуюцца» [13, арк. 34 адв.–35].

Нягледзячы на прадузятыя адносіны С. Крэйца да Аскеркі, паўстання і Літоўскага крэдытнага таварыства, блытаніну ў ацэнках і тэрміналогіі, вялікая колькасць выпісак і копій з розных дакументаў у згаданай архіўнай справе не пакідаюць сумнення: арганізацыя так ці іначай існавала і з эканамічнай перад паўстаннем, сапраўды, пераўтварылася ў палітычную. Таварыства ахоплівала сваім уплывам тэрыторыю былога Вялікага Княства Літоўскага, на аднаўленне якога была разлічана дзейнасць гэтай арганізацыі. Пры пераможным паўстанні Літоўскае земскае крэдытнае таварыства пераўтваралася б ва ўжо сфарміраваную дзяржаўную структуру.

Такім чынам, у пачатку 1860-х гг. у новай гістарычнай сітуацыі адраджэння легальных форм грамадскага жыцця ў Расійскай імперыі і ўздыму народаў былой Рэчы Паспалітай палітычна актыўная шляхта Беларусі і Літвы, што склала «белае» крыло апазіцыі царызму, прыйшла да ідэі аднавіць Вялікае Княства Літоўскае як аўтаномную дзяржаўна-палітычную адзінку ў складзе імперыі і спрабавала дамовіцца на гэты конт з урадам. Выразнікамі інтарэсаў шляхты былі маршалкі магілёўскі Ян Богуш, гродзенскі Віктар Старжынскі, мінскі Аляксандр Лапа, а таксама заснавальнік Літоўскага земскага крэдытнага таварыства Аляксандр Аскерка. Яны аж да паўстання шукалі пагаднення з царызмам на прадмет стварэння мясцовай адміністрацыі, аднаўлення дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага, публічнага галоснага суда, адкрыцця

Віленскага ўніверсітэта, стварэння Крэдытнага і Земляробчага таварыстваў, вяртання ўніяцкай веры і да т.п.

Пераканаўшыся, што Пецярбург не пойдзе на ўступкі, мясцовае дваранства стала ў фронду. З пачаткам паўстання быў арганізаваны дэмарш маршалкаў — дэманстрацыйнае асуджэнне яго палітыкі ў Беларусі. Царызм спыняў усялякія намеры аслаблення і расчлянення імперыі і жорстка пакараў лідараў грамадскай думкі, якія дамагаліся аўтаноміі для свайго краю і вяртання забраных атрыбутаў Вялікага Княства Літоўскага.

Створанае адным з лідараў партыі «белых» А. Аскеркам Літоўскае земскае крэдытнае таварыства ахоплівала сваім уплывам тэрыторыю былога ВКЛ, на аднаўленне якога разлічвала. Акрамя сацыяльнай мэты (абароны інтарэсаў заможнай беларуска-літоўскай шляхты, па якой адмена прыгоннага права нанесла ўдар) і мэты эканамічнай (кантроль за не залежнай ад дзяржавы структурай над усёй зямлёй заходніх губерняў), таварыства згуртоўвала дваранства ў «адзінае згоднае палітычнае цела», падпарадкаванае строгай дысцыпліне, дзеля мірнай рэстаўрацыі ВКЛ і ў ім свайго «ранейшага бязмежнага значэння і багацця».

Таварыства збірала людзей, землі, грошы, стварала цэнтралізаваную бюракратычную сістэму кіравання, мела філіялы на месцах. Меркавалася, што яно будзе трымаць на праве ўласнасці большую частку зямлі заходніх губерняў і кантраляваць значную частку фінансаў краю. З пачаткам паўстання гэта мірнае эканамічнае таварыства пераўтварылася ў палітычную арганізацыю — віленскае аддзяленне Нацыянальнага «жонда», а ў выпадку перамогі паўстання станавілася вярхоўнай уладай з ужо арганізаванай вертыкаллю і фінансавай структурай.

Гісторыкам пара адмовіцца ад атаясамлення пазіцыі партыі «белых» у Беларусі і Польшчы, а таксама перастаць ігнараваць беларускія дзяржаватворчыя сілы і інтарэсы напярэдадні сацыяльнага выбуху 1863 г.

## Крыніцы і літаратура

1. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Мінск, 1930. — 275 с. (Запіскі Аддзела гуманітарных навук. — Кн. 13. — Працы Інстытута гістарычных навук. — Т. V).
2. Лушчыцкі, І. Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX века. — Мінск : Выдавецтва Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, 1958. — 367 с.
3. Лясковский, А. И. Литва и Белоруссия в восстании 1863 г. (по новым архивным материалам). — Берлин : Арзамас, 1939. — 191 с.
4. Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. — М.: АН СССР, 1963. — 392 с.
5. Fajnhauz, D. 1863: Litwa i Białoruś. — Warszawa : Neriton, 1999. — 357 s.

6. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. — Мінск: Грамадскае аб'яднанне "Маладзёжнае навуковае супрацоўніцтва", 2002. — 248 с.
7. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. — Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : Беларус. навука, 2011. — 584 с.
8. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей — ДАРФ). — Ф. 109. I экспедыцыя. 1861 год. — Спр. 106. — Пра памешчыка Марцінкевіча, які рассылаў у Заходнія губерні абуральныя заклікі да літоўцаў. 13 красавіка 1861 г. — 9 арк.
9. ДАРФ. — Ф. 109. I экспедыцыя. 1861 год. — Спр. 303. Ч. 1. — Аб палітычных беспарадках у Заходніх губернях. Ч. 5-я. У Мінскай губерні. — 63 арк.
10. ДАРФ. — Ф. 109. I экспедыцыя. 1861 год. — Спр. 394. Аб Рагачоўскім павятовым правадыры дваранства палкоўніку Богушу. Пачата 24 кастрычніка 1861 г. — 59 арк.
11. ДАРФ. — Ф. 109. I экспедыцыя. 1861 год. — Спр. 497. — Аб паперах абуральнага зместу, знойдзеных у вучня Віцебскай гімназіі Зелянко. Пачата 20 лістапада 1861 г. — 35 арк.
12. ДАРФ. — Ф. 109. Сакрэтны архіў. — Воп. 2. — Спр. 702. — Запіска невядомага літоўца «Як выйсці з ненармальнага становішча ў заходніх губернях» і спосабах ліквідацыі ў іх лаціна-польскага элемента». 12 кастрычніка 1865 г. — 67 арк.
13. Расійская нацыянальная бібліятэка. Аддзел рукапісаў. — Ф. 629. Ратч В. Ф. — Спр. 348. Крэйц С. Аляксандр Аскерка. Міністр унутраных спраў Літоўскага народнага жонду. Нарыс, складзены па сапраўдных дакументах, якія ўтрымліваюцца ў следчых справах. І па расказах відавочцаў і людзей, азнаёмленых з апошнім мяцяжом. (Урывак з падрыхтоўчых работ). 1867 г. Вільна. — 36 арк.
14. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — ЛДГА). — Ф. 1248. Часовы палявы аўдытарыят пры штабе камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі. — Воп. 1. — Спр. 1. — Памешчык граф Віктар Старжынскі. 27.06.1863 –лістапад 1863. — 250 арк.
15. ЛДГА. — Ф. 1248. Часовы палявы аўдытарыят пры штабе камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі. — Воп. 2. — Спр. 226. — Памешчык Віленскай губерні, Вілейскага павета, адстаўны паручнік Аляксандр Аскерка, асуджаны за зносіны з мяцежнікамі. Т. I. 20.02.1864–03.1864. — 492 арк.
16. ЛДГА. — Ф. 1248. Часовы палявы аўдытарыят пры штабе камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі. — Воп. 2. — Спр. 226а. — Памешчык Віленскай губерні, Вілейскага павета, адстаўны паручнік Аляксандр Аскерка. Т. II. 05.03.1864–11.06.1873. — 33 арк.
17. Murawiow (Wieszatel), M. Wspomnienia / Opracowanie, przekład i wstęp Z. Podgórzec. — Warszawa: Wydawnictwo „ZEBRA”, 1990. — 107 s.

18. Каліноўскі, К. За нашу вольнасць. Творы, дакументы / Уклад, прадм., пасляcл., камент. Г. Кісялёва. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 1999. — 464 с.
19. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. : Документы и материалы. — М. : Наука, 1964. — LXXII, 708 с.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 21.09.2015

*Д. Ч. Матвейчык*

# Дзейнасць Юзафа Ядкоўскага па даследаванні і папулярызацыі гісторыі паўстання 1863–1864 гг.

Пасля аднаўлення польскай дзяржаўнасці ў 1918 г. у выглядзе ІІ Рэчы Паспалітай на яе тэрыторыі адбыўся ўсплёск гісторыяпісання ва ўсіх магчымых формах. Гэты працэс быў падрыхтаваны працяглым перыядам развіцця польскай гістарыяграфіі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай з канца XVIII да пачатку XX ст., калі польскамоўныя гістарычныя працы ствараліся як ва ўсіх частках падзеленай дзяржавы (расійскай, прускай, аўстрыйскай), так і ў эміграцыі. Аднак утварэнне незалежнай польскай дзяржавы надало гістарыяграфіі вялізны імпульс, значна пашырыўшы яе тэматычнае кола, увёўшы ва ўжытак шматлікія зборы новых ці слаба да гэтага выкарыстаных крыніц і стварыўшы новыя палітычныя ўмовы для напісання і выдання прац. Адным з тэматычных накірункаў, якія пачалі актыўна распрацоўвацца ў міжваеннай Польшчы, стала барацьба за аднаўленне падзеленай Рэчы Паспалітай, і ў тым ліку паўстанне 1863–1864 гг.

Варта адзначыць, што аб'ектам навуковых даследаванняў паўстанне не раз станавілася і ў перыяд да Першай сусветнай вайны. У гэты час былі выдадзены працы Валерыя Пшыбароўскага [33], Марыяна Дубецкага [17], Станіслава Козьмяна [30], Агатона Гілера [18] і шматлікіх іншых. Аднак усе гэтыя працы ў невялікай ступені раскрывалі падзеі паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы, галоўным чынам канцэнтруючыся на Каралеўстве Польскім. У выніку перад міжваеннымі гісторыкамі Заходняй Беларусі і Віленшчыны паўстала пытанне даследавання паўстання на тэрыторыі былых Гродзенскай і Віленскай губерняў. Адным з такіх гісторыкаў стаў Юзаф Ядкоўскі.

Гэтая асоба добра вядома ў айчыннай гістарыяграфіі, галоўным чынам дзякуючы навуковым працам даследчыкаў з Гродна, адкуль Ядкоўскі паходзіў і дзе правёў большую частку свайго жыцця. Ён паходзіў з дробнашляхецкага роду Гродзенскага павета, нарадзіўся 20 снежня 1890 г. у Гродне і быў сынам Юзафа і Зоф'і Занеўскай. Пачатковыя




Медаль з партрэтам Юзафа Ядкоўскага (мастак Уладзімір Алехна) [1]

гады свайго жыцця таксама правёў у горадзе, вучыўся ў падамініканскай гімназіі і нават удзельнічаў у 1905 г. у школьнай забастоўцы. Менавіта ў гімназічныя гады ён захапіўся гісторыяй Гродзеншчыны і пачаў збіраць разнастайныя друкаваныя і рукапісныя матэрыялы, а таксама пісаць свае першыя навуковыя працы. У выглядзе невялікіх нарысаў і артыкулаў яны з 1907 г. друкаваліся ў выданнях «Віленская газета» («Dziennik Wileński») і «Святавіт» («Światowit»). Апынуўшыся пад пагрозай выключэння з гімназіі, патэнцыяльнага арышту за палітычную дзейнасць і атрымання так званага «воўчага білета», які б зрабіў немагчымым паступленне ў іншую навучальную ўстанову ў Расійскай імперыі, у 1906 ці 1907 г. Ядкоўскі перабраўся ў Варшаву, дзе працягваў вучобу і адначасова працаваў у археалагічным музеі. Вышэйшую адукацыю ён атрымаў у Школе прыгожых мастацтваў і Археалагічным інстытуце ў Маскве. Затым працаваў у гэтым жа інстытуце і ў Румянцаўскім музеі, а ў 1910–1914 гг. як сябра Маскоўскага археалагічнага таварыства шмат падарожнічаў па Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях (у тым ліку ў 1912 г. працаваў у Мірскім замку) для фіксацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і правядзення археалагічных прац. Пасля аднаўлення польскай дзяржавы ён вярнуўся ў Гродна ў 1920 г. і заняўся пачатковым зборам помнікаў гісторыі. Аднак пры пагрозе заняцця горада бальшавіцкімі войскамі, значную частку сабранага давялося эвакуіраваць. Пасля службы ў польскім войску і ўдзелу ў савецка-польскай вайне, за што быў узнагароджаны залатым крыжам, Ядкоўскі прыбывае ў Гродна. Менавіта з гэтага часу пачаўся перыяд яго жыцця, найбольш карысны для беларускай гістарычнай навукі.

З 1920 г. Ядкоўскі актыўна ўдзельнічаў у стварэнні ў Гродне гістарычнага музея, што патрабавала шмат намаганняў у перыяд да 1936 г., і

[1] Выява медаля была ласкава дадзена для гэтай публікацыі сп. Андрэем Вашкевічам, за што выказваем яму шчырую падзяку.

варта адзначыць, што ў гэтым накірунку ён дасягнуў неверагодных поспехаў, пра што сведчыць створаны ім музей, які дзейнічае да цяперашняга часу пад назвай Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (у міжваенны час — Дзяржаўны музей у Гродне). Гэты перыяд з'яўляецца асобнай яскравай старонкай яго дзейнасці як гісторыка, музейшчыка і археолага. Аднак раскопкі ў 1930-х гг. ля Каложскай царквы, Новага і Старога замкаў выклікалі канфлікт з польскімі археолагамі, якія вінавацілі Ядкоўскага ў іх бессістэмнасці і парушэнні методыкі правядзення. У выніку ён быў адхілены ад правядзення раскопак, а ў хуткім часе пакінуў Гродна і пераехаў у Варшаву.

У Варшаве Ядкоўскі найбольшых поспехаў дамогся як нумізмат, да Другой сусветнай вайны працуючы ў Дзяржаўных Зборах Мастацтва ў Замку, а пасля яе ўзнаўляючы амаль цалкам знішчаны Нумізматычны кабінет Нацыянальнага музея. Ён памёр 2 студзеня 1950 г., пакінуўшы жонку Галіну Баброўскую і дачку Альжбету [больш падрабязна пра біяграфію Ядкоўскага гл.: 2; 4; 13; 19; 36 і інш.].

Бібліяграфія прац Ядкоўскага налічвае больш за сотню пазіцый, пераважна невялікіх артыкулаў і нарысаў. Асноўная частка яго навуковых зацікаўленасцяў звязана з правядзеннем археалагічных раскопак, апісаннем і ўвядзеннем у навуковы ўжытак разнастайных помнікаў матэрыяльнай культуры і сярэднявечных рукапісаў, захапляўся таксама нумізматыкай, фалерыстыкай і да т.п. Паўстанне 1863–1864 гг. як аб'ект даследавання моцна выбіваецца з гэтага шэрагу, не звязана з археалогіяй ці матэрыяльнай культурай і як быццам стаіць адасоблена. Яго наяўнасць у полі зроку Ядкоўскага-гісторыка магчыма растлумачыць асабістымі пабудкамі. Як пісаў Аляксандр Снежка — яго сябра ў апошні перыяд жыцця, які пакінуў свае ўспаміны, — *«падчас Студзеньскага паўстання некалькі асоб з яго бліжэйшай сям'і бралі ўдзел у нацыянальным руху»*, у выніку чаго частка маёмасці Ядкоўскіх была затым канфіскавана, а бацька Ядкоўскага вымушаны быў у дзіцячым узросце перасяліцца ў Гродна [36, s. 14]. Магчыма, тут маецца на ўвазе сярод іншых Юльян Янавіч Ядкоўскі, пра якога дакладна вядома, што яго маёмасць падлягала канфіскацыі [9, арк. 17–18 адв.].

Каля 10 публікацый Ядкоўскага ў той ці іншай ступені тычацца гісторыі паўстання 1863–1864 гг. У асноўным гэта невялікія артыкулы, якія друкаваліся ў разнастайных перыядычных выданнях. Храналагічна першы з іх з'явіўся яшчэ ў юнацкія гады Ядкоўскага — у 1907 г. у «Віленскай газеце» пад назвай «1863 год і гродзенская школьная моладзь» [23]. У гэтай публікацыі Ядкоўскім былі ўпершыню згаданыя некаторыя сюжэты, якія ў далейшым будуць неаднаразова паўтарацца ў яго наступных публікацыях. Бурныя падзеі біяграфіі з 1907 па 1921 г. прыпынілі на пэўны час публікацыю яго навуковых прац на тэму паўстання.

Усе наступныя яго публікацыі пра паўстанне былі надрукаваны ў перыяд знаходжання на пасадзе дырэктара Дзяржаўнага музея ў Гродне ў 1920-я – 1930-я гг. Першая з іх — «1863 год у Гродзенскім павеце» — з'яўляецца найбольш грунтоўнай і аб'ёмнай. Яна была апублікавана ў васьмі частках у штодзённай гродзенскай газеце «Echo Grodzieńskie» («Гродзенскае рэха») — органе мясцовай арганізацыі праўрадавага Таварыства варты ўскраін («Towarzystwa straży kresowej») [24]. Першая частка публікацыі з'явілася ў № 18 ад 23 студзеня 1921 г. і была прымеркавана да чарговай гадавіны пачатку паўстання (пачалося ўночы з 21 на 22 студзеня 1863 г. у Варшаве). У першых абзацах Ядкоўскі ставіць некалькі праблем, якія ён плануе вырашаць. Гэта адсутнасць грунтоўных прац, што раскрывалі б паўстанне на тэрыторыі Гродзеншчыны, і нявыкарыстанасць мясцовых крыніц па яго гісторыі — *«Хаця гісторыя паўстанцкага руху ў Кароне ў пэўнай частцы ўжо апрацавана, у нас жа — мы маем занадта мала гістарычнага матэрыялу, а ён ёсць, аднак ляжыць мёртвы, недаследаваны і нават несістэматызаваны ў былых расійскіх архівах [2]»*.

У артыкуле падзеі ў Гродзенскім павеце разглядаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці, пачынаючы з 1861 г. — часу першых маніфестацый салідарнасці з дэманстрацыямі ў Варшаве, калі загінулі некалькі іх удзельнікаў, рэлігійных працэсій і ўтварэння ў Гродне падпольнай арганізацыі па падрыхтоўцы паўстання на чале з Канстанцінам Каліноўскім. Асобная ўвага надаецца апісанню сітуацыі ў Гродне напярэдадні выступлення — агульным настроям, грамадскай думцы, паводзінам пэўных сацыяльных груп (напрыклад, моладзі, жанчын). У некалькіх абзацах трэцяй часткі (№ 31 ад 9 лютага 1921 г.) Ядкоўскі спыняецца на ўплыве, які аказала на разгортванне паўстання аграрная рэформа 1861 г., і прыходзіць да высновы, што *«гэта быў абдуманы ўдар для забойства польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Усе добра разумелі гэта, але выбуху паўстання стрымаць было немагчыма»*.

Найбольш падрабязна ў артыкуле апісаны падзеі, што адбываліся непасрэдна ў Гродне — няўдалая спроба паўстанцаў выехаць з горада на цягніку, сітуацыя ў Гродзенскай гімназіі і рэпрэсіі супраць яе вучняў і выкладчыкаў і г.д.

Ва ўсім артыкуле вялікая ўвага звяртаецца на асоб, якія рыхтавалі паўстанне ў Гродне, Гродзенскім павеце і Гродзенскай губерні ў цэлым,

---

[2] Верагодна, тут маюцца на ўвазе архівы, якія засталіся пасля дзейнасці расійскіх уладных органаў — губернскіх і павятовых устаноў, напрыклад Дзяржаўны архіў у Гродне (Archiwum Państwowe w Grodnie; у цяперашні час — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна) ці Дзяржаўны архіў у Вільні (Archiwum Państwowe w Wilno; у цяперашні час — Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў).

а па тэксце падаюцца шматлікія біяграфічныя даведкі пра тых ці іншых дзеячаў перадпаўстанцкага і паўстанцкага перыядаў, напрыклад Цэлястына Цеханоўскага (*«душой гродзенскай арганізацыі быў <...>»*), графа Віктара-Вацлава Старэнскага, Севярына Ромэра і інш. Вялікая ўвага надаецца структуры паўстанцкай адміністрацыі ў павеце і губерні (ваяводстве), напрыклад, уся шостая частка артыкула (№ 34 ад 12 лютага 1921 г.) прысвечана выключна цывільным уладам гродзенскай павятовай арганізацыі, дзе раскрываюцца функцыі кожнай з асоб, што атрымалі ад паўстанцкіх улад намінацыю на тую ці іншую пасаду — рэферэнтаў і акруговых начальнікаў.

Нягледзячы на станоўчую ацэнку факта паўстання і гераізацыю яго ўдзельнікаў, Ядкоўскі ўказвае на некалькі фактараў, якія сталі прычынамі яго задушэння. Па-першае, гэта непрыхільная да яго пазіцыя сялянства — *«Паўстанне, не падтрыманае актыўна народнымі масамі, ператварылася ў партызанку <...>»* (№ 32 ад 10 лютага 1921 г.). Па-другое, гэта пераацэнка падрыхтаваных да паўстання сіл — *«І вось прыйшла гадзіна паўстання. Тады аказалася, што значная частка палаючага полымя аказалася толькі саламяным агнём»* (№ 3). Па-трэцяе, гэта спецыфічны сацыяльны склад паўстанцкіх атрадаў, праблема якога *«“вялікасць” асобных адзінак»*. Паводле Ядкоўскага, гэта значыла, што *«кожны хацеў быць галавой, але не кожны плячом, кожны прагнуў загадваць, але не кожны хацеў слухаць»*. Верагодна, тут маецца на ўвазе той факт, што большасць удзельнікаў паўстання складалі прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя (дваранства, шляхты), сярод якіх немалую частку складалі памешчыкі альбо іх дзеці, што ўжо пакаленнямі прызвычаіліся размаўляць са сваімі падданымі (сялянамі) шляхам аддачы распараджэнняў і не любілі цярпець ад каго б то ні было ўмяшання ў свае дзеянні. У выніку гэтае апошняе вяло да *«маруднасці ў выкананні загадаў вышэйшай улады»*, што стала *«прычынай шматлікіх няшчасцяў, што палі на наш народ»* (№ 3).

Варта адзначыць, што раскрыць зададзеную тэму цалкам Ядкоўскаму ўдалося толькі часткова. Яна хутчэй застаецца фрагментарнай. Адны падзеі апісваюцца дастаткова падрабязна, другія толькі ледзьве згадваюцца. Напрыклад, большая палова другой часткі артыкула (№ 28 ад 5 лютага 1921 г.) прысвечана падрыхтоўцы і апісанню рэлігійнай працэсіі з Гродна ў Ружансток, якая павінна была адбыцца 27 жніўня 1861 г., але не ўдалася, а пры апісанні дзейнасці гродзенскага паўстанцкага атрада пад камандаваннем Аляксандра Лянкевіча (№ 33 ад 11 лютага 1921 г.) бой ва ўрочышчы Святое Балота нават не згаданы. Як і дзейнасць іншых атрадаў на тэрыторыі Гродзенскага павета на працягу вясны–восені 1863 г.

Прычынай падобнай фрагментарнасці з’яўляецца нешырокая крынічавая база артыкула. Пры адсутнасці традыцыйнага навукова-даведачнага апарату ў выглядзе спіса выкарыстаных крыніц, пра іх ужыванне дазваляюць меркаваць толькі згадкі непасрэдна ў тэксце. Так, з усіх апублікаваных крыніц згадваюцца толькі ўспаміны Вандаліна Шукевіча [35], Фелікса Ражанскага [34], Аляксандра Масолава [8], Ігната Арамовіча [15] і, верагодна, Юзафа Маеўскага [6], працы Яана Длугаша [16] і А. Гілера [18]. Аднак разам з гэтым вялікая колькасць ужо апублікаваных на той час крыніц і даследаванняў, напрыклад Івана Мітрапольскага [7], Яўстафія Арлоўскага [10], Сцяпана Славуцінскага [12], артыкулы ў часопісе «Веснік Паўднёва-Заходняй і Заходняй Расіі» [1; 5] і шматлікія іншыя, не была выкарыстана. Таксама толькі гіпатэтычна магчыма меркаваць пра рукапісныя матэрыялы, якія ўжываліся пры напісанні артыкула. У тэксце яны пазначаюцца, як правіла, словазлучэннямі накшталт *«расійскія архіўныя крыніцы»* (*«źródła archiwalne rossyjskie»*) ці *«афіцыйныя расійскія крыніцы»* (*«źródła urzędowe rossyjskie»*). Найбольш верагодна, што маюцца на ўвазе рукапісныя крыніцы, якія на той час захоўваліся ў Гродне (Дзяржаўным архіве ў Гродне ці Дзяржаўным музеі ў Гродне) ці ў Вільні (Дзяржаўным архіве ў Вільні). Адна са спасылак у пятай частцы артыкула сфармулявана як *«дакументы палявога трыбуналу»* (*«akta trybunału polowego»*). Тут таксама складана вызначыць, якая канкрэтна ўстанова маецца на ўвазе — палявы ваенны суд, які дзейнічаў у Гродне, ці Часовы палявы аўдытарыят Віленскай вайсковай акругі, які дзейнічаў у Вільні. Ядкоўскі мог у розны час карыстацца як аднымі матэрыяламі, так і другімі. Аднак і ў гэтым выпадку немагчыма казаць, якімі расійскімі дзяржаўнымі ўстановамі ці якімі чыноўнікамі ствараліся гэтыя крыніцы. І толькі ў адным выпадку маецца прамое ўказанне на гродзенскія матэрыялы. У пятай частцы Ядкоўскі піша: *«На жаль, дакументы, якімі мы карысталіся, былі вывезены маскалямі ў 1915 г. з Гродна <...>»*.

Пра паходжанне некаторых дакументаў, якія выкарыстоўваліся Ядкоўскім у працах, пакідае паведамленне А. Снежка: *«Ядкоўскі пасля вяртання з Расіі на радзіму, ужо пасля заканчэння Першай Сусветнай вайны, атрымаў ад удавы пасля свайго ранейшага выкладчыка* [Яўстафія Арлоўскага — *Д. М.*] *пачак матэрыялаў, што тычацца Студзеньскага паўстання ў былой Гродзенскай губерні»* [36, s. 21]. Гістарычная іронія падобнага факта заключаецца ў тым, што Арлоўскі, выкладчык Гродзенскай гімназіі, гісторык і шматгадовы даследчык паўстання, прытрымліваўся дыяметральна супрацьлеглых палітычных поглядаў і ў сваіх працах актыўна займаўся праслаўленнем дзейнасці расійскіх улад і асабліва Міхаіла Мураўёва. Аднак і А. Снежка не пакідае звестак пра тое, якія канкрэтна гэта былі матэрыялы і як яны трапілі да Арлоўскага.

Не маючы дастаткова матэрыялу, каб канцэнтравацца выключна на Гродзенскім павеце, Ядкоўскі некалькі разоў у артыкуле звяртаў увагу на іншыя з’явы і падзеі. Напрыклад, у трэцяй частцы ў публіцыстычным стылі апісваецца цеплыня зімы і вясны 1863 г., у чацвёртай значная ўвага нададзена дзейнасці атрада Рамана Рагінскага на поўдні Гродзенскай і Мінскай губерняў, а ў пятай згадваюцца дзеянні іншых паўстанцкіх камандзіраў Гродзенскай губерні.

Звяртаюць на сябе ўвагу некаторыя факталагічныя памылкі, зробленыя ў артыкуле. Напрыклад сцвярджаецца, што Аляксандр Лянкевіч пасля таго, як гродзенскі паўстанцкі атрад быў разбіты, адступіў на поўдзень, перад гэтым *«павесіўшы за здраду каля 70 сялян»*. Аднак ніводная з вядомых на сённяшні дзень крыніц не змяшчае звестак пра факт такога масавага забойства грамадзянскага насельніцтва ў Гродзенскай губерні і на ахопленай паўстаннем тэрыторыі ўвогуле. Магчыма прывесці і іншы прыклад. У пятай частцы (№ 33 ад 11 лютага) сцвярджаецца, што *«ад імя Нацыянальнага Урада* [гродзенскім — *Д. М.*] *павятовым камісарам быў спачатку Канстанцін Каліноўскі»*, хаця ён ніколі не займаў гэтую пасаду, а з вясны 1863 г. з’яўляўся камісарам усяго Гродзенскага ваяводства. Зроблены ў артыкуле і некаторыя іншыя памылкі.

Адразу трэба заўважыць, што як гэтая, так і ўсе наступныя публікацыі Ядкоўскага маюць публіцыстычны характар. Яны напоўнены шматлікімі эмацыянальнымі пасажамі, пафасам, імкненнем да герагізацыі паўстанцаў і паўстання ў цэлым. Напрыклад, артыкул пачынаецца з фраз: *«Ва ўсіх узброеных рухах, што мелі мэтай уваскрашэнне Рэчы Паспалітай, Гродзеншчына заўжды брала ўдзел вельмі гарачы і поўны шчырай самаадданасці нацыянальнай справе. Таму як прывязанасць да Польшчы не магла лепей падкрэсліць, як зямля «спрадвечна руская», інакш як крывёй сваіх сыноў, пралітай у барацьбе за Польшчу і за волю»*; а ў трэцяй частцы маецца наступны ўрывак: *«Надзея! Хто яе тады не меў у нашым краі? Каму не мроіліся вялікія планы адбудовы Польшчы ад мора да мора? <...>»*. Магчыма выказаць меркаванне, што гэта вызначана з аднаго боку месцам публікацыі — газетамі, арыентаванымі на публіцыстычны стыль падачы матэрыялу і шырокае кола чытачоў, а з другога — палітычнай пазіцыяй як газет, так і самога Ядкоўскага.

Сёмая частка артыкула (№ 36 ад 15 лютага 1921 г.) уяўляе сабой публікацыю ўсяго адной крыніцы — адраса ў падтрымку Нацыянальнага Урада ад жыхароў (*«obywateli»*) Гродзенскага ваяводства ад 1(13) кастрычніка 1863 г. Прычым гэтая частка планавалася як своеасаблівае пазітыўнае заканчэнне ўсяго апавядання, у якім пакідалася надзея на будучыню, нягледзячы на амаль поўнае задушэнне паўстання ў Гродзенскай губерні на час складання адраса. Гэтаму ж павінна была садзейнічаць своеасаблівая гульня з лічбамі — колькасцю падпісаных

пад «усепадданейшым» адрасам ад гродзенскага дваранства Аляксандру II (1600 чалавек) і пад адрасам адданасці Нацыянальнаму Ураду (46 289 чалавек).

Хаця статус сёмай часткі быў зададзены як «заканчэнне» (*«dokończenie»*), а пасля яе пастаўлена слова «канец» (*«koniec»*), апошняй яна не стала. З № 160 ад 21 ліпеня 1921 г. той жа газеты «Echo Grodzieńskie» пачаў выходзіць яго працяг у выглядзе іменнага спіса ці невялікага біяграфічнага слоўніка асоб з Гродзенскага павета, што ўдзельнічалі ў паўстанні ці мелі да яго дачыненне. Прычыну падобнай публікацыі сам Ядкоўскі тлумачыў дастаткова спецыфічна — неабходнасцю ўліку гэтых звестак пры правядзенні зямельных пераўтварэнняў — *«Паўстанцы гублялі жыццё і маёнткі, а асірацелыя сем'і заставаліся часам у найбольшай галечы. Іх маёнткі аддаваліся царскім чыноўнікам альбо іншым русіфікатарам нашай краіны, якія за проста смешныя сумы набывалі часам даробак пакаленняў. Ці не вялікі час прыняць вышэйзгаданае пад увагу пры вырашэнні самых разнастайных спраў зямельных і незямельных, якія маюць месца вакол і даюць магчымасць зарабляць багацце элементу, цалкам незаслужанаму для краіны, з прычыны няшчасця, якое напаткала байцоў за волю Польшчы. Дзе справядлівасць?!»*. Цяжка ацаніць гэтае выказванне крытычна на прадмет таго, ці адлюстроўвае яно пункт гледжання ўласна Ядкоўскага, ці з'яўляецца спробай рэдакцыі газеты такім выключна публіцыстычным спосабам актуалізаваць пададзены матэрыял, які выходзіў у час бурных дыскусій у грамадстве на тэму аграрных змяненняў у незалежнай Польшчы. Аднак, нягледзячы на такую пастаноўку праблемы, пададзены далей фактычны матэрыял (у №№ 162, 166–169, 171–177, 179) мае дастаткова далёкае дачыненне да ўласна зямельных ці ўвогуле маёмасных спраў. Толькі ў пераважнай меншасці біяграм маюцца звесткі пра якую-небудзь маёмасць паўстанцаў. Крыніцамі для гэтага біяграфічнага слоўніка (сам Ядкоўскі называў яго *«спіс паўстанцаў»*) з'яўляліся, як заяўляў крыху пазней яго аўтар, *«тагачасныя афіцыйныя паперы і ўспаміны нешматлікіх сёння відавочцаў-сведкаў паўстання»* [25].

Усяго Ядкоўскім былі апублікаваны 280 біяграм. Як правіла, яны маюць невялікі аб'ём — ад 2 да 8 радкоў на кожную, і толькі некаторыя выбіваюцца з гэтага шэрагу і маюць каля 20 радкоў. Відавочна, што звесткі ў іх фрагментарныя і з'явіліся ў публікацыі з прычыны таго, што менавіта столькі іх і мелася ў аўтара. Напрыклад, біяграма Канстанціна Каліноўскага (№ 167 ад 29 ліпеня) уключае толькі наступныя звесткі: *«дэлегат Нацыянальнага Урада на Гродзенскае ваяводства, пазней — дыктатар Літвы, пакараны смерцю ў Вільні»*. Аднак і ў гэтых біяграмах магчыма заўважыць пэўную непаслядоўнасць, напрыклад, уклю-

чаныя непасрэдна ў артыкул біяграфічныя даведкі пра некаторых асоб змяшчаюць больш звестак, чым іх маецца ў слоўніку.

На працягу 1921 г. у той жа газеце «Echo Grodzieńskie» выйшлі яшчэ дзве публікацыі Ядкоўскага, прысвечаныя гісторыі паўстання. Хранагічна першая з іх з'явілася ў № 77 ад 7 красавіка 1921 г. пад назвай «Святое Балота» [28]. Публікацыя выразна дапаўняла артыкул, надрукаваны на два месяцы раней, дзе пра бой ля Святога Балота не мелася нават згадкі (гл. вышэй). Артыкул уяўляе сабой пераклад апісання бою, што адбыўся 22 красавіка (4 траўня) 1863 г., узятага з расійскай крыніцы «Журнал ваенных дзеянняў у Віленскай ваеннай акрузе з 26 красавіка па 2 траўня». Як пазначана ў канцы артыкула, журнал знаходзіўся на той час у *«Архіве былога віленскага генерал-губернатара»* (верагодна, маецца на ўвазе фонд віленскага генерал-губернатара ў Дзяржаўным архіве ў Вільні). Пераклад папярэджаны невялікім уступам, у якім сярод іншага тлумачыцца актуальнасць публікацыі — яна распавядае *«пра эпізод, да гэтага часу невядомы ў гістарыяграфіі студзеньскага паўстання»*, на падставе *«найверагоднейшай крыніцы»*. Тут жа адзін абзац уяўляе сабой апісанне на падставе той жа крыніцы сутычкі ў Гродзенскай пушчы з атрадам Баляслава Нарбута.

Другая публікацыя мае назву «Рамуальд Траўгут» і з'явілася ў № 174 ад 6 жніўня 1921 г. [26] — на наступны дзень пасля гадавіны павешання апошняга дыктатара паўстання ў Варшаўскай цытадэлі (5 жніўня 1864 г. па новым стылі). Большая частка артыкула распавядае пра біяграфію Траўгута, прычым асноўная ўвага надаецца не яго багатай біяграфіі да паўстання, а менавіта непрацягламу паўстанцкаму перыяду. Увесь артыкул з'яўляецца хутчэй не біяграфічным, а больш нагадвае хвалебны памфлет ці пасмяротны панегірык. У ім найбольш яскрава бачны публіцыстычны характар і гераізацыя постаці. Напрыклад, пра дыктатуру Траўгута Ядкоўскі піша наступнае: *«<...> І вось на працягу доўгіх, бясконца доўгіх, па гадзінах, не па днях, лічаных шасці месяцаў нёс Траўгут гэты крыж... Адзіным лозунгам яго было вытрываць!»*, а заканчваецца артыкул словамі: *«Пасля паланення Траўгута не было каму несці цяжар інсурэкцыйнай улады. Адзіны слуп будынка, што рассыпаўся, абрынуўся, а з ім загінуў жыватворны дух...»*. Пры гэтым у самім тэксце не зроблена спасылак на крыніцы, адкуль былі ўзятыя звесткі.

На працягу далейшых гадоў Ядкоўскі працягваў займацца зборам звестак пра паўстанне ў Гродзенскім павеце. Гэта вылілася яшчэ ў дзве яго публікацыі, якія ўяўляюць сабой дапаўненні да папярэдніх артыкулаў.

Першая з іх з'явілася ва ўсё той жа газеце «Echo Grodzieńskie» з нагоды 60-гадовага юбілею паўстання — у № 17 ад 23 студзеня 1923 г. [25]. Яна мела назву «1863 год у Гродзенскім павеце: нататкі і дапаўненні».

Патрэбу выдання артыкула сам Ядкоўскі тлумачыў наступным чынам: *«Сёння я дакіну яшчэ некалькі прозвішчаў, якія папоўняць крывавы спіс байцоў 1863 года, а таксама запісваю пару падрабязнасцяў, што тычацца паўстання, да гэтага часу неахопленых друкам»*. Артыкул складаецца з трох частак, кожная з якіх мае назву — «У дні нацыянальнай жалобы», «Ваяводская арганізацыя» і «Бітвы і сутычкі». Першая ўключае верш Цэлястына Цеханоўскага пад назвай «Падзяка полькам», прысвечаны жанчынам, што бралі ўдзел у маніфестацыйным руху ў 1861 г. Другая ўяўляе сабой дапаўненне і выпраўленне некаторых момантаў з папярэдніх публікацый, прысвечаных структуры паўстанцкіх улад у губерні. У ёй называецца вялікая колькасць імёнаў асоб, якія бралі ўдзел у паўстанні (займалі розныя пасады), і падаюцца некаторыя біяграфічныя звесткі пра іх. У трэцяй частцы згадваюцца тры сутычкі, што адбываліся ў Гродзенскім павеце, прычым палова часткі прысвечана спробе гродзенскіх паўстанцаў выехаць з горада на цягніку. Тут значна папаўняюцца звесткі пра гэтую ж падзею, апублікаваныя раней. Заканчваецца артыкул заклікам да чытачоў збіраць матэрыялы пра паўстанне: *«Быць можа хтосьці з яшчэ жывых відавочцаў-сведкаў пажадае падаць трохі звестак, што папоўняць пададзеныя ўрыўкава намі, і гэтым акажа дапамогу гістарыяграфіі студзеньскага паўстання на Гродзеншчыне, што застаецца да гэтага часу на пачатку апрацоўкі»*.

Ізноў складана вызначыць усе крыніцы, якімі Ядкоўскі карыстаўся пры напісанні «нататак і дапаўненняў». Як ён сам піша, верш Ц. Цеханоўскага яму перадала Алена Андрайковіч, народжаная Кярсноўская, якая брала ўдзел у дапамозе паўстанцам. Звесткі, пададзеныя пра сутычку расійскіх войскаў з атрадам Б. Нарбута, тыя ж, што ўжо былі надрукаваны ў артыкуле «Святое Балота» на падставе «Журнала ваенных дзеянняў». Пра ўсе іншыя звесткі магчыма толькі выказаць меркаванне, што яны ўзяты з рукапісных крыніц, з якімі Ядкоўскі працягваў працаваць.

Апошні з гэтай серыі артыкулаў з'явіўся ў № 8 ад 24 студзеня 1926 г. у гродзенскай газеце «Nowe Życie» («Новае жыццё») пад назвай «Сілуэты 1863 года» [27]. Мяркуючы паводле даты выхаду, ён быў прымеркаваны да чарговай гадавіны пачатку паўстання. Публікацыя ўяўляе сабой дапаўненне выдадзенага раней біяграфічнага слоўніка і змяшчае біяграмы 37 асоб. Некаторыя з іх ужо былі згаданы ў папярэдніх публікацыях (напрыклад, Севярын Ромэр ці Станіслаў Сільвястровіч), аднак тут падаваліся раней невядомыя біяграфічныя звесткі пра іх. Задачу артыкула Ядкоўскі для сябе ставіць наступным чынам: *«Да доўгага спісу асоб, што бралі ўдзел у нацыянальным руху ў перыяд студзеньскага паўстання, мы дакідаем цяпер жменьку звестак, дапаўняючы імі цыкл артыкулаў, змешчаных у свой час на старонках тутэйшых выданняў»*.

Неабходнасць гэтай публікацыі Ядкоўскі тлумачыць такім жа чынам, што і папярэдніх — зародкавы стан гістарыяграфіі паўстання 1863 г. у Гродзенскім павеце і невядомасць імёнаў *«шматлікіх байцоў за нашу Волю і Незалежнасць»*. Тут жа Ядкоўскі ўзнаўляе свой заклік да грамадскасці перасылаць у Дзяржаўны музей у Гродне матэрыялы па гісторыі паўстання (*«нават самыя сціплыя нататкі»*), якія *«будуць выкарыстаны на славу польскай зброі ў наднёманскіх краях»*.

Неабходна заўважыць, што згаданы біяграфічны слоўнік Ядкоўскага, нягледзячы на невялікую колькасць уключаных у яго звестак і вузкасць кола ўжытых крыніц, з'яўляецца храналагічна найбольш раннім з усіх, прысвечаных паўстанцам, якія паходзілі менавіта з тэрыторыі Беларусі. З упэўненасцю магчыма сказаць, што гэта была першая спроба ў дадзеным накірунку даследаванняў.

Апрача таго, звесткі пра паўстанне былі ўключаны ў некалькі кніг аўтарства Ядкоўскага. Так, невялікі пасаж публіцыстычнага характару быў змешчаны ў гістарычным нарысе «Гродна» [21, s. 48–50], выдадзеным у Вільні ў 1923 г., а ў наступным — 1924-м — годзе выйшла з друку невялікая брашура «Па-дамініканская гімназія ў Гродне», прысвечаная яе гісторыі і дзейнасці, дзе таксама некалькі старонак прысвечаны ўдзелу гімназістаў у паўстанні [20, s. 29–32]. Галоўным чынам у ёй апісваецца іх спроба выехаць з Гродна на цягніку і падаецца спіс 19 з тых, хто намагаўся гэта зрабіць. Заканчваецца гэтая частка брашуры традыцыйным заклікам да *«людзей добрай волі»* папаўняць і выпраўляць *«тое, што нам удалося выцягнуць на свет Божы»*. Варта адзначыць цікавую акалічнасць — значна раней гісторыю Гродзенскай гімназіі выдаў настаўнік і палітычны апанент Ядкоўскага Яўстафій Арлоўскі [11].

Апрача вышэй згаданага, Ядкоўскі імкнуўся папулярызаваць гісторыю паўстання праз месцы, звязаныя з ім. У прыватнасці, у выдадзеным ім турыстычным даведніку «Гродна і ваколіцы. Аўгустоўскія азёры. Сувалшчына» ён асобна звяртаў увагу патэнцыяльных падарожнікаў на неабходнасць наведаць урочышча Святое Балота, дзе ў 1863 г. адбыўся бой [22, s. 16–17].

Храналагічна апошняя з вядомых публікацый Ядкоўскага пра паўстанне з'явілася ў № 3 за 1933 г. выдання «Ваўкавыскі тыднёвік» і мела юбілейны характар, што і задавалася ў яе назве — «У 70 гадавіну студзеньскага паўстання» [29]. Яе пачатак даслоўна паўтарае першыя радкі яго артыкула «1863 год у Гродзенскім павеце (гл. вышэй) з тым толькі адрозненнем, што словы *«Гродзеншчына»* заменена на *«Ваўкавыскі павет»*. Артыкул складаецца з дзвюх частак. У першай, якая служыла своеасаблівай прадмовай да другой, згаданы некаторыя асобы, якія брали актыўны ўдзел у паўстанні альбо пацярпелі ў выніку рэпрэсій

пасля яго. Падставай для гэтай часткі паслужылі, верагодна, папярэднія публікацыі Ядкоўскага, асабліва яго біяграфічны слоўнік.

Другая ж частка выклікае значна большую цікавасць, бо з'яўляецца публікацыяй мемуарнай крыніцы, знаходжанне якой невядома ў наш час — успамінаў пра падзеі паўстання ўраджэнца Ваўкавышчыны Фелікса Міхальскага, які іх *«напісаў для Дзяржаўнага музея ў Гродне»*. Гэта сведчыць пра тое, што адпаведныя заклікі Ядкоўскага ў ранейшых публікацыях далі свой плён. Апублікаваная частка ўспамінаў мае невялікі аб'ём — усяго 16 абзацаў. Аднак яе каштоўнасць у тым, што гэта адзін з нешматлікіх мемуарных твораў пра падзеі паўстання ў Ваўкавыскім павеце, які напісаны непасрэдным, хоць маладым на той час, відавочцам. У ім згадваюцца назвы мясцовасцяў і апісваюцца асобныя выпадкі, а таксама называюцца канкрэтныя асобы, якія ўдзельнічалі ў падзеях, і падаюцца характарыстыкі некаторых з іх. Напрыклад, расійскі ваенны начальнік Ваўкавыскага павета Васіль Казанлі — *«чалавек жорсткі»*, а пра яго ад'ютанта Станіслава Чымбаевіча *«казалі, што быў чалавечым і карысным»*. Пра тое, што ўспаміны змешчаны ў артыкуле не цалкам, сведчаць некалькі скарачэнняў, пазначаныя шматкроп'ямі. Заканчваецца артыкул звычайным для Ядкоўскага заклікам *«сабраць і перадаць наступным пакаленням»* крыніцы і помнікі пра паўстанне, а таксама клапаціцца і ўшаноўваць магілы палеглых паўстанцаў.

Наконт паспяховасці заклікаў Ядкоўскага аб зборы матэрыялаў пра паўстанне неабходна таксама сказаць, што ў пачатку 1920-х гг. у Гродзенскі музей быў перададзены т.зв. «Альбом паўстанцаў», дзе змешчаны 90 партрэтных фотаздымкаў, з якіх каля 10 асоб, якія ўдзельнічалі ў паўстанні, і яшчэ некалькі сваякоў паўстанцаў [3, с. 155].

У гэтым жа 1933 г. Ядкоўскі удзельнічаў у працы т.зв. «Нядзельнага ўсеагульнага ўніверсітэта ў Гродне», які ўяўляў сабой цыкл лекцый, чытаных навукоўцамі горада для *«самых шырокіх слаёў насельніцтва»*. Планавалася, што ў межах гэтага «ўніверсітэта» Ядкоўскі будзе спецыялізавацца на гісторыі і гісторыі мастацтва. Тэма яго першага выступлення, якое планавалася на 22 лютага як інаўгурацыйнае для ўсёй серыі, адпавядала яго ранейшым працам і мела назву «Студзеньскае паўстанне ў Гродзенскім павеце» [31]. Ужо праз 3 дні пасля выхаду паведамлення пра пачатак дзейнасці «ўніверсітэта» да нумара ад 21 студзеня гэтай жа газеты «Ostatnie Wiadomości Grodzieńskie» («Апошнія гродзенскія навіны») выйшаў 8-старонкавы дадатак пад назвай «Студзеньскае паўстанне 1863 года» [32]. Увогуле, на тэму лекцыйнай дзейнасці Ядкоўскага Снежка пісаў у сваіх успамінах: *«З энергіяй і замілаваннем аддаваўся таксама Ядкоўскі папулярызацыі гісторыі свайго рэгіёну. З выступленнямі і рэфератамі на розныя тэмы, якія, аднак, заўжды тычыліся гі-*

*сторыі, мастацтва, археалогіі ці этнаграфіі родных краёў, нястомна ездзіў амаль па ўсёй тагачаснай Польшчы»* [36, s. 38].

Пасля выезду Ядкоўскага з Гродна ў 1930-я гг. даследаваннем паўстання 1863–1864 гг. ён больш не займаўся, і яго публікацый на гэтую тэму больш невядома.

Такім чынам, Юзаф Ядкоўскі зрабіў значны ўклад у даследаванне і папулярызацыю гісторыі паўстання 1863–1864 гг. на Гродзеншчыне. Да яго заслуг неабходна аднесці ўвядзенне ў навуковы ўжытак і публікацыю раней нявыкарыстаных крыніц, пераважна рукапісных матэрыялаў, якія захоўваліся ў Гродне, а таксама стварэнне першага біяграфічнага слоўніка ўдзельнікаў паўстання, якія паходзілі з Гродзенскага рэгіёна. Яму належыць таксама заслуга ў папулярызацыі сабраных звестак праз публікацыю ў перыядычнай прэсе, публічныя выступленні і ўключэнне памятных месцаў паўстання ў турыстычную сферу. Сведчаннем карысці і навуковай каштоўнасці яго прац з'яўляецца тое, што ў апошнія гады яго спадчына пачынае выклікаць усё большую цікавасць даследчыкаў, перакладацца на беларускую мову [14] і асэнсоўвацца [3].

## Крыніцы і літаратура


1. Голос из Гродненской губернии // Вестник Юго-Западной и Западной России. — Год 2. — 1864. — Т. 1, ч. 7, отд. 4. — С. 57–59.
2. Госцеў, А., Швед, В. Ядкоўскі Юзаф // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. — Т. 6. — Кн. 2. — Мінск : БелЭн, 2003. — С. 288.
3. Казак, Т., Вашкевіч, А. Паўстанне 1863 г. у навуковай спадчыне Юзафа Ядкоўскага // Гарадзенскі соцыум 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Краўцэвіча і А. Ф. Смаленчука. — Гародня: б/в, 2014. — С. 153–157.
4. Какаренко, В. Юзеф Иодковский: музейщик и нумизмат // Банкаўскі веснік. — Сакавік 2010. — С. 20–27.
5. Крживицкий. Письмо из Гродна к редактору Московск[их] ведомостей // Вестник Юго-Западной и Западной России. — Год 2. — 1864. — Т. 2, ч. 6, отд. 4. — С. 344–345.
6. Маевский, И. Гродненская процессия 14 августа 1861 года // Русская старина. — 1891. — Т. 70. — № 5. — С. 489–497.
7. Митропольский И. А. Повстанье в Гродне в 1863–1864 годах. Из воспоминаний врача // Русский архив. — Год 33. — 1895. — Т. 1. — С. 129–156.
8. [Мосолов А. Н.]. Виленские очерки 1863–1865 гг. Воспоминания очевидца. Часть вторая. С 25-го мая 1864 года // Русская старина. — Год 14. — 1883. — Т. 40. — С. 181–200, 391–406, 573–628; Год 15. — 1884. — Т. 41. — С. 15–60.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 1416. — Воп. 6. — Спр. 328. — Справа паводле паведамлення Гродзенскага губернскага праўлення ад 31 снежня [1863 года] за № 10239 пра пошук маёмасці і

капіталаў розных асоб, што бралі ўдзел у паўстанні, для канфіскацыі ў казну. 31.12.1863–17.07.1866. — 37 арк.

10. Орловский, Е. Граф М. Н. Муравьев как деятель над укреплением прав русской народности в Гродненской губернии 1831–1835 и 1863–1865. — Гродно: Губ. типогр., 1898. — 31 с.
11. Орловский, Е. Ф. Исторический очерк Гродненской гимназии. — Гродно: Паровая лито-типография С. Лапина, 1901. — 119 с.
12. Славутинский, С. Т. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа. (Отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. — 1889. — Т. 37. — № 7. — С. 53–79, № 8. — С. 271–295.
13. Шоцік, В. Юзаф Ядкоўскі і яго роля ў стварэнні кнігазбору Гарадзенскага гісторыка-археалагічнага музея // Гістарычны альманах. — Т. 2. — Гародня, 1999. — С. 116–121.
14. Ядкоўскі, Ю. 1863 год у Гродзенскім павеце / пераклад з пол. мовы, рэд. і каментары Т. Казак, В. Герасімчыка і А. Вашкевіча // Горад Святога Губерта: Альманах лакальнай гісторыі. — Вып. VIII / рэдкал.: А. Смалянчук [і інш.]. — Гродна: б/в, 2014. — С. 14–67.
15. Aramowicz, I. Pamiętnik o ruchu partyzanckim, w województwie grodzieńskiem, w 1863 i 1864 r. — Bendlikon: w Drukarni “Ojczyzny”, 1865. — 84 s. — (Marzenia)
16. Długosz, J. Oddziały powstańcze roku 1863 w gubernii grodzieńskiej // Przegląd Narodowy. — 1912. — S. 67–86.
17. Dubiecki, M. Romuald Traugutt i jego dyktatura podczas powstania styczniowego 1863–1864. — 2-e wyd., powiększone. — Kraków: G. Gebethner, 1907. — 216 s.
18. Giller, A. Historia powstania narodu polskiego. — T. 1–4. — Paryż, 1867–1871.
19. Hoppe, S. Jodkowski Józef // Polski słownik biograficzny. — T. 11. — Wrocław [etc.]: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1964–1965. — S. 258–259.
20. Jodkowski, J. Gimnazjum po-dominikańskie w Grodnie. — Grodno: Nakładem Muzeum Państwowego w Grodnie, 1924. — 39 s.
21. Jodkowski, J. Grodno: z 28 ilustracjami i planem miasta. — Wilno: Nakładem księgarni J. Zawadzkiego w Wilnie, 1923. — 119 s.
22. Jodkowski, J. Grodno i okolice. Jeziora Augustowskie. Suwalszczyzna. Przewodnik turystyczny. — Grodno: Komisja turystyczna przy Zarządzie Miejskim w Grodnie, 1934. — 28 s., tabl. 1.
23. Jodkowski, J. Rok 1863 a grodzieńska młodzież szkolna // Dziennik wileński. — R. 2. — 1907. — № 200. — S. 1–2.
24. Jodkowski, J. Rok 1863 w powiecie grodzieńskim // Echo Grodzieńskie. — R. 4: 1921. — № 18. — 23.01.1921. — S. 1–2; № 28. — 05.02.1921. — S. 3; № 31. — 09.02.1921. — S. 3; № 32. — 10.02.1921. — S. 3; № 33. — 11.02.1921. — S. 3; № 34. — 12.02.1921. — S. 3; № 36. — 15.02.1921. — S. 3; № 160. — 21.07.1921. — S. 3; № 162. — 23.07.1921. — S. 2; № 166. — 28.07.1921. — S. 2; № 167. — 29.07.1921. — S. 2–3; № 168. —

30.07.1921. — S. 2; № 169. — 31.07.1921. — S. 2; № 171. — S. 3; № 172. — S. 2–3; № 173. — S. 2; № 174. — S. 4; № 175. — S. 2; № 176. — S. 2; № 177. — S. 2; № 179. — S. 2.
25. Jodkowski, J. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim (Notatki i uzupełnienia) // Echo Grodzieńskie. — № 17. — 23.01.1923. — S. 2–3.
26. Jodkowski, J. Romuald Traugutt // Echo Grodzieńskie. — № 174. — 06.08.1921. — S. 2.
27. Jodkowski, J. Sylwety z roku 1863 // Nowe Życie. — № 8. — 24.01.1926. — S. 2–3.
28. Jodkowski, J. Święte Błoto // Echo Grodzieńskie. — № 77. — 07.04.1921. — S. 4.
29. Jodkowski, J. W 70 rocznicę powstania styczniowego // Tygodnik wołkowyski. — 1933. — № 3. — S. 1–2.
30. Koźmian, S. Rok 1863. — T. I–III. — Warszawa, 1903.
31. Niedzielny Uniwersytet Powszechny w Grodnie // Ostatnie Wiadomości Grodzieńskie. — 1933. — 18 stycznia. — S. 6.
32. Powstanie Styczniowe 1863 roku // Ostatnie Wiadomości Grodzieńskie. — 1933. — 21 stycznia. — Dodatek. — 8 s.
33. Przyborowski, W. Dzieje 1863 roku / przez autora „Historyi dwóch lat". — T. 1–3. — Kraków: W. L. Anczyc, 1897–1902.
34. Rożański, F. Z województwa grodzieńskiego // W czterdziestą rocznicę powstania styczmiowego. — Lwów: Komitet Wydawniczy, 1903. — S. 396–400.
35. Szukiewicz, W. Wspomnienie z r. 1863 // Kalendarz wydany staraniem katolickiego Towarzystwa Dobroczynności przy Kościele Św. Katarzyny w Petersburgu. — R. 13. — 1908. — S. 96–101.
36. Śnieżko, A. Wydobył z ziemi gród, o którym nikt nie wiedział: Wspomnienie o Józefie Jodkowskim. — Białystok: Białostockie Towarzystwo Naukowe, 2000. — 156 s. (Prace Białostockiego Towarzystwa Naukowego. — № 45).

Артыкул пастyпiў у рэдакцыю 08.10.2015

*С. Н. Рындин*

## Иностранные рабочие на территории белорусских губерний в период Первой мировой войны

В августе–сентябре 1915 г. германские войска заняли Виленскую и Гродненскую губернии. С этого времени белорусские земли рассекал восточный фронт Первой мировой войны. Но еще до вторжения немцев война оказывала ощутимое воздействие на жизнь края. В результате мобилизации военнослужащих резко сократилось

количество рабочей силы, спрос на которую в городе и на селе многократно возрос.

В довоенное время в белорусских губерниях не было дефицита рабочих рук, но война создала новые условия, к которым приходилось приспосабливаться. Востребованным трудовым ресурсом стали рабочие из-за рубежа. В военные годы их состав был специфичным. Среди них находилось много военнопленных.

Приток иностранной рабочей силы был значим для экономики. Следует отметить, что этот процесс имел не только экономический, но и социальный аспект. Для стабильности общества адаптация приезжих к новой среде очень важна. В историографии этот вопрос мало освещен. Военный историк А. Л. Самович первым затронул привлечение военнопленных к труду на западе России в 1915–1917 гг. Его исследования завершаются октябрем 1917 г. [23]. Но архивные источники свидетельствуют, что труд иностранных военнопленных использовался и при советской власти.

В число иностранных рабочих входили не только пленные. Среди них была и партия вольнонаемных. Пребыванию в Российской империи китайских рабочих посвящен сборник документов «Китайские рабочие на Урале в годы Первой мировой войны» [7]. Согласно материалам Государственного архива Российской Федерации (ГАРФ), китайские рабочие приезжали и в белорусские губернии.

В статье рассматриваются трудовая занятость и условия жизни иностранных рабочих, пребывавших на территории белорусских губерний в период Первой мировой войны.

До начала 1915 г. экономика не испытывала нехватки рабочей силы, даже несмотря на масштабную мобилизацию. В докладе Витебской губернской земской управы IV губернскому земскому собранию было отмечено: «В то время большинство земств не видело надобности использовать труд военнопленных ввиду окончания сельскохозяйственных работ и строительного сезона. В январе месяце сего года этот вопрос снова выдвинулся» [12, л. 52 об].

Особенностью белорусских губерний в условиях начавшейся войны стало их транзитное положение для многих тысяч военнопленных. В прифронтовых городах создавались сборные пункты, где из пленных формировались пересыльные партии. Под охраной их везли в Москву и Омск для последующего распределения по местам постоянного пребывания [14, лл. 25, 28 об.]. С августа 1914 г. сборные пункты действовали в Витебске, Волковыске и Двинске [14, л. 32].

С 1915 г. часть пленных возвращалась в прифронтовые губернии. На прибытие первых партий проливают свет документы Российского государственного военно-исторического архива (РГВИА). В мае 1915 г.

Главнокомандующий армиями Северо-Западного фронта М. В. Алексеев запросил 8000 пленных славян для работ по укреплению позиций [16, л. 78]. Первые эшелоны с рабочими прибыли в Волковыск уже 29 мая [16, л. 90].

Пленные немцы, венгры и турки считались враждебным элементом и к фронту не допускались. В западные губернии присылались только солдаты-славяне. Множество славян в рядах австро-венгерской армии считалось закономерным. В Австро-Венгрии славянские народы составляли большинство населения. Российская империя проявляла благожелательное отношение к пленным славянам. Для них предусматривался ряд льгот. В сентябре 1914 г. Военное министерство выступило с инициативой селить их обособленно от немцев, венгров и турок. Требовалось также снабжать славян лучшей одеждой и пищей. Привлечение к труду было возможно только с их согласия. Те же льготы распространялись и на пленных эльзас-лотарингцев [16, л. 4–4 об.].

Иностранные славяне, доставленные в западные губернии, были организованы по армейскому образцу. Они числились при армиях фронта. 12 ноября 1915 г. приказом № 238 начальника штаба Верховного главнокомандующего М. В. Алексеева предписывалось сформировать из командированных к фронту военнопленных рабочие роты согласно указанному штату. В марте 1916 г. Ставка Верховного главнокомандующего принимает решение объединить роты в дружины. Каждая дружина включала шесть рот [21, л. 371]. В документах РГВИА упоминаются 8 рабочих дружин из военнопленных при 2-й армии Западного фронта. Одна из них — 108-я — в июне 1916 г. насчитывала 1326 рабочих [18, л. 310]. 3 армия Западного фронта распоряжалась 4 дружинами. В августе 1916 г. в их составе находились 5043 иностранных подданных [20, л. 209]. В последующие годы реорганизация трудового контингента из военнопленных продолжалась. К июлю 1917 г. все рабочие дружины были объединены в рабочие батальоны, состоящие из 8 рот в каждом [21, л. 141].

Контингент пленных солдат предназначался для нужд фронта. Они работали в распоряжении как непосредственно армии, так и гражданских предприятий, выполнявших военные заказы. Так, при управлении коменданта этапа г. Витебска состояла смешанная рабочая команда военнопленных австрийцев. Согласно материалам РГВИА в конце 1915 г. она включала 2000 человек, которые занимались укреплением позиций [16, л. 254–254 об.].

В Витебской губернии трудом военнопленных в разное время пользовались 10 частных предприятий, обслуживавших армию. Согласно отчету старшего фабричного инспектора Витебской губернии 21 июня 1916 г. военнопленные работали более или менее постоянно на трех

витебских предприятиях — чугунолитейный завод И. И. Гринберга, акционерное общество «Витебский трамвай», чугунолитейный завод Я. М. Шехтера [13, л. 30–30 об.]. В июне 1917 г. витебские фирмы использовали 119 военнопленных. 69 человек из этого числа трудились на льнопрядильной фабрике «Двина» [13, л. 112].

Прикомандированные к фронту славяне строили и ремонтировали мосты и дороги, в том числе железные. Например, в Минской губернии они прокладывали ширококолейную полевую железную дорогу Уречье–Слуцк и второй путь Либаво-Роменской железной дороги. Значительное количество австро-венгерских военнопленных в 1915 г. было направлено в Речицкий уезд. Большая часть занималась заготовкой сена для войск Юго-Западного фронта.

В Минской губернии, как и в Витебской, пленных выделяли предприятиям оборонного значения. Иностранцы поступали на гвоздильный завод братьев Рикк в Речице, Наровлянскую судостроительную верфь, на 4 сенопрессовальных заводах в Речицком уезде и 3 лесопильных в Минском.

[1] Выказваю шчырую падзяку Герману Брэгеру за дапамогу па вызначэнні прозвішча гэтай асобы.

бо адсутнічае подпіс Казіміра Валодзькі [4, л. 277а об. — 277б об.]. Што тычыцца першай копіі, то ў ёй зафіксаваны толькі 31 подпіс, а дакладней, адсутнічаюць подпісы 5 шляхцічаў: Францішка Антонія Кандратовіча, Цыпрыяна Бародзіча, Іяхіма Бародзіча, Тадэвуша Кшышылоўскага і Бенядыкта Кунцэвіча [4, л. 255–255 об.]. Пад другой копіяй інструкцыі з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (у якой адсутнічаюць 3 пункты: 30-32) налічваюцца 33 подпісы шляхцічаў. У параўнанні з копіяй інструкцыі з трыбунальскай кнігі ў ёй адсутнічаюць подпісы 3 шляхцічаў: Цыпрыяна Бародзіча, Іяхіма Бародзіча і Тадэвуша Кшышылоўскага [4, л. 259 об. — 260]. Адразу бачна, што ў параўнанні з радзівілаўскімі прыхільнікамі прыхільнікі Чартарыйскіх маюць нязначнае прадстаўніцтва мясцовыхураднікаў, а дакладней толькі чатыры: земскі сурагатар, лоўчы, канюшы і будаўнічы.

Паспрабуем падлічыць прыкладнае прадстаўніцтва абодвух бакоў. Для гэтага, акрамя інструкцый, неабходна падлічыць колькасць шляхты з абодвух бакоў, якая падпісала пратэстацыі. Сем маніфестаў было пададзена 23 жніўня 1756 г. у наваградскім гродскім судзе. Першы з актыкаваных маніфестаў пададзены супраць усіх пастаноў наваградскага пасольскага сойміка. Прычынай паслужыў выбар дырэктарам сойміка Томаша Валодзькі, якога абралі незважаючы на пратэстацыі. Затым з пратэстамі адбылося абранне пасламі крайчага ВКЛ Станіслава Радзівіла і наваградскага падстолія Ігната Вайніловіча. Гэты маніфест падпісалі толькі тры шляхцічы — Казімір, Ян і Матэвуш Чачоты [2, арк. 823–824 адв]. Звяртае на сябе ўвагу, што толькі з гэтага маніфеста нам вядома аб спробе абраць дырэктарам сойміка Томаша Валодзьку. Пратэстуючыя супраць гэтага Чачоты не паставілі свае подпісы пад іншымі соймікавымі дакументамі, менавіта пад інструкцыяй і пратэстацыяй. Томаш Валодзька падпісаў інструкцыю паслам з сойміка прыхільнікаў Фаміліі, а таксама пратэстацыі супраць сойміка прыхільнікаў Радзівілаў. Аднак прыналежнасць Томаша Валодзькі да прыхільнікаў Фаміліі не дае нам поўнай упэўненасці, што пратэстацыя Чачотаў была выклікана іх прыналежнасцю да групоўкі Радзівілаў, а не прыватнай непрыязню да Томаша Валодзькі. Да таго ж Валодзька з'яўляўся прыхільнікам Фаміліі, а ў дакуменце сцвярджалася, што пад яго дырэкцыяй былі абраны радзівілаўскія прыхільнікі. Другі з актыкаваных дакументаў — акт маніфеста супраць усіх пастаноў наваградскага пасольскага сойміка падпісалі толькі 5 шляхцічаў (Юзаф Туганоўскі, Аляксандр Цехановіч, Тадэвуш Шаціла, Юзаф Пясецкі, Адам Рудкоўскі). Пратэстуючая шляхта сцвярджала, што «з-за тумулта (гвалта — *Рэд.*) ў соймікавай ізбе і падавання розных дырэктараў» не быў абраны дырэктар сойміка і ўвогуле ён быў сарваны [2, арк. 825–826 адв]. Трэці з актыкаваных маніфестаў пададзены супраць паўторнага наваградскага сойміка. Згодна з ім з-за

дзейнасці цырынскага старосты Юзафа Несялоўскага і «некаторых іншых» на сойміку пачаліся хваляванні, але іх удалося супакоіць. Пасля былі абраны паслы — крайчы ВКЛ Станіслаў Радзівіл і наваградскі падстолі Ігнат Вайніловіч. Дырэктар сойміка працягнуў пасяджэнні для напісання інструкцыі паслам на сойм. Тады частка нязгоднай шляхты пры старанні цырынскага старосты Юзафа Несялоўскага сфарміравала новы соймік. Шляхта пратэставала супраць паўторнага сойміка і абраных на ім пасламі на сойм Юзафа Несялоўскага і Віктара Вайніловіча. Гэты маніфест падпісалі 23 шляхцічы: Вінцэнт Равінскі, Антоні Нясецкі, Францішак Рац, Юзаф Куковіч, Антоні Куковіч, Уладзіслаў Хадкоўскі, Юры Мазадзелеўскі, Антоні Куковіч, Юры Куковіч, Бенядыкт Куковіч, Дыянізі Аколаў, Міхал Падгайскі, Самуэль Панфіловіч, Павел Панфіловіч, Юры Падгайскі, Дамінік Аколаў, Марцін Аколаў, Ігнат Аколаў, Караль Аколаў, Станіслаў Яжэўскі [2, арк. 827–827 адв]. Чацвёрты маніфест пададзены супраць усіх пастаноў наваградскага пасольскага сойміка. Згодна з ім пасля пачатку сойміка наваградскім падстоліем Вайніловічам распачаліся канфлікты пры выбары дырэктара сойміка. Некаторыя шляхцічы імкнуліся абраць яго з дапамогай сілы і ўзнік «тумульт» у соймікавай ізбе. Супраць усяго гэтага быў складзены маніфест, які падпісалі толькі чатыры шляхцічы Казімір, Юзаф, Караль Пясецкія і Якуб Неслухоўскі [2, арк. 828–829]. Пяты з актыкаваных маніфестаў пададзены супраць паўторнага наваградскага пасольскага сойміка. Згодна з ім пасля пачатку сойміка наваградскім падстоліем Ігнатам Вайніловічам аднагалосна дырэктарам сойміка абралі наваградскага ротмістра Антонія Міладоўскага. Ужо пад яго дырэкцыяй і без пратэстаў пасламі на сойм абралі Станіслава Радзівіла і Ігната Вайніловіча. Пасля таго як дырэктар сойміка прыпыніў соймікавыя пасяджэнні для напісання інструкцыі, а дырэктар сойміка,ураднікі і шляхта выйшлі з соймікавай ізбы, наваградскі канюшы Міхал Кшышылоўскі, «незвычайную ў нашым ваяводстве фарміруючы практыку», насуперак ужо перш абранаму дырэктару і паслам сабраў шляхту на паўторны соймік і абраў яго дырэктарам Феліцыяна Данэйку, а пасламі Юзафа Несялоўскага і Віктара Вайніловіча. З такім паўторным соймікам не пагадзілася прысутная на ім шляхта і вынесла маніфест супраць яго. Гэты маніфест быў падпісаны 5 шляхцічамі: Ігнатам Беліковічам, Міхалам Пажарыскім, Янам Галаўнём, Янам Палонскім і Аляксандрам Пажарыскім [2, арк. 830–831 адв]. Згодна з шостым маніфестам, «Працэсам абываціляў Наваградскага ваяводства», пасля таго як наваградская шляхта на сойміку зноў хацела абраць дырэктара, то тады «некаторыя» шляхцічы насуперак «вольнаму голасу» «з сваёй кампаніі насуперак заходзячым публічна пратэстам» імкнуліся «незаконна» абраць дырэктара сойміка і паслоў на сойм. Дакумент падпісалі 9 шляхцічаў: Ян Дамінік Дунін Раецкі,

Уладзіслаў Раецкі, Казімір Дунін Раецкі, Дыянізі Раецкі, Тадэвуш Раецкі, Ян Радзевіч, Марцін Гарбатоўскі, Барталамей Радзевіч і Канстанцін Маліноўскі [2, арк. 832–832 адв]. Апошні, сёмы з актыкаваных у навагродскай гродскай кнізе маніфестаў, таксама быў накіраваны супраць паўторнага навагрaдскага пасольскага сойміка. Яго тэкст паўтарае змест пятага маніфеста і быў падпісаны шасцю шляхцічамі: Янам Галаўнёй, Станіславам Долматам, Міхалам Пажарыскім, Аляксандрам Пажарыскім, Францішкам Мінкоўскім і Ігнатам Беліковічам [2, арк. 833–833 адв]. Подпісы Ігната Беліковіча, Міхала Пажарыскага, Яна Галаўні і Аляксандра Пажарыскага сустракаюцца ў пятым і сёмым маніфестах. За выключэннем першага маніфеста, які хоць і быў пададзены супраць радзівілаўскага сойміка, але змяшчае непраўдзівую інфармацыю, прыхільнымі Фаміліі былі другі, чацвёрты і шосты маніфесты. Радзівілаўскія прыхільнікі вынеслі свае маніфесты супраць «паўторнага» сойміка (трэці, пяты, сёмы). Разам маніфесты прыхільнікаў Радзівілаў падпісалі 27 шляхцічаў, а Фаміліі — 17 шляхцічаў.

Яшчэ два маніфесты былі занесены ў слонімскую гродскую кнігу. Першы — пададзены супраць усіх пастаноў навагрaдскага пасольскага сойміка. Згодна з ім пасля пачатку сойміка навагрaдскім падстоліем Ігнатам Вайніловічам «некаторыя» шляхцічы імкнуліся з дапамогай сілы абраць дырэктара сойміка, не звяртаючы ўвагі на пратэсты супраць прапанаваных кандыдатаў. Маніфест падпісаў 41 шляхціч: Станіслаў Лісоўскі, Вінцэнт Лісоўскі, Антоні Вайніловіч, Ігнат Ябланоўскі Снадзкі, Станіслаў Ладзята, Юзаф Міхал Іздэбскі, Ігнат Міладоўскі, Францішак Нясецкі, Антоні Тэраевіч, Юры Сяліцкі, Ігнат Логвін, Рафал Логвін, Вінцэнт Барзабагаты, Юры Тэраевіч, Пётр Тэраевіч, Якуб Янчэўскі, Юзаф Янчэўскі, Лявон Ігнат Баброўскі, Станіслаў Садоўскі, Лявон Тэраевіч, Міхал Мержэеўскі, Пётр Тэраевіч, Крыштаф Пазнанскі, Ізідор Паўлоўскі, Антоні Чэрнік, Марцін Гурскі, Ваўжынец Шандрон, Сымон Тэраевіч, Ян Яніслаўскі, Юры Дэшына, Казімір Кандратовіч, Ян Сапліца, Марцін Садоўскі, Павел Сухціцкі, Юзаф Вольскі, Францішак Шудрык, Юры Ясінецкі Война, Ян Браткоўскі, Міхал Цехановіч, Дамінік Пузевіц і Ян Пацэвіч [8, арк. 417–417 адв]. Другі маніфест супраць крайчага ВКЛ Станіслава Радзівіла і навагрaдскага пасольскага сойміка быў занесены ў кнігі слонімскага гродскага суда, бо яго не прынялі ў навагрaдскім гродзе. Згодна з гэтым маніфестам пасля пачатку сойміка навагрaдскім падстоліем Ігнатам Вайніловічам соймікавым дырэктарам абралі лідскага лоўчага Феліцыяна Данэйку, а пасламі Юзафа Несялоўскага і Віктара Вайніловіча. Ужо пасля заканчэння сойміка Станіслаў Радзівіл разам з Ігнатам Вайніловічам, «са сваімі афіцэрамі і слугамі, не жыхарамі Навагрaдскага ваяводства, інкогніта ці то на вуліцы, ці то ў сваёй станцыі (абоз, лагер — *Рэд.*)» нібыта абраліся за паслоў пад ды-

рэкцыяй Антонія Міладоўскага. Гэты маніфест падпісалі дванаццаць шляхцічаў: слонімск земскі рэгент і слонімскі каморнік Леапольд Броніц, Адам Рудкоўскі, Юзаф Пясецкі, Тадэвуш Шаціла, Юры Клячкоўскі, Міхал Чарняўскі, Антоні Сапліца, Юры Тэраевіч, Адам Тэраевіч, Міхал Броніц, Міхал Сасімовіч і Ян Панфіловіч [8, арк. 463–463 адв]. Таксама два маніфесты былі актыкаваны ў кнізе Трыбунала ВКЛ. Першы супраць наваградскіх гродскіх ураднікаў і канцылярыі наваградскага гродскага суда. Згодна з ім соймік пачаў наваградскі падстолі Ігнат Вайніловіч, а потым пачаліся моцныя спрэчкі паміж канкурэнтамі на абранне дырэктара сойміка. Пасля таго як некаторыя канкурэнты адмовіліся, дырэктарам сойміка быў абраны лідскі лоўчы Феліцыян Данэйка. Затым, спачатку Станіслаў Радзівіл, а пасля яго «некаторыя» ўраднікі і шляхцічы з сойміка выйшлі ў свае станцыі. Не было ніякіх пратэстаў, і шляхта ўпрасіла дырэктара паслаць дэлегатаў у наваградскі гродскі суд па каралеўскую інструкцыю да наваградскай шляхты і іншыя магчымыя звароты да яе. Аднак канцылярыя наваградскага гродскага суда адмовілася выдаць каралеўскую інструкцыю на соймік. Гэта не перашкодзіла на падставе выдадзеных каралём і публікаваных па парафіях універсалах абраць пасламі на сойм Юзафа Несялоўскага і Віктара Вайніловіча. Сабраная шляхта маніфеставала ў соймікавай ізбе супраць дзейнасці наваградскіх гродскіх ураднікаў і канцылярыі наваградскага гродскага суда. Маніфест падпісалі 85 шляхцічаў: лідскі лоўчы і дырэктар сойміка Феліцыян Данэйка, скарбовы пісар ВКЛ Віктар Юзаф Хэлхоўскі, наваградскія: лоўчы Антоні Туганоўскі, земскі сурагатар Эліяш Магільніцкі, канюшы Міхал Кшышылоўскі, будаўнічы Ян Хмялеўскі, ротмістры Ян Булгак, Марцін Совіч Корсак, Ігнат Равінскі, Ян Равінскі, Аляксандр Цяльшэўскі, мазырскі харужыц Казімір Булгарын, чарнігаўскі стольнік Ян Ведніч, Марцін Магільніцкі, Багуслаў Узлоўскі, Казімір Корвін Мілеўскі, Ігнат Хэлхоўскі, Антоні Вайніловіч, Францішак Антоні Кандратовіч, Ігнат Кандратовіч, Казімір Кандратовіч, Міхал Мержэеўскі, Багуслаў Берасневіч, Баніфацы Берасневіч, Томаш Валодзька, Казімір Валодзька, Антоні Валодзька, Караль Буроўскі, Станіслаў Масальскі, Ігнат Ябланоўскі Снадзкі, Юры Дэшына, Казімір Конвід Жукоўскі, Антоні Велшіло [1], Міхал Пласкавіцкі, Мацей Ян Ябланоўскі, Марцін Садоўскі, Юзаф Цяльшэўскі, Францішак Кшышылоўскі, Тадэвуш Кшышылоўскі, Марцін Замойскі, Аляксандр Ясётр Магільніцкі, Ян Беліковіч, Антоні Данэйка, Бенядыкт Кунцэвіч, Пётр Яхавіцкі, Антоні Юрэвіч, Казімір Пясецкі, Ян Дмухоўскі, Стэфан Сапліца, Ян Беліковіч, Станіслаў Садоўскі, Ігнат Райкевіч, Юры Тэраевіч, Мікалай Жукоўскі, Фелікс Пласкавіцкі, Аляксандр Цехановіч, Якуб Яніковіч, Павел Юхціцкі, Самуэль Змя-

---

[1] З-за памылкі пісара ў дакуменце адсутнічае як мінімум адзін радок з подпісамі.

еўскі, Лявон Ігнат Рачкоўскі, Феліцыян Дзідзіуліч (напэўна, ідэнтычны Феліцыяну Дзідзінскаму, а насамрэч прозвішча Дзідзіула)[2], Казімір Хмялеўскі, Геранім Давідовіч, Ян Дашкевіч, Пётр Тэраевіч, Геранім Нароцкі, Антоні Хмялеўскі, Сымон Тэраевіч, Юзаф Янчэўскі, Фабіян Пласкавіцкі, Тадэвуш Шаціла, Міхал Звяровіч, Марцін Звяровіч, Юзаф Магільніцкі, Андрэй Кунцэвіч, Якуб Янчэўскі, Юры Рытвіньскі, Юзаф Цяльшэўскі, Андрэй Тэраевіч, Гіляры Замойскі, Крыштаф Пазнанскі [3, p. 1386–1389 v]. Другі маніфест быў пададзены супраць крайчага ВКЛ Станіслава Радзівіла. Маніфест актыкаваны 25 жніўня 1756 г. падчас чытання інструкцыі паслам. Згодна з ім пасламі абралі Юзафа Несялоўскага і Віктара Вайніловіча. Маніфест быў занесены не толькі супраць Станіслава Радзівіла, але і супраць наваградскага падстолія Ігната Вайніловіча і наваградскага гродскага рэгента Мацея Яновіча. Радзівіл і Вайніловіч імкнуліся быць пасламі пры дапамозе «афіцэраў і іншых жаўнераў» і пагражалі шляхце. Яшчэ да сойміка, 22 жніўня 1756 г., пагражалі зброяй нават у станцыі цырынскага старосты Несялоўскага, а потым, вяртаючыся да сябе, атакаваў насупраць касцёла іезуітаў «спакойна вуліцай ідучую» шляхту. Падчас сойміка Станіслаў Радзівіл выйшаў з соймікавай ізбы пасля недапушчэння да абрання дырэктарам Антонія Міладоўскага і выбару на гэты ўрад лідскага лоўчага Феліцыяна Данэйкі. У станцыі да яго далучыліся Ігнат Вайніловіч, Антоні Міладоўскі і некаторыя іншыя ўраднікі і шляхцічы. Там яны «нібыта ў соймікавай ізбе» абралі пасламі Станіслава Радзівіла і Ігната Вайніловіча. Акрамя таго, наваградскі грод не выдаў на соймік у соймікавую ізбу каралеўскую інструкцыю. Шляхцічы, што сабраліся на соймік, звярнуліся да законна абраных паслоў з пратэстам супраць такіх дзеянняў Радзівіла і яго прыхільнікаў. Маніфест падпісалі 87 шляхцічаў: лідскі лоўчы і дырэктар сойміка Феліцыян Данэйка, скарбовы пісар ВКЛ Віктар Юзаф Хэлхоўскі, наваградскія: земскі сурагатар Эліяш Магільніцкі, лоўчы Антоні Туганоўскі, канюшы Міхал Кшышылоўскі, будаўнічы Ян Хмялеўскі, ротмістры Ян Булгак, Марцін Совіч Корсак, Ігнат Равінскі, Ян Равінскі, мазырскі харужыц Казімір Булгарын, мазырскі мастаўнічы Францішак Антоні Кандратовіч, чарнігаўскі стольнік Ян Ведніч, Станіслаў Масальскі, Марцін Магільніцкі, Багуслаў Узлоўскі, Томаш Валодзька, Баніфацы Берасневіч, Багуслаў Берасневіч, Казімір Валодзька, Людвік Валодзька, Антоні Валодзька, Дамінік Галаўня, Бенядыкт Кунцэвіч, Антоні Вайніловіч, Антоні Данэйка, Ігнат Хэлхоўскі, Казімір Кандратовіч, Ігнат Кандратовіч, Самуэль Ланеўскі, Матэуш Сайновіч, Лявон Ігнат Пяхоўскі, Міхал Цехановіч, Антоні Вайніловіч, Пётр Яцкоў-

---

[2] Выказваю шчырую падзяку Герману Брэгеру ў дапамозе па вызначэнні прозвішча гэтай асобы.

скі, Пётр Некраш, Ігнат Ябланоўскі Снадзкі, Геранім Давідоўскі, Казімір Пясецкі, Караль Буйноўскі, Аляксандр Цяльшэўскі, Францішак Кшышылоўскі, Тадэвуш Кшышылоўскі, Марцін Замойскі, Ян Дашкевіч, Ян Беліковіч, Антоні Данэйка, Міхал Мержэеўскі, Казімір Хмялеўскі, Казімір Нясецкі, Самуэль Змяеўскі, Феліцыян Дзідзінскі, Ян Дмухоўскі, Стэфан Сапліца, Казімір Пясецкі, Станіслаў Садоўскі, Марцін Гурскі, Тадэвуш Шаціла, Міхал Звяровіч, Мікалай Крыжан Жукоўскі, Антоні Хмялеўскі, Антоні Тэраевіч, Ігнат Магільніцкі, Фелікс Пласкавіцкі, Гіляры Замойскі, Павел Сухціцкі, Юзаф Янчэўскі, Антоні Кунцэвіч, Антоні Тэраевіч, Якуб Янчэўскі, Крыштаф Пазнанскі, Міхал Пласкавіцкі, Геранім Навіцкі, Пётр Тэраевіч, Казімір Жукоўскі, Мацей Ян Ябланоўскі, Аляксандр Цехановіч, Юзаф Магільніцкі, Сымон Тэраевіч, Юры Дэшына, Якуб Ежыковіч, Ігнат Райкевіч, Вінцэнт Бжобагаты, Марцін Садоўскі, Юры Рытвіньскі, Ваўжынец Шандрон і Стэфан Бянькоўскі [3, р. 1390–1391 v]. Яшчэ адна копія гэтага дакумента знаходзіцца ў «Аўтографах Дуброўскага», якія захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Праўда, пад копіяй змешчаны толькі 83 подпісы шляхцічаў [4, л. 248–250]. У ёй адсутнічаюць подпісы наступных шляхцічаў: чарнігаўскага стольніка Яна Ведніча, Бенядыкта Кунцэвіча, Самуэля Ланеўскага, Лявона Ігната Пяхоўскага, Феліцыяна Дзедзінскага, Антонія Тэраевіча, Антонія Кунцэвіча, Мацея Яна Ябланоўскага. Затое ў копіі з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў адрозненне ад копіі са слонімскай гродскай кнігі прысутнічаюць подпісы Марціна Магільніцкага, наваградскага ротмістра Яна Булгака (другі раз і таму магчыма, што памылкова), Баніфацыя Кунцэвіча і Юрыя Тэраевіча.

Як адзначалася вышэй, разам маніфесты прыхільнікаў Радзівілаў падпісалі 27 шляхцічаў. Інструкцыю паслам на сойм прыхільнікаў Радзівілаў падпісалі 24 шляхцічы, а паслам да караля — 39 шляхцічаў. Праўда, Францішак Мінкоўскі і Міхал Пажарыскі падпісалі інструкцыю паслам на сойм і маніфест супраць паўторнага сойміка. Адначасова пад інструкцыяй паслам да караля падпісаліся 17 шляхцічаў, якія не ставілі свае подпісы ні пад інструкцыяй паслам на сойм, ні пад маніфестамі супраць сойміка прыхільнікаў Фаміліі. Такім чынам, усяго радзівілаўская групоўка на сойміку налічвала не больш за 66 шляхцічаў.

Колькасць прыхільнікаў Чартарыйскіх была значна большай. З улікам шляхты, якая больш за адзін раз паставіла свае подпісы пад інструкцыяй і пратэстацыямі супраць сойміка прыхільнікаў Радзівілаў, агулам атрымліваецца 145 шляхцічаў. З улікам двух паслоў групоўка прыхільнікаў Фаміліі на наваградскім пасольскім сойміку 1756 г. складалася са 147 шляхцічаў.

Такім чынам, магчыма зрабіць наступныя высновы. У Наваградку ў 1756 г. адбыліся два канкурыруючыя пасольскія соймікі: прыхільнікаў

Радзівілаў і прыхільнікаў Чартарыйскіх. Большасць шляхты падтрымала соймік Чартарыйскіх (каля 147 чалавек). Колькасць прыхільнікаў Радзівілаў складала каля 66 шляхцічаў. Гэтая групоўка больш чым у два разы саступала групоўцы прыхільнікаў Фаміліі. Аднак на баку Радзівілаў апынулася большасць павятовыхураднікаў. Усе подпісы разам з пратэстацыяй трох Чачотаў паказваюць прысутнасць на абодвух сойміках 216 шляхцічаў. Безумоўна, колькасць шляхты, якая падпісала інструкцыі і пратэстацыі і прысутнічала рэальна адрознівалася, але на падставе гэтых подпісаў мы можам уявіць прыкладную лічбу шляхцічаў, прысутных на двух наваградскіх сойміках. Пасольская інструкцыя прыхільнікаў Чартарыйскіх была лепш распрацаванай і складалася з 33 пунктаў, якія ўтрымлівалі прапановы, накіраваныя як супраць Радзівілаў, так і каралеўскага двара. У асноўным яны тычыліся злоўжыванняў гетманаў у Трыбунале ВКЛ, дзеянняў каралеўскага двара ў справе Астрожскай ардынацыі і яго ўмяшальніцтва ў кампетэнцыю асэсарскіх судоў. Таксама інструкцыя мела пункты падзякі лідарам Фаміліі. У канцы яе знаходзіўся пункт аб аднаўленні павятовых попісаў, што ў дадзенай унутрыпалітычнай сітуацыі фактычна азначала пагрозу шляхецкага выступлення супраць караля. Інструкцыя прыхільнікаў Радзівілаў складалася з 17 пунктаў, якія ў асноўным падтрымлівалі прапановы каралеўскага двара.

## Крыніцы і літаратура


1. Мацук, А. Паслы ад павятовых соймікаў ВКЛ на сойм Рэчы Паспалітай 1756 г. // Україна крізь віки: Збірник наукових праць на пошану академіка НАН України професора Валерія Смолія. — К.: Институт истории Украины НАН Украины, 2010. — С. 624–639.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 1730. — Воп. 1. — Спр. 30. — Актавая кніга Наваградскага гродскага суда. 03.01.– 31.12.1756.
3. Lietuvos valstybės istorijos archyvas. SA 121.
4. Российская Национальная библиотека. — Ф. 971. Автографы Дубровского 126.
5. Мацук, А. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.). Мінск: Медысонт, 2010. — 640 с.
6. Biblioteka PAN PAU. — Sygn. 361.
7. Konopczyński, W. Polska w dobie wojny siedmioletniej. — T. 2. — Warszawa, Kraków: Druk W. L. Anczyca i Spółki, 1912. — 525 s.
8. НГАБ. — Ф. 1737. — Воп. 1. — Спр. 41. — Актавая кніга Слонімскага гродскага суда. 02.01.1756–30.12.1757.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.10.2015

# Генеалогія

*В. К. Крэсс*

## Скіндзеры герба «Шранява»: нарысы да гісторыі і генеалогіі старажытнага шляхецкага роду (XIV–XVIII стст.)

Старажытным родам, які прымаў чынны ўдзел у фарміраванні дзяржаўных асноў ВКЛ, уплываў на палітычныя, эканамічныя і культурныя працэсы ў рэгіёнах, з'яўляецца род Скіндзераў. Першыя яго прадстаўнікі разам з першымі Радзівіламі, Кязгайламі, Завішамі, Шэметамі, Гаштольдамі, Гедройцамі па сутнасці фарміравалі дзяржаўна-палітычную эліту ВКЛ у XIV–XV стст. Мэта працы — агульная рэканструкцыя гісторыі і генеалогіі літоўска-беларускага роду, даволі ўплывовага і знакамітага ў ВКЛ, але сёння практычна забытага. У адрозненне ад многіх згаслых да нашага часу шляхецкіх родаў Скіндзеры паспяхова перажылі гістарычныя пертрусы і многія прадстаўнікі роду пражываюць цяпер у Беларусі, Польшчы, Літве, а таксама далёка за іх межамі. Гэты факт надае даследаванню асаблівую актуальнасць.

Пачатак старажытнага літоўскага роду Скіндзераў, які ў сваёй гісторыі карыстаўся некалькімі шляхецкімі гербамі, пранікае сваімі каранямі ў часы праўлення вялікага князя Вітаўта (1392–1430). Важна адзначыць, што гісторыя прозвішча хавалася за прыдомкамі, іншымі прозвішчамі, магчыма, за гістарычнымі памылкамі, таму слушна агучыць версіі, якія адпрацоўваліся ў ходзе пошуку.

**Версіі вытокаў роду Скіндзераў**. Першая версія грунтуецца на паведамленні «Хронікі Быхаўца» пра князя Івана Дзмітрыевіча Скіндыра, удзельніка бітвы на р. Ворскла ў 1399 г., які называецца нашчадкам друцкага князя Рагвалода Барысавіча, унука Усяслава Чарадзея. Такая моцная ў гістарычным сэнсе версія аб пачатках генеалогіі Скіндзераў натыкаецца на няправільны варыянт напісання мянушкі князя, якую належыць перадаваць як Кіндыр. У працы польскага гісторыка і геральды-

ста графа Юліюша Астроўскага гэтая гістарычная памылка падаецца як сапраўдны факт паходжання Скіндзераў ад Рагвалодавічаў [28, s. 354, 579].

Паводле другой версіі продкамі роду з'яўляліся крымскія татары. У 1397 і 1398 гг. падчас сумесных з ханам Тахтамышам паходаў пад Азоў і Крым князь Вітаўт прывёў у ВКЛ некалькі тысяч татарскіх перасяленцаў, якім за вайсковую службу даваў землі ў ваколіцах Вільні, Ліды, у Ашмянскім, Берасцейскім, Навагародскім паветах. Частка татараў, якія апынуліся ў Літве, змянілі мусульманскае веравызнанне, прыняўшы хрысціянства праз каталіцкі абрад, і тым самым далі пачатак такім літвінскім родам, як Булгакі, Скірмунты, Глінскія, Солтаны і інш. Даследчык гісторыі старажытных татарскіх родаў у Рэчы Паспалітай гісторык-генеалог Station Дзядулевіч паведамляе: «…Скіндзеры гербаў «Ляліва», «Равіч» і «Шранява» на Валыні, Жмудзі і Літве. Род са старых часоў хрысціянскі, а прозвішча іх паказвае татарскае паходжанне, ад прапрапластаў, якія носяць імя Скіндзер…» [26, s. 436]. Тое самае сцвярджае «Польская шляхецкая энцыклапедыя»: «…Скіндзер герба «Ляліва», успамін за 1550 г., брацлаўскія татары-хрысціяне; Скіндзер герба «Равіч», успамін за 1500 г., Скіндзерышкі віленскія, татары-хрысціяне; Скіндзер герба «Шранява», успамін за 1500 г., Скіндзер-Сакольскі, татары хрысціяне…» [39, s. 71].

Больш звестак па гэтай тэме падае польскі гісторык Антон Прахаска [24, s. 196]. Распавядаючы аб унутрыпалітычных справах вялікага князя Вітаўта ў дачыненні да татарскіх перасяленцаў, ён спасылаецца на ксяндза Вінцэнта Пшыялгоўскага, які пад 1424 г. паведамляе аб заснаванні Станіславам і Андрэем Праставілавічамі Скіндзерамі касцёла ў Ляцку Віленскай дыяцэзіі (цяпер — вёска Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.) [41, s. 48].

Бацька братоў Праставіл Скіндзер (Скиндир, Скинъдир, Скиндар, Скиндзеревич; умоўныя гады жыцця 1380–1445) можа лічыцца заснавальнікам роду Скіндзераў. Названае паселішча, якое пазней увайшло ў склад Лідскага павета Троцкага ваяводства, да канчатковага трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. з'яўлялася вотчынай шматлікіх пакаленняў Скіндзераў герба «Шранява», іх надзейным радавым гняздом.

Асноўная прычына, чаму А. Прахаска і С. Дзядулевіч палічылі Скіндзераў татарамі, можа грунтавацца на іх беспадстаўнай думцы аб магчымай сувязі з імем Іскандэр. Аднак імя па бацьку братоў — Праставілавічы — адназначна сведчыць аб іншым, зусім не татарскім паходжанні. Імя Праставіл належыць да ліку паганскіх імёнаў літоўцаў-жамойтаў. Яго можна паставіць у адзін шэраг з такімі гучнымі імёнамі, як Радзівіл, Маставіл, Таўцівіл, Войшвіл. Такім чынам, гэтае імя не магло быць дадзена пры каталіцкім хрышчэнні неафіту-татарыну.

**Прарадзіма Скіндзераў**. У старарускім напісанні прозвішча «Скиндиръ» прасочваецца лацінскі корань дзеяслова «scindo» (раздзіраць, разрываць), сэнс якога магчыма звязаць з мяцежным характарам уладальніка імя. Вытворнае адсюль літоўскае слова «скіндзіліс» азначае парванае адзенне. Сугучнае яму «skinti» са значэннем «высякаць» можна аднесці да чалавека, які з'яўляецца лесарубам [18]. Таксама пацвярджальным фактам у адносінах да жамойцкай версіі з'яўляецца дакументальна зафіксаванае месца пражывання Праставіла. Прывілей вялікага князя Казіміра за 1442 г., завераны саноўнымі панамі Кязгайлам, Судзівоем і Сапегай, паведамляе аб наданні яму трох сялян у Пенянскай воласці (Рамейку, Стрыпейку і Трыгіса). Аб яе месцы знаходжання нагадвае маленькая літоўская вёска Пенянкай (Peniankai), якая лакалізуецца за 100 кіламетраў на поўнач ад Вільні, у землях гістарычнай Жамойці, дзе, дарэчы, не было татарскіх пасяленняў [29, s. 67].

Нашчадкі Праставіла Крыштаф і Мікалай Станіслававічы Скіндзеры ў 1569 г. трымалі дзедзічныя маёнткі Пашушвенскае на рацэ Шушва і Падубісе на рацэ Дубіса, якія знаходзіліся ў Ясвонскай і Айракгольскай валасцях Троцкага ваяводства, у цэнтры этнічнай Жамойці. Меў сваю частку ў гэтых уладаннях і іх аддалены сваяк Ян Мікалаевіч Скіндзер [12, с. 1, 12, 22, 63, 96, 158–160].

Варта адзначыць, што на перыяд XVI ст. прыходзіцца апагей працэсу фарміравання шляхецкіх прозвішчаў у рэгіёне. У гэты час за адным родам нярэдка замацаваны кангламерат родавых найменняў, якія паходзяць ад назваў населеных пунктаў і імён па бацьку. Так, дзед названых вышэй жамойцкіх баяр Крыштафа і Мікалая Станіслававічаў Скіндзераў — Мітка (Матца, Мацей) па назве свайго ўладання, маёнтка Пашушвы, нярэдка пісаўся як Пашушвенскі, тым самым заклаўшы галіну роду Скіндзераў-Пашушвенскіх-Мітkaвічаў. Яго сын Шыман, харунжы земскі ў 1523 г., упамінаўся ў дакументах як Міткавіч-Пашушвенскі і як Скіндзер. Унукі, дзеці Шымана, пісаліся як Скіндзеры-Міткавічы (Мікалай і Станіслаў), Пашушвенскія (Зоф'я, жонка цівуна рэтаўскага Марка Унучка), Міткавічы (Дарота, жонка кухмістра літоўскага Станіслава Шэмета). Такі прыклад ужывання трох прозвішчаў у адной сям'і характарызуе складаную антрапанімічную сітуацыю, у якой апынаецца даследчык шляхецкай генеалогіі адзначанага перыяду.

**Пачатак роду і першыя пакаленні**. У XV ст. ад Праставіла і яго сыноў Станіслава, Андрэя, Івашкі (Івана) Праставілавічаў Скіндзераў заснаваны два асобныя роды: Скіндзеры і Міткавічы-Пашушвенскія. Уласна Скіндзеры маюць працяг і на сённяшні дзень. Родапачынальні-

кам Міткавічаў-Пашушвенскіх з’яўляецца Мацей Станькавіч Праставіловіч, унук Івашкі Праставілавіча, згаданы ў 1488 г.

Імёны па бацьку і па дзеду схіляюць да думкі, што ад Мацея-Матцка-Міткі-Міцкі (так ён пазначаўся ў дакументах) пайшла галіна Станкевічаў-Праставіловічаў, але яе цяжка прасачыць, бо ў XV–XVI стст. антрапонім «Станкевіч» вельмі распаўсюджаны. У перапісе войска ВКЛ 1528 г. можна адшукаць некалькі дзясяткаў носьбітаў варыяцый гэтага ўтварэння: Станкевіч, Станькевіч, Станьковіч. Але з вялікай доляй верагоднасці можна вылучыць у гэтым дакуменце баярына васілішкаўскага Мацея Станьковіча, які ставіць аднаго вершніка, і яго жонку Мацееву Станковічаву, якая ставіць шэсць вершнікаў [16, с. 93]. У тым жа дакуменце ўпамінаецца баярын Бельскага павета Станіс Праставіловіч, які ставіў аднаго вершніка паводле перапісу войска ВКЛ 1528 г. [16, с. 57]. Сляды Станкевічаў-Праставіловічаў губляюцца напрыканцы XVI ст. у сувязі з іх пераходам на прозвішчы Станкевіч або Скіндзер. Генеалагічная інфармацыя аб прадстаўніках гэтай лініі прадстаўлена ў прывілеі караля Жыгімонта Аўгуста баярам Праставілавічам на правы шляхецтва за 5 лістапада 1569 г.: «Земяне нашие повету Слонимского, люди добрые, шляхта, Миколай Станкевичъ Проствиловичъ а Богушъ Машковичъ Проствиловичъ тыми словы зезнавали, ижъ продкове ихъ были Проствилы, а пять рожоные братья народу шляхецкого зъ Проствила вышли, два сыны Станько и Анисько, зъ Станька вышовъ сынъ Миколай, а зъ Миколая онъ сынъ его Богушъ, а тые Ленецъ Ивановичъ, Марко Климовичъ, Василий Борисовичъ и Пётръ Ходоровичъ зъ Проствиловичовъ рожоного брата Ивана пошли и суть стрыечные имъ братья» [5, с. 36–38].

Пра хрышчэнне Праставіла, уласніка тыпова жамойцкага паганскага імя, невядома, але яго сыны Станіслаў і Андрэй ужо мелі хрысціянскія імёны. Прыналежнасць да каталіцкага веравызнання пацвярджаецца фактам закладання касцёла Св. Станіслава ў в. Ляцк у 1424 г. Прымаючы пад увагу імя старэйшага сына Праставіла, можам дапусціць, што выбар апекуна для Ляцкага касцёла быў невыпадковым. Івашка (Іван), трэці сын Праставіла, разам з Пятром Лелюшам, ваяводам троцкім (1433–1440), і Івашкам Вяжэвічам, будучым маршалкам гаспадарскім (1452–1470), фундаваў будаўніцтва Шчучынскага касцёла Найсвяцейшага Сэрца Ісуса і Святой Тэрэзы ў 1436 г. [22, s. 210].

У першай палове XV ст. уплыў каталіцтва на землях Панямоння быў неістотным. Знаходжанне братоў сярод прадстаўнікоў буйной літоўскай шляхты ў справе распаўсюджвання каталіцтва сведчыла аб значным статусе сям’і ў ВКЛ і адмысловым канфесійным напрамку іх дзейнасці як прадстаўнікоў дзяржаўна-палітычнай эліты. Верагодна, Івашка Прас-

тавілавіч быў паяднаны з Лелюшам і Вяжэвічам і ўнутрыпалітычнай канфрантацыяй з Жыгімонтам Кейстутавічам.

Пасля ўступлення на вялікае княжанне ў 1440 г. Казімір Ягелончык пачаў прымірэнне з ворагамі Жыгімонта Кейстутавіча, а менавіта ажыццявіў перадачу ім новых зямель з сялянамі. Свідрыгайлу аддаў Валынскае княства, Праставілу і Біліусу падараваў людзей у Пенянскай валасці. 17 кастрычніка 1441 г. кароль і вялікі князь перадаў Івашку Праставілавічу ўладу над даннікамі Вяшкуцевічамі ў Астрыне [36, s. 111].

Наступнае падараванне для прадстаўнікоў сям'і вялікі князь Казімір зрабіў у 1449 г. [29, s. 61]. Агульны пералік сямейнай маёмасці ў Ваўкавыскім, Васілішкаўскім і Астрынскім паветах прыводзіцца ў пацвярджэнні вялікага князя Аляксандра Казіміравіча дваранам Станіславу, Яну, Венцлаву Андрушкавічам і іх дзядзькавічу (дваюраднаму брату) Матцу Станковічу ад 5 кастрычніка 1499 г. [32, s. 221–222].

Усе пералічаныя вышэй землі і маёнткі знаходзіліся ў дзяржанні Праставіловічаў-Скіндзераў доўгія часы. Напрыклад, радавое гняздо Ляцк трымалася ў руках роду да часу ліквідацыі ВКЛ як дзяржавы ў 1795 г. Імя па бацьку Праставілавіч у XVII ст. стала прыдомкам «Праставіловіч» і пэўны час ужывалася Скіндзерамі герба «Шранява», як напрыклад гродскім суддзёй Лідскага павета (1645–1649), у такім парадку: «Самуэль Крыштаф Паўлавіч Праставіловіч Скіндзер».

Прааналізаваўшы працу літоўскага гісторыка Еўгеніюса Савішчаваса, у якой распісана генеалогія асноўных баярскіх родаў Жамойці ў XV–XVI стст., мы выявілі шэраг жамойцкіх баярскіх родаў, якія перакрыжоўваюцца з родам Праставіловічаў-Скіндзераў. Такім чынам, прадстаўнікам згаданага прозвішча знайшлося месца сярод Білевічаў, Станкевічаў, Пашушвінскіх, Міткавічаў, чые роспісы былі распрацаваны ў гэтай кнізе раней [40, p. 397, 405–407]. Далей мы будзем разглядаць род Скіндзераў ад пратапласты Праставіла Скіндзера, пакінуўшы ў баку асоб, якія паходзяць ад яго братоў Біла і Маставіла.

Першым вядомым прадстаўніком роду прынята лічыць жамойцкага баярына Жадзейку, бацьку Біла, Маставіла і Праставіла. Звесткі пра яго ўпершыню сустракаюцца пад 1418 г. Польскі гісторык-генеалог Войцах Каяловіч прыпісвае яму шлюб з сястрой вялікага князя Вітаўта Малушай (Міклоўсай) [27, s. 166–167], што, верагодна, з'яўляецца міфам, бо сястра Вітаўта, хрышчаная Марыяй, была ў шлюбе з князем Іванам Цвярскім.

Андрэй Івашкавіч Скіндзер, сын Івашкі Праставілавіча, застаўся вядомым у гісторыі дзякуючы так званаму «разбору шляхты» на нізавым узроўні, які ён учыніў Марціну Мішкавічу 30 ліпеня 1510 г., напрыканцы свайго жыцця [34, s. 370].

Пра яго пляменніка, Мацея Станькавіча Праставіловіча, сведчыць дакумент за 1488 г., паводле якога пан Мацей атрымліваў прыбытак у памеры шасці коп з корчмаў ваўкавыскіх і шасці коп з мыта ў Берасці [30, s. 56].

Прадстаўнік пятага пакалення Андрэй Іванавіч Скіндзер пакінуў сыноў Станіслава, Яна, Венцлава, Марціна і Мікалая. Найбольш удалую кар'еру ў гэтай сям'і зрабіў Станіслаў Андрэевіч Скіндзер, пасол ад ВКЛ у Крымскім ханстве ў 1511–1516 гг., намеснік астрынскі, маршалак ВКЛ з 1516 г. [33, s. 336]. Яго жонкай, ужо да 1502 г., была Ганна Якубаўна з уплывовага магнацкага роду Кішак-Ціханавецкіх, дачка Якуба Мацеевіча з Ціханаўца Кішкі. Аднак пасаг Ганны Якубаўны Кішкі, маёмасць Яблань Сверчава ў Падляшшы, быў больш сціплым у параўнанні з яе траюраднымі сёстрамі Ганнай і Барбарай Станіславаўнамі Кішкамі, выдадзенымі замуж адпаведна за Яна і Юрыя Радзівілаў. У шлюбе са Станіславам Скіндзерам яна нарадзіла сына Мікалая, суддзю троцкага ў 1553–1554 гг., і дачку Ядвігу, якая была ў шлюбе са Станіславам Пясецкім. Памерла Ганна Якубаўна пасля 1546 г. [23, s. 43–44].

Станіслаў Скіндзер адыграў вялікую ролю ў дыпламатычных зносінах з Крымскім ханствам у 1511–1516 гг. і адпаведна неаднойчы згадваецца ў матэрыялах ліставання вышэйшых урадавых асоб абедзвюх дзяржаў [33, s. 258–259, 264–265, 301–302, 352]. Ён з'яўляўся каралеўскім паслом і кіраўніком пасольства ВКЛ у палітычных перамовах караля і вялікага князя Жыгімонта Старога з крымскімі ханамі Менглі Гірэем і яго сынам Махмет Гірэем падчас вайны ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай за ўсходнія памежныя землі ў 1512–1522 гг., у кантэксце якой адбылася перамога літвінскага войска пад кіраўніцтвам гетмана вялікага Канстанціна Іванавіча Астрожскага ў бітве з маскоўцамі пад Оршай у 1514 г. Перад гэтай бітвай і пасля яе пасольскімі місіямі, якія ўзначальваў Скіндзер, вяліся дыпламатычныя перамовы з крымскімі ханамі, з мэтай арганізацыі сумесных ваенных дзеянняў супраць Маскоўскага княства.

Станіслаў Андрэевіч Скіндзер памёр на дзяржаўнай службе ўвосень 1516 г., выконваючы пасольскія абавязкі ў Перакопе Крымскага ханства, аб чым годам пазней паведамляў Махмет-Гірэй у сваім лісце да Жыгімонта I [33, s. 353–354]. Аб тым жа паведамілі вялікаму князю Астафей Дашкевіч, стараста чаркаскі і канеўскі, і Андрэй Неміровіч, ваявода кіеўскі [33, s. 350–351]. Пасля смерці Станіслава Скіндзера пасольскае прызначэнне ў Крым атрымаў Іван Гарнастай.

Займаючы пасаду намесніка астрынскага, Станіслаў Скіндзер прымаў у Астрыне татарскага царэвіча Узубек-салтана, сына Дэўлеш-салтана з дынастыі Гірэяў, якому вялікі князь Жыгімонт у 1514 г. падараваў сялян і пусташ каля Астрыны (з таго часу пачалі называцца царэвічамі

Астрынскімі). Дзякуючы сваяцтву з крымскай дынастыяй род Астрынскіх некаторы час займаў ганаровае становішча пры двары вялікага князя і быў найбольш уплывовым татарскім родам у ВКЛ [10, с. 263–264]. Выбар вялікага князя Жыгімонта І адносна месца пасялення царэвіча невыпадковы. Будучы літоўскім паслом у Крымскім ханстве Станіслаў Скіндзер быў асабіста знаёмы з прадстаўнікамі роду Гірэяў, карыстаўся даверам і павагай, а таму мог спрыяць іх інкарпарацыі ў шляхецкую супольнасць ВКЛ [35, s. 144].

Нерухомая маёмасць Станіслава Скіндзера складалася з асобных паселішчаў (спадчыннае сяло Пялевічы) і зямельных валоданняў (землі ў Ляцку і Камянцы) у Астрынскай воласці. Акрамя гэтага, у 1509 г. яго гадавы прыбытак з менскіх мытаў складаў 15 коп грошай. Пасля яго смерці вёску Пялевічы з сялянамі набываў Мікалай Мікалаевіч Радзівіл, канцлер ВКЛ.

Ян Андрэевіч Скіндзер, як і старэйшы брат Станіслаў, быў уплывовым чалавекам таго часу. Пра яго Каспар Нясецкі ў «Польскім гербоўніку» пісаў: «…Ян Скіндзер, дваранін каралеўскі, у 1507 г. пасольства да Масквы здзяйсняў … падчас заключэння міру паміж Жыгімонтам І, каралём польскім і князем маскоўскім» [25, s. 380]. Ян Скіндзер знаходзіўся ў Маскве па пасольскіх справах і ў 1508 г. [14, с. 102–103]. Пазней, у 1529–1533 гг., Ян Андрэевіч Скіндзер займаў пасаду суддзі, верагодна, Троцкага ваяводства [32, s. 80, 134].

Адным з асноўных гістарычных дакументаў перыяду Вялікага Княства Літоўскага са звесткамі масавага генеалагічнага характару з'яўляецца «Перапіс войска ВКЛ» за 1528 г. Гэта адна з найбольш значных крыніц па гісторыі кіруючых эліт дзяржавы, з якой можна даведацца пра маёмасны стан рыцараў-шляхты. У ёй зафіксаваны: 1) імя і прозвішча шляхціча; 2) прыналежнасць да сацыяльнай катэгорыі (князь, пан, баярын-шляхціч ці проста баярын); 3) назва павета, пад харугвай якога ён запісаны, г.зн. месца пражывання або знаходжання ўласнасці; 4) ступень заможнасці — колькасць «коней», якіх ён мог выставіць на ваенны попіс. Пад «канём» разумеўся па-ваеннаму экіпіраваны ваяр на кані са зброяй. Адзін конны вершнік выстаўляўся ад васьмі сялянскіх дымоў, г.зн. сялянскіх гаспадарак. Той, хто не меў уласных сялян альбо меў менш за восем дымоў, павінен быў сам станавіцца на перапіс ці ставіць свайго сына або брата ці слугу. Перапіс прадстаўляе звесткі аб валоданні Янам Андрэевічам Скіндзерам сялянскімі гаспадаркамі ў колькасці 144: «…Пан Ян Андреевич Скиндер мает ставити 15 коней. Он же маеть ставити з людеи закупных 3 кони…» [16, s. 56]. Марцін і Мікалай Андрэевічы Скіндзеры, родныя браты Яна, выстаўлялі тры кані на дваіх. Жонка памерлага на той час Станіслава, Ганна Якубаўна з Кішак Скіндзер, ставіла ад баяр астрынскіх чатыры кані. Другі іх сваяк,

баярын Андрэй Скіндзер з Віцебскай зямлі, ставіў аднаго каня [16, с. 53, 156].

Матэрыялы ваенных перапісаў ВКЛ 1528 і 1565–1567 гг., а таксама запісы Літоўскай Метрыкі XV–XVI стст. далі магчымасць вызначыць геаграфію ўладанняў і прыкладнага рассялення роду Скіндзераў у прасторы дзяржавы. Асноўная частка прадстаўнікоў мела ўладанні ў Лідскім і Ваўкавыскім паветах, астатнія — у Менскім павеце, Віцебскай зямлі, Жамойці.

Герб «Шранява», які належаў большай частцы Скіндзераў, быў атрыманы імі пасля Гарадзельскай уніі 1413 г. Тады, у замку Гарадло на р. Заходні Буг, у дзвюх граматах, выдадзеных для замацавання братэрства паміж Каралеўствам Польскім і Вялікім Княствам Літоўскім, 47 польскіх феадалаў надзялілі 47 феадалаў- каталікоў ВКЛ сваімі гербамі і тым самым прынялі іх у свае гербавае брацтва. У сваю чаргу 45 феадалаў-каталікоў прынялі гербы польскіх феадалаў і абяцалі быць з імі ў вечнай дружбе і саюзе. У трэцяй грамаце (т.зв. Гарадзельскі прывілей 1413 г.) польскі кароль Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт абяцалі прызначаць на дзяржаўныя пасады феадалаў-каталікоў, якія прынялі польскія гербы, і дазволіць ім свабодна распараджацца маёмасцю ў сваіх маёнтках. Такія крокі садзейнічалі павышэнню грамадскага становішча літоўскага баярства, якое фактычна ўраўноўвалася правамі з князямі Рурыкавічамі і Гедзімінавічамі [21, с. 495]. Можна меркаваць, што менавіта гэтымі абставінамі тлумачыцца пераход Праставіловічаў-Скіндзераў з паганства ў каталіцтва. Павелічэнне правоў спрыяла павелічэнню матэрыяльнага дабрабыту роду і зрабіла магчымай фундацыю касцёлаў у Ляцку і Шчучыне.

Скіндзеры, якія жылі ў Жамойці, з канца XVI ст. сталі карыстацца шляхецкім гербам «Равіч». Верагодна, да іх адносіцца галіна жамойцкага баярына Шымона Міткавіча Пашушвенскага Скіндзера, прадстаўнікі якой у пачатку XVI ст. карысталіся гербам «Ліс». Галіна яго брата Станіслава Міткавіча Скіндзера, баярына гаспадарскага Ясвенскай і Айракгольскай валасцей, які згадваецца ў 1541 г. [32, s. 228–229, 268–269], а таксама яго нашчадкі, як і большасць астатніх Праставіловічаў Скіндзераў, абралі герб «Шранява». Таксама ў гісторыі Рэчы Паспалітай ёсць Скіндзеры герба «Ляліва».

У шостым пакаленні пасольскую справу сваіх продкаў Станіслава і Яна Андрэевічаў Скіндзераў прадоўжыў іх унучаты пляменнік Мікалай Міткавіч Пашушвенскі Скіндзер, які ў 1558 г. разам з ваяводам падляскім і старастам менскім Васілём Тышкевічам узначальваў пасольства ад караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста да рускага цара Івана IV Васільевіча (Жахлівага) [14, с. 208–210]. Менавіта ў гэтым годзе пачалася Лівонская вайна (1558–1582 гг.), у якой давялося ўдзельнічаць Ста-

ніславу Скіндзеру, роднаму брату Мікалая. У 1561–1562 гг. у званні каралеўскага ротмістра ён з’яўляўся камендантам і начальнікам гарнізона Волмерскага замка, які складаўся са 100 вершнікаў.

У XV–XVI стст. род Скіндзераў герба «Шранява» парадніўся з княжацкімі родамі Лукомскіх і Масальскіх. Ганна Янаўна Скіндзер, дачка Яна Андрэевіча, стала жонкай князя Андрэя Іванавіча Лукомскага (прыкладныя гады жыцця 1500–1530), які ў 1528 г. ставіў дзевяць вершнікаў ад Полацкай зямлі [16, с. 155]. У гэтым шлюбе нарадзіліся сыны Багдан і Балтазар Андрэевічы Лукомскія. Яе сваячка Дарота Скіндзер была жонкай князя Сяргея Лукомскага. Згодна з перапісам войска ВКЛ ад 9 ліпеня 1565 г., які адбыўся ў Ракаве, «…Княгиня Сергеевная Лукомская Дорота Скиндеровна выслала коней чотыры конно, збройно, по-козацку» [17, с. 244]. Шлюбы Лукомскіх са Скіндзерамі былі невыпадковымі — у Астрынскім павеце яны мелі суседнія ўладанні.

Парадненне з родам князёў Масальскіх адбылося праз шлюб Якуба Скіндзера з княгіняй Сафіяй, дачкой князя Фёдара Іванавіча Масальскага, маршалка Гарадзенскага павета. У сваім тастаменце за 1617 г. ён загадаў пахаваць яго ў сямейнай праваслаўнай царкве Святога Спаса ў Алексічах, збудаванай яго бацькам. Згодна з тым жа дакументам сваёй дачцэ княжне Зафіі Якубавай Скіндзеравай ён пакінуў 600 коп літоўскіх грошай і частку маёмасці Чэрнеў у Берасцейскім павеце [4, с. 41–47].

З родам Ваньковічаў герба «Ліс» род Скіндзераў звязала Ганна Янаўна, дачка Яна Мікалаевіча Скіндзера, зямяніна Менскага павета, які ў 1582 г. валодаў вёскай Перажыры пад Ракавам (цяпер — Пярэжары Валожынскага р-на Мінскай вобл.). Яна выйшла замуж за Адама Ваньковіча, войскага менскага з 1624 г., нарадзіла дзяцей Стэфана і Пятра. Паміраючы ў сваім маёнтку Сліжын Менскага павета, пакінула тастамент, датаваны 30 мая 1600 г. Адметнасць гэтага шлюбу ў тым, што менавіта ад Стэфана Ваньковіча з пачатку XVII ст. вядзецца ўвесь далейшы радавод гэтага роду. Таму Ганну Янаўну Скіндзер паўнавартасна можна лічыць прабабуляй роду Ваньковічаў герба «Ліс», які даў свету вядомага мастака Валентыя Ваньковіча. Пасля смерці Ганны Адам Ваньковіч ажаніўся другі раз. Яго жонкай стала Ева Дуброўская, якая нарадзіла яму дачок Крысціну і Элеанору [19, с. 36].

Напачатку XVII ст. род перастае згадвацца ў дачыненні да Віцебскага павета. Верагодна, няспынныя войны з Маскоўскім княствам паўплывалі на пераход роду на захад ВКЛ у больш спакойныя мясціны, далей ад межаў з усходнім суседам. У пазнейшы час асноўная частка Скіндзераў пражывала ў Ваўкавыскім і Лідскім паветах, дзе прадстаўнікі роду займалі важныя дзяржаўныя пасады. Асабліва гэта тычыцца Лідскага павета, дзе Скіндзеры здаўна трымалі пасады гродскіх і земскіх суддзяў, пісараў і мечнікаў.

**Скіндзеры і рэлігія**. У выбары веравызнання Скіндзеры адштурхоўваліся ад інтарэсаў таго грамадска-палітычнага кола, якое прадстаўлялі. Да якой рэлігійнай плыні адносілася большасць літоўскіх магнатаў — той жа плыні трымаліся і яны. Адзін з пачынальнікаў роду Праставіл Скіндзер, як і большасць жамойцкіх баяраў у пачатку XV ст., заставаўся язычнікам, аднак ужо яго сыны і нашчадкі засведчылі сваю прыналежнасць да каталіцкай царквы.

З надыходам у XVI ст. эпохі Рэфармацыі Скіндзеры разам з буйнымі літоўскімі феадаламі таго часу Радзівіламі, Гаштольдамі і Кішкамі прынялі кальвінізм, ідэі якога прыходзілі ў Літву з тэрыторыі суседняй Усходняй Прусіі. Вызнавала кальвінізм Зофія Шымонаўна Пашушвенская Скіндзер, жонка Марка Лаўрэнцьевіча Унучка, рэтаўскага цівуна і таксама кальвініста. Разам з мужам яна фундавала і збудавала ў сваім маёнтку Пашушвы кальвінісцкі збор, дзе ў 1588 г. пахавала свайго мужа згодна з яго апошняй воляй [13, с. 16, 39]. У канцы XVI ст. род Скіндзераў з Лідскага павета перарабіў свой фамільны касцёл Св. Станіслава ў Ляцку ў пратэстанцкі збор. Пры гэтым, як сведчыць у сваёй працы «Гісторыя старажытнага літоўскага народа» гісторык і ваенны інжынер Тэадор Нарбут, пераход Скіндзераў у пратэстантызм адбыўся праз злачынства. «У павеце Лідскім, у Ляцку, Скіндзеры, прыняўшы самі рэформу, захацелі тамтэйшы парафіяльны касцёл, імі пабудаваны, перарабіць у кальвінскі збор. Пры гэтым плябану, які гэтай справе перашкаджаў, аднялі жыццё ў самой святыні, калі ён адважыўся адарваць ад касцёльных дзвярэй пячатку і прыступіць да алтара» [38, s. 478]. Пасля гэтага трагічнага выпадку перароблены касцёл некалькі дзясяткаў гадоў з’яўляўся пратэстанцкім зборам. Яшчэ адзін прадстаўнік роду — пісар земскі лідскі Войцах Скіндзер — прымаў удзел у падпісанні Віленскага ўніверсала 1599 г., у якім пратэстанты і праваслаўныя вернікі ВКЛ на чале з князем Канстанцінам Астрожскім патрабавалі ад караля і вялікага князя Жыгімонта III Вазы роўных правоў з каталікамі. Пасля смерці князя Мікалая Радзівіла Чорнага (1515–1565), галоўнага праваднікa і мецэната ідэй пратэстантызму ў ВКЛ, Рэфармацыя на Літве пачала згасаць. Яе далейшаму заняпаду спрыяла актывізацыя езуітаў на землях ВКЛ.

Пасля паступовага згасання моды на пратэстантызм Скіндзеры Лідскага павета ў XVII ст. вяртаюцца да каталіцтва. Але ідэі рэфармацыі і свабоды веравызнання працягваюць сваё існаванне ў сэрцах жыхароў Лідскага павета. У 1689 г. у Варшаве пакаралі смерцю філосафа Казіміра Лышчынскага, берасцейскага падсудка, афіцыйнай віной якога было прызнана адмаўленне існавання Бога. Галоўным прадстаўніком абвінаваўчага боку і прыхільнікам вынясення суровага рашэння вальнадумцу

выступаў на тым судовым працэсе віленскі біскуп Канстанцін-Казімір Бжастоўскі. Пазней, падчас яго прыезду ў Скіндзераўскі Ляцк і правядзення службы ў Ляцкім касцёле Св. Станіслава, «… абывацелі Лідскага павета ўвайшлі ў прытворы касцёла і так збілі …нявіннага праз заклінанні чартоўскія…, што бедны біскуп ледзь не пазбавіўся жыцця…, небяспечна ўпаўшы, разбіў галаву і без памяці доўгі час знаходзіўся…». Да гэтай гучнай справы былі прыцягнуты таксама ўладальнікі маёнтка Ляцк Караль Самуэльевіч Праставіловіч Скіндзер са сваёй жонкай Петрунэлай Солтан [1, арк. 767].

У канцы XVIII ст., у час з'яўлення ў ВКЛ масонаў, альбо як іх называлі «вольных муляраў», на беларускіх землях закладзены першыя масонскія ложы. На пачатку XIX ст., дзякуючы згодзе расійскага імператара Аляксандра I, які таксама быў масонам, у 1816 г. утварыліся ложы «Паўночная паходня» ў Менску і «Добры пастар» у Вільні, а ў 1817 г. пачалі сваю дзейнасць яшчэ тры ложы: «Вузел еднасці» ў Навагрудку, «Палямон» у Расенях і «Сябры чалавецтва» ў Гародні. Да гарадзенскай ложы «Сябры чалавецтва», якая налічвала каля 150 удзельнікаў, належаў Ігнат Міхайлавіч Скіндзер, масон III ступені (1817–1821 гг.) [7, с. 67, 107]. У 1812 г., падчас праўлення Напалеона на былых землях ВКЛ, Ігнат Скіндзер займаў пасаду падпрэфекта Лідскага павета. Пра гэты час у цэлым і настрой літвінскага грамадства ў прыватнасці, у тым ліку і Скіндзераў, цудоўна апавядаецца ў апісанні святкавання дня нараджэння Напалеона, якое ўласна арганізоўваў і праводзіў сам лідскі падпрэфект [20, с. 113–114].

Ігнат Міхайлавіч Скіндзер карыстаўся павагай у шляхты Лідскага павета і пасля прыходу рускай арміі і вяртання Лідчыны пад крылы імперскага двухгаловага арла. Ён быў абраны маршалкам шляхты Лідскага павета ў 1816–1819 і 1824–1827 гг., а яго сваяк Антон Скіндзер маршалкам лідскім у 1819–1824 гг. [37, s. 6].

У 1790-х гг. ксяндзом і плябанам Блоньскага езуіцкага касёла стаў Тадэвуш Скіндзер.

**Скіндзеры Лідскага павета**. У пачатку XVII ст. у Лідскім павеце пражывалі сем'і Скіндзераў герба «Шранява», якія паходзілі ад двух стрыечных братоў Лукаша Мікалаевіча (згадваецца ў 1608 г.) і Паўла Андрэевіча Скіндзераў. Сынамі Лукаша з'яўляліся Мікалай, Канстанцін, Даніэль, Аляксандр-Казімір, Станіслаў, Адам, Ян. Сыны Паўла — Самуэль-Крыштаф, Стэфан, Балтазар, Нікадзім. У сваю чаргу большасць з пералічаных мелі свае сем'і, а таму ў другой палове XVII ст. сям'я Скіндзераў на Лідчыне была амаль самай вялікай па колькасці і даволі ўплывовай па прысутнасці ва ўладзе Лідскага павета. Такі стан рэчаў пацвярджае наступны прыклад.

Аляксандр-Казімір Лукашавіч Праставіловіч Скіндзер, мечны лідскі ў 1662–1676 гг., прымаў удзел у вайне з маскавітамі 1654–1668 гг. Знаходзіўся на чале Белай харугвы старасты жамойцкага Ежы Глябовіча ў 1655 г., затым трапіў у палон і быў накіраваны ў Свіяжскую крэпасць (размяшчалася ў месцы зліцця рэк Волга і Свіяж, цяпер у межах рэспублікі Татарстан). На той час Свіяжскі і Казанскі замкі былі месцамі масавага ўтрымання палоннай літвінскай шляхты. У 1662 г. ён ужо знаходзіўся ў Смаленскім замку, дзе разам з іншымі вязнямі чакаў абмену палоннымі альбо выкупу роднымі. Кожны шляхціч, які выходзіў на волю ў выніку абмену ці выкупу, станавіўся перад сваімі таварышамі па зброі, якія заслухоўвалі яго аповед аб сваім жыцці. Шляхту цікавіла: хто ён, адкуль, як змагаўся з ворагам, як апынуўся ў палоне. Гэтыя працэсы называліся соймікамі палоннай шляхты, казанскімі, свіяжскімі, смаленскімі (адпаведна месцам вызвалення). Паведаміўшы аб сабе, шляхціч атрымліваў атэстат, у якім гэты аповед быў занатаваны пісарам і падпісанымі баявымі таварышамі, пастаўленымі па старшынству. Вярнуўшыся дамоў, ён падаваў атэстат у гродскі суд. Дзякуючы гэтай працэдуры сталі вядомымі акалічнасці той цяжкай і крывавай вайны, падчас якой насельніцтва ВКЛ зменшылася ўдвая… «Мы, сидящие в плену до Смоленска на обмен отправленные, потверждаем, что Мартин Новицкий, земянин Пинского повета, товарищ хоругви Мацея- Казимира Эйсмонта ротмистра… в 1660 году попал в плен вместе с ротмистром в Казанский замок, где Эйсмонт и умер… Подписались в Смоленске 8 сентября 1662 года: Александр Скиндер мечный лидский, Караль Лисовский полковник…» [6, с. 245–246, 380]. Трэба дадаць, што Караль Лісоўскі камандаваў Блакітнай харугвай, быў баявым таварышам Аляксандра Скіндзера і, верагодна, сваяком легендарнага Аляксандра Лісоўскага, пад кіраўніцтвам якога атрады «лісоўшчыкаў» рабілі глыбокія рэйды па рускіх землях у смутныя часы 1600-х гг. Камендантам Белай харугвы ў бытнасць харунжага Аляксандра Скіндзера быў Багуслаў-Казімір Маскевіч, які пакінуў для гісторыі «Дыярыюш Руска-польскай вайны», дзе падрабязна апісаў падзеі таго часу.

Шляхцічаў, якія патрапілі падчас вайны ў рукі маскавітаў, прымушалі даваць прысягу рускаму цару. У большасці выпадкаў гэта адбывалася пад пагрозай вынясення смяротнага прысуду. Царом Аляксеем Міхайлавічам 19 кастрычніка 1655 г. была выдадзена грамата баярыну і князю Сямёну Андрэевічу Урускаму на прывядзенне палонных да прысягі. У ліку іншых яе здзейснілі Лукаш Скіндзер з сынамі Канстанцінам, Аляксандрам і Янам [15, с. 62, 64, 69, 82].

Пасля вяртання з палону Аляксандр Скіндзер прыбыў у родны Лідскі павет, у свой маёнтак Ляцк. Першым шлюбам быў жанаты з Кацярынай Быхоўскай, другім — з Кацярынай Шыманскай. Напрыканцы жыцця, у

1675 г., зрабіў пазыку ў памеры 3 000 польскіх злотых у лідскіх кармелітаў пад заставу ў пасесію свайго маёнтка Ляцк Скіндзероўскі-Пісароўскі, з умовай кожны год дадаваць айцам-кармелітам да гэтай сумы 260 злотых. Умова выконвалася да 1690 г., часу смерці Аляксандра. Яго сын Францішак-Уладзіслаў, таксама як і бацька, займаў пасаду мечнага лідскага ў 1668–1707 гг., грошы стаў выплачваць нерэгулярна, а потым і зусім перастаў. Доўг павялічваўся, з кожным годам узрастаючы на 260 злотых. У 1696 г. лідскія кармеліты нагадалі Францішку Аляксандравічу і яго сыну Аляксандру, крайчаму ваўкавыскаму, што іх пазыка складае 3 960 злотых [1, арк. 429]. 7 кастрычніка 1706 г. у справе ксяндза Дзіянізія Гільвіцкага, прыора канвента лідскіх кармелітаў, з Аляксандрам Скіндзерам, крайчым ваўкавыскім, было адзначана, што ўмовы пагаднення паміж імі не выконваюцца, бацька Францішак Скіндзер грошай не выплачвае, пазыка ўзрастае. Прыгавор суда прадугледжваў для Аляксандра Скіндзера два верагодныя варыянты паводзін: вяртанне ўсіх грошай або вечная баніцыя (выгнанне з краіны). Паколькі Скіндзер на суд не з’явіўся, то быў асуджаны на баніцыю [9, арк. 374].

Вельмі верагодна, што менавіта згаданая гучная судовая справа паспрыяла змяненню Францішкам Скіндзерам месца жыхарства. З маёнтка Ляцк у 1707 г. ён перасяліўся ў другое сваё валоданне — Мацеевічы ў Менскім ваяводстве. Маёнтак Мацеевічы, набыты дзядзькам Францішка, Даніэлем Скіндзерам у 1647 г., відаць, з-за бяздзетнасці апошняга перайшоў у дзвюх роўных частках (па 10 дымоў кожная) да яго братоў Аляксандра і Адама Лукашавічаў Скіндзераў, што вынікае з падымнага перапісу Менскага ваяводства 1667 г. У 1707 г. валоданне цалкам належала Францішку Аляксандравічу Скіндзеру, сын якога Аляксандр, нягледзячы на баніцыю, застаўся ў Лідскім павеце. Іншыя сыны Францішка, Адам і Канстанцін, пераехалі ў маёнтак Мацеевічы разам з бацькам.

У 1703 г. яшчэ аднаму прадстаўніку роду Скіндзераў, менавіта Марціну, належаў блізкі да Мацеевіч маёнтак Арэшкавічы. Марцін увайшоў у гісторыю мясцовасці сваімі наездамі на суседні маёнтак Лапічы [2, арк. 62, 473]. Такім чынам у валоданні сям’і Скіндзераў апынуўся значны абшар зямлі ў межах Менскага павета Менскага ваяводства.

**Суцінская галіна**. Далейшы радавод Скіндзераў ад пачатку XVIII ст. вядомы дзякуючы дакументам, сабраным гэтым родам для прызнання свайго шляхецтва (пастанова Мінскага ДДС ад 10.06.1824) і зацвярджэння ў дваранстве Расійскай імперыі (указ Сената ад 31.10.1858 за № 7467) [8].

Гэту галіну роду Скіндзераў мы назвалі суцінскай паводле назвы суседняга з іх Мацеевічамі маёнтка Суцін, частка якога ў першай палове XVIII ст. належала Базылю Панятоўскаму герба «Юноша» і яго

сынам Дамініку, Міхалу і Яну. Сацыяльная роўнасць і геаграфічная набліжанасць спрыяла шлюбам паміж Панятоўскімі і Скіндзерамі. Жонкай Міхала Янавіча Панятоўскага з Суціна (1740–1813) была Эльжбета Скіндзер. Таксама Скіндзеры парадніліся са шляхецкімі сем'ямі Вернікоўскіх і Карзюкоў, якія валодалі або арандавалі землі ў Суціне. Такім чынам, у пачатку XX ст. большасць Скіндзераў суцінскай галіны жылі менавіта ў гэтай шляхецкай ваколіцы (цяпер — вёска Суцін Пухавіцкага р-на Мінскай вобласці Рэспублікі Беларусь).

У 1733 г. браты Скіндзеры падзялілі землі. Старэйшаму Міхалу, войскаму старадубскаму, адышлі Мацеевічы. Юзаф, Станіслаў, Ян і Браніслаў узялі сабе Арэшкавічы і Слабодку [11, с. 68]. У 1739 г. сыны Міхала Скіндзера, войскага старадубскага, Дамінік і Антон, ужо спасля смерці бацькі пачалі захады па продажы маёнтка Мацеевічы Казіміру Пятровічу і Бенядзікце з Віндарскіх Янішэўскім, падстоліям оўруцкім. У 1742 г. яны прадалі ім палову маёнтка, пакінуўшы падрабязны план падзелу зямлі і атрымаўшы новых суседзяў [3, арк. 964–977 адв.]. Да сённяшняга дня ў паселішчы існуе мікратапонім Скіндзераўскае поле. У рэшце рэшт Мацеевічы цалкам адышлі Янішэўскім, якія пабудавалі ў некалькіх кіламетрах ад маёнтка, у маляўнічым лясным кутку пад назвай Сарафінава гара, драўляны францысканскі касцёл Святога Антонія. У 1762 г. у Мацеевічах складзены і падпісаны фундуш на яго. Сведкамі выступалі судовы стараста Рэчыцкага павета князь Альбрэхт Радзівіл, падстолі менскі Язэп Прушынскі і Ігнат Янішэўскі [11, с. 89–93]. З 1790-х гг. плябанам езуіцкага касцёла ў суседняй Блоні з'яўляўся Тадэвуш Скіндзер, які адпаведна фундушоваму запісу таксама прамаўляў казанні ў Сарафінскім касцёле, выконваў абрады хрышчэння, шлюбу, пахавання прадстаўнікоў роду Скіндзераў і іншай мясцовай шляхты.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. уладанні Скіндзераў у Менскім ваяводстве апынуліся ў складзе Расійскай імперыі.

Дадзены артыкул, у якім мы прывялі асобныя звесткі аб паходжанні, канфесійнай прыналежнасці і рассяленні Скіндзераў на землях ВКЛ у XIV–XVIII стст., з'яўляецца першай спробай у беларускай гістарыяграфіі прасачыць гісторыю гэтага старажытнага роду, аднаго з нямногіх праслаўленых родаў літвінскай шляхты, які мае працяг і цяпер. Яго гісторыя цесна пераплятаецца з гісторыяй дзяржаўнага ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, паказвае ролю антрапалагічнага фактару ў палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных працэсах у межах рэгіёна. Перспектыўным напрамкам у генеалогіі Скіндзераў з'яўляецца даследаванне далейшага працэсу разрастання сем'яў і маёмаснага драблення ў часы Расійскай імперыі, а таксама сацыяльных змен і перамен у свядомасці яго прадстаўнікоў у найноўшы час.

## Крыніцы і літаратура


1. Актавая кніга Лідскага гродскага суда за 1695 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 1722. — Воп. 1. — Спр. 8.
2. Актавая кніга Мінскага гродскага суда за 1703–1706 гг. // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 4.
3. Актавая кніга Мінскага гродскага суда за 1752–1757 гг. // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 12.
4. Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией (АВАК). — Т. 2 : Акты Брестского земского суда (1431–1793 гг.). — Вильна, 1867. — X+361 с.
5. АВАК. — Т. 12 : Акты Главного Литовского трибунала. — Вильна, 1883. — XL+651+67 с.
6. АВАК. — Т. 34 : Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654–1667). — Вильна, 1909. — LII+588 с.
7. Вольныя муляры ў беларускай гісторыі. Канец XVIII – пачатак XX ст. / уклад. А. Ф. Смалянчук. — Вільня : Gudas, 2005. — 280 с.
8. Вывадовая справа аб паходжанні роду Скіндзераў, 10.06.1824 // НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2991.
9. Дэкрэтавая кніга Лідскага гродскага суда за 1700–1709 гг. // НГАБ. — Ф. 1722. — Воп. 1. — Спр. 69.
10. Думін, С. Астрынскія / С. Думін // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. — Т. 1. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2007. — С. 263–264.
11. Ільініч, Н. Талька і наваколлі : Краязнаўчыя нататкі пра Тальку, Арэшкавічы, Блужу, Мацеевічы, Суцін / Н. Ільініч. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. — 131 с.
12. Опись документов Виленского центрального архива древних актовых книг. — Вып. 1: Акты Россиенского земского суда 1575–1586 гг., №№ 14575–14586. — Вильна, 1901. — VI, 251 с.
13. Опись документов Виленского центрального архива древних актовых книг. — Вып. 2: Акты Россиенского земского суда 1588–1591 гг., № 14587–14592 / [предисловие И. Я. Спрогиса]. — Вильна, 1903. — V, 217 с.
14. Памятники истории Восточной Европы : источники XV–XVII вв. — Т. II: «Выписка из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487–1572 гг. / сост. Б. Н. Морозов. — М.–Варшава, 1997. — 330 с.
15. Памятники истории Восточной Европы: источники XV–XVII вв. — Т. IV: «Крестоприводная книга шляхты Великого княжества Литовского 1655 г.» / сост. Е. Е. Лыкова. — М.–Варшава, 1999. — 261 с.
16. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года : Метрыка Вялікага княства Літоўскага / Нац. акад. Навук Беларусі. Ін-т гісторыі; Рэдкал. : Галенчанка Г. Я. (адказ. рэд.) і інш. Кн. 523, Кніга публічных спраў 1. — Мінск : Беларуская навука, 2003. — 444 с.

17. Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. — Т. 33. — СПб., 1915. — 702 с.
18. Форум о Вильнюсе / Гедройц, Гарасевич, Гранатовский, Нарбут, Скиндер. — Режим доступа: http://vilnius.borda.ru/?1-1-0-00000179-000-20-0. — Дата доступа: 19.03.2014.
19. Чарняўскі, Ф. В. Ураднікі Менскага ваяводства XVI–XVIII стст. : біяграф. давед. : Вып. II (скарбнікі, стражнікі) / Ф. В. Чарняўскі, нав. рэд. З. Л. Яцкевіч. — Мінск : Зміцер Колас, 2012. — 544 с.
20. Швед, В. В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў, 1805–1815 гг. / В. Швед, С. Данскіх. — Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2006. — 250 с.
21. Юхо, Я. Гарадзельская унія / Язэп Юхо // Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. — Т. 1. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2007. — С. 495.
22. Biskupstwo Wilenskie / Opr. ks. Jan Kurczewski. — Wilno, 1912.
23. Dzieje rodziny Ciechanowieckich herbu Dąbrowa (XIV–XXI wiek) / pod red. A. Rachuby. — Warszawa : DiG, 2013. — 614 s.
24. Dzieje Witolda W. Księcia Litwy / A. Prochaska. — Wilno, 1914.
25. Herbarz Polski Kaspra Niesieckiego powiększony dodatkami z późniejszych autorów, rekopismów, dowodów urzędowych i wydany przez J.N. Bobrowicza. — T. 8. — Lipsk, 1841. — 664 s.
26. Herbarz rodzin tatarskich w Polsce / S. Dziadulewicz. — Wilno, 1929.
27. Kojałowicz, W. Herbarz rycerstwa Wielkiego Księstwa Litewskiego, tj. Compendium 1650 oraz Nomenclator 1656. — Kraków, 1897. — II, 526 c.
28. Księga herbowa rodów polskich / J. Ostrowski. — Warszawa, 1897. — 620 s.
29. Lietuvos Metrika. Kn. 3 : (1440–1498). — Vilnius, 1998. — 167 p.
30. Lietuvos Metrika. Kn. 4 : (1479–1491). — Vilnius, 2004. — 285 p.
31. Lietuvos Metrika. Kn. 6 : (1494–1506). — Vilnius, 2007. — 517 p.
32. Lietuvos Metrika. Kn. 6 : (1528–1547). — Vilnius, 1995.
33. Lietuvos Metrika. Kn. 7 : (1506–1539). — Vilnius, 2011. –1010 p.
34. Lietuvos Metrika. Kn. 8 : (1499–1514). — Vilnius, 1995. — 710 p.
35. Lietuvos Metrika. Kn. 9 : (1511–1518). — Vilnius, 2002. — 615 p.
36. Lietuvos Metrika. Kn. 25 : (1387–1546). — Vilnius, 1998. — 460 p.
37. Malewski, C. Rody szlacheckie w powiecie lidzkim na Litwie w XIX wieku / Czesław Malewski. — Wilno : Wydawnictwo Czas, 2002. — 113 p.
38. Narbutt, T. Dzieje narodu litewskiego / przez Teodora Narbutta. — T. 9 : Panowania Zygmuntów. — 1841. — 492 s.
39. Polska Encykłopedja Szlachecka / oprac. Dr.fił. S. J. Starykoń- Kasprzyckiego, ks. M. Dworskiego. — T. 11 : Sarnowski– Trąmpczyński. — Warszawa, 1938. — 380 s.
40. Žemaitijos savivalda ir valdžios elitas 1409–1566 metais / Eugenijus Saviščevas. — Vilnius, 2010. — 461 p.
41. Żywoty biskupów wilenskich / W. Przyałgowski. — Petersburg, 1860.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.01.2015

*Ф. В. Чарняўскі*

## Антоні Свентарэцкі — апошні земскі пісар Менскага ваяводства

Нямногія знаўцы гісторыі могуць згадаць Антонія Свентарэцкага, які ў другой палове XVIII ст. каля трыццаці двух гадоў займаў пасаду пісара земскага менскага, тым больш распавесці пра яго жыццёвы шлях. Аднак быў час, калі пра Свентарэцкага, пісара земскага Менскага ваяводства, ведалі ўсе высокія ўрадоўцы Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта да яго, са словамі «пане і каханы браце», звяртаўся ў адным са сваіх лістоў сам Міхал Казімір Агінскі, ваявода віленскі, вялікі гетман ВКЛ [1, арк. 286]. У другой палове XVIII ст. ніводная палітычная падзея ў Менскім павеце не абыходзілася без удзелу Антонія Свентарэцкага.

На пасаду земскага пісара Менскага ваяводства Антонія Свентарэцкага, які ў гэты час займаў урад падчашага менскага, абралі на павятовым сойміку менскай шляхты 1765 г. у адпаведнасці з новай канстытуцыяй Рэчы Паспалітай, «на сойме шчаслівай каранацыі ўстаноўленай» [2, арк. 27, 29].

На час каранацыі Станіслава Панятоўскага земскі суд не дзейнічаў у Менскім павеце амаль сорак тры гады. Незадаволенасць менскай шляхты дзейнасцю земскага суда праявілася яшчэ ў самым пачатку XVIII ст. У 1722 г. пасля смерці Аляксандра Уніхоўскага, суддзі земскага менскага, шляхта адмовілася ад правядзення элекцыйнага сойміка па выбарах чатырох электаў (кандыдатаў) на вакантную пасаду. З гэтага часу земскі суд Менскага ваяводства перастаў у поўным аб'ёме выконваць свае абавязкі. У 1725 г. пасля смерці Стэфана Валадковіча шляхта не абрала падсудка. Таксама і пасля смерці ў пачатку 1731 г. Казіміра Караля Уніхоўскага ў Менскім павеце не адбыліся выбары электаў на вакантную пасаду пісара земскага. 25 сакавіка 1731 г. Аўгуст II падпісаў прывілей былому пісару гродскаму менскаму Тэафілу Жыжэмскаму на сурагаторыю менскую [3, арк. 385]. Менскія сурагатары займаліся толькі актыкацыяй дакументаў аб продажы і набыцці зямель, аб адмове ад правоў на валоданне землямі і маёмасцю, аб памерах пасагу і выправы. Сурагатары не мелі права праводзіць разгляд судовых спраў, якія павінны былі разглядацца толькі пры поўным складзе земскага суда. Менавіта ў гэты час у многіх паветах ВКЛ земскія суды адмянілі і ўвялі сурагаторыю.

Толькі пасля ўвядзення ў 1764 г. новай канстытуцыі Рэчы Паспалітай шляхта Менскага павета пагадзілася на аднаўленне дзейнасці ў Менскім павеце земскага суда.

Згодна з пастановамі каранацыйнага сойма Рэчы Паспалітай, якія былі прыняты ў 1764 г., шляхта абірала на сойміку з ліку кандыдатаў па адной асобе на кожную пасаду і перадавала каралю спісы абраных для зацвярджэння і надання ім прывілееў на пасаду. Каралеўскі прывілей стаў чыстай фармальнасцю, бо абраныя асобы, не чакаючы яго падпісання, прыносілі прысягу перад шляхтай на павятовым сойміку. Згодна з правам ВКЛ, земскія ўраднікі пасля атрымання прывілея на судовую пасаду адмаўляліся ад тых земскіх урадаў, якімі карысталіся раней.

Прывілей Станіслава Аўгуста на пісарства земскае Менскага ваяводства для Антонія Свентарэцкага актыкаваны 1 мая 1765 г. [4, арк. 307].

Згадкі пра жыццё і дзейнасць Свентарэцкага ў першай палове XVIII ст. вельмі рэдкія. Значана больш падрабязна асвятляюць падзеі з яго жыцця судовыя дакументы, складзеныя ў другой палове гэтага стагоддзя.

На нашу думку, Антоні Свентарэцкі атрымаў выдатную юрыдычную адукацыю і з пачатку самастойнага жыцця выступаў у судах Вялікага Княства Літоўскага ў якасці патрона (адваката). Да 9 красавіка 1751 г. ён атрымаў пасаду суддзі неіснуючага Старадубскага павета [5, арк. 752].

Антоні Свентарэцкі больш за 15 гадоў трымаў урад стражніка Менскага ваяводства. Дата надання прывілея на пасаду намі пакуль што не ўстаноўлена. Першая згадка аб трыманні Свентарэцкім тытула стражніка Менскага ваяводства адносіцца да 1748 г. На жнівеньскім ваяводскім сойміку гэтага года, як звычайна адзін раз у два гады, адбывалася абранне паслоў на сойм Рэчы Паспалітай ад Менскага ваяводства (павета). У прынятых соймікам дакументах Антоні Свентарэцкі ўпершыню ўпамінаецца як сапраўдны менскі стражнік. Прынятая на сойміку і ўнесеная ў гродскія актавыя кнігі інструкцыя была прызначана для Крыштофа Завішы, старасты любоніцкага, і Антонія Свентарэцкага, стражніка менскага, абраных пасламі [6, арк. 674].

11 студзеня 1762 г. Аўгуст III падпісаў прывілей на ўрад падчашага менскага Антонію Свентарэцкаму [7, арк. 586]. На нашу думку, у Свентарэцкага ўстанавіліся вельмі добрыя адносіны з прадстаўнікамі роду Хмараў, менавіта Адамам, на гэты час віцэ-інстыгатарам ВКЛ, а ў канцы стагоддзя і ваяводам менскім і яго родным братам Іахімам, пісарам гродскім менскім. Віцэ-інстыгатар ВКЛ у сувязі з атрыманнем новага, больш высокага прызначэння адмовіўся ад падчашаства менскага і даў згоду Антонію Свентарэцкаму на заняцце гэтай пасады. У сваю чаргу Свентарэцкі даў цэсію Іахіму Хмары на атрыманне тытула стражніка менскага.

У сярэдзіне 1762 г. Антоні Свентарэцкі разам з Ігнацыем Іваноўскім, старастам судовым менскім, абіраюцца пасламі на чарговы сойм Рэчы

Паспалітай. Праз некаторы час Свентарэцкі разам з пасламі, якія былі абраны на сойм ад іншых частак Рэчы Паспалітай, падпісвае адозву да ўсяго паспольства краіны, абяцаючы прыкласці ўсе сілы для дасягнення міру і парадку ўнутры яе [8, арк. 581–587].

У чэрвені 1766 г. Антонія Свентарэцкага разам з яго пляменнікам Янам Паўлікоўскім, лоўчым менскім, павятовая шляхта абірала дэпутатамі на экстраардынарыйны сойм Рэчы Паспалітай. На павятовым сойміку зацвярджаецца інструкцыя паслам, асноўным пунктам якой з’яўляецца патрабаванне да дэпутатаў сойму ў садзейнічанні хутчэйшаму вываду чужаземных войскаў з тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага [4, арк. 982, 992].

На грамнічным сойміку менскай павятовай шляхты, які адбыўся ў пачатку лютага 1769 г., Антоні Свентарэцкі паспрабаваў заняць вельмі ўплывовую ў павеце пасаду падкаморыя Менскага ваяводства [9, арк. 408, 470]. Пасля смерці ў 1768 г. былога падкаморыя, князя Міхала на Жыжмах Жыжэмскага, у павеце абвастрылася барацьба за атрыманне гэтай пасады. Прэтэнзіі на заняцце вакантнага ўрада прад’явілі: Ігнацы Карніцкі, падстарасціч судовы гродскі менскі, Юзаф Прашынскі, чашнік і падстараста судовы гродскі менскі, Себастыян Тадэвуш Ваньковіч і Антоні Свентарэцкі. 6 лютага 1769 г. перамогу на выбарах атрымаў Юзаф Прашынскі. За яго абранне выказалася большасць шляхетных асоб, якія прысутнічалі на сойміку: ён атрымаў у сваю падтрымку 326 «вотаў» (галасоў). За Антонія Свентарэцкага, які заняў другое месца на выбарах, прагаласавала 310 чалавек. Верагодна, ён больш не спрабаваў заняць гэтую пасаду.

Свентарэцкаму як пісару земскаму менскаму прыходзілася шмат часу траціць на забеспячэнне захаванасці матэрыялаў, якія выпрацоўваліся падчас судовых пасяджэнняў земскага суда Менскага ваяводства. Інтарэс шляхецкай грамады да стану захавання судовых спраў асабліва ўзмацніўся пасля трагедыі 1762 г., калі ў полымі вялікага пажару згарэў не толькі ўвесь драўляны Менск, але матэрыялы гродскіх, земскіх, падкаморскіх судоў Менскага павета. Згарэлі і ўсе матэрыялы пасяджэнняў менскай кадэнцыі Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Першапачаткова архівы судоў захоўваліся ў адзіным у горадзе каменным склепе. Па ўсім відаць, што з часам яны патрапілі ў іншае памяшканне, дзе і былі знішчаны агнём.

Пры выкананні сваіх абавязкаў Свентарэцкаму дазвалялася прымаць на працу памочнікаў — судовых рэгентаў. 3 чэрвеня 1765 г. пісар земскі менскі падпісаў «акт крэдэнсальнага інструмента» на рэгенцыю земскую менскую Тадэвушу Нарвоюшу Дышлевічу, вайсковічу смаленскаму, свайму сестранцу (сыну сястры) [10, арк. 13]. Такі акт складаўся пасля правядзення асаблівых сумоўяў з кандыдатам на пасаду. Толькі

пасля таго, як кандыдат паспяхова праходзіў гэты экзамен, яго дапускалі да выканання абавязкаў рэгента земскага суда. На нашу думку, немалую ролю ў прыняцці Дышлевіча на вельмі выгодную працу адыграла яго пароднёнасць са Свентарэцкім.

14 студзеня 1792 г. у сувязі з частай адсутнасцю на працоўным месцы хворага падчашага смаленскага і рэгента менскага земскага суда Станіслава Есмана, таксама пляменніка земскага пісара, Антоні Свентарэцкі падпісаў крэдэнс Ігнацыю Кудзіновічу, скарбоваму дваранiну Рэчы Паспалітай, на пасаду рэгента земскага [11, арк. 169]. Зразумела, што рэгенты часта мянялі месца сваёй працы і такіх крэдэнсаў Свентарэцкі за гады сваёй працы падпісаў шмат.

Па пэўных прычынах да 1790 г. архівы земскага суда Менскага ваяводства па рашэнні канфедэрацыі Менскага ваяводства былі перавезены ў іншае больш бяспечнае месца захавання, магчыма, і за межамі Менска. Абставіны змяніліся толькі ў сярэдзіне 1792 г. 4 верасня гэтага года Свентарэцкі правёў актыкацыю дазволу вольнай канфедэрацыі Менскага ваяводства «на неадкладнае вяртанне на тое месца, на якім яны былі складзены раней, адкрыццё і экспедыцыю актаў земскіх менскіх» [11, арк. 327].

Звернем увагу на сямейна-роднасныя сувязі пісара земскага менскага. Антоні Свентарэцкі нарадзіўся ў сям'і Міхала і Ганны Свентарэцкіх, зямян Менскага павета, якія ў пачатку XVIII ст. неаднаразова згадваліся ў актавых дакументах менскіх судоў. Як мы лічым, шлюб Міхала Свентарэцкага і Ганны Жукоўскай меў месца на мяжы XVII–XVIII стст. Большасць іх дзяцей нарадзілася ў самым пачатку XVIII ст. Старэйшая дачка ўзяла шлюб у самым пачатку 1720-х гадоў. Што ж датычыцца Антонія Свентарэцкага, які ўпершыню ўпамінаецца ў 1738 г. у якасці асобы [42, арк. 1718], якая дасягнула паўналецця і магла самастойна распараджацца сваёй маёмасцю, то не выключана, што нарадзіўся будучы пісар земскі менскі яшчэ да 1720 г. Улічваючы гэта, можна сцвярджаць, што ў 1796 г. ён дасягнуў 80-гадовага ўзросту.

Ад памерлых бацькоў Антоні Свентарэцкі атрымаў у спадчыну трэць маёнтка Уша Аляхновіцкая. Акрамя Свентарэцкіх у ім гаспадарылі і іншыя зямяне. Пры гэтым невядома, якая частка зямель належала прадстаўнікам роду Свентарэцкіх. 22 лютага 1748 г. пры падзеле маёнтка паміж братамі Антоні Свентарэцкі да сваёй часткі Ушы далучыў са згоды старэйшага брата Яна, мечнага менскага, і яго частку зямель [6, арк. 1231]. Другі брат Станіслаў сваю частку бацькоўскай спадчыны ў маёнтку Уша Аляхновіцкая прадаў Антонію яшчэ да 9 красавіка 1751 г. [5, арк. 752].

Рэестры падымнага па Менскім павеце, якія трапілі ў нашы рукі, з-за сваёй няпоўнасці не даюць нам магчымасці вызначыць памеры зямель,

якія знаходзіліся ў карыстанні Антонія Свентарэцкага. У 1775 г. у Менску яму належала некалькі пляцаў з забудовамі. Сярод іх вылучаліся памерамі пляцы на Францысканскай вуліцы. Двор самога Антонія Свентарэцкага знаходзіўся непадалёку ад Свіслачы каля цяперашняй вуліцы Раманаўская Слабада. У межах Менскага павета яму належаў фальварак Чыкі, за які ён уносіў у скарб каля 90 злотых [12, арк. 51].

Свентарэцкі атрымліваў вялікія прыбыткі і лічыўся адным з самых багатых людзей у павеце. Немалыя грошы паступалі ў яго карыстанне з уласных і застаўных маетнасцяў. Асноўную частку даходаў Свентарэцкі атрымліваў за працу ў земскім судзе Менскага ваяводства. Акрамя таго, ён, выдатна ведаючы права ВКЛ, паспяхова ажыццяўляў абарону маёмасных інтарэсаў прадстаўнікоў эліты ВКЛ.

Частку грашовых даходаў Свентарэцкі выкарыстоўваў на павелічэнне сваіх зямельных уладанняў. Захавалася шмат звестак аб набыцці Свентарэцкімі зямель у межах Менскага павета. Да 20 лістапада 1765 г. Антоні Свентарэцкі, пісар земскі менскі, набыў у Юзафа Мусіча сяло Каўкава ў Менскім павеце за 5 000 польскіх злотых [13, арк. 130]. Каля 21 сакавіка 1774 г. Антоні Свентарэцкі купіў у сына войскага смаленскага Францішка Вайдзевіча і яго жонкі Ганны з Праздзецкіх за 40 000 злотых землі ў сяле Чысць Менскага павета [14, арк. 66]. Праз год, 22 сакавіка 1782 г., Антоні і Кацярына з Багдановічаў набылі за 24 000 злотых фальварак Аляхновічы, аддзелены ад маетнасці Уша [15, арк. 135–136]. Некалі гэтыя землі атрымала ад сваіх бацькоў Тэкля са Свентарэцкіх, кроўная Антонія, пасля таго як узяла шлюб з Жыгімонтам Глушынскім, суддзёй гродскім старадубскім. Глушынскім тэрмінова спатрэбіліся грошы, а Антоні Свентарэцкі стараўся вярнуць у сваё распараджэнне радавыя землі і ахвотна дапамагаў кроўным у іх грашовых патрэбах. У пачатку 90-х гадоў XVIII ст. Свентарэцкія набылі ў Агінскіх Траскаўшчыну, размешчаную ў Менскім павеце [16, арк. 413].

Добрае веданне права дазваляла Свентарэцкаму паспяхова выконваць замовы высокіх саноўнікаў ВКЛ па абароне іх маёмасных інтарэсаў. У другой палове 70-х гадоў XVIII ст. Антоні Свентарэцкі дапамагаў Марціну Аскерку, маршалку Ашмянскага павета, і яго сынам Антонію, каменданту літоўскіх войскаў, і Ігнацыю, каралеўскаму шамбяляну, у вырашэнні пытанняў, якія ўзніклі ў іх у адносінах валодання землямі ў маетнасці Кабыльнік [17, арк. 610].

Вялікія грошы не маглі заставацца без выкарыстання, і Антоні Свентарэцкі, як і большая частка менскай шляхты, займаўся ліхвярствам. 28 лютага 1755 г. ён праводзіў інтрамісію па маетнасці Станькава, якую атрымаў у часовае карыстанне, пазычыўшы грошы самому Гераніму Радзівілу, харужаму ВКЛ [5, арк. 609]. Харужы ВКЛ сплаціў крэдытору пазыку ва ўмоўлены тэрмін і вярнуў уладанне ў сваё карыстанне.

15 чэрвеня 1774 г. маршалак ВКЛ і стараста крамянецкі Юзаф Паўлін Сангушка пазычыў у Антонія Свентарэцкага 16 666 штук чырвоных небракаваных «галендэрскіх» манет і 12 польскіх злотых. У пераліку на польскія злотыя — гэта вялікая па тых часах сума ў 300 000. На час да вяртання пазыкі пісар земскі атрымліваў у заставу землі, якія належалі да Дубраўлянскага ключа ў Ашмянскім павеце [18, арк. 59]. Кошт гэтых зямель значна пераўзыходзіў памеры атрыманай маршалкам пазыкі.

Каля 1 ліпеня 1782 г. па пазыку да пісара земскага менскага звяртаецца сам падканцлер ВКЛ Іахім Храптовіч [19, арк. 394, 401]. Да часу вяртання грошай Свентарэцкі атрымаў у сваё карыстанне землі, якія знаходзіліся ў Зембіне.

21 сакавіка 1785 г. біскуп віленскі Ігнацы Масальскі пазычыў у Антонія і Кацярыны Свентарэцкіх каля 5 000 штук «чырвоных злотых, важных, абрачковых, галендэрскіх», што ў пераводзе на польскія злотыя складала каля 90 000. Дзякуючы гэтаму Свентарэцкія некалькі гадоў трымалі застаўным правам землі вялікага сяла Раванічы разам з фальваркам Дрэхеза [20, арк. 175].

У тыя часы многія пазыкадаўцы, якія страцілі надзеі на вяртанне пазык і не мелі вопыту правядзення судовых спраў па іх вяртанні, збывалі свае пазыковыя лісты за паўцаны. 23 красавіка 1759 г. пісар земскі менскі выкупіў пазыковы ліст Гераніма Фларыяна Радзівіла, харужага ВКЛ, які быў ім выдадзены Антонію Рэйводскаму Байкоўскаму, старасце тутліцкаму, на адзін год. Вяртанне Радзівілам пазыкі памерам у 70 000 злотых забяспечвалася коштам сёл Менскага павета Дрыкава, Слабада, Пятровічы, Дамашаны, Аборкі, Лукава і Каралёў Стан з карчмой [10, арк. 843–845]. Грошы магнат абяцаў вярнуць праз год, але ў 1760 г. ён памёр. Да 1775 г. гэтыя землі перайшлі ў валоданне Караля Станіслава Радзівіла Пане Каханку, ваяводы віленскага, маршалка генеральнай канфедэрацыі ВКЛ [12, с. 32, 34, 62]. За фальваркі Дрыкава, Слепянку, Пакалін і некаторыя іншыя сёлы Свентарэцкі ўнёс у скарб у 1775 г. каля 1 400 злотых.

Зразумела, што карыстанне гэтымі землямі прыносіла пісару земскаму менскаму вялікі прыбытак, і ён не надта імкнуўся атрымаць першапачатковую суму ў сваю кішэнь. У сувязі з адсутнасцю ў пачатку 80-х гадоў XVIII ст. у межах Вялікага Княства Літоўскага Караля Радзівіла яго ўласнасцю распараджаўся Геранім Вінцэнт Радзівіл, падкаморы ВКЛ, стараста судовы менскі, родны брат Пане Каханку. 23 сакавіка 1783 г. ён склаў новы аблігацыйны запіс Свентарэцкаму яшчэ на 500 «чырвоных галендэрскіх манет» [21, арк. 551, 583–588]. Вяртанне і гэтай пазыкі было забяспечана коштам тых ж маёнткаў: Дрыкава з фальваркам Слепянка, Пакалін і некаторых іншых, застаўленных яшчэ ў пачатку 1759 г.

Даволі часта пазыкаатрымальнікі адмаўляліся вяртаць пазычаныя грошы. У такіх выпадках крэдыторы дабіваліся прыняцця судамі ВКЛ рашэння аб правядзенні эксдывізіі. Землі, коштам якіх забяспечвалася ў пазыковых дакументах вяртанне пазыкі, адбіраліся ў іх ранейшых гаспадароў і перадаваліся крэдыторам. 3 снежня 1788 г. пасля правядзення эксдывізіі па нявернутых пазыках Свентарэцкі быў уведзены ва ўладанне вялікім маёнткам Хоўхлава [22, арк. 528].

Антоні Свентарэцкі, стражнік менскі, у прамежак часу паміж 1738 і 1750 гг., ужо пасля смерці бацькі, узяў шлюб «з волі маці» з Кацярынай Багдановіч [23, арк. 428]. Яшчэ ў 1738 г. ён згадваецца ў матэрыялах судоў без упамінання імя і прозвішча Кацярыны з Багдановічаў. У матэрыялах судоў Менскага ваяводства, што цудам захаваліся, на сённяшні дзень не выяўлена звестак пра бацькоў жонкі будучага менскага земскага пісара. Першае паведамленне пра Антонія і Кацярыну Свентарэцкіх прыходзіцца на 6 чэрвеня 1750 г.

У гэтай сям'і нарадзілася шмат дзяцей, дакладную колькасць якіх нельга вызначыць з-за адсутнасці паўнаты звестак. Вядома аб нараджэнні сыноў Яна, Юзафа, Марціна і Тадэвуша. На нашу думку, сыны пісара земскага менскага, за выключэннем Яна, большую частку свайго жыцця правялі за межамі павета і таму ў актавых кнігах судоў Менскага ваяводства сустракаюцца толькі адзінкавыя згадкі пра іх.

У пачатку 1786 г. Ян Свентарэцкі, пісарэвіч земскі менскі, узяў шлюб з Цэцыліяй Кукевіч, дачкой канюшага Аршанскага павета [24, арк. 83]. У лютым гэтага ж года складаецца і перадаецца для актыкацыі адмова маладых ад усіх зямельных і грашовых набыткаў бацькоў нявесты, якія заставаліся ў іх распараджэнні пасля перадачы Яну і Цэцыліі Свентарэцкім абгавораных раней пасаговых сум. Ян, канюшы Аршанскага павета, і Тэрэза з Ратамскіх Кукевічы, бацькі маладой, перадалі пасаг наяўнымі грашовымі сумамі ў памеры 40 000 польскіх злотых. Аднак нішто не магло параўнацца са шчодрасцю бацькоў Яна Свентарэцкага, якія перадалі маладым на пачатак іх сумеснага жыцця да 90 000 злотых. Праўда, гэта не былі наяўныя грошы. У рукі маладых пераходзілі Раванічы, атрыманыя роўна за год да гэтага пісарам земскім менскім за такую ж пазыку ад біскупа віленскага Ігнацыя Масальскага [20, арк. 175]. На нашу думку, Масальскія не змаглі выкупіць Раванічы, і яны засталіся ў пажыццёвым карыстанні Яна і Цэцыліі Свентарэцкіх.

Ян Свентарэцкі ў якасці першага надання атрымаў прывілей на пасаду скарбніка Менскага ваяводства. Менавіта з гэтым тытулам ён згадваецца 16 сакавіка 1796 г. [25, арк. 143]. У сярэдзіне 1800 г. Ян Свентарэцкі ўпамінаецца на пасадзе засядацеля Менскага павятовага суда, а 7 чэрвеня 1801 г. ужо як мінскі павятовы маршалак [26, арк. 409].

Пра Юзафа Свентарэцкага, пісарэвіча земскага менскага, вядома толькі адна згадка. Ён падпісаў актыкаваны 10 лютага 1785 г. лаўдум ваяводскага менскага сойміка па выбары суддзяў у Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага [20, арк. 77].

Гэтак жа нязначна адлюстраваўся ў актавых кнігах судоў Менскага павета і жыццёвы шлях Марціна Свентарэцкага. 23 сакавіка і 17 чэрвеня 1778 г. пісарэвіч земскі менскі прымаў удзел у вырашэнні судовых спраў, якія разглядаліся ў земскім судзе Менскага ваяводства [27, арк. 526].

Верагодна, самым малодшым сынам пісара земскага менскага быў Тадэвуш. Ён пазней, чым яго браты, пачынае згадвацца ў актавых запісах судоў Менскага ваяводства. Да 23 мая 1791 г. Тадэвуш Свентарэцкі, камісар цывільна-вайсковай і парадкавай камісіі Менскага ваяводства, паручнік войскаў ВКЛ, узяў шлюб з дачкой мастаўнічага ашмянскага Брыгідай Хмялеўскай [28, арк. 420]. На гэты раз Антоні Свентарэцкі, пісар земскі менскі, даў сыну 100 000 польскіх злотых.

Да 14 лютага 1792 г. на грамнічным сойміку Менскага павета адбылося абранне складу новай судовай установы, менавіта зямянскага суда Менскага павета. Асэсарам гэтага суда абраны Тадэвуш Свентарэцкі, камісар цывільна-парадкавай і вайсковай камісіі Менскага ваяводства [29, арк. 138–201]. Тадэвуш Свентарэцкі, былы падкаморы менскі, упамінаецца яшчэ і напачатку XIX ст. [30, арк. 2].

У пісара земскага менскага нарадзілася і некалькі дачок, з якіх нам вядомы імёны Тэрэзы, Ганны і Юдыты. Звесткі пра іх лёс, акрамя паведамленняў аб шлюбах, у нашы рукі не трапілі.

16 красавіка 1769 г. складзены зрэчны запіс ад Яна Караля Завішы, паручніка войскаў ВКЛ, і яго жонкі Тэрэзы [31, арк. 28]. Бацькі надзялілі сваю дачку немалым пасагам у памеры 30 000 польскіх злотых наяўнымі грашыма, а ў дадатак выдалі 4 000 злотых выправы. Муж, згодна з правіламі таго часу, запісаў жонцы суму ў два разы большую, чым пасаговая, а таксама 6 000 злотых выправы. 60 000 злотых пасагу Ян Завіша забяспечыў коштам сваіх шматлікіх маёнткаў, размешчаных у розных паветах Вялікага Княства Літоўскага.

23 верасня 1776 г. склаў рэфармацыйны запіс бацькам жонкі Ганны Тадэвуш Казімір Ваньковіч, сын войскага менскага Уладзіслава Ваньковіча і дачкі падсудка земскага менскага Алены Барбары Валадковіч [32, арк. 532]. Пасаг і гэтай дачцэ вызначаны бацькамі ў тых жа памерах, што і яе сёстрам. У сваю чаргу Ваньковіч запісаў Ганне Свентарэцкай 100 000 злотых на сваіх маёнтках.

Да 18 лютага 1791 г. сын чашніка менскага Мікалай Станіслаў Ваньковіч узяў шлюб з дачкой пісара земскага менскага Юдытай [28, арк. 157]. На гэты час Станіслаў Ваньковіч меў за плячыма немалы

кавалак жыцця. У яго трыманні знаходзілася Сенажацкае староства, а за плячыма — значны вопыт удзелу ў грамадска-палітычным жыцці павета.

Дзейнасць земскага суда Менскага ваяводства ў складзе старшыні (прэзідэнта) Францішка Уніхоўскага, суддзі Яна Людвіка Валадковіча і пісара Антонія Свентарэцкага занатавана 9 студзеня 1794 г. [33, арк. 17] і ў 1796 г. У адрозненне ад тых судовых пастаноў, якія прымаліся да 1793 г., у пачатку дакумента пасля пераліку суддзяў, якія бралі ўдзел у разглядзе чарговай справы, паведамлялася, што суд праходзіць падчас «панавання найяснейшай расійскай імператаравай».

На гэты час у Менскім павеце дзейнічала новая судовая ўстанова — зямянскі суд Менскага павета. Абранне суддзяў і пісара гэтай установы адбылося на лютаўскім сойміку 1793 г. На пасаду пісара зямянскага прэтэндавала некалькі асоб, аднак найбольшую падтрымку на сойміку атрымаў Станіслаў Лышкевіч, былы пісар гродскі менскі, які і быў зацверджаны соймікам на гэтай пасадзе [34, 203]. Сярод прэтэндэнтаў на пасаду пісара зямянскага суда Антоні Свентарэцкі не згадваецца.

Апошняе ўпамінанне пра Антонія і Кацярыну з Багдановічаў Свентарэцкіх, пісараў земскіх менскіх, датычыцца 16 сакавіка 1796 г. У гэты дзень складаецца застаўны і пазыковы запісы ад імя жонкі ротмістра войскаў ВКЛ Караліны Радзівілавай і яе сына Дамініка. Радзівілам на ўласныя патрэбы тэрмінова спатрэбіліся вялікія сумы грошай. На трохгадовую заставу для забеспячэння своечасовага вяртання пазыкі Свентарэцкім перадавалася сяло Ігнатычы. Муж і жонка з прычыны нездароўя не змаглі прысутнічаць на падпісанні асекурацыйнага запісу ад Радзівілаў, і іх прадстаўляў і ажыццяўляў падпісанне дамовы сын Ян [25, арк. 143].

Падчас працы над жыццяпісам Антонія Свентарэцкага нас зацікавіла паходжанне яго роду, які на рубяжы XVII–XVIII стст. валодаў землямі ва Ушы Аляхновіцкай у межах Менскага павета і меў кроўныя сувязі з пісарам земскім менскім. На нашу думку, гэтыя Свентарэцкія ў даўнія часы называлі сябе Юхновічамі, а новае прозвішча набылі пасля атрымання ў сваё валоданне часткі сяла Свентарэцк на беразе ракі Свенты ва ўсходняй частцы Вількамірскага павета.

Польскі гісторык Анджэй Рахуба, прыводзячы звесткі пра будаўнічых Браслаўскага павета, згадвае і Казіміра Юхновіча Свентарэцкага, роднага дзядзьку Антонія, пісара земскага менскага [35, № 3941, s. 513]. Юхновічам незадоўга да смерці называе сябе і бацька пісара земскага Міхал [36, арк. 513]. Дарэчы, 18 студзеня 1738 г. у прадажным акце на частку маёнтка Уша Аляхновіцкая Антоні Свентарэцкі, будучы будаўнічы вількамірскі, пляменнік згаданых Казіміра і Міхала Юхновічаў Свентарэцкіх, таксама называе сябе Юхновічам [37, арк. 1312]. Ні ў вод-

ным пазнейшым дакуменце ўжыванне Свентарэцкімі прозвішча Юхновіч не сустракаецца.

Па нашым меркаванні, Свентарэцкія, нягледзячы на працяглы час пражывання ў Менскім павеце, не парывалі сувязяў з кроўнымі, якія засталіся ў межах Вількамірскага павета. Тытулам скарбніка вількамірскага на працягу многіх гадоў карыстаўся стрый (брат бацькі) пісара земскага менскага Ежы [38, арк. 308]. Асноўная частка яго жыцця была звязана з Менскім паветам. У 1724 г. менская шляхта абірае яго камісарам па Уздзенскай парафіі Менскага павета [39, арк. 888]. Пасля смерці Ежы ў 1743 г. урадам карысталіся яго нашчадкі.

Паводле наяўных звестак, Свентарэцкія жылі ў ваколіцах сёл Краснае і Аляхновічы яшчэ ў канцы XVI ст. 3 мая 1593 г. Сымон Свентарэцкі, ураднік красносельскага плябана, скардзіўся на суседа, ураднікa князя Вішнявецкага, які з вялікай грамадой падданых зрабіў нечаканы напад на палеткі касцёла [40, арк. 126]. Існуе высокая верагоднасць таго, што Сымон Свентарэцкі — продак пісара земскага менскага і яго шматлікіх родных і стрыечных братоў і сясцёр.

Напачатку XVIII ст. у межах Менскага павета пражывала шмат прадстаўнікоў гэтага роду. У асноўным яны валодалі землямі ў ваколіцах Аляхновіч, вызнавалі каталіцызм і лічыліся парафіянамі Красносельскага касцёла.

У рэестры падымнага Менскага ваяводства (павета), складзенага ў 1690 г., згадваюцца браты Казімір і Крыштоф Свентарэцкія [41, арк. 17 адв.]. У іх валоданні знаходзіліся тры службы падданых ва Ушы Аляхновіцкай. У сям'і аднаго з братоў нарадзіліся сыны Траян і Казімір, а ў другога — Міхал і Ежы. На дадзеным этапе даследавання генеалогіі Свентарэцкіх мы не змаглі ўстанавіць іх бацькоў. Магчыма, што у пачатку XVIII ст. каля Аляхновіч пражывалі і іншыя прадстаўнікі гэтага роду, згадак пра якіх не захавалася.

Пасля смерці бацькоў Міхал і Ежы з аднаго боку, і Казімір, скарбнік вількамірскі, з Траянам з другога падзялілі Ушу Аляхновіцкую. Не ўсё прайшло гладка. Супярэчнасці ўзніклі пасля смерці Траяна, які, відаць, карыстаўся сярод братоў вялікім аўтарытэтам. Пачаліся доўгатэрміновыя судовыя працэсы. Тамаш Свентарэцкі, адзін з трох сыноў Траяна, не чакаючы канца судовага працэсу, прадаў сваю частку Ушы дзецям Міхала [40, арк. 1723].

Міхал Свентарэцкі, бацька пісара земскага менскага, склаў тастамент 6 чэрвеня 1729 г. і неўзабаве памёр [42, арк. 694]. Перад смерцю ён прасіў прабачэння ў брата Ежы, якому нанёс крыўду пры падзеле спадчыны. Браты не падзялілі «шмат грунту над ставам». Як ён пісаў у тастаменце, Ежы, даведаўшыся пра вынікі падзелу, «шмат бунтаваў».

Захаваліся згадкі і пра бацькоў маці пісара земскага Менскага ваяводства. Яе бацька Тамаш Жукоўскі сваю частку спадчыннай зямлі ў Жукаве Ліўскай зямлі ў Каралеўстве Польскім пасля смерці бацькоў і падзелу спадчыны паміж чатырма братамі «з усімі забудаваннямі дворнымі і грунтамі» аддаў брату Войцаху ў заставу за 700 злотых. Пасля пераезду на пастаяннае жыхарства ў ВКЛ Тамаш Жукоўскі ўзяў шлюб з Марцыянай Жыдовіч з-пад Койданава. У рэестры падымнага па Менскім павеце за 1690 г. ён пазначаны як уладальнік чатырох службаў падданых у маёнтку Бярвец (або Бярведзь) [41, арк. 2а]. Вядома аб нараджэнні ў гэтым шлюбе толькі Ганны, якая ўзяла шлюб з Міхалам Свентарэцкім [37, арк. 1306]. Бацькі вылучылі для дачкі пасаг памерам у 3 000 злотых, а муж запісаў ёй 6 000 злотых [36, арк. 694 адв.–695]. Памёр Тамаш Жукоўскі ў вельмі пачцівым узросце пасля 1690 г.

У нашы рукі трапіла некалькі згадак аб нараджэнні ў сям'і Міхала і Ганны з Жукоўскіх Свентарэцкіх сямі сыноў і дачок. Магчыма, дзяцей нарадзілася болей, але да дарослага ўзросту дажылі, акрамя Антонія, сыны Ян і Станіслаў, дочкі Разалія, Іаана, Крыстына і Кунягунда.

Пра Яна, які крыху болей за чатыры гады (1746–1750 гг.) карыстаўся тытулам мечнага Менскага ваяводства, захавалася мала згадак у параўнанні з яго братамі. Каралеўскі прывілей Свентарэцкаму на карыстанне ганаровым тытулам менскага мечнага падпісаны 1 студзеня 1746 г. [43, арк. 321]. Цікава, што 23 жніўня 1748 г. лаўдум сойміка падпісалі адразу два мечныя Менскага ваяводства — Аляксандр з Самсонаў Яблонскі і Ян Свентарэцкі [6, арк. 674]. Здаецца, што гэтая акалічнасць не паслужыла падставай для ўзнікнення судовай справы па вызначэнні, хто ж з двух трымальнікаў урада мечнага з'яўляецца больш сапраўдным. Да ліпеня 1736 г. Ян Свентарэцкі ўзяў шлюб з Іаанай Вайдзевіч, багатай спадчынніцай па жаночай лініі менскіх месцічаў Захарэвічаў. Памёр Ян Свентарэцкі ў першай палове 1750 г. 9 жніўня гэтага года падпісваецца прывілей на вакантны ўрад мечнага менскага Антонію Барэцкаму «post fata» («пасля смерці») Яна Свентарэцкага [44, арк. 554]. Жонка Яна Свентарэцкая Іаана надоўга перажыла свайго мужа. Пасля яго смерці ў яе распараджэнні засталіся значныя сумы грошай, якія яна выкарыстала не толькі для таго каб забяспечыць сынам атрыманне выдатнай адукацыі, а дочкам — пасагу і выправы, але і на павелічэнне сваіх зямельных уладанняў.

На нашу думку, Станіслаў, самы малодшы сын Міхала і Ганны Свентарэцкіх, сваё жыццё прысвяціў службе ў літоўскім войску і мала часу праводзіў у межах Менскага павета. Вайсковая кар'ера Свентарэцкага складвалася вельмі добра. У 1729 г., у час смерці бацькі, ён ужо знаходзіўся ў войску, у складзе пяцігорскай харугвы [36, арк. 695]. У 1753 г. Станіслаў Свентарэцкі — паручнік, а да 1765 г. яму надалі званне ка-

пітана коннага палка войскаў ВКЛ. Станіслаў Свентарэцкі склаў тастамент у 1771 г. [45, арк. 186]. Асноўная частка яго спадчыны была размеркавана згодна з тастаментам паміж дзецьмі яго памерлых сясцёр, што пацвярджае нашу здагадку аб адсутнасці ў яго нашчадкаў.

З дакументаў можна зрабіць выснову, што адносіны паміж братамі былі сардэчнымі і захаваліся такімі на працягу ўсяго іх жыцця. Нам не сустрэліся дакументы, якія могуць сведчыць аб непрыязні паміж сынамі Міхала і Ганны з Жукоўскіх Свентарэцкіх.

Вельмі мала захавалася згадак пра сясцёр Антонія Свентарэцкага. Не выключана, што самай старэйшай з дзяцей Міхала і Ганны Свентарэцкіх была Роза (Разалія), якая першай з сясцёр узяла шлюб. Імя яе першага мужа невядома, другім мужам да 1727 г. стаў Міхал Нарвоюш Дышлевіч, войскі смаленскі. Пасаг маладым выплачаны поўнасцю толькі пасля смерці бацькі Разаліі. Адпаведна яго тастамента Дышлевічы, акрамя належнай выправы, атрымалі 6 000 злотых [5, арк. 698].

Да 17 кастрычніка 1726 г., яшчэ пры жыцці бацькі, узяла першы шлюб з Міхалам Рыпінскім (або Рыбінскім) Іаана. Неўзабаве Рыпінскі зыходзіць з гэтага свету і Іаана Свентарэцкая заключае шлюб з Антоніем Паўлікоўскім, старастам ахельніцкім, які знаходзіўся на службе ў Масальскіх і ад іх імя кіраваў Радашковіцкім староствам. Пасаговыя сумы Паўлікоўскія атрымалі 23 лютага 1733 г. [5, арк. 697].

8 лютага 1721 г. склалі бацькам жонкі «акт вячыстага зрачэння» (адмовы) ад усіх прэтэнзій на атрыманне іншых добраў Юзаф, стражнік ашмянскі, і Крыстына Сарокі [5, арк. 700]. Звестак пра гэту сям'ю захавалася вельмі мала. Анджэй Рахуба паведамляе, што Юзаф Сарока памёр каля 16 лістапада 1754 г. [35, № 2060, s. 307].

Задоўга да 20 кастрычніка 1735 г. узяла шлюб з Бенядыктам Есманам, зямянінам Менскага ваяводства, Кунягунда, апошняя з сясцёр Свентарэцкіх. У гэты дзень Бенядыкт і Ганна Есманы склалі для маці і брата Антонія свой зрэчны запіс, дзе пацвердзілі атрыманне пасагу і выправы. Па нейкіх прычынах браты правялі актыкацыю зрэчных запісаў сваіх сясцёр толькі 9 чэрвеня 1755 г., праз шмат гадоў пасля іх замужжа [5, арк. 696].

Нягледзячы на праведзенае даследаванне, у нас і сёння адсутнічаюць адказы на многія пытанні, якія датычацца жыццёвага шляху Антонія Свентарэцкага, знакамітага палітычнага дзеяча Менскага павета другой паловы XVIII ст. Працяг даследавання генеалогіі Свентарэцкіх дазволіць атрымаць адказ на многія загадкі, звязаныя як з асобай пісара земскага Менскага ваяводства, так і з абставінамі жыцця яго продкаў.

## Крыніцы і літаратура


1. Актавая кніга Менскага земскага суда. 02.01.1781–27.12.1781 // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 12. — 438 арк.
2. Кніга меншай канцылярыі ВКЛ (каралеўскія прывілеі на духоўныя і цывільныя пасады за подпісам віцэ-канцлера Антона Тадэвуша Пшаздзецкага). 1764–1772 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 188.
3. Кніга вялікай канцылярыі ВКЛ канцлера Міхала Карыбута Вішнявецкага (складзена Войцахам Францам Даманскім). 1724–1733 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 162.
4. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 08.01.1765–31.12.1767 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 14. — 1466 арк.
5. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 15.01.1752–13.12.1757 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 12. — 1354 арк.
6. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 28.01.1746–29.12.1751 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 11. — 1346 арк.
7. Кніга вялікай канцылярыі канцлера М. Чартарыйскага. 1758–1763 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 183.
8. Кніга вялікай канцылярыі ВКЛ канцлера Міхала Чартарыйскага. 1752–1763 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 180.
9. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 02.01.1768–24.12.1770 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 15. — 1336 арк.
10. Актавая кніга Менскага земскага суда. 03.01.1765–12.04.1769 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 4. — 1232 арк.
11. Актавая кніга Менскага земскага суда. 03.01.1792–31.12.1792 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 24. — 582 арк.
12. Падымныя рэестры Менскага ваяводства. Менскі павет. 1775. Rejestry podymnego województwa mińskiego. Powiat miński. 1775 / Уклад. Дз. Дрозд. — Мінск : Медысонт, 2014. — С. 198.
13. Актавая кніга Менскага земскага суда. 31.01.1757–21.12.1777 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 3. — 144 арк.
14. Актавая кніга Менскага земскага суда. 06.07.1771–16.05.1774 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 6. — 1107 арк.
15. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 02.01.1782–21.12.1782 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 21. — 390 арк.
16. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 03.01.1787–20.12.1787 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 26. — 406 арк.
17. Актавая кніга Ашмянскага гродскага суда. 03.01.1786–27.12.1790 // НГАБ. — Ф. 1732. — Воп. 1. — Спр. 12. — 1191 арк.
18. Актавая кніга Менскага земскага суда. 17.07.1774–30.12.1775 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 7. — 952 арк.
19. Актавая кніга Менскага земскага суда. 08.01.1782–21.12.1782 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 13. — 683 арк.

20. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 03.01.1785–31.12.1785 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 24. — 517 арк.
21. Актавая кніга Менскага земскага суда. 03.01.1783–30.12.1789 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 14. — 772 арк.
22. Актавая кніга Менскага земскага суда. 02.01.1788–31.12.1788 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 19. — 581 арк.
23. Актавая кніга Менскага магістрата. 07.01.1749–31.03.1751 // НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 8. — 782 арк.
24. Актавая кніга Менскага земскага суда. 04.01.1786–29.12.1786 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 17. — 695 арк.
25. Актавая кніга Менскага земскага суда. 19.10.1795–22.12.1796 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 28. — 314 арк.
26. Анішчанка, Я. Ураднікі беларускіх зямель ВКЛ пры Станіславе Панятоўскім. Спісы на рускай мове. Збор твораў у шасці тамах. Т. 4. — Мінск : Выдавец Віктар Хурсік, 2008. — 532 с.
27. Актавая кніга Менскага земскага суда. 18.07.1777–29.06.1779 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 9. — 1405 арк.
28. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 02.01.1791–31.12.1791 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 30. — 683 арк.
29. Актавая кніга Менскага земскага суда. 05.01.1792–22.12.1792 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 23. — 1040 арк.
30. Справа аб забранні зямлі ў памешчыка Свентарэцкага сялянамі Генскага староства. 12.07.1818–1828 // НГАБ. — Ф. 155. — Воп. 1. — Спр. 52. — 96 арк.
31. Актавая кніга Менскага земскага суда. 20.03.1769–16.08.1771 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 5. — 843 арк.
32. Актавая кніга Менскага земскага суда. 02.01.1776–17.07.1777 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 8. — 1193 арк.
33. Актавая кніга Менскага земскага суда. 02.01.1794–31.12.1794 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 26. — 728 арк.
34. Дэкрэтавая кніга Менскага земскага суда. 03.02.1773–16.07.1781 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 23. — 203 арк.
35. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. I. Województwo Wileńskie. XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby; opr. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, przy współpracy U. Jamieljanczyka i A. Macuka. — Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2004. — 764 s.
36. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 07.01.1727–30.12.1732 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 9. — 1785 арк.
37. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 08.01.1733–19.08.1738 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 10. — 1534 арк.
38. Паточная кніга Менскага гродскага суда. 07.01.1737–17.08.1738 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 59. — 1138 арк.
39. Актавая кніга Менскага гродскага суда. 03.01.1720–09.12.1726 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 8. — 1544 арк.

40. Рэестр дакументаў актавых кніг Менскага гродскага суда № 11767–11768. 1593–1594 гг. // НГАБ. — Ф. 1926. — Воп. 5. — Спр. 2.
41. Тарыфная кніга па збору падымнага, чопавага, шэляжнага і іншых падаткаў з жыхароў Мінскага пав. 1690–1724 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 144.
42. Дэкрэтавая кніга Менскага гродскага суда. 08.01.1728–21.05.1738 // НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 41. — 1864 арк.
43. Кніга меншай канцылярыі віцэ-канцлера М.К. Чартарыйскага. 1746 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 175.
44. Кніга меншай канцылярыі віцэ-канцлера Міхала Чартарыйскага. 1747–1752 // НГАБ. — КМФ № 18. — Воп. 1. — Спр. 176.
45. Актавая кніга Менскага земскага суда. 20.01.1793–30.12.1793 // НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 25. — 908 арк.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 31.03.2015*

# Постаці архівістаў

*Д. В. Лісейчыкаў*

## Да 70-годдзя з дня нараджэння Алы Купрыянаўны Галубовіч

Першы кіраўнік у гісторыі любой установы займае надзвычай важнае месца. Гісторыкі без цяжкасцей прыгадаюць імёны нашых першых віцебскіх і віленскіх архіварыусаў Аляксандра Сазонава і Мікіты Гарбачэўскага. Менавіта яны заклалі асновы і ў многім вызначылі напрамкі далейшага развіцця архіўнай справы на беларускіх землях у канцы XIX ст. Ёсць такая знакавая постаць і ў найноўшай гісторыі Беларусі. Гэта першы дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Ала Купрыянаўна Галубовіч.

Ала Купрыянаўна нарадзілася 6 красавіка 1945 г. у г. Тбілісі (Грузія) у сям'і вайскоўца. Пасля сканчэння школы ў г. Віцебску паступіла на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З ліпеня 1970 г. працавала навуковым супрацоўнікам у Віцебскім краязнаўчым музеі, са жніўня 1975 г. — старшым захавальнікам фондаў, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і навукова-даведачнага апарату Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР у г. Мінску. З 1982 па 1984 г. працавала інспектарам навукова-выдавецкага аддзела Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР. З 1985 па 1992 г. — загадчыкам чытальнай залы, пасля загадчыкам аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў ЦДГА БССР.

У студзені 1993 г. Алу Купрыянаўну прызначылі на пасаду намесніка генеральнага дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (комплекс дакументаў XIV – пачатак XX ст.), а ў жніўні 1995 г. яна ўзначаліла новаствораны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, на пасадзе дырэктара якога знаходзілася да красавіка 2012 г.

Яна стала кіраўніком НГАБ, калі архіў знаходзіўся на этапе станаўлення, пошуку свайго месца ў сістэме дзяржаўных архіўных устаноў,



А. К. Галубовіч (злева) у час працы ў аддзеле навукова-даведачнага апарату Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР у г. Мінску, каля 1980 г.

вырашэння надзвычай важных для 1990-х гг. пытанняў фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Менавіта пад кіраўніцтвам Алы Купрыянаўны адбылася знакавая з'ява — пераезд архіва ў новы будынак па вуліцы Крапоткіна, 55, дзе ён знаходзіцца і на сённяшні дзень.

90-я гады мінулага стагоддзя — гэта час, калі архівы прыстасоўваліся да патрэб новага, адкрытага грамадства. Сыходзілі ў нябыт часы, калі ў іх можна было патрапіць толькі паводле накіравання з сур'ёзных навуковых інстытутаў. Мінулым сваёй зямлі і свайго роду пачаў цікавіцца масавы карыстальнік. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі стаў першым аб'ектам «генеалагічнага буму» канца 1990-х гг. Ала Купрыянаўна, якая мела каласальны вопыт працы ў чытальнай зале і ў якасці загадчыка аддзела выкарыстання дакументаў, як ніхто разумела ўсе асаблівасці і цяжкасці гэтага накірунку архіўнай працы. Менавіта тады ў НГАБ была распрацавана методыка работы па выкананні генеалагічных запытаў — найбольш папулярнай і працаёмкай паслугі архіва. Ала Купрыянаўна брала актыўны ўдзел у працы самых разнастайных навукова-практычных канферэнцый па генеалагічнай тэматыцы не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Расіі, Украіне і нават Вялікабрытаніі.

У той складаны перыяд архіву трэба было думаць аб актывізацыі публікацыйнай дзейнасці. Менавіта пры падтрымцы і пры непасрэдным удзеле А. К. Галубовіч былі заснаваны доўгатэрміновыя выдавецкія праекты «Беларусь у актавых кнігах» і «Гербоўнік беларускай шляхты». На сённяшні дзень у гэтых серыях выйшла 5 кніг. У 2001 г. пад рэдакцыяй Алы Купрыянаўны пачаў выходзіць зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў «Архіварыус», які хутка зрабіўся вядомым і прэстыжным выданнем для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках. Дзякуючы намаганням дырэктара для інтэнсіфікацыі навуковай работы ў архіве ў 2004 г. быў створаны асобны аддзел публікацыі дакументаў. Сама Ала Купрыянаўна таксама актыўна ўдзельнічала ў публікацыйнай дзейнасці — яе аўтарству належаць некалькі дзясяткаў навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у беларускіх выданнях і выданнях краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Колькасць інтэрв'ю для сродкаў масавай інфармацыі, тэле- і радыёперадач з яе ўдзелам не паддаецца падлікам. Пад кіраўніцтвам А. К. Галубовіч у 2006 г. быў падрыхтаваны доўгачаканы даведнік «Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі». Папярэдняе падобнае выданне па нашых старажытных дакументах выходзіла толькі ў 1974 г.

Сёння ўспрымаецца як данасць, што архіў мае ўласны афіцыйны вэб-сайт, праводзіць алічбоўку сваіх старажытных дакументаў, удзельнічае ў прэс-канферэнцыях, круглых сталах, супрацоўнічае з установамі розных краін па пытаннях захавання дакументальнай спадчыны. Усё гэта аформілася і было як кажуць «абкатана» менавіта пры кіраўніцтве архівам Алай Купрыянаўнай.

Асаблівую ўвагу надавала яна працы з маладымі архіўнымі кадрамі, у лік якіх у свой час пашанцавала трапіць і мне. Моладзь прыходзіла не толькі праз размеркаванне з гістарычных факультэтаў, але і мэтанакіравана ішла з жаданнем працаваць у канкрэтным, унікальным архіве. Я ж пасля работы ў адной з сярэдніх школ на Палессі не асабліва ўяўляў, чым і як буду займацца ў такой сур'ёзнай установе, як Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Нават не мог падумаць, наколькі родным праз некалькі гадоў ён зробіцца для мяне. Баяўся, што не хопіць ведаў і вопыту. І на ўсіх этапах сваёй архіўнай кар'еры я адчуваў падтрымку і дапамогу Алы Купрыянаўны.

Сёння не толькі архіўныя работнікі НГАБ, але і супрацоўнікі многіх устаноў архіўнай галіны, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь могуць назваць Алу Купрыянаўну Галубовіч сваёй настаўніцай.

За сваю плённую працу А. К. Галубовіч не раз атрымлівала прэстыжныя дзяржаўныя ўзнагароды: Ганаровыя граматы Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Саве-




А. К. Галубовiч, дырэктар Нацыянальнага гiстарычнага архiва Беларусi, 2008 г.

це Мiнiстраў СССР i БССР, Дэпартамента па архiвах i справаводству Мiнiстэрства юстыцыi Рэспублiкi Беларусь, а таксама медаль «Ветэран працы» i знак «Ганаровы архiвiст Беларусi».

Ад усёй душы вiншуем Алу Купрыянаўну з юбiлеем! Жадаем ёй моцнага здароўя i доўгiх гадоў жыцця ў акружэннi блiзкiх людзей.

Артыкул паступiў у рэдакцыю 08.10.2015

# Рэцэнзіі

*Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні / Р. А. Аляхновіч, С. А. Рыбчонак, А. І. Шаланда; склад. А. І. Шаланда; навук. рэд. М. Н. Гальпяровіч. — Мір: Музей «Замкавы комплекс "Мір"», 2015. — 374 с.: іл.*




Адной з тэндэнцый развіцця беларускай гістарычнай навукі з'яўляецца павышэнне цікавасці да даследавання гісторыі асобных магнацкіх родаў перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Так, у 2014 г. пабачыў свет зборнік артыкулаў, прысвечаны розным бакам жыцця і дзейнасці паноў Валовічаў [1], інспіраваны навуковай ініцыятывай «Цэнтр генеалагічных даследаванняў». Працягам гэтай справы стала калектыўная манаграфія (аўтары — супрацоўнікі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Рагнеда Аляхновіч, Сяргей Рыбчонак, Аляксей Шаланда) пра магнацкі род Іллінічаў. Праца складаецца з некалькіх структурных частак — гістарыяграфія і крыніцы; паходжанне і каментаваны пакаленны роспіс роду; геральдыка і сфрагістыка; зямельныя валоданні; кліенты, служэбнікі і прыватнае войска Іллінічаў. У дадатку надрукаваны 11 дакументаў, звязаных з гісторыяй роду.

Іллінічы, якія ў другой палове XV – першай палове XVI ст., стала ўваходзілі ў склад эліты ВКЛ, да нядаўняга часу заставаліся ў гістарыяграфіі ў цені іншых магутных фамілій таго часу (Гаштаўты, Гальшанскія, Радзівілы, Сапегі, Глябовічы і інш.) і звычайна прыгадваліся з нагоды будаўніцтва Юрыем Іванавічам Іллінічам Мірскага замка. Гэта абумоўлена як адносна

---

[1] Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XV–XVIII стст. / Склад. А. М. Янушкевіч; навук. рэд. А. І. Шаланда. — Мінск: Медысонт, 2014. — 508 с.

нядоўгім знаходжаннем на гістарычнай арэне і раннім фізічным згасаннем Іллінічаў (апошні мужчынскі прадстаўнік роду — граф Юрый Шчаснавіч — памёр у 1569 г.), так і адсутнасцю трывалай гістарычнай традыцыі, звязанай з гэтым родам, якая б узыходзіла яшчэ да XVI–XVIII стст.

Вялікую навуковую складанасць уяўляе вызначэнне паходжання Іллінічаў. У адпаведнай главе манаграфіі (аўтар С. Рыбчонак) выкладаюцца і характарызуюцца асноўныя версіі іх паходжання — «магілёўская», «віцебская», «смаленская», «старадубская», «валынская» і «наваградская». На думку С. Рыбчонка, верагоднымі з'яўляюцца вывады роду з Валыні або Наваградчыны (С. 34). Такая выснова грунтуецца на тым, што Івашка Іллініч называе сваёй «вотчынай» маёнтак Студзёнка Крамянецкага пав. (С. 31–32), а ў крыжацкім спісе польскіх і «літоўскіх» палонных 1454 г. ён пазначаецца як «пан на Поўберазе» (цяпер в. Поўбераг Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.) (С. 33). Пошукі каранёў родаў з апорай на згадкі пра «вотчынны» характар уладанняў з'яўляюцца традыцыйным прыёмам у гістарыяграфіі, але далёка не бездакорным. Сам С. Рыбчонак падаў прыклад, што ўнук Івашкі Мікалай Мікалаевіч называў сябе «уроджаны Іллініч на Вялікай Зэльве і на Поўберазе» (С. 33), што нібыта павінна сведчыць пра вотчынны характар валодання Зэльвай. У той жа час добра вядома, што яна трапіла да Мікалая як мацярызна пасля смерці яго маці Ганны Нацавічоўны (С. 236–237). Можна прывесці і хрэстаматыйны прыклад, калі ў 1547 г. Мікалай Радзівіл Чорны стаў князем Святой Рымскай імперыі «на Алыцы і Нясвіжы», хоць апошні знаходзіўся ў руках Радзівілаў толькі некалькі больш за 20 гадоў. Згадкі пра «вотчыну» і найменне прадстаўніка родам «спадкаемцам» («heres») пэўнай тэрыторыі не заўсёды сведчаць пра родавы (даўні) характар валодання. Гэта магла быць выслуга (самога чалавека або яго бацькі), пасаг або мацярызна і г. д.

С. Рыбчонак адкінуў «магілёўскую» (А. Банецкі) і «віцебскую» (В. Воронін) версіі паходжання Іллінічаў (С. 26–28). Абедзве яны грунтуюцца на тым, што ў крыніцах XV–XVI стст. фіксуюцца магілёўскія і віцебскія баяры з прозвішчам (імем па бацьку) Іллінічы. Апрача таго, у 1470-я гг. на ўрадзе віцебскага канюшага фіксуецца нейкі Івашка Іллініч. С. Рыбчонак абгрунтавана лічыць, што гэта быў папросту поўны цёзка пачынальніка магнатаў Іллінічаў (С. 28), а патранімічнае прозвішча Іллінічы віцебскіх або магілёўскіх баяраў не дае падставы сцвярджаць аб іх кроўнасці з будучымі магнатамі. Цікава, аднак, што жыхары Мсціслаўскага пав. сярэднезаможная шляхта Іллінічы ў сярэдзіне XVII ст. валодала маёнткам Дзеснакіта [2] (цяпер в. Мсціслаўскага р-на Магілёў-

[2] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 2116. — Воп. 1. — Спр. 2. Актавая кніга Мсціслаўскага павятовага суда. 2 студзеня – 14 снежня 1779 г. — Арк. 331 адв.

скай вобл.), які знаходзіцца на адлегласці каля 100 км ад Харковічаў (былі часткай валоданняў, выслужаных у часы Казіміра), якіх Івашка Іллініч пазбыўся ў 1467 г. (С. 258). Зразумела, што мсціслаўскія Іллінічы (верагодна, адгалінаванне магілёўскіх ці віцебскіх баяр) пражывалі не так ужо блізка ад уладанняў (тым больш атрыманых за службу) Івашкі, але, як здаецца, «магілёўская» і асабліва «віцебская» версіі паходжання роду патрабуюць больш пільнай увагі.

Далей С. Рыбчонак грунтоўна прааналізаваў і ўдакладніў урадніцкую кар'еру Івашкі Іллініча, а таксама выдатна абгрунтаваў сваю гіпотэзу аб наяўнасці ў Івашкі трох жонак і іх паходжанні (С. 35–53). Тым не менш, даследчык амаль не закрануў пытання аб прычынах імклівай кар'еры Івашкі. Услед за паведамленнем «Хронікі Быхаўца» С. Рыбчонак адзначыў удзел Івашкі ў выратанні караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра ў Хойніцкай бітве 1454 г., што павінна было паспрыяць яго службоваму прасоўванню (С. 45), а таксама звярнуў увагу на пратэкцыю ўплывовых Кязгайлаў (С. 47), з прадстаўніцай іх роду Іллініч ажаніўся (другім шлюбам) прыблізна ў 1470 г. (С. 41). Але на момант Хойніцкай бітвы 1454 г. Івашка займаў пасаду «лажнічага» на двары Казіміра, гэта пераконвае ў тым, што ўжо ў той час ён (ці яго род) меў пэўную грамадскую вагу. Увогуле, варта паставіць пытанне аб шляхах пранікнення русінскай знаці ў склад агульнадзяржаўнай эліты ВКЛ у XV ст.

С. Рыбчонак таксама распісаў і ўдакладніў гады жыцця, пасады і зямельныя валоданні прадстаўнікоў роду Іллінічаў, асаблівую ўвагу гісторык надаў асобе Юрыя Іванавіча (каля 1470–1526). Ён падкрэсліў высокі статус Юрыя сярод паноў-рады, ахарактарызаваў яго як «аднаго з нямногіх фаварытаў» Жыгімонта Старога і Боны Сфорцы, узорнага дзяржаўнага ўрадніка (С. 80). Гэтыя высновы падмацоўваюцца шматлікімі прыкладамі дзейнасці Юрыя Іванавіча. Тым не менш, засталося па-за ўвагай цікавае пытанне ролі Юрыя Іллініча ў спляценні міжасабовых і міжгрупавых канфліктаў, якія разгараліся ў 1520-я гг. унутры эліты ВКЛ — паміж канцлерам, ваяводам віленскім Альбрэхтам Гаштаўтам і Радзівіламі, паміж тым жа Гаштаўтам і гетманам, ваяводам троцкім Канстанцінам Астрожскім. Зрэшты, дакладна акрэсліць гэты аспект немагчыма з прычыны адсутнасці непасрэдных крыніц, але нават гіпатэтычныя, заснаваныя на ўскосных звестках развагі не падаліся б недарэчнымі.

У цэлым, генеалагічная частка манаграфіі выканана на вельмі высокім навуковым узроўні і дазваляе прасачыць уздым роду пры Івашку і яго сынах і паступовае змяншэнне яго ўплыву (што выявілася ў адсутнасці высокіх дзяржаўных урадаў) у наступных пакаленнях.

Аляксей Шаланда ў частцы, прысвечанай геральдыцы і сфрагістыцы Іллінічаў, прыйшоў да высновы, што яны карысталіся распаўсюджа-

ным у ВКЛ, перш за ўсё на Валыні, мясцовым «рускім» гербам «Урубы» (С. 155, 160), які пад пяром польскага геральдыка апошняй чвэрці XVI ст. Барташа Папроцкага быў атаясамлены з падобным польскім гербам «Корчак» (С. 145–146). Той жа Б. Папроцкі выводзіў Іллінічаў ад Чупы, літоўскага баярына часоў Вітаўта. Як слушна адзначыў А. Шаланда, адзінай падставай для гэтага з'яўлялася тое, што Чупа атрымаў «Корчак» падчас Гарадзельскай адопцыі 1413 г. (С. 145–146). Даследчык, аднак, не паставіў пытанне, ці злучэнне Чупы з Іллінічамі вынікала выключна з інтэлектуальных канструкцый геральдыка ці было інспіравана самімі Іллінічамі (у той самы час паходжанне ад літоўскага баярства часоў Вітаўта прыпісвалі сабе Глябовічы, Сапегі, Валовічы). Праўда, як справядліва падкрэсліў А. Шаланда, да моманту выдання Б. Папроцкім гербоўнікаў (1578 і 1584 гг.) род Іллінічаў ужо згас.

Таксама А. Шаланда адзначыў магчымасць наяўнасці «валынскага следу» у геральдыцы Іллінічаў, бо герб «Урубы» быў распаўсюджаны менавіта на Валыні (С. 146). Такая заўвага падмацоўваецца тым, што гербам «Урубы» карыстаўся валынскі род Багавіцінаў, пачынальнік якіх таксама трапіў у палон пад Хойніцамі ў 1454 г. і, як сцвярджае А. Шаланда, у спісе палонных знаходзіўся «разам» з Івашкам (С. 146). «Разам» не надта пэўная катэгорыя — Багавіцін упісаны праз 3 чалавекі пасля Івашкі [3]. Напрыклад, перад і пасля Івашкі ўпісаны прадстаўнікі этнічна літоўскага баярства Станька Касцевіч, Багдан Саковіч, Ян Кучук і Алехна Судзімонтавіч. Такім чынам, наўрад ці размяшчэнне ў спісе палонных 1454 г. можа неяк падмацоўваць факт прыналежнасці Іллінічаў да валынскай гербавай супольнасці «Урубы», хоць такая гіпотэза А. Шаланды, у цэлым, не выглядае беспадстаўнай.

Глава, прысвечаная зямельнай уласнасці Іллінічаў (аўтар Р. Аляхновіч) насычана карысным матэрыялам, які адлюстроўвае збіранне латыфундыі Івашкам, Мікалаем і, перш за ўсё Юрыем Іванавічамі і паступовае яе расцярушванне прадстаўнікамі наступных пакаленняў.

Вельмі цікавай выглядае спроба складання рэестра кліентаў і служэбнікаў (аўтар С. Рыбчонак) і апісанне прыватнага войска (почта) Іллінічаў (аўтар А. Шаланда). Даследаванне супольнасці залежнай ад магнатаў шляхты з'яўляецца важным і плённым напрамкам у літуаністычных штудыях [4]. Спіс, складзены С. Рыбчонкам (С. 126–136), налічвае 62 асобы і вылучаецца руплівасцю і грунтоўнасцю. Магчыма, можна было б

---

[3] Biskup, M. Spisy jeńców polskich z bitwy pod Chojnicami // Przegląd Historyczny. — 1965. — T. 56. — Z. 1. — S. 102.

[4] Варта згадаць класічныя даследаванні Уршулі Аўгустыняк, напрыклад: Augustyniak, U. Dwór i klientela Krzysztofa II Radziwiłła // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. — 1994. — T. 38. — Z. 1. — S. 63–77. У беларускай гістарыяграфіі нядаўні артыкул Настассі Скеп'ян: Скеп'ян, Н. Двор і слугі князёў Слуцкіх у канцы XV – 80-я гг. XVI ст.

падаць пералік не паводле алфавітнага прынцыпу, а паводле асобных катэгорый (намеснікі на месцах,ураднікі, служэбнікі, баяры і зямяне і г. д.), хоць зразумела, што ў некаторых выпадках статус мог змяняцца або не быць адлюстраваным у крыніцах. Апрача таго, аўтар абмяжоўваецца толькі занатаваннем акалічнасцей службы асобных шляхцічаў Іллінічам. Але многія з іх (напрыклад, шырока вядомыя Кавячынскія [5]) адзначыліся і ў перыяд пасля згасання роду Іллінічаў. Зразумела, апісанне іх кар'ер пасля 1569 г. выходзіць за межы даследавання, але, як падаецца, добра было хаця б зрабіць пэўныя адсылкі да адпаведнай літаратуры.

Вельмі перспектыўнай выглядае даследчыцкая ініцыятыва, зададзеная А. Шаландам, пры апісанні почта Іллінічаў, які складаўся са шляхты і зямян, аселых у ваколіцах Міра (С. 265–285). У асобным раздзеле манаграфіі аўтар прасочвае асабовы склад почта, геральдычныя знакі мірскай шляхты і зямян, іх зямельныя валоданні, закранае пытанне змянення іх сацыяльнага статусу на працягу XVI– XVIII стст.

Такім чынам, калектыўная манаграфія закранае асноўныя аспекты родавай гісторыі паноў Іллінічаў, раскрывае асноўныя этапы іх грамадска-палітычных кар'ер, фарміраванне адпаведнай магнацкаму статусу фамільнай латыфундыі. Нягледзячы на выказаныя нешматлікія заўвагі, дадзенае даследаванне можа лічыцца ўзорным і з'яўляецца безумоўным дасягненнем беларускай гістарыяграфіі. Будзем спадзявацца, што аўтарскі калектыў працягне працу ў акрэсленым накірунку і ажыццявіць даследаванні, прысвечаныя іншым прадстаўнікам дзяржаўнай эліты Вялікага Княства Літоўскага.

*Я. С. Глінскі*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.09.2015

/ Н. Скеп'ян // ARCHE. — 2014. — № 6: Магнатэрыя Вялікага Княства Літоўскага. — С.305–339.

[5] Менш вядомымі з'яўляюцца неаднойчы згаданыя на старонках манаграфіі (С. 127, 257, 277, 338 — генеалагічная схема пачатковых кален) служэбнікі Іллінічаў Аравінкі, ад якіх пайшлі роды Аўсядоўскіх-Аравінкаў (Асядоўскіх) і Гурыновічаў-Аравінкаў. Апошні з іх у XVII–XVIII стст. належаў да лакальнай эліты Лідскага павета (Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. — T. 1. — Warszawa: DiG, 2004. — S. 657–658). Між іншым, у фондах НГАБ маецца генеалогія Гурыновічаў-Аравінкаў ад 1643 г. (НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 856. — Справа аб дваранскім паходжанні роду Гурыновічаў. — Арк. 7–13 адв.).

**Маліноўскі, Мікалай**. *Кніга ўспамінаў / Мікалай Маліноўскі; уклад., прадм., камент., імян. паказ. Аляксандр Фядута; пераклад з польск. Я. М. Кісялёва. — Мінск: Лімарыус, 2014. — 240 с., іл. (Беларуская мемуарная бібліятэка).*




Непараўнальнымі па сваёй значнасці з’яўляюцца факты вяртання ў сацыяльную памяць забытых герояў або проста асоб, што пакінулі значны след у развіцці той або іншай сферы жыцця грамадства, у пэўнай сітуацыі дзякуючы сваёй добрасумленнасці і патрыятызму адыгралі істотную ці нават вырашальную ролю ў тых або іншых працэсах, падзеях айчыннай гісторыі. Яшчэ больш важным падаецца рост прызнання такіх асоб і далучэнне новых даследчыкаў да вывучэння іх дзейнасці. У 2014 г. у серыі «Беларуская мемуарная бібліятэка» выйшлі ў свет на беларускай мове ўспаміны вядомага ў свой час гісторыка, філолага-перакладчыка, выдаўца крыніц па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай, архіварыуса архіва Радзівілаў Мікалая Маліноўскага (1799–1865) пад назвай «Маліноўскі Мікалай. Кніга ўспамінаў» (Мінск: Лімарыус, 2014).

Асоба гэтага чалавека выклікае цікавасць па некалькіх аспектах. Выпускнік Віленскага ўніверсітэта, сябра Таварыства філаматаў, пракуратар Радзівілаўскай масы, пазней паўнамоцны прадстаўнік князя Леана Пятровіча Вітгенштэйна, аўтар публікацый у вядучых грамадска-палітычных і навукова-літаратурных перыядычных выданнях першай паловы XIX ст., такіх, як «Віленскі кур’ер» («Kurjer wileński»), «Віленскі веснік» («Dziennik wileński»), «Пецярбургскі тыднёвік» («Tygodnik petersburgski»), «Варшаўская бібліятэка» («Biblioteka warszawska»). Ён быў сучаснікам, сведкам, а часам удзельнікам многіх значных гістарычных падзей, палітычных і культурных працэсаў, што разгортваліся на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у першыя дзесяцігоддзі панавання Расійскай імперыі. Далучанасць да інтэлектуальнай эліты дазволіла М. Маліноўскаму пазнаёміцца з многімі вядомымі і сапраўды знакавымі дзеячамі сваёй эпохі, сярод якіх прафесары Віленскага ўніверсітэта Готфрыд Эрнэст Гродэк (1762–1826), Іаахім Лялевель (1786–1861), сябра Таварыства філаматаў Тамаш Зан (1796–1855), паэт Адам Міцкевіч (1798–1855) і інш. Ён стаў сведкам дзейнасці грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў Казіміра Контрыма (1775–1836), Адама Чартарыйскага (1770–1861), быў паплечнікам выдаўца Адама Ганорыя Кіркора.

Істотнай для айчыннага архівазнаўства старонкай жыцця Мікалая Маліноўскага з'яўляецца яго праца на пасадзе загадчыка архіва, т. зв. Пракураторыі Радзівілаўскай масы ў Вільні — органа кіравання ўладаннямі спадкаемцаў князя Дамініка Гераніма Радзівіла (1786–1813) падчас функцыянавання Радзівілаўскай камісіі па падзеле спадчыны і ліквідацыі запазычанасці, у якой апынуліся ўладанні роду Радзівілаў (1814–1838/39). Аснову архіва, якім М. Маліноўскі загадваў з 1828 г., склаў архіў князёў Радзівілаў, вывезены ў 1818 г. з Нясвіжа. Гэтаму пытанню прысвечаны шэраг нашых артыкулаў, праз якія, між іншым, беларускі чытач можа пазнаёміцца з унёскам адзначанай гістарычнай асобы ў захаванне айчыннай дакументальнай спадчыны [2; 3; 4; 5]. Адзначым толькі, што сваёй дзейнасцю М. Маліноўскі аздобіў галерэю партрэтаў нясвіжскіх архіварыусаў і хоць з'яўляўся стаўленікам Вітгенштэйнаў распачаў традыцыю прызначэння на кіруючую пасаду ў архіве знакамітых даследчыкаў, асоб з універсітэцкай адукацыяй, сярод якіх пазней былі: у 1860–1873 гг. гісторык, знаўца старажытных моў і перакладчык Міхал Богуш-Шышка (1811–1877); у 1890–1893 гг. мовазнаўца Аляксандр Валіцкі (1826–1893) і інш. Гэта з аднаго боку мусіла падкрэсліць высокае становішча працадаўцаў — знакамітага арыстакратычнага роду, а з другога — знаменавала паступовую крышталізацыю і ўзвышэнне навуковага статусу архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў.

Аб задуме аўтара ў пэўным сэнсе сведчыць загаловак адной з частак тэксту мемуараў — «Грамадскі, духоўны і бытавы стан краю». Сапраўды, М. Маліноўскім апісваецца незалежніцкі рух, рэлігійнае пытанне, адукацыйная справа, становішча простага народа і іншае з жыцця насельніцтва былой Рэчы Паспалітай пасля яе падзелу. Дзякуючы гэтым апісанням мы маем каштоўную, багатую на інфармацыю і назіранні, насычаную жывымі вобразамі гістарычную крыніцу. Мемуары даюць унікальныя звесткі аб студэнцкіх таварыствах і навуковым жыцці ў сценах Віленскага ўніверсітэта ў першай трэці XIX ст., аб дзейнасці «польска-ліцвінскай дыяспары» ў Пецярбургу ў другой палове 1820-х гг., жыцці і творчасці Адама Міцкевіча, паўстанні 1830–1831 гг. і інш. Мемуары адметныя тым, што ўтрымліваюць апісанне асобных цікавых выпадкаў, здарэнняў з жыцця шляхты, прадстаўнікоў арыстакратычных родаў, каранаваных асоб, гісторый, якія бытавалі ў адукаваным асяроддзі народаў былой Рэчы Паспалітай у канцы XVIII – 60-я гг. XIX ст., і перадаюць багаты каларыт характару, настрояў, памкненняў чалавека і грамадства таго часу. Акрамя гэтага, кніга дае і пэўнае ўяўленне аб вытоках беларускага нацыянальнага руху. Такім чынам, даследчыкі шырокага кола праблем азначанага перыяду несумненна будуць вітаць выданне мемуараў у Беларусі.

Успаміны датуюцца апошнімі гадамі жыцця М. Маліноўскага (1863–1865), верагодней 1864 г. Запісаныя яны былі Сафіяй Кіркор па прычыне амаль поўнай страты зроку аўтарам. Арыгінал рукапісу захоўваецца ў Бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта. Упершыню ён быў апублікаваны ў Кракаве ў 1907 г. Юзафам Трацяком пад назвай «Mikołaja Malinowskiego Księga wspomnień».

Укладальнік «Кнігі ўспамінаў», а таксама аўтар прадмовы і каментарыяў — Аляксандр Іосіфавіч Фядута. Пераклад з польскай на беларускую мову здзейснены Янінай Міхайлаўнай Кісялёвай. Беларускае выданне, наколькі можна зразумець з прадмовы, уяўляе сабой пераклад тэксту выдання Ю. Трацяка. На жаль, укладальнік не паведамляе аб сучасным стане рукапісу, навуковых падыходах да яго перакладу і перавыдання. Па зразумелых прычынах мы не можам таксама ацэньваць частку працы, якая ўтрымлівае тэкст успамінаў. Адзначым толькі, што заслугоўвае павагі вялікая і складаная перакладчыцкая праца Яніны Міхайлаўны Кісялёвай. Каштоўнае значэнне мае прадмова А. І. Фядуты пад назвай «Сляпы ўглядаецца ў мінулае. Мікалай Маліноўскі і яго мемуары». Як і ўся кніга, яна з'яўляецца, на наш погляд, заслужаным і ўдалым актам на шляху вяртання памяці аб выдатным, у тым ліку ў гісторыі Беларусі, дзеячу. Прадмова падрыхтавана на шырокай гістарыяграфічнай базе, дастаткова грунтоўна раскрывае карціну жыцця Мікалая Маліноўскага, утрымлівае аўтарскую трактоўку яго характару і поглядаў. Аўтар канцэнтруе меркаванні вядучых даследчыкаў па найбольш адметных або нявысветленых аспектах біяграфіі мемуарыста, аналізуе іх, спрабуючы знайсці найбольш лагічны і верагодны адказ [1]. З асобнымі з іх, у тым ліку з аўтарам рэцэнзіі, шаноўны А. І. Фядута палемізуе, аб чым ніжэй. Аб'ёмны раздзел каментарыяў значна пашырае і дапаўняе

---

[1] Трэба адзначыць, што багаты матэрыял для верыфікацыі дадзеных, што прыводзяцца даследчыкамі, даюць самі мемуары М. Маліноўскага. Так М. Маліноўскі ўдакладняе час свайго паступлення ў Віленскі ўніверсітэт — верасень 1819 г. [1, с. 67], а не 1821 г., як пісалася раней [1, с. 6]; у прадмове са спасылкай на Ежы Бароўчыка дзень арышту і месца зняволення падчас следства па справе Таварыства філаматаў указаны няпэўна, як 30 кастрычніка — 15 лістапада «віленскі (верагодна бернардзінскі) манастыр» [1, с. 7], М. Маліноўскі ж перыяд і месца зняволення называе канкрэтна — 1 лістапада 1823 г. — 24 красавіка 1824 г., бернардзінскі кляштар у Вільні [1, с. 50–53]; меркаванне аб добрых стасунках прафесара расійскай славеснасці І. М. Лабойкі (1786–1861), з якім «Маліноўскі блізка сышоўся», і яго магчымай ролі ў вызваленні «свайго выхаванца» з-пад арышту ў 1824 г. [1, с. 6–8] ставіць пад пытанне ацэнка асобы прафесара самім аўтарам успамінаў: «Універсітэт атрымаў новага прафесара рускай літаратуры Яна Лабойку, вялікага невука, якому здавалася, што зможа прывіць любоў ліцвінаў да паэзіі рускіх класікаў. Лабойка пагарджаў Пушкіным, але аддаваў ідалапаклонніцкую пашану Дзяржавіну…» [1, с. 105].

інфармацыйную базу тэксту, істотна спрыяе паўнаце рэканструкцыі гістарычнай карціны ва ўяўленні чытача, выступае сведчаннем асобнай маштабнай даследчыцкай працы.

Яшчэ большай каштоўнасці працы надае ілюстрацыйны дадатак. У ім змешчаны тры выявы асобы М. Маліноўскага. Адна з іх паходзіць са збораў музея ў Вілянове. Гэта партрэт М. Маліноўскага аўтарства знакамітага Івана Хруцкага, які ў выданні змешчаны ў каляровай версіі. Аднак сапраўды ўнікальнымі з’яўляюцца фотаздымкі за 1846 і 1865 гг. са збораў Бібліятэкі Ягелонскага ўніверсітэта. Тэкст успамінаў, які адлюстроўвае характар і жыццёвы шлях М. Маліноўскага, і яго фотаздымкі фарміруюць чытацкае ўяўленне аб архіварыусе з вялікай ступенню рэалістычнасці.

У якасці дадатку да выдання ўспамінаў Д. Матвейчык падрыхтаваў пераклад ліста М. Маліноўскага канца 1840-х – пач. 1850-х г. да «высакародных беларускіх землякоў» са збораў бібліятэкі Вільнюскага ўніверсітэта на тэму выдання навукова-літаратурнага зборніка, які асвятляе пытанне нацыянальных поглядаў і дапаўняе разважанні аўтара прадмовы наконт нацыянальнай прыналежнасці героя ўспамінаў.

Напрыканцы хацелася б указаць на некаторыя меркаванні, зробленыя ўкладальнікам адносна сцвярджэнняў, якія прыведзены ў публікацыях аўтара рэцэнзіі, прысвечаных М. Маліноўскаму.

У прадмове да выдання, апісваючы абставіны прызначэння М. Маліноўскага на пасаду загадчыка архіва Пракуратарыі Радзівілаўскай масы, А. І. Фядута піша: «Вядома цяжка пагадзіцца з тым, што Маліноўскага заўважыў (падкрэслена аўтарам. — *А. Л.*) «як таленавітага і працавітага даследчыка, знаўца старажытнасцей» граф Л. П. Вітгенштэйн. Малады гісторык быў дужа далёкі ад высокіх сфер, у якіх знаходзіліся Вітгенштэйны і Радзівілы…» [1, с. 13–14]. Цытата аб таленавітым даследчыку паходзіць з нашага артыкула аб М. Маліноўскім у біябібліяграфічным даведніку «Архівісты Беларусі» [3, с. 27]. Мы ўдзячны шаноўнаму навукоўцу за каштоўнае назіранне і прапанаваны спектр версій адносна таго, хто мог аказаць пратэкцыю маладому чалавеку ў гэтай справе (хадайнік за віленцаў у Пецярбургу Гаспар Жэльветр, чыноўнікі статс-сакратарыята па справах Царства Польскага, сябра і супрацоўнік II Аддзялення імператарскай канцылярыі Францішак Малеўскі). Аднак мы не можам пагадзіцца з аўтарам прадмовы ў тым, што веды і вопыт М. Маліноўскага як даследчыка гісторыі ВКЛ, знаўца архіўных матэрыялаў не адыгралі ніякай ролі ў выбары кандыдатуры на пасаду загадчыка аднаго з самых буйных на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай збору гістарычных дакументаў і ён быў прыняты як «архівіст-пачатковец» [1, с. 13–14]. Дакладна вядома, што М. Маліноўскі падчас свайго жыцця ў сталіцы актыўна працаваў са зборамі кніг і рукапісаў Публічнай і Ака-

дэмічнай бібліятэк, музея графа Румянцава і іншых устаноў, кантактаваў з вядомымі навукоўцамі, напрыклад Аляксандрам Вастокавым, які, між іншым, дапамагаў яму атрымаць доступ да рэдкіх матэрыялаў («бібліятэчных скарбаў»). Гэта пацвярджаецца тэкстам мемуараў [1, с. 70, 77]. Адметна, што адна са знакамітых гістарычных імправізацый Адама Міцкевіча, пастаўленая ў Пецярбургу ў канцы снежня 1827 г., была падрыхтавана на падставе выяўленых М. Маліноўскім рукапісаў аб дзейнасці Самуэля Збароўскага (пам. 1584) [1, с. 77–93]. Такім чынам, М. Маліноўскага сапраўды ведалі ў вышэйшых колах Пецярбурга «як таленавітага і працавітага даследчыка, знаўца старажытнасцей». Ва ўсялякім разе менавіта такім яго ведаў і Францішак Малеўскі, які, паводле меркавання А. І. Фядуты, і мог садзейнічаць прызначэнню М. Маліноўскага на пасаду архіварыуса [1, с. 14].

Сваё меркаванне аб тым, што «на працу ў «Радзивилловскую массу» бралі не выдатнага даследчыка [2], а архівіста-пачаткоўца», А. І. Фядута спрабуе даказаць памерам «невысокага» заробку, прызначанага М. Маліноўскаму на пасадзе архівіста Пракуратарыі ад 1 лістапада 1828 г. — 600 руб. срэбрам у год і 100 руб. на жыллё (арыгінал пастановы захаваўся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі: Ф. 694. — Воп. 1. — Спр. 411. — Арк. 59–59 адв.) [1, с. 14]. Правядзенне такой простай сувязі падаецца нам не зусім апраўданым. М. Маліноўскі быў запрошаны ўзначаліць архіў. Пад яго кіраўніцтвам знаходзілася некалькі архівістаў-памочнікаў. У абавязкі яго ўваходзілі найскладанейшыя задачы па пошуку і падрыхтоўцы доказальнай базы для спраў, што разглядаліся Судом Радзівілаўскай камісіі. Больш таго, М. Маліноўскі фактычна быў запрошаны як «крызісны менеджар» для прыняцця экстранных захадаў па паляпшэнні арганізацыі працы, захаванні цэласнасці архіва і абароне маёмасных інтарэсаў Л. П. Вітгенштэйна на даручаным напрамку [2; 3; 4; 5]. З гэтым ён бліскуча справіўся, што пацвярджаецца яго далейшай кар’ерай на службе ў Пракуратарыі і ў Л. П. Вітгенштэйна. Будзе справядліва дапусціць, што заробак у 600 руб. срэбрам быў часовым (па стане на 1828 г. адпавядаў пасадзе «першага памочніка» архівіста) і абумоўленым асаблівасцямі штатнага раскладу архіва, калі папярэдні загадчык афіцыйна яшчэ не склаў з сябе паўнамоцтвы і нарматыўным парадкам не здаў архіў пераемніку. Працэс прыёму-перадачы архіва ад папярэдняга яго загадчыка Ануфрыя Ёдкі цягнуўся больш за паўгода [2]. Згодна ж з «Табелем штату Пракуратарыі і ўсёй адміністрацый [Радзівілаўскай] масы на 1828 г.», апублікаваным В. В. Гарбачовай, загадчык архіва — архівіст Ануфрый

---

[2] Выраз «выдатнага даследчыка» ўжыты аўтарам прадмовы. У нашым тэксце: «таленавітага і працавітага даследчыка, знаўца старажытнасцей».

Ёдка — у 1828 г. атрымліваў 2250 руб. [7, с. 61–62], генеральны пракуратар — 4500 руб. У цэлым жа па Пракураторыі на 1828 г. заробак нават у 600 руб. быў вышэйшым за сярэдні. З 40 супрацоўнікаў болей атрымлівалі толькі генеральны пракуратар, яго намеснік, генеральны сакратар, паўнамоцны прадстаўнік па «Каралеўстве Польскім», паўнамоцны прадстаўнік у Варшаве, кантралёр аддзела Кантролю, бухгалтар і згаданы архівіст Ануфрый Ёдка (дыяпазон ад 700 да 4500 руб.) [7, с. 61–62].

Такім чынам, 600 руб. срэбрам прызначаны М. Маліноўскаму ў пачатку працы. Гэта, безумоўна, не вельмі вялікія грошы, але яны не з'яўляюцца ацэнкай «выдатнасці» ці «невыдатнасці» кандыдата, а з'яўляюцца сумай, зацверджанай у штатным раскладзе Пракураторыі для супрацоўнікаў секцыі «Архіў».

Аўтар гэтых радкоў у сваіх працах прадстаўляе М. Маліноўскага як асобу, што адыграла выключна станоўчую ролю ў захаванні дакументальнай спадчыны Радзівілаў, фактычна выратавала архіў ад знішчэння, больш таго, выявіла крадзеж дакументаў бібліятэкарам Дамініка Радзівіла К. Квяткоўскім і ініцыявала судовы працэс над ім [2; 3; 4; 5]. А. І. Фядута ж у прадмове, інтэрпрэтуючы наш тэкст аб тым, што «ўласны збор рукапісаў Маліноўскага ўтрымліваў значную колькасць арыгінальных і капіяваных матэрыялаў, запазычаных з архіва Радзівілаў», прыходзіць да высноў, што мы сцвярджаем аб нейкім «элементарным службовым злоўжыванні» [1, с. 15]. Гэта катэгарычна не так. Уласны збор М. Маліноўскага на самой справе змяшчаў матэрыялы нясвіжскай правеніенцыі. Самым яскравым прыкладам з'яўляецца інвентар бібліятэкі Нясвіжскага замка 1651 г. аўтарства архіварыуса і бібліятэкара Радзівілаў Яна Гановіча, створаны разам з такім жа сумарыюшам замкавага архіва 1650–1652 гг. Інвентар бібліятэкі захоўваецца ў фондзе М. Маліноўскага ў Бібліятэцы Польскай Акадэміі Навук у Курніку (sygn. 1320), а інвентар архіва — у складзе фонду «Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski» (Rękopisy biblioteczne, VIII-16). Аднак сцвярджаць, што ён патрапіў у збор Маліноўскага незаконным чынам нельга. Дакументы ў той час сапраўды маглі быць пазычаны, што мела і сваю працэдуру афармлення. Увогуле, аб гэтым аспекце біяграфіі М. Маліноўскага працытуем наступнае: «Вядома, што М. Маліноўскі ў 1835, 1845, 1846, 1852 гг. працаваў з дакументамі архіва, у тым ліку і часова пазычанымі з яго. Так, напрыклад, ён атрымаў лісты Льва Сапегі і інш. для падрыхтоўкі кнігі. Напачатку 1857 г. яны яшчэ захоўваліся ў бібліятэцы М. Маліноўскага ў Вільні. У жніўні 1857 г. лісты Сапегі, пазычаныя з архіва 25 мая 1846 г., былі вернуты, аднак, магчыма, не ў поўным аб'ёме. Зараз частка збораў М. Маліноўскага ў колькасці 73 спраў захоўваецца ў Курніцкай бібліятэцы пад нумарамі

1283–1352» [6, с. 86] [3]. І гэта канстатацыя фактаў. Іншага на іх аснове сцвярджаць немагчыма.

Такім чынам, нашу інфармацыю аб тым, што «уласны збор рукапісаў Маліноўскага ўтрымліваў значную колькасць арыгінальных і капіяваных матэрыялаў, запазычаных з архіва Радзівілаў» трэба разумець выключна так, як напісана. Калі б у нас былі падставы сцвярджаць іншае, мы напісалі б іншае. Мы не лічым М. Маліноўскага асобай, якая пайшла на службовае злоўжыванне. Сітуацыя, калі ва ўласных зборах архіварыусаў заставаліся некаторыя дакументы або іх копіі з архіва, у якім яны працавалі, для таго часу была дастаткова натуральнай. Тым больш, калі архіварыус займаўся гістарычнымі даследаваннямі. Аднак ні ў якім разе нельга адназначна сцвярджаць аб незаконным утрыманні такіх актаў. Кола шляхоў, якімі яны маглі патрапіць у асабістыя, а магчыма ў пасмяротныя зборы чалавека, шырокае. М. Маліноўскі выдатна разумеў маральныя і юрыдычныя бакі невяртання або крадзяжу архівалій. Ён змагаўся з дакументальнымі стратамі такога кшталту падчас сваёй працы на пасадзе загадчыка архіва Пракуратарыі і фактычна ўпершыню галасна ўзняў гэту праблему, звярнуўшы ўвагу Радзівілаўскай камісіі на яе пагражальныя маштабы. М. Маліноўскі ініцыяваў працэс па справе буйнейшага за гісторыю Нясвіжскага архіва Радзівілаў крадзяжу яго дакументаў — т. зв. справа К. Квяткоўскага, — а таксама іншыя разбіральніцтвы па справах выдачы гістарычных дакументаў з архіва [5] і распрацоўваў іх доказную базу. Не выклікаюць сумненняў і чалавечыя якасці М. Маліноўскага. Мы лічым яго адной з выдатнейшых асоб у плеядзе персаналій прыватнай архівістыкі і далёкія ад таго, каб інкрымінаваць яму «службовае злоўжыванне», тым больш «элементарнае».

На заканчэнне хацелася б пажадаць далейшых поспехаў выдаўцу, а таксама ўсім тым, хто робіць нялёгкую, але высакародную справу адраджэння нашай гістарычнай памяці. Для тых жа, хто зацікавіцца мемуарнай спадчынай М. Маліноўскага, адзначым, што ў ёй ёсць і яшчэ адны ўспаміны, якія адлюстроўваюць падзеі 1827–1828 гг. з жыцця дзеяча [8]. Каштоўнасць, у тым ліку навуковую, маюць і яго даследчыцкія працы. Значэнне многіх з іх, асабліва прысвечаных маёмаснай гісторыі роду Радзівілаў, яшчэ не ацэнена. Іх спіс прыведзены ў ніжэй адзначаным біябібліяграфічным артыкуле [3].

[3] Там жа — спасылкі на крыніцы.

## Крыніцы і літаратура

1. Маліноўскі, Мікалай. Кніга ўспамінаў / Мікалай Маліноўскі; уклад., прадм., камент., імен. паказ. Аляксандр Фядута; пераклад з польск. Я. М. Кісялёва. — Мінск: Лімарыус, 2014. — 240 с., іл. (Беларуская мемуарная бібліятэка).
2. Латушкін, А. М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у перыяд дзейнасці Вышэйшай радзівілаўскай камісіі (1814–1838 гг.): гісторыя і арганізацыя архіўнай справы, стан дакументаў / А. М. Латушкін // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. — Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. — 2004. — № 2. — С. 3–9.
3. Латушкін, А. М. Маліноўскі Мікалай / А. М. Латушкін // Архівісты Беларусі: Біябібліягр. давед. / склад. С. У. Жумар, М. Ф. Шумейка; навук. рэд. У. І. Адамушка, В. У. Бірукова. — Мінск: БелНДІДАС, 2006. — С. 27–29.
4. Латушкін, А. М. Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў XVII – першай паловы XX ст. (частка IV, літары "М" — "Р") / А. М. Латушкін // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 9. — Мінск: БелНДІДАС, 2011. — С. 218–226.
5. Латушкін, А. М. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у пачатку XIX ст. (справа К. Квяткоўскага) / А. М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік / гал. рэд. Э. М. Савіцкі [і інш.]. — Вып. 13. — Мінск: БелНДІДАС, 2012. — С. 149–160.
6. Латушкін, А. М. Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII – першай палове XX ст.: Дыс. на саіск. вуч. ст. канд.гіст. навук па спецыяльнасці 05.25.02 — дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства (гістарычныя навукі) / А. М. Латушкін. — Мінск, 2007. — 297 с.
7. Гарбачова, В. В. Сістэма кіравання Радзівілаўскай масай у 20–30-я гг. XIX ст. / В. В. Гарбачова // Acta anniversaria. — Т. 1. — Нясвіж: НГКМЗб «Нясвіж», 2015. — С. 53–65.
8. Malinowski, M. Dziennik. Z rękopisu Biblioteki Ordynacji Krasińskich / oprac. M. Kridl. — Wilno: NS, 1921. — 131 s.

*А. М. Латушкін*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.10.2015

**Быхаўцаў, М.** *Паўстанне 1863–1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. — Гародня : [б.в.], 2014. — 344 с.: іл. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»).*




150-годдзе паўстання 1863–1864 гадоў істотна актывізавала цікавасць беларускіх даследчыкаў да гэтай важнай падзеі айчыннай і сусветнай гісторыі. Адзін з вынікаў гэтай хвалі навуковай цікавасці — з'яўленне шэрагу прац, якія апісваюць паўстанне на пэўнай невялікай тэрыторыі, як правіла, у межах аднаго павета. На працягу апошніх трох гадоў у свет выйшла адразу некалькі адпаведных нарысаў у якасці кніг [2; 15] і яшчэ больш як артыкулы [1; 4; 5; 6; 8; 9; 14 і інш.]. Усе гэтыя публікацыі моцна розняцца паміж сабой паводле колькасці ўключаных у іх звестак і адпаведна аб'ёму, шырыні кола ўжытых для іх напісання крыніц, ступені навуковасці альбо публіцыстычнасці ў падачы матэрыялу і г.д. Аднак, безумоўна, найбольш аб'ёмнай у гэтым шэрагу з'яўляецца кніга ваўкавыскага даследчыка Мікалая Быхаўцава пра падзеі паўстання ў Ваўкавыскім павеце.

Знаёмства з кнігай пакідае супярэчлівыя ўражанні. З аднаго боку, яна з'яўляецца найлепшай з выпушчаных у свет пра паўстанне беларускімі краязнаўцамі, грунтуецца на найбольшай колькасці крыніц, асабліва архіўных, і распавядае пра вялікую колькасць падзей і найбольш падрабязна ў адносінах да пэўнага рэгіёна. Аднак з другога боку, шматлікія дапушчаныя хібы і памылкі, зробленыя падчас яе напісання і публікацыі, моцна зніжаюць яе каштоўнасць. Шмат у чым кніга пакідае ўражанне недапрацаванасці, недаведзенасці да канца пачатых пошукаў, няскончанасці пачатых даследаванняў, заўчаснасці выдання.

Варта зрабіць агаворку, што сам аўтар не сцвярджае пра высокую навуковую каштоўнасць сваёй працы, абіраючы для сябе дастаткова сціплую пазіцыю — не прафесійнага гісторыка, а *«правінцыйнага краязнаўцы з Ваўкавыска»* (с. 6). Нідзе на кнізе не пастаўлены грыф «навуковае выданне». Аднак у параўнанні з іншай краязнаўчай літаратурай яна робіць істотны крок наперад на шляху да навуковасці, пра што выразна сведчыць яе змест. І менавіта з навуковага пункту гледжання кніга і будзе падвержана крытыцы ніжэй, хаця падобны падыход можа ў дадзеным выпадку і пэўнай ступені лічыцца неабавязковым, неправамоцным ці «нацягнутым».

Структурна кніга падзелена на 41 невялікі раздзел і 10 дадаткаў, дзе апублікаваны некаторыя дакументы. Навукова-даведачны апарат прадстаўлены імянным і геаграфічным паказальнікамі і спісам выкарыстаных крыніц.

Першае, што варта адзначыць у кнізе, гэта карпатлівую працу аўтара з дакументальнымі матэрыяламі, што захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна (далей — НГАБ у Гродна). Са 161 пазіцыі, змешчанай у спісе выкарыстаных крыніц і літаратуры, большую частку складаюць менавіта справы з гэтага архіва. Дзякуючы гэтаму ў кнігу ўведзена вялікая колькасць факталагічных звестак, раней невядомых гісторыкам. Зададзены прынцып *«Вузкія тэрытарыяльныя рамкі даследавання, на погляд аўтара, маюць пэўную перавагу, бо дазваляюць засяродзіць увагу на самых звычайных дробязях, якія ў выніку і даюць найлепшае ўяўленне аб падзеях»* (с. 5) рэалізоўваецца на працягу ўсёй працы і шмат у чым паспяхова.

Неабходна адзначыць шырокае тэматычнае кола, якое аўтар абірае сабе ў якасці даследавання. У кнізе прысутнічаюць такія тэмы, як дзейнасць Ваўкавыскай следчай камісіі (с. 179–182), рэпрэсіі паўстанцаў супраць грамадзянскага насельніцтва павета за дапамогу расійскім уладам (раздзел «Адваротны бок вайны», с. 162–178), узнагароджванне за ўдзел у задушэнні паўстання (раздзел «Узнагароды», с. 276–277), хлуслівыя паказанні і даносы расійскім уладам (раздзел «Ілжэсведкі», с. 246–253) і інш. І хаця не заўсёды аўтару ўдаецца раскрыць у належнай ступені тую ці іншую тэму, сам зварот да падобных, часта рэдка даследаваных пытанняў, варты самай станоўчай ацэнкі.

Аднак кніга засталася на сутыку гісторыі як навукі, краязнаўства і публіцыстыкі, не здолеўшы ўзняцца да ўзроўню навуковай манаграфіі. Перашкаджае гэтаму шэраг істотных недахопаў.

Па-першае, недастатковае знаёмства аўтара з навуковай літаратурай па выбранай тэматыцы даследавання. Асабліва ўражвае малая колькасць выкарыстаных прац польскіх навукоўцаў — у спісе крыніц згадана ўсяго 8 польскамоўных пазіцый. І гэта пры тым, што менавіта ў Польшчы гістарыяграфія паўстання 1863–1864 гг. мае найлепшыя поспехі. Напрыклад, у кнізе нават не згаданы працы Яана Длугаша [18], Давіда Файнгаўза [19], Станіслава Зялінскага [24], Вацлава Студніцкага [23] і шматлікія іншыя, якія прама закранаюць падзеі паўстання ў Ваўкавыскім павеце. Тое ж тычыцца і беларускай гістарыяграфіі. Напрыклад, у кнізе не згадана праца Усевалада Ігнатоўскага [3] — адзіная манаграфія па гісторыі паўстання на беларускай мове. Пры гэтым адсутнасць у спісе крыніц некаторых бібліяграфічных пазіцый выклікае шчырае здзіўленне, напрыклад сумеснага артыкула Сяргея Токця, Альбіны Семянчук і Янкі Трацяка пра высланых за дачыненне да паўстання сялян з Ваўка-

выскага павета, які выйшаў у 2008 г. у часопісе «Ваўкавышчына», рэдагаваным непасрэдна М. Быхаўцавым [12]. Пры гэтым у спісе крыніц не згадана і справа з НГАБ у Гродна (ф. 1, воп. 14, спр. 1141), на падставе якой напісаны гэты артыкул. Адсутнасць такіх матэрыялаў ніяк не растлумачана. Тое ж самае тычыцца артыкула Эдмунда Ярмусіка, які яшчэ ў 1997 г. зрабіў спробу апісання паўстання ў Ваўкавыскім павеце [16]. Верагодна, менавіта падобная няўвага да папярэдняга навуковага даробку і з'яўляецца прычынай таго, што асобны раздзел (альбо як частка прадмовы), прысвечаны аналізу (ці хаця б агляду) гістарыяграфіі і крыніц і абавязковы для навуковых прац, у кнізе проста адсутнічае. Традыцыйна менавіта з аналізу папярэдняй бібліяграфіі выводзіцца навуковая праблема. Адпаведна ў рэцэнзаванай кнізе яна не пастаўлена. Паўтары старонкі тэксту пад назвай «Ад аўтара» не могуць замяніць паўнавартасную прадмову.

Па-другое, гэта вузкае кола ўжытых у кнізе крыніц. У раздзеле «Ад аўтара» згадана: *«Даследаванне абапіраецца на дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне, Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні, а таксама на іншыя крыніцы»* (с. 5). І калі частка гэтага сказа, што тычыцца гродзенскіх матэрыялаў, асаблівых пытанняў не выклікае, то іншую, што тычыцца віленскіх, варта ўспрымаць крытычна. У спісе крыніц згаданы толькі 5 спраў з віленскага архіва. Усе яны захоўваюцца ў адным фондзе 1248 «Часовы палявы аўдытарыят пры Штабе войскаў Віленскай вайсковай акругі». Аднак толькі ў адным гэтым фондзе захоўваюцца яшчэ больш за 20 спраў (воп. 1, спр. 53, 100, 123, 176 і інш.; воп. 2, спр. 85, 359, 434, 565 і інш.), што тычацца ўраджэнцаў Ваўкавыскага павета. Матэрыялы ж іншых фондаў, напрыклад 438 «Віленская следчая камісія па палітычных справах» альбо 378 «Канцылярыя віленскага, гродзенскага і ковенскага генерал-губернатара», дзе захоўваюцца дзясяткі спраў пра ўраджэнцаў Ваўкавышчыны, не выкарыстаны ўвогуле. З іншых крыніц у вышэй згаданым спісе фігуруюць толькі 6 апублікаваных мемуараў удзельнікаў паўстання, іх апанентаў ці сведкаў падзей, 8 разнастайных зборнікаў дакументаў і 2 тамы «Поўнага збору законаў Расійскай імперыі». Пры гэтым у падборы крыніц бачна пэўная неадпаведнасць зададзенай тэме. Напрыклад, мемуары Аляксандра Масолава і Мікалая Палявога, апублікаваныя ў часопісе «Руская старына», тычацца зусім іншых тэрыторый — г. Вільні і Мінскай губерні адпаведна. Успаміны Адама Багдановіча таксама не маюць дачынення да Гродзенскай губерні, бо апісваюць падзеі ва ўсходняй частцы Барысаўскага павета. І пры гэтым іншыя мемуары, значна бліжэйшыя паводле геаграфіі падзей, напрыклад, Юзафа Маеўскага з той жа «Рускай старыны» [7] ці Сцяпана Славуцінскага з «Гістарычнага весніка» [11] нават не згаданы. Таксама адсутнічаюць у спісе ўспаміны

такіх важных у паўстанні асоб, як віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў [10] і кіраўнік паўстанцкага Аддзела кіравання правінцыямі Літвы Якуб Гейштар [20].

Па-трэцяе, выклікае вялікую колькасць нараканняў структура кнігі ў цэлым. Увогуле, асноўная «апавядальная» частка тэксту выкладзена паводле тэматычна-храналагічнага прынцыпу, калі пэўныя тэматычныя блокі размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці развіцця падзей. Гэты прынцып амаль цалкам вытрымліваецца да раздзела «Справа Владычанскіх» (пачынаецца на с. 183). Выключэнне складаюць толькі некаторыя адхіленні, накшталт раздзела «Кастусь Каліноўскі і яго брат Віктар» (с. 40–50), дзе большая частка пададзенага матэрыялу хоць і не тычыцца ні Ваўкавыскага павета, ні 1863–1864 гг. непасрэдна, аднак можа быць змешчана ў агульны аповед з-за тэматычнай і геаграфічнай блізкасці. Аднак значная частка змешчанага ў кнізе матэрыялу (16 раздзелаў, с. 183–245) уяўляе сабой пераказ асобных спраў і паказанняў некаторых асоб з фонду Ваўкавыскай следчай камісіі. Падобная форма падачы матэрыялу моцна адрозніваецца ад традыцыйнай навуковай, якая разумее пад сабой абавязковую крытыку крыніц. Пры гэтым масавы пераказ асобных выпадкаў, здарэнняў і г.д. не фарміруе якой-небудзь цэльнай карціны апавядання альбо аўтарскіх высноў. Самі па сабе матэрыялы той ці іншай справы і тым больш паказанні маюць вялікі адбітак суб’ектыўнасці, а таму не павінны ўспрымацца як аповеды, апрыёры адпаведныя рэчаіснасці, а менавіта такое ўражанне можа скласціся ў непадрыхтаванага чытача. Як вядома, арыштаваныя асобы і палонныя паўстанцы шмат хлусілі на следстве і судзе, каб выратавацца ад пакарання ці хаця б зменшыць ступень яго цяжкасці. Пры гэтым сумнеўнай таксама выглядае менавіта форма пераказу, пры якой шмат якія падрабязнасці могуць губляцца, а не, напрыклад, публікацыі дакумента (асабліва гэта тычыцца паказанняў). З іншага боку, выглядае немэтазгодным уключэнне ў падобныя пераказы шматлікіх звестак, якія не тычацца паўстання. Напрыклад, у раздзел «Справа Владычанскіх» уключаны амаль тры старонкі тэксту пра гісторыю роду і біяграфічныя звесткі пра аднаго з яго прадстаўнікоў, у тым ліку больш чым на паўстаронкі падрабязна перапісваюцца звесткі з фармулярнага спіса аб службе за 1816–1860 гг. (с. 183–185). Застаецца незразумелым і прынцып адбору спраў для пераказу ў кнізе. Аўтар абмяжоўваецца толькі сцвярджэннем *«якія ўяўляюць сабой найбольшую цікавасць»* (с. 182), аднак не тлумачыцца, у чым заключаецца гэтая цікавасць.

Па-чацвёртае, назвы раздзелаў кнігі сфармуляваны некарэктна. Напрыклад, другі раздзел мае назву «Непакорлівыя», што, мяркуючы паводле назвы кнігі, асацыятыўна павінна было б звязваць змест раздзела менавіта з паўстаннем, аднак пададзены тэкст не мае да яго дачынен-

ня, а прысвечаны рэалізацыі сялянскай рэформы 1861 г. у Ваўкавыскім павеце і сялянскім хваляванням 1861–1863 гг. Тое ж самае тычыцца назваў «Парадкі», «Адваротны бок вайны», «Пакаранне», «Узнагароды» і інш., якія маюць выразна публіцыстычны характар, і пра тэматыку адпаведных раздзелаў можна скласці ўяўленне, толькі азнаёміўшыся непасрэдна з тэкстам.

Па-пятае, гэта некрытычнае стаўленне да выкладзенай факталогіі. Пры гэтым тыя звесткі, якія чэрпаюцца з архіўных крыніц, аўтарам паддаюцца аналізу на прадмет верагоднасці, а тыя, што перапісваюцца з іншых кніг, у некаторых выпадках не верыфікуюцца ўвогуле. Напрыклад, на с. 162–163 апісваюцца «ваенныя злачынствы» генерала Захара Манюкіна падчас і пасля бітвы ля мястэчка Сямяцічы Бельскага павета Гродзенскай губерні (спаленне жыўцом і забойства штыкамі некалькіх дзясяткаў параненых паўстанцаў, забойства дзевяці яўрэяў у Сямяцічах, свядомае абрабаванне і спаленне мястэчка ўжо пасля яго заняцця расійскімі войскамі), а на с. 150–151 — звесткі пра вобыскі і штрафы, якія перапісаны з твора Фердынанда-Уладзіслава Чапліцкага «Маскоўская ўлада ў Літве» [17]. Аднак у кнізе цалкам ігнаруецца той факт, што праца Чапліцкага з’яўляецца не столькі гістарычным даследаваннем, колькі палітычна-публіцыстычным памфлетам супраць Расійскай імперыі, а сам Чапліцкі моцна крытыкаваўся ўжо польскімі гісторыкамі XIX ст. за неаб’ектыўную падачу матэрыялу і выкарыстанне неправераных звестак. Больш таго, звесткі пра масавае забойства параненых паўстанцаў адсутнічаюць у любых іншых гістарычных крыніцах па гісторыі паўстання, у тым ліку і архіўных, з якімі працаваў М. Быхаўцаў.

Па-шостае, выклікаюць крытыку некаторыя сцвярджэнні аўтара пра тыя ці іншыя падзеі. Напрыклад, наступнае: *«Канчатковым спыненнем пераследавання ўдзельнікаў паўстання можна лічыць 11 мая 1873 год, калі расійскі імператар Аляксандр II зацвердзіў палажэнне камітэта міністраў аб спыненні канфіскацыі маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863 года»* [4] (с. 288). Разнастайных маніфестаў, указаў да т.п. аб аблягчэнні лёсу пакараных удзельнікаў паўстання было выдадзена каля дзесяці на працягу доўгага часу. Першы з вядомых з’явіўся 16 красавіка 1866 г., апошні — 14 лістапада 1894 г. Указ ад 1873 г., які, дарэчы, быў удакладнены ўказам ад 9 студзеня 1874 г., з’яўляецца ўсяго толькі адным з гэтага шэрагу. Апрача таго, яго рэалізацыя — вызваленне ад канфіскацыі — расцягнулася на гады.

Па-сёмае, публіцыстычны стыль падачы матэрыялу. Варта адразу заўважыць, што гэта характэрна не для ўсёй кнігі. Значная яе частка

---

[4] Аўтарскія арфаграфія і стылістыка захаваны цалкам, што добра ілюструе характэрную для ўсёй кнігі недастатковую тэхнічную працу па падрыхтоўцы тэксту да друку.

выкладзена звычайным навуковым стылем. Аднак у шматлікіх абзацах аўтар збіваецца на эмацыянальнасць, уласную суб'ектыўнасць, ужыванне літаратурных выразаў і іншыя рысы, недапушчальныя для навуковай працы. Напрыклад, на с. 247 маецца фраза *«Па цяперашніх паняццях віна доктара Ельца была проста высмактана з пальца»*, на с. 248 — *«Як гаворыцца, добра тое, што добра заканчваецца. Праўда перамагла»*, якія з'яўляюцца апісаннем суб'ектыўнай аўтарскай пазіцыі ў адносінах да тых ці іншых гістарычных падзей. І падобныя прыклады можна множыць. Раздзел «Заключэнне», у якім традыцыйна ў навуковых манаграфіях падводзяцца высновы даследавання і ацэньваецца паспяховасць яго правядзення (што ў кнізе ўвогуле адсутнічае), уяўляе сабой публіцыстычны артыкул на тэму ўшанавання звязаных з паўстаннем мясцін на Ваўкавышчыне ў цяперашні час, больш прыдатны для якога-небудзь перыядычнага выдання.

Па-восьмае, непаслядоўнасць у выкарыстанні тэрміналогіі. Гэта тычыцца як ужывання розных беларускіх адпаведнікаў імёнам уласным, так і спецыфічных гістарычных тэрмінаў. Напрыклад, у раздзеле «Справа двараніна Яна Ельскага» (с. 230–232) імя Ельскага пішацца ў розных выпадках як у форме Ян, так і ў форме Іван. Яшчэ адзін добры прыклад, ксёндз Абелевіч (прозвішча якога ў адпаведнасці з правіламі беларускай фанетыкі павінна пісацца як Абялевіч). У двух выпадках ён фігуруе ў кнізе з імем Іосіф (с. 221, 314), у трэцім — Язэп (с. 270). Увогуле, у кнізе відавочная адсутнасць адзінага прынцыпу перакладу рускамоўных форм імёнаў і прозвішчаў у беларускія адпаведнікі. Тое ж тычыцца і тэрмінаў. Напрыклад, у пераважнай большасці выпадкаў рускі тэрмін «уезд» перакладаецца як «павет» (у тым ліку і ў назве), аднак у некаторых выпадках ён пакідаецца ў пачатковай форме (напрыклад, с. 279). Аналагічная сітуацыя з тэрмінамі «дэкан» (с. 221, 270) і «дзекан» (с. 314), і са шматлікімі іншымі.

Па-дзявятае, асобнай крытыкі заслугоўвае афармленне спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры, які некарэктна называецца проста «Крыніцы». Ужыты пры яго складанні прынцып размяшчэння пазіцый у адпаведнасці з парадкам выкарыстання крыніц у тэксце прыдатны хутчэй для артыкулаў, невялікіх паводле свайго аб'ёму і з невялікай колькасцю ўжытай бібліяграфіі. Аднак ён выразна не пасуе для аб'ёмных кніг, бо выключна ўскладняе знаёмства чытача з выкарыстанымі крыніцамі і працамі. І гэта бачна на прыкладзе самога П. Быхаўцава, які некаторыя пазіцыі змяшчае ў спісе двойчы — №№ 52 і 147, 90 і 96. Прынцып размяшчэння ў алфавітным парадку значна больш прыдатны ў гэтым выпадку. Апрача таго, у кнізе адсутнічае ўніфікацыя напісання бібліяграфічных пазіцый — як імёнаў аўтараў, так і выходных дадзеных публікацый. Напрыклад, імя гісторыка Аляксандра Смалянчука, працы яко-

га прадстаўлены ў спісе шасцю пазіцыямі, фігуруе ў чатырох адрозных варыянтах — «Смалянчук Алесь» (тройчы — нумары пазіцый 33, 90, 96), «Смалянчук А. Ф.» (№ 39), «Смалянчук А.» (№ 74) і «Алесь Смалянчук» (№ 141). Таксама неабходна згадаць, што архіўныя справы ўнесены ў спіс выключна ў форме «назва архіва — фонд — вопіс — справа» без указання назваў спраў, іх крайніх дат і колькасці аркушаў. Не варта забывацца, што назвы спраў (нягледзячы на іх магчымую недакладнасць ці некарэктнасць) дэ-факта выконваюць тую ж функцыю, што і назвы кніг ці артыкулаў. Варта таксама выказаць меркаванне пра магчымую няпоўнасць спіса. Напрыклад, на с. 318 у біяграме Якуба Гейштара маецца фраза *«Пакінуў пасля сябе ўспаміны — каштоўную крыніцу па гісторыі паўстання 1863–1864 гадоў»*, якая сведчыць пра верагоднае знаёмства аўтара са згаданымі ўспамінамі, аднак у спісе згадка пра яе адсутнічае.

Па-дзясятае, якасць і геаграфічнага, і імяннога паказальнікаў нізкая праз шматлікую колькасць хібаў. У геаграфічным не пададзена лакалізацыя населеных пунктаў — вёсак, фальваркаў, маёнткаў і інш. Апрача таго, формы, у якіх назвы вынесены ў паказальнік, часта не адпавядаюць тым, што змешчаны ў тэксце. Напрыклад, самая першая пазіцыя ў паказальніку — «Адамкаў», хаця ва ўсім іншым тэксце яна пяць разоў сустракаецца ў форме «Адамкава». Да таго ж, апошні з нумароў старонак, указаны ў гэтай жа пазіцыі — 302, — пададзены памылкова, бо назва сустракаецца на с. 301. Увогуле, недакладнасць і памылковасць шматлікіх нумароў старонак з'яўляюцца характэрнымі для абодвух паказальнікаў. Імянны паказальнік варты крытыкі за няпоўнасць і шматлікія пропускі. Напрыклад, мемуарыст М. Палявой, згаданы на с. 278 з цытатай з яго ўспамінаў, увогуле не вынесены ў паказальнік; з усіх прадстаўнікоў роду Ельскіх, пра якіх вядзецца апавяданне на с. 230–232, у паказальнік вынесены толькі вышэй згаданы Ян, а ні яго бацька Адам, ні брат Восіп у ім не фігуруюць.

Па-адзінаццатае, асобна варта згадаць пра няўвагу да карэктнасці подпісаў пад ілюстрацыямі. Гэта тычыцца выяў гравюр, якія былі апублікаваны ў 1860-я гг. у еўрапейскай прэсе, у тым ліку ў тыднёвіку «Le Monde illustré» («Ілюстраваны свет»). Кожная з апублікаваных гравюр мела подпіс, які адначасова апісваў выяўленае дзеянне і з'яўляўся імем уласным, назвай гэтай самай гравюры (нягледзячы на тое, што некаторыя выявы маглі публікавацца ў розных выданнях пад рознымі подпісамі). У кнізе ж назвы гравюрам дадзены абсалютна незалежна ад арыгінальных подпісаў. Напрыклад, ілюстрацыя (у некарэктнай тэрміналогіі кнігі — малюнак) 17 названа «Падчас бітвы з расійскімі войскамі», хаця нават у апублікаванай версіі з лёгкасцю чытаецца франкамоўны подпіс, які перакладаецца як «Польскі капелан,

паранены ўдарам шаблі і вызвалены добраахвотнікамі». Аднак і гэтая назва выразна супярэчыць выяве. У іншым выпадку яна была апублікавана з подпісам «Польскія афіцэры, параненыя у бітве пад Слянобскай» [22, s. 597]. Тое ж тычыцца ілюстрацыі 19 «Адыход паўстанцаў», арыгінальнай назвай якой з'яўляецца «Атрад палякаў, суправаджаемы аўстрыйцамі ў Тарнаў». Пры гэтым неарыгінальныя назвы змешчаны пад усімі выявамі гравюр. У асобных выпадках дадзеныя М. Быхаўцавым (ці спісаныя ім аднекуль) назвы прама супярэчаць арыгінальным. Ілюстрацыя 18 азагалоўлена «Атака расійскіх казакоў», хаця яе франкамоўны подпіс, які магчыма прачытаць у кнізе, перакладаецца як «Рускі абоз, атакаваны палякамі ў Казловай Рудзе (Літва)». І падпісаная менавіта так гравюра была апублікавана не ў «Le Monde illustré», як гэта напісана М. Быхаўцавым, а ў выданні «L'Illustration. Journal Universel» («Ілюстрацыя. Усеагульная газета») [22, s. 130], а каляровая літаграфія з падобным нямецкамоўным подпісам — у 1863 г. у Вене [21, s. 74]. Ілюстрацыя 23 названа «Высылка паўстанцаў у Сібір», аднак яе арыгінальны подпіс — «Калона рэкрутаў, якая пакідае Варшаву», і яна тычыцца не сасланых удзельнікаў паўстання, а рэкрутаў, набраных у Польшчы ў студзені 1863 г. [22, s. 66–67]. Як бачна, розніца прынцыповая.

Па-дванаццатае, афармленне і прынцып адбору дакументаў для дадатку не вытрымліваюць крытыкі. Ні ў раздзеле «Ад аўтара», ні ў іх пачатку, ні ў якасці каментарыяў да дакументаў нідзе не растлумачана, чаму менавіта гэтыя адабраны для публікацыі. Тым больш, што толькі тры з апублікаваных у кнізе маюць дачыненне непасрэдна да Ваўкавыскага павета. Астатнія ж шэсць тычацца ўсіх беларуска-літоўскіх губерняў («Паўночна-Заходняга краю»). Пытанне пра якую-небудзь археаграфічную апрацоўку архіўных дакументаў аўтарам нават не ставіцца, а апублікаваны яны ў перакладзе на беларускую мову без тлумачэння іх паходжання і з некарэктна дадзенымі загалоўкамі. Указваюцца толькі каардынаты месца іх захавання. І вельмі сумнеўна выглядае неабходнасць публікацыі чатырох дакументаў у якасці перадруку з іншых твораў, асабліва са зборніка «Кастусь Каліноўскі. За нашую вольнасць: Творы, дакументы» (нават назва яго ў кнізе пададзена з памылкай — с. 297), выпушчанага ў 1999 г. вялікай колькасцю ў 5,5 тыс. асобнікаў і лёгка даступнага па ўсёй Беларусі.

Як паказвае вышэй прыведзенае, хібаў кніга мае нямала, аднак усе яны вырашальныя. Варта спадзявацца, што ў выпадку працягу сваіх навуковых даследаванняў і патэнцыяльнага выпуску ў свет наступных выданняў аўтар кнігі возьме пад увагу і гэтыя заўвагі.

Аднак, нягледзячы на ўсе недахопы, кніга М. Быхаўцава мае адну важную станоўчую рысу, апрача згаданых вышэй, на якую варта звярнуць увагу. Яна вельмі добра ўказвае на багацце крыніцавага матэрыялу,

які маецца па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у айчынных і замежных сховішчах, у першую чаргу архіўных. І гэты пласт крыніц ляжыць у значнай ступені нявыкарыстаны, ступень яго засваення на цяперашні час увогуле можна назваць невысокай, а яго мэтанакіраваная планамерная распрацоўка распачалася адносна нядаўна [13]. Аб'ём у 344 старонкі кнігі, прысвечанай падзеям усяго ў адным павеце, у далейшым павінен стаць арыенцірам для наступных даследчыкаў, якія паставяць сваёй мэтай напісанне кніжных нарысаў пра паўстанне на пэўнай невялікай тэрыторыі. І колькі б не было ў кнізе недапрацовак, яны могуць толькі знізіць, але не могуць цалкам нівеліраваць галоўную яе заслугу — вялікай колькасці факталагічных звестак, змяшчэнне якіх магчыма, варта паўтарыцца, толькі пры доўгай і плённай працы з архіўнымі матэрыяламі.

Кніга М. Быхаўцава робіць несумненны ўклад у айчынную гістарыяграфію. Яе выкарыстанне ў далейшых навуковых распрацоўках па гісторыі паўстання 1863–1863 гг. у Гродзенскай губерні і ў Беларусі ў цэлым будзе з'яўляцца абавязковым.

## Крыніцы і літаратура


1. Акудовіч, Ц., Юрчык, Д. Паўстанне 1863 года на Слонімшчыне // Горад Святога Губерта: Альманах лакальнай гісторыі. — Вып. VIII / рэдкал.: А. Смалянчук [і інш.]. — Гродна, 2014. — С. 116–168.
2. Буднік, І. Ф. Да падзеяў 1863–1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — 107 с.: іл., партр., карты.
3. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Мн., 1930. — 275 с. (Запіскі Аддзелу гуманітарных навук. — Кн. 13. — Працы Інстытуту гістарычных навук. — Т. V).
4. Карпович, О. В. Восстание 1863 года в Игуменском и Слуцком уездах Минской губернии // Запісы Таварыства аматараў беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага. Выпуск 3. 1863 год: Шляхецкае паўстанне ці народная рэвалюцыя? / Укладальнік і рэдактар А. Я. Тарас. — Рыга : Выданне ІБГіК, 2014. — С. 149–161.
5. Карпович, О. В. Восстание 1863 года в Кобринском уезде // Запісы Таварыства аматараў беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага. Выпуск 3. 1863 год: Шляхецкае паўстанне ці народная рэвалюцыя? / Укладальнік і рэдактар А. Я. Тарас. — Рыга : Выданне ІБГіК, 2014. — С. 139–148.
6. Карпович, О. В. Попытка вооруженного восстания в Могилевской губернии в 1863 году // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Магілёў, 26–27 чэрвеня 2013 г. / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. — Магілёў : УА «МДУХ», 2013. — С. 157–163.
7. Маевский, И. Гродненская процессия 14 августа 1861 года // Русская старина. — 1891. — Т. 70. — № 5. — С. 489–497.

8. Матвейчык, Д. Ч. Паўстанне 1863–1864 у Ашмянах і Ашмянскім павеце // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі : Ашмяны і Ашмянскі рэгіён : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад. : А. А. Скеп'ян, А. Б. Доўнар; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2015. — С. 123–133.
9. Матвейчык, Д. Ч. Уладзіслаў Машэўскі і спроба ўзброенага выступлення ў Слуцкім павеце ў 1863 г. // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне : гісторыя і памяць : зб. навук. арт. / уклад. : В. В. Яноўская, А. У. Унучак, А. Э. Фірыновіч; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук. Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск : Беларуская навука, 2014. — С. 79–92.
10. Муравьев, М. Н. Граф Михаил Николаевич Муравьев. Записки его об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа, 1863–1866 гг. // Русская старина. — Т. 36–38. — 1882–1883; приложение — Т. XLII. — 1884. — № 6. — С. 573–584.
11. Славутинский, С. Т. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа. (Отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. — 1889. — Т. 37. — № 7. — С. 53–79; № 8. — С. 271–295.
12. Токць, С., Семянчук, А., Трацяк, Я. Паўстанцы 1863 г. сялянскага стану з Ваўкавыскага павета // Ваўкавышчына: краязнаўчы часопіс. — 2008. — № 3. — С. 3–9.
13. Фірыновіч, А. Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. — Мінск: Беларуская навука, 2013. — 315 с.
14. Фірыновіч, А. Э. «Мяцежная Магілёўшчына 1860-х»: закуліссе гадавой справаздачы губернатара // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Магілёў, 26–27 чэрвеня 2013 г. / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. — Магілёў : УА «МДУХ», 2013. — С. 386–390.
15. Хаценчык, З. А., Канецкі, Д. В. Падзеі паўстання 1863 г. на Вілейшчыне: гістарычныя нарысы. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — 67 с.: іл., партр., карты.
16. Ярмусик, Э. С. Восстание 1863 г. в Волковысском уезде // Ваўкавышчына: з гісторыі краю і лёсу людзей. Матэрыялы навукова-практычнай краязнаўчай канферэнцыі, 22 снежня 1995 года. — Ваўкавыск: Ваўкавыская ўзбуйненая друкарня, 1997. — С. 126–134.
17. Czaplicki, F. M. W. Moskiewskie na Litwie rządy 1863–1869. — Kraków: Nakładem Jana Siedleckiego, 1869. — 375 s.
18. Długosz, J. Oddziały powstańcze roku 1863 w gubernii grodzieńskiej // Przegląd Narodowy. — R. 5. — 1912. — T. 10. — S. 67–85.
19. Fajnhauz, D. 1863: Litwa i Białoruś / Inst. Historii PAN. — Warszawa: Neriton, 1999. — 357 s.
20. Gieysztor, J. Pamiętniki z lat 1857–1865. — T. 1–2. — Wilno, 1913.
21. Powstanie styczniowe. 1863-4. — Warszawa: Bellona SA; Narodowe Centrum Kultury; Muzeum Wojska Polskiego, 2013. — 205 s.

22. Powstanie styczniowe w europejskiej ilustracji prasowej. Grafika z kolekcji Krzysztofa Kura / skład.: A. Grochala, E. Miller, K. Pijanowska. — Warszawa: Drukarnia Pasaż, 2014. — 623 s.
23. Rok 1863: Wyroki śmierci / Red.: Wacław Studnicki. — Wilno: Nakł. i druk Ludwika Chomińskiego, S. a. — (Wileńskie źródła archiwalne)
24. Zieliński, S. Bitwy i potyczki 1863–1864. Na podstawie materiałów drukowanych i rękopiśmiennych Muzeum Narodowego w Rapperswilu. — Rapperswil, 1913. — 559 s.; tabl., mapy.

*Д. Ч. Матвейчык*

Артыкул паступіў у рэдакцыю 08.10.2015

# Рэзюмэ

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*«Лёсы канцылярыстаў Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі ў канцы XIX ст.»*

У артыкуле на прыкладзе лёсаў двух канцылярыстаў Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі (І. А. Манкевіча і А.-У. А. Стэфановіча) разглядаецца штодзённасць свецкіх супрацоўнікаў установы: патрабаванні да прэтэндэнтаў на пасаду, памеры ўтрымання і іншыя сацыяльныя ўмовы, магчымасці кар'ернага росту і далейшага працаўладкавання. Аўтар прыходзіць да высноў аб нізкіх кваліфікацыйных патрабаваннях установы да канцылярыстаў і недастатковым узроўні іх сацыяльнага забеспячэння, чым абумоўлена невысокая прывабнасць уладкавання на пасаду канцылярыста ў рымска-каталіцкую кансісторыю і частыя змены кадравага складу яе канцылярыі.

**Волкаў Мікалай Аляксандравіч,** вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў НГАБ, аспірант і малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі; **Плавінскі Мікалай Аляксандравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

*«Мядзельскі замак у святле пісьмовых і археалагічных крыніц»*

Ажыццяўляецца комплексная спроба даследавання гісторыі будаўніцтва і функцыянавання Мядзельскага замка, адметнага сваім значэннем у рэгіёне. Артыкул напісаны на падставе параўнання дадзеных, атрыманых у выніку археалагічных даследаванняў апошніх гадоў, з агульнай карцінай гісторыі Мядзела і Мядзельскага краю, рэканструкцыя якой выконваецца з далучэннем шырокай базы пісьмовых крыніц.

**Герасімчык Васіль Уладзіміравіч,** магістр гістарычных навук, настаўнік гісторыі Верцялішкаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раёна.

*«Удзел праваслаўнага насельніцтва Беларусі ў паўстанні 1863–1864 гг.»*

У артыкуле на падставе навуковых прац, матэрыялаў мемуарыстыкі і архіўных звестак даследуецца ступень удзелу праваслаўнага насельніцтва Беларусі ў падзеях 1863–1864 гг., адзначаецца сацыяльнае паходжанне ўдзельнікаў паўстання, іх узрост і матывацыя.

**Глінскі Яўген Станіслававіч,** старшы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый НГАБ.

*«Родавая памяць ці звычайны падман? Венская бітва 1683 г. у справах аб доказе дваранства ў Мінскай губерні»*

На падставе дакументаў фонду НГАБ «Мінскі дваранскі дэпутацкі сход» аўтар даследуе прычыны масавай падачы шляхецкімі родамі ў ДДС дакументаў са згадкамі пра ўдзел продкаў у знакамітай Венскай бітве 1683 г. супраць туркаў. Паказальна, што абсалютная большасць падобных актаў (прывілеяў і патэнтаў) з'яўляліся сфальсіфікаванымі і мелі на мэце пацвердзіць шляхецтва пры адсутнасці іншых пераканаўчых доказаў.

***Яго ж**, Рэцэнзія: Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні / Р. А. Аляхновіч, С. А. Рыбчонак, А. І. Шаланда; склад. А. І. Шаланда; навук. рэд. М. Н. Гальпяровіч. — Мір: Музей «Замкавы комплекс “Мір”», 2015. — 374 с.: іл.*

У рэцэнзіі прааналізавана калектыўная манаграфія беларускіх гісторыкаў, прысвечаная магнацкаму роду Іллінічаў. Адзначаны моцныя бакі і недахопы даследавання.

**Долатава Вольга Уладзіміраўна,** магістр гістарычных навук, аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта БДУ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела выкарыстання дакументаў і інфармацыі НГАБ.

*«Інтэлігенцыя ў Віцебскім губернскім выбарчым сходзе па выбарах у Дзяржаўную Думу І–IV скліканняў»*

У артыкуле на падставе спісаў выбаршчыкаў, якія захоўваюцца ў НГАБ і РДГА, аналізуецца ўдзел прадстаўнікоў інтэлігенцыі ў Віцебскім губернскім выбарчым сходзе па выбарах дэпутатаў Дзяржаўнай Думы І–IV скліканняў. Адзначаецца ўплыў змен у палітычным рэжыме краіны на ход выбарчых кампаній 1906–1912 гг. і ў прыватнасці на выбарчую ініцыятыву інтэлігенцыі.

**Доўнар Аляксандр Барысавіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык сектара крыніцазнаўства і археаграфіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*«Прывілеі Шклову на магдэбургскае права»*

Артыкул прысвечаны апісанню ўмоў і працэсу надання ў сярэдзіне XVIII ст. магдэбургскага права гораду Шклову, уласнасці Чартарыйскіх. Прывілеі караля Аўгуста III за 07.10.1750 і 10.04.1762 гг. публікуюцца ў дадатку да артыкула на польскай мове арыгінала.

**Кабрынец Валерый Арсеньевіч,** навуковы супрацоўнік Музея Беларускага Палесся (Пінск).

*«Пра курсы абмену рускай капейкі на рынках Магілёва ў апошняй чвэрці XVI – пачатку XVII ст.»*

У артыкуле разглядаюцца каціроўкі ці абменныя курсы рускай капейкі на рынках Магілёва ў апошняй чвэрці XVI – пачатку XVII ст. Даследаванне ажыццяўлялася на падставе дакументаў актавых кніг Магілёўскага магістрата, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Аўтарам адзначаецца, што ў гэты час курс капейкі выяўляўся пераважна ў літоўскіх і зрэдку ў польскіх грошах.

**Калініна Ганна Сяргееўна,** аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта БДУ, выкладчык кафедры рэлігіязнаўства Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла.

*«Святар вачыма праваслаўных веруючых БССР першай паловы 1930-х гг. (паводле матэрыялаў фонду НГАБ «Беларускі праваслаўны Свяцейшы Сінод»)»*

На падставе матэрыялаў фонду «Беларускі праваслаўны Свяцейшы Сінод» аўтарам аналізуюцца ўзаемадачыненні настаяцеляў з веруючымі ў праваслаўных прыходах БССР першай паловы 1930-х гг. У прыватнасці, разглядаюцца патрабаванні прыхаджан да асобы пастыра, якія залежалі ад прафесійных і асабістых якасцей, сямейнага становішча, царкоўнай арыентацыі. Адзначаюцца месца і роля архірэя ў жыцці паствы, а таксама агульная эвалюцыя свядомасці праваслаўных веруючых, выкліканая рэлігійнай палітыкай савецкай дзяржавы.

**Крэсс Віктар Канстанцінавіч,** гісторык-генеалог.

*«Скіндзеры герба "Шранява": нарысы да гісторыі і генеалогіі старажытнага шляхецкага роду (XIV–XVIII стст.)»*

Пры дапамозе матэрыялаў Літоўскай метрыкі, актаў Віленскай археаграфічнай камісіі, актавых і дэкрэтавых кніг Мінскага і Лідскага гродскіх судоў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, а таксама навукова-даведачнай літаратуры даследуюцца паходжанне, сямейна-роднасныя сувязі, канфесійная прыналежнасць, гісторыя асобных галін і адгалінаванняў шляхецкага роду Скіндзераў герба «Шранява».

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

*Рэцэнзія: Маліноўскі, Мікалай. Кніга ўспамінаў / Мікалай Маліноўскі; уклад., прадм., камент., імян. паказ. Аляксандр Фядута; пераклад з польск. Я. М. Кісялёва. — Мінск: Лімарыус, 2014. — 240 с.: іл. (Беларуская мемуарная бібліятэка).*

Рэцэнзуецца першае беларускамоўнае выданне ўспамінаў навукоўца і архівіста Мікалая Маліноўскага (1799–1865), загадчыка архіва Радзівілаў (з

1828 г.), запісаных з яго слоў Сафіяй Кіркор каля 1864 г. Прыводзяцца біяграфічныя звесткі аб ім, дадзена характарыстыка зместу мемуараў, крытычна разглядаюцца прадмова і каментарыі пад аўтарствам А. І. Фядуты. Рэцэнзент палемізуе з укладальнікам адносна асобных фактаў біяграфіі архіварыуса (прычыны ўладкавання ў архіў і знаходжання ва ўласным зборы Маліноўскага дакументаў з архіва Радзівілаў). Напрыканцы рэцэнзіі адзначаецца наяўнасць яшчэ адной наратыўнай крыніцы пад аўтарствам Маліноўскага — дзённіка за 1827–1828 гг.

**Лаўрык Юрый Мікалаевіч,** вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

*«Габрэйскія пергаментныя рукапісы ў зборах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі»*

У артыкуле разглядаюцца габрэйскія пергаментныя сувоі са збору Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Праводзячы аналіз знешняга выгляду і змешчаных тэкстаў, аўтар прыходзіць да высновы, што ўсе яны з'яўляюцца літургічнымі рукапісамі, якія выкарыстоўваліся ў сінагозе. Чатыры сувоі, згодна з тэкставым складам, уяўляюць рукапісы Торы, а адзін з біблейскай кніжнай калекцыі — «Хамеш Мэгілёт» («Пяць сувояў»), які звычайна складаецца з «Песні Саламона», «Руф», «Ляманта Іераміі», «Эклезіяста» і «Эстэр» і дастаткова рэдка сустракаецца ў беларускіх навуковых бібліятэках, музеях і архівах. Прапануецца кнігазнаўчае апісанне сувояў.

**Лісейчыкаў Дзяніс Васільевіч,** кандыдат гістарычных навук, намеснік дырэктара НГАБ.

*«Надмагільныя камяні з "рускімі" надпісамі XVI–XVII стст. каля в. Малькавічы Ганцавіцкага раёна»*

У даследаванні даецца апісанне могілак XVI–XVII стст. каля в. Малькавічы Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Прыведзены малюнкі асобных надмагілляў з надпісамі на «рускай» (старабеларускай) мове і дадзена расчытка іх тэкстаў. Аўтар таксама аналізуе змест і гісторыю стварэння «рускіх» надпісаў на ўсіх надмагіллях XVI–XVII стст. з тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага, вядомых на сённяшні дзень.

***Яго ж**, «Да 70-годдзя з дня нараджэння Алы Купрыянаўны Галубовіч»*

Артыкул прысвечаны 70-гадоваму юбілею Алы Купрыянаўны Галубовіч, дырэктара Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў 1995–2012 гг. Адзначаецца яе ўклад у такія напрамкі дзейнасці НГАБ, як інфармацыйная, публікацыйная і адукацыйная праца.

**Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч,** доктар гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і найноўшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ.

*«Механізаваныя (аўтабранятанкавыя) войскі Беларускай ваеннай акругі: стварэнне, эвалюцыя аргструктуры, стан (1929–1938 гг.)»*

У артыкуле аналізуюцца станаўленне і развіццё механізаваных (аўтабранятанкавых) войск Беларускай ваеннай акругі ў 1930-я гг. Адзначаецца, што ў СССР была распрацавана арыгінальная арганізацыйная структура аўтабранятанкавых войск.

**Марозаў Сяргей Паўлавіч —** магістр гістарычных навук, старшы выкладчык кафедры журналістыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

*«Ідэя рэстытуцыі Вялікага Княства Літоўскага ў ідэалогіі партыі "белых" у Беларусі (1861 – вясна 1863 г.)»*

На падставе новых крыніц з Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы і Расійскай нацыянальнай бібліятэкі паказана адметнасць дзяржаўна-палітычных ідэалаў напярэдадні і ў пачатку паўстання 1863 г. партыі «белых» у Беларусі, якая жадала аднавіць Вялікае Княства Літоўскае як аўтаномную дзяржаўна-палітычную адзінку ў складзе Расійскай імперыі. Выразнікамі інтарэсаў беларуска-літоўскай шляхты былі Віктар Старжынскі, які падаваў у Пецярбург праекты «ўваскрашэння Літвы», і Аляксандр Аскерка — стваральнік Літоўскага земскага крэдытнага таварыства, якое ў выпадку перамогі паўстання магло стаць вярхоўнай уладай ВКЛ.

**Матвейчык Дзмітрый Часлававіч,** кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Дзейнасць Юзафа Ядкоўскага па даследаванні і папулярызацыі гісторыі паўстання 1863–1864 гг.»*

На падставе шэрагу публікацый, пераважна ў польскамоўнай прэсе Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду, разглядаецца дзейнасць гродзенскага гісторыка і музейшчыка Юзафа Ядкоўскага па зборы, увядзенні ў навуковы ўжытак і выкарыстанні матэрыялаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. Вызначаюцца асаблівасці яго артыкулаў, асобная ўвага звяртаецца на крыніцы іх напісання. У канцы артыкула даецца агульная ацэнка дзейнасці Ядкоўскага і яго ўкладу ў гістарыяграфію гісторыі Беларусі.

***Яго ж**, Рэцэнзія: Быхаўцаў, М. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. — Гародня : [б.в.], 2014. — 344 с. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»).*

Рэцэнзуецца манаграфія ваўкавыскага краязнаўцы Мікалая Быхаўцава, прысвечаная апісанню і аналізу падзей паўстання 1863–1864 гг. у Ваўкавыскім павеце. Вызначаюцца моцныя і слабыя бакі манаграфіі, даецца ацэнка мэтазгоднасці абранай структуры, паўнаце комплексаў прааналізаваных крыніц, выкарыстанай тэрміналогіі, а таксама ўкладу ў айчынную гістарыяграфію ў цэлым.

**Мацук Андрэй Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*«Наваградскія пасольскія соймікі 1756 г.»*

У артыкуле разглядаецца дзейнасць двух павятовых соймікаў, праведзеных у Наваградку ў 1756 г. прыхільнікамі палітычных груповак Чартарыйскіх («Фамілія») і Радзівілаў. На падставе інструкцый паслам на агульны сойм ад абедзвюх партый, якія захаваліся ў актавых кнігах Наваградскага гродскага суда і Галоўнага Трыбунала ВКЛ, вызначаюцца прыкладная колькасць удзельнікаў-шляхты з кожнага боку і іх асноўныя праграмныя патрабаванні да каралеўскага двара.

**Рындзін Сяргей Мікалаевіч,** магістр гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый дакументаў НГАБ.

*«Замежныя рабочыя на тэрыторыі беларускіх губерняў у перыяд Першай сусветнай вайны»*

Аўтар даследуе ўмовы жыцця, нацыянальны склад замежных рабочых на тэрыторыі Беларусі ў 1914–1918 гг. У артыкуле аналізуецца выкарыстанне іх працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, разглядаецца заканадаўства, якое рэгламентавала працоўную занятасць замежных грамадзян. Паказана, што значная частка замежных рабочых у гэты перыяд складалася з германскіх і аўстра-венгерскіх ваеннапалонных. Вывучаецца рэалізацыя цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі нормаў міжнародных канвенцый аб умовах утрымання ваеннапалонных. У артыкуле таксама асвятляецца знаходжанне ў беларускіх губернях буйной партыі вольнанаёмных рабочых з Азіі. Праца заснавана на матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі.

**Снапкоўскі Юрый Мікалаевіч,** галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«“Вялікая еўрапейская вайна” ў жыцці насельніцтва прыфрантавых губерняў у дакументах НГАБ. Частка ІІ (1915 г.)»*

Публікуюцца 17 дакументаў НГАБ, якія асвятляюць малавядомыя старонкі айчыннай гісторыі перыяду Першай сусветнай вайны — рэпрэсіўную палітыку ўлад у дачыненні да германскіх і аўстрыйскіх падданых, цяжкае матэрыяльнае становішча насельніцтва тылавых губерняў, настроі сярод насельніцтва ў сувязі з ваенным часам, канфліктныя сітуацыі паміж ваеннымі ўладамі і цывільным насельніцтвам. Да дакументаў дадзены падрабязныя тэкстуальныя заўвагі і заўвагі па зместу.

**Урублеўскі Вадзім Валер’евіч,** кандыдат гістарычных навук, галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў НГАБ.

*«Выпадак вызвалення селяніна ад прыгоннай залежнасці з наданнем новага прозвішча».*

Адзначаецца факт вызвалення селяніна з-пад прыгоннай залежнасці з пераменай прозвішча, які зафіксаны ў дакуменце, актыкаваным у актавай кнізе Аршанскага гродскага суда 14.12.1780. Дакумент публікуецца ў дадатку на польскай мове арыгінала з перакладам на беларускую.

**Цішчанка Анжэла Сяргееўна,** вядучы архівіст аддзела аўтаматызаваных архіўных тэхналогій НГАБ.

*«Стварэнне і выкарыстанне электроннай базы дадзеных "Імянны паказальнік асоб, якія выязджаюць за мяжу па дадзеных пашпартоў" да фонду Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі "Канцылярыя мінскага грамадзянскага губернатара"»*

У артыкуле разглядаюцца працэс стварэння і асаблівасці выкарыстання базы дадзеных «Імянны паказальнік асоб, якія выязджаюць за мяжу па дадзеных пашпартоў» да фонду 295 «Канцылярыя мінскага грамадзянскага губернатара». Адзначаюцца колькасныя і якасныя характарыстыкі базы дадзеных, яе вартасці і запатрабаванасць.

**Чарняўскі Фёдар Віктаравіч,** гісторык-генеалог.

*«Антоні Свентарэцкі — апошні земскі пісар Менскага ваяводства»*

Даследуюцца факты біяграфіі, сямейна-родsuccessive сувязі і маёмаснае становішча грамадска-палітычнага дзеяча, апошняга пісара земскага менскага Антонія Свентарэцкага (1716?–1796). На прыкладзе яго жыццядзейнасці асвятляюцца працэсы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII ст.

# Резюме

**Антонович Зинаида Васильевна,** кандидат исторических наук, доцент кафедры источниковедения исторического факультета БГУ.

*«Судьбы канцеляристов Могилевской римско-католической консистории в конце XIX в.»*

В статье на примере судеб двух канцеляристов Могилевской римско-католической консистории (И. А. Монкевича и А.-В. А. Стефановича) рассматривается повседневность светских сотрудников учреждения: требования к претендентам на должность, размеры жалования и другие социальные условия, возможности карьерного роста и дальнейшего трудоустройства. Автор приходит к выводу о низких квалификационных требованиях учреждения к канцеляристам и недостаточном уровне их социального обеспечения, чем обусловлена невысокая привлекательность трудоустройства на должность канцеляриста в римско-католическую консисторию и частота смен кадрового состава ее канцелярии.

**Волков Николай Александрович,** ведущий научный сотрудник отдела древних актов НИАБ, аспирант и младший научный сотрудник Института истории НАН Беларуси; **Плавинский Николай Александрович,** кандидат исторических наук, доцент.

*«Мядельский замок в свете письменных и археологических источников»*

Осуществляется комплексная попытка изучения истории строительства и функционирования Мядельского замка, выделяющегося своим значением в регионе. Статья написана на основании сравнения данных, полученных в результате археологических исследований последних лет, с общей картиной истории Мяделя и Мядельского края, реконструкция которой осуществляется с привлечением широкой базы письменных источников.

**Врублевский Вадим Валерьевич,** кандидат исторических наук, главный архивист отдела публикации документов НИАБ.

*«Случай освобождения крестьянина от крепостной зависимости с наделением новой фамилией»*

Отмечается факт освобождения крестьянина из крепостной зависимости с переменой фамилии, который зафиксирован в документе, внесенном в актовую книгу Оршанского гродского суда 14.12.1780. Документ публикуется в приложении на польском языке оригинала с переводом на белорусский.

**Герасимчик Василий Владимирович,** магистр исторических наук, учитель истории Вертелишковской средней школы Гродненского района.

*«Участие православного населения Беларуси в восстании 1863–1864 гг.»*

В статье на основании научных работ, материалов мемуаристики и архивных сведений исследуется степень участия православного населения Беларуси в событиях 1863–1864 гг., отмечается социальное происхождение участников восстания, их возраст и мотивация.

**Глинский Евгений Станиславович,** старший научный сотрудник отдела публикаций НИАБ.

*«Родовая память или обыкновенный обман? Венская битва 1683 г. в делах о доказательстве дворянства в Минской губернии»*

На основании документов фонда НИАБ «Минское дворянское депутатское собрание» автор исследует причины массовой подачи шляхетскими родами в ДДС документов с упоминаниями об участии предков в известной Венской битве 1683 г. против турок. Показательно, что абсолютное большинство подобных актов (привилеев и патентов) являлись сфальсифицированными и имели целью подтвердить шляхетство при отсутствии иных подтверждающих доводов.

***Его же**, Рецензия: Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні / Р. А. Аляхновіч, С. А. Рыбчонак, А. І. Шаланда; склад. А. І. Шаланда; навук. рэд. М. Н. Гальпяровіч. — Мір: Музей «Замкавы комплекс “Мір”», 2015. — 374 с.: іл.*

В рецензии проанализирована коллективная монография белорусских историков, посвященная магнатскому роду Ильиничей. Отмечены сильные стороны и недостатки исследования.

**Довнар Александр Борисович,** кандидат исторических наук, заведующий сектором источниковедения и археографии Института истории НАН Беларуси.

*«Привилеи Шклову на магдебургское право»*

Статья посвящена описанию условий и процесса наделения в середине XVIII в. магдебургским правом города Шклова, собственности Чарторийских. Привилеи короля Августа III за 07.10.1750 и 10.04.1762 гг. публикуются в приложении к статье на польском языке оригинала.

**Долотова Ольга Владимировна,** магистр исторических наук, аспирантка кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени

исторического факультета БГУ, ведущий научный сотрудник отдела использования документов и информации НИАБ.

*«Интеллигенция в Витебском губернском избирательном собрании по выборам в Государственную Думу I–IV созывов»*

В статье на основании списков избирателей, хранящихся в НИАБ и РГИА, анализируется участие представителей интеллигенции в Витебском губернском избирательном собрании по выборам депутатов Государственной Думы I–IV созывов. Отмечается влияние изменений в политическом режиме страны на исход избирательных кампаний 1906–1912 гг. и в частности на избирательную инициативу интеллигенции.

**Калинина Анна Сергеевна,** аспирантка кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета БГУ, преподаватель кафедры религиоведения Института теологии имени святых Мефодия и Кирилла.

*«Священнослужитель глазами православных верующих БССР первой половины 1930-х гг. (по материалам фонда НИАБ «Белорусский православный Святейший Синод»)»*

На основании материалов фонда «Белорусский православный Святейший Синод» автором анализируются взаимоотношения настоятелей с верующими в православных приходах БССР первой половины 1930-х гг. В частности, рассматриваются требования прихожан к личности пастыря, которые зависили от его профессиональных и личных качеств, семейного положения, церковной ориентации. Отмечаются место и роль архиерея в жизни паствы, а также общая эволюция сознания православных верующих, вызванная религиозной политикой советского государства.

**Кобринец Валерий Арсеньевич,** научный сотрудник Музея Белорусского Полесья (Пинск).

*«О курсах обмена русской копейки на рынках Могилева в последней четверти XVI – начале XVII в.»*

В статье рассматриваются котировки или обменные курсы русской копейки на рынках Могилева в последней четверти XVI – начале XVII в. Исследование осуществлялось на основе документов актовых книг Могилевского магистрата, хранящихся в Национальном историческом архиве Беларуси. Автором отмечается, что в это время курс копейки выражался преимущественно в литовских и изредка в польских грошах.

**Кресс Виктор Константинович,** историк-генеалог.

*«Скиндеры герба “Шранява”: очерки к истории и генеалогии древнего шляхетского рода (XIV–XVIII вв.)»*

При помощи материалов Литовской метрики, актов Виленской археографической комиссии, актовых и декретовых книг Минского и Лидского гродских судов Национального исторического архива Беларуси, а также научно-справочной литературы исследуются происхождение, семейно-родственные связи, конфессиональная принадлежность, история отдельных ветвей и ответвлений шляхетского рода Скиндеров герба «Шранява».

**Лаврик Юрий Николаевич,** ведущий научный сотрудник Национального исторического музея Республики Беларусь.

*«Еврейские пергаментные рукописи в собраниях Национального исторического архива Беларуси».*

